Установа адукацыі
“Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”

С. Ф. Бут-Гусаім

Анамастыка Брэстчыны ў кантэксце беларускай анамастыкі: вучэбна-метадычны матэрыял

БрДУ імя А.С. Пушкіна
2021

ЛЕКЦЫЙНЫ МАТЭРЫЯЛ
Тэма 1. АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ ТЭОРЫІ АНАМАСТЫКІ

Тэрмін “**анамастыка**” (ад старажытнагрэчаскага ὀνομαστική ‘мастацтва даваць імёны’) мае два значэнні: па-першае, ім абазначаецца комплексная навука аб імёнах уласных; па-другое, самі імёны ўласныя (у апошнім значэнні ўжываецца таксама тэрмін “анімія”).

Аб’ектам вывучэння анамастыкі з’яўляюцца **ўласныя імёны (онімы)** – адзінкі мовы-маўлення, якія служаць для падкрэслена канкрэтнага называння асобных прадметаў рэчаіснасці і з прычыны такой спецыялізацыі выпрацавалі некаторыя асаблівасці ў значэнні, граматычным афармленні і функцыянаванні: ***Георгій Марчук***, ***Каляды***, ***Баранавічы***, ***Свіцязь***, крама жаночага трыкатажу “***Мужчынскія слёзы***”.

Дэфініцыі онімаў часта суправаджаюцца пытаннямі аб іх колькасным складзе і прыводзяць даследчыкаў да шырокай трактоўкі кампанентнага складу імёнаў – гэта і слова, і словазлучэнне, і сказ. Так, у “Рускай граматыцы” 1980 год. адзначана, што “для ўласных найменняў выкарыстоўваюцца агульныя назоўнікі або спалучэнні слоў” [55, с. 461]. Паводле А. К. Мацвеева, “імёны, якія вылучаюць прадмет з шэрагу падобных, могуць быць і словам, і словазлучэннем, і сказам” [42, с. 9].

В. І. Фанякова называе онімы “ўніверсальнай функцыянальна-семантычнай катэгорыяй назоўнікаў”, “асаблівым тыпам слоўных знакаў, прызначаных для выдзялення і ідэнтыфікацыі адзінкавых аб’ектаў (адушаўлёных і неадушаўлёных); знакаў, якія выражаюць адзінкавыя паняцці і агульныя ўяўленні аб гэтых аб’ектах у мове, маўленні і культуры народа” [74, с. 21].

Адметныя прыкметы ўласнага імя:

1) яно даецца індывідуальнаму аб’екту, а не класу аб’ектаў, што маюць рысу, характэрную для ўсіх індывідаў, якія ўваходзяць у гэты клас;

2) названы з дапамогай імя ўласнага аб’ект заўсёды дакладна вызначаны, адмежаваны, акрэслены;

3) імя не звязана непасрэдна з паняццем і не мае на ўзроўні мовы дакладнай і адназначнай канатацыі [63, с. 324].

Асноўныя адрозненні паміж **онімамі** і **агульнымі назоўнікамі** (**апелятывамі**) выяўляюцца на ўзроўні: 1) **паходжання**: вялікая частка імён уласных утворана ад апелятываў; 2) **функцый**: імёны ўласныя індывідуалізуюць аб’екты рэчаіснасці, а агульныя назоўнікі класіфікуюць іх; 3) **сувязі з рэчаіснасцю**: імёны ўласныя сацыяльна і гістарычна абумоўленыя; без сувязі з гісторыяй грамадства немагчыма растлумачыць

з'яўленне імён; імя адлюстроўвае традыцыі наймення і з'яўляецца сацыяльнай характарыстыкай чалавека.

Асноўнае адрозненне імён уласных ад агульных бачыцца ў асаблівай семантыцы онімаў. Шэраг навукоўцаў лічыць, што імёны ўласныя не ўтрымліваюць паняцця і, адпаведна, не маюць лексічнага значэння (А. А. Рэфармацкі, В. С. Ахманова, Е. М. Галкіна-Федарук і інш.). Імёны ўласныя звязаны з паняццем апасродкавана, праз суаднесенасць з прадметам, тады як у агульных назоўнікаў, наадварот, сувязь з прадметам ажыццяўляецца праз паняцце. Іншыя навукоўцы (А. А. Патабня, Ф. І. Буслаеў, Л. В. Шчэрба і інш.) разумеюць пад лексічным значэннем імені ўласнага такое, якое з'яўляецца ў маўленчай сітуацыі, у кантэксце. А. А. Рэфармацкі, Г. В. Вінакур і інш. называюць семантыкай імён уласных іх анталагічную сутнасць: **антрапонімы** – імёны чалавека, **тапонімы** – геаграфічныя назвы і г. д. В. Д. Бандалетаў, насупраць, выяўляе ў сутнаснай прыродзе оніма тры тыпы адносін: 1) **дэнататыўныя** (адносіны значэння слова да прадмета); 2) **сігніфікатыўныя** (адносіны да паняцця); 3) **структурныя** (адносіны значэння слова, а таксама ўсяго слова да іншых слоў дадзенай мовы) [12, с. 24].

А. В. Супяранскай прапануецца прадметна-намінатыўная класіфікацыя ўласных імён, у якой утрымліваецца абазначэнне класаў названых аб'ектаў і адпаведныя ім анамастычныя разрады: людзі – **антрапонімы**, геаграфічныя аб'екты – **тапонімы**, расліны – **фітонімы** і г. д. Аналізуючы анамастычную прастору ў цэлым, А. В. Супяранская вылучае [63, с. 144–145]: 1) рэальна існуючыя аб'екты; 2) аб'екты, народжаныя фантазіяй людзей, або імёны выдуманых прадметаў; 3) аб'екты, існаванне якіх мяркуецца, але яшчэ не даказана; 4) аб'екты, народжаныя ўяўленнем творцы. Кожная з гэтых груп падзяляецца на некалькі разрадаў. Так, да рэальна існуючых аб'ектаў адносяцца: **антрапонімы** – абазначэнні людзей у сувязі з іх рознымі характарыстыкамі: ***Зінаіда Іосіфаўна Дудзюк***, ***Радзівіліха***, ***Ганна Аршыца***; **заонімы** – найменні жывёл: конь ***Мадагаскар***, начніца ***Нюня***; **анэмонімы** – уласныя імёны вятроў, сезонаў, стыхійных бедстваў, напр.: ураганы ***Алекс***, ***Аліса***, ***Гілберт***; **касмонімы** – назвы галактык, зорных скапленняў, сузор'яў: ***Мілавіца***, сузор'е ***Валасажары***; **хранонімы** – агульнапрынятыя абазначэнні часу, а таксама, па версіі Н. У. Падольскай, уласныя імёны асобных свят, мерапрыемстваў [52, с. 162]), напр.: ***Вялікі пост***, ***Радаўніца***, гастрафэст "***Мотальскія прысмакі***"; **эргонімы** – уласныя імёны комплексных аб'ектаў: назвы ўстаноў, прадпрыемстваў, таварыстваў, у тым ліку транспартных сродкаў, напр.: турагенцтва "***Находка***", салон прыгажосці "***Эго***", рэстаран "***Малка***", кінатэатр "***Адрыя***", гасцініца "***Морское око***"; **дакументонімы** – агульныя

абазначэнні дакументаў і іх відаў, напр.: ***Метрыка Вялікага Княства Літоўскага***, "***Устава на валокі***" і інш. [63, с. 144–145].

Важным у класіфікацыі А. В. Супяранскай з'яўляецца той факт, што кожны з разрадаў дапускае далейшую спецыфікацыю. Так, **тапонімы** (агульнапрынятыя абазначэнні формаў рэльефу, водных аб'ектаў, паселішчаў) могуць падзяляцца на разнавіднасці паводле тыпу названага прадмета, аб'екта: **аронімы** – уласныя імёны гор і іншых узвышшаў: ***Балканы***, ***Кара-даг***; **гідронімы** – назвы ўсіх водных аб'ектаў: рака ***Заходні Буг***, возера ***Белае***; **айконімы** – назвы населеных пунктаў: ***Асіповічы***, ***Калауравічы***, ***Гальцы***; **урбанонімы** – назвы ўнутрыгарадскіх аб'ектаў, напрыклад назвы вуліц г. Брэста 1921–1939 гг: ***Дамброўскага***, ***Баторыя***, ***Траўгута***, ***Крашэўскага***, ***Сянкевіча***; **спелеонімы** – назвы пячор, гротаў і цэлых падземных сістэм, напр.: пячора ***Альтаміра***, ***Бута Гухалу***, ***Барабар***; **дрымонімы** – назвы лясных масіваў: ***Чорны лес***; **пелагонімы** – назвы мораў, напр.: ***Чорнае мора***, ***Чырвонае мора***; **лімнонімы** – назвы азёр, напр.: ***Лосьвіца***, ***Снуды***, ***Недрава***, ***Поцех***; **гелонімы** – назвы балот, напр.: ***Узляны-Маліннікі***, ***Сосніца-Дражбітка***; **патамонімы** – назвы рэк, напр.: ***Сож***, ***Бярэзіна***, ***Пціч***, ***Шчара***; **асціёнімы** – назвы гарадоў, напр.: ***Жабінка***, ***Маларыта***, ***Ружаны***, ***Баранавічы***; **харыёнімы** – назвы сельскіх паселішчаў, напр.: ***Паросцы***, ***Лемяшэвічы***, ***Чорнава***, ***Храсцібалавічы***, ***Барычавічы***, ***Вуйвічы***; **харонімы** – назвы вялікіх абласцей, геаграфічных, эканамічных, гістарычных, напр.: ***Нальшаны*** (гістарычная вобласць на паўночна-заходняй ускраіне Беларусі), ***Дайнова*** (гістарычная вобласць на тэрыторыі Літвы і паўночным захадзе Беларусі), ***Вялікае Княства Літоўскае***, ***Галіцка-Валынскае княства*** [63, с. 144–145].

Асаблівае становішча імён уласных у мове, іх цесная сувязь з названымі аб'ектамі, а праз іх з чляненнем чалавекам навакольнага свету – усё гэта здаўна прыцягвала да сябе ўвагу філосафаў і логікаў. Ад антычных тэорый праз сярэднявечную тэалогію да вучэнняў новых часоў прасочваюцца такія катэгорыі, як nomina propria і nomina appellativa. З імёнамі Арыстоцеля, Гобса, Лейбніца звязана развіццё тых катэгорый і адносін, з дапамогай якіх класіфікуюцца з'явы рэчаіснасці. Да Гобса і Лейбніца ўзыходзяць сучасныя асновы класіфікацыі ўласных імён. На працы Гобса і Лейбніца, якія і сфармулявалі тэорыю знакаў, абапіраўся логік Д. С. Міл, канцэпцыя якога ў той ці іншай ступені паўплывала на ўсе пазнейшыя лінгвістычныя тэорыі імя ўласнага [63, с. 328–329].

Заснавальнікам анамастыкі лічыцца нямецкі вучоны В. Гумбальд (1767–1835 гг.), а заснавальнікам славянскай анамастыкі – вядомы чэшскі славіст Франц Міклошыч, які ў 1860–1874 гг. апублікаваў важныя даследаванні славянскіх геаграфічных назваў.

Пачатак лінгвістычнага даследавання беларускай анамастыкі адносіцца да 90-х гг. XIX ст. Найбольш значныя працы гэтага перыяду: Ю. Ю. Трусман “Этимология местных названий Витебской губернии” і А. А. Качубінскі “Территория доисторической Литвы”. У 20-х гг. XX ст. пачалася работа па наладжванні арганізаванага збору анамастычнага матэрыялу. Прыкметнай працай гэтага перыяду з’яўляецца артыкул Я. Тараноўскага “Да пытання аб паходжанні назваў вёсак, мястэчак, гарадоў Беларусі”. У гэты час з’явіўся артыкул Г. А. Ільінскага “Яшчэ раз аб паходжанні назвы ракі Дзвіны”.

Ажыўленне ў вывучэнні беларускай анамастыкі наступае ўжо ў пасляваенны перыяд.

Сучасную беларускую анамастычную школу заснаваў доктар філалагічных навук акадэмік М. В. Бірыла, аўтар фундаментальнай трохтомнай працы “Беларуская антрапанімія” і шэрагу прац па беларускай тапаніміцы. Актыўна працавалі і працуюць у галіне анамастыкі такія беларускія вучоныя, як Я. М. Адамовіч, Э. К. Бірыла, Л. М. Грыгор’ева, В. П. Лемцюгова, Г. М. Мезенка, Г. М. Прышчэпчык, А. К. Усціновіч, В. В. Шур, І. Я. Яшкін.

У цяперашні час анамастыка цалкам склалася як самастойная лінгвістычная дысцыпліна. Яна мае ясна акрэсленае кола праблем, метады анамастычных даследаванняў працягваюць удасканальвацца. Акрамя збору, запісу і сістэматызацыі анамастычных матэрыялаў, у задачы анамастаў уваходзяць структурныя і тыпалагічныя даследаванні імён, рэканструкцыі больш старажытнага стану анамастычных сістэм, аналіз механізмаў іх пераўтварэння і многае іншае. Усё гэта выводзіць анамастыку далёка за рамкі “дапаможнай” і ператварае ў самастойную лінгвістычную дысцыпліну [67, с. 12].

Пераважае вывучэнне анамастычнага матэрыялу лінгвістычнымі метадамі: устанаўленне моўнай прыналежнасці імён, выяўленне фанетычных і фанематычных заканамернасцей, марфаналагічных чаргаванняў, структурных тыпаў і т. д. Важнае значэнне мае тэксталагічны аналіз пісьмовых помнікаў, аднясенне іх да пэўнай эпохі і дыялекту, вызначэнне моўных уплываў, пад якія падпадае аўтар.

Аднак, калі б анамастыка абмяжоўвалася толькі лінгвістычным кампанентам, не было б падставы вылучаць яе ў асобную дысцыпліну. Спецыфіка вывучаемага прадмета заключаецца ў тым, што, лінгвістычны ў сваёй аснове, ён уключае таксама этнаграфічны, гістарычны, геаграфічны, сацыялагічны, літаратуразнаўчы кампаненты, якія дапамагаюць лінгвісту вылучаць спецыфіку названых аб’ектаў і традыцыі, звязаныя з іх іменаваннем. Акрамя таго, у анамастычных даследаваннях выкарыстоўваюцца дадзеныя археалогіі, гісторыі матэрыяльнай і духоўнай

культуры, біялогіі, тэалогіі, філасофіі, логікі, псіхалогіі і г. д. Усё гэта выводзіць анамастычную праблематыку за межы адной толькі лінгвістыкі і надае самастойнасць комплексу яе складнікаў.

Падчас экстралінгвістычнага аналізу анамастычнага матэрыялу вывучаюць гісторыю ўзнікнення аб'ектаў, змяненне іх назваў, перанясенне назваў вядомых аб'ектаў на іншыя, храналогію геаграфічных адкрыццяў і перамяшчэння плямёнаў і народаў і г. д. [67, с. 13].

Спосаб наймення, вобраз, пакладзены ў аснову імені, вельмі індывідуальныя ў кожнага народа. Імёны (і асабліва мянушкі) у жывой гутарковай мове цесна звязаны з рэаліямі, традыцыямі, рэлігіяй, светапоглядам і г. д., уласцівымі пэўнаму этнасу, а ўсё гэта якраз і складае вобласць інтарэсаў **этнаграфіі** як адной з гістарычных навук.

Рашэнне сур'ёзнага гісторыка-этнаграфічнага пытання пра народы, якія зніклі з гістарычнай арэны або перасяліліся ў іншыя, аддаленыя рэгіёны, звязана з анамастыкай. Анамастычныя дадзеныя дапамагаюць этнографу ўстанавіць межы мінулага рассялення этнічнай супольнасці, датаваць помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры.

Вялікую цікавасць уяўляюць **археалагічныя** знаходкі, якія ўтрымліваюць фрагменты старажытнага пісьменства. Пры гэтым асабліва часта ў выяўленых археолагамі тэкстах сустракаюцца ўласныя імёны. Рэшткі старажытных анамастычных сістэм захоўваюць рысы зніклых моў і робяць магчымай хоць бы частковую рэканструкцыю іх. Дзякуючы ўласным імёнам былі прачытаны егіпецкія іерогліфы і вавілонская клінапіс, помнікі хецкай мовы, мовы мая і інш. [67, с. 14].

Летапісы, булы, пісцовыя кнігі і да т. п., якія служаць важнымі дакументамі для вывучэння старажытнай і новай **гісторыі**, аказваюцца ў той жа час невычэрпнымі крыніцамі для анамастычных даследаванняў [67, с. 14].

Анамастыка звязана з **сацыялогіяй**. "Выконваючы шэраг сацыяльных функцый, імя жыве і развіваецца па законах мовы, хоць прычыны, якія стымулююць развіццё анамастычных сістэм, па сваім паходжанні сацыяльныя, г. зн. ляжаць па-за сферай дзеяння лінгвістыкі" [63, с. 26]. Нават форма імя – структурны кампанент анамастыкі – часта абумоўліваецца сацыяльнымі фактарамі. Гэта найбольш ярка можа быць паказана на матэрыяле назваў устаноў і назваў вуліц, своеасаблівых для кожнай эпохі.

Сувязь анамастыкі і **геаграфіі** незвычайна цесная. Спецыяльнае філалагічнае даследаванне геаграфічнай наменклатуры дапамагае геаграфіі, спрыяючы высвятленню этымалогіі назваў, дапамагаючы выпрацаваць аптымальныя правілы арфаграфіі ўласных імён і даючы каштоўныя звесткі для гісторыі геаграфічных ведаў. У XX ст. у многіх

краінах былі ўтвораны спецыяльныя бюро па транскрыпцыі геаграфічных назваў. Праблемам транскрыпцыі быў прысвечаны Міжнародны кангрэс анамастычных навук (Сафія, 1972) [67, с. 16].

Важна падкрэсліць, што большасць даследчыкаў адзначаюць ***адлюстраванне ў семантычным патэнцыяле імёнаў уласных асаблівасцяў культуры, яе нацыянальнай адметнасці***. На першы план выходзіць праблема ўзаемадзеяння культуры з імем, якое функцыянуе ў ёй. Онімы могуць адлюстроўваць асаблівасці культуры таго ці іншага этнасу, пры гэтым культурна-гістарычны патэнцыял у адных імёнах выяўляецца ярчэй, у іншых менш інтэнсіўна, але няма ні аднаго імя ўласнага, якое не было б звязана так ці інакш з культурай народа, які яго стварыў або ўжывае [47].

Сукупнасць уласных імёнаў складае **анамастыкон**, ці **анамастычную (анімічную) прастору**, пэўнай мовы. Тэрмін "**анамастыкон**" ужываецца даўно і носіць інтэрнацыянальны характар. У "Слоўніку рускай анамастычнай тэрміналогіі" Н. У. Падольскай названы тэрмін выкарыстоўваецца ў двух значэннях: 1) **анамастыкон** – гэта слоўнік ці спіс любых уласных імёнаў, складзеных звычайна асобна для розных катэгорый онімаў, у прыватнасці, антрапанімікон, тапанімікон, з лінгвістычнымі і экстралінгвістычнымі тлумачэннямі; 2) **анамастыкон** – рэпертуар уласных імён дадзенага этнасу, дадзенага соцыуму, для дадзенага перыяду [52, с. 98].

У другім значэнні тэрмін "**анамастыкон**" супадае з паняццем "**аніміі**". Пад **аніміяй** разумеецца сукупнасць онімаў [52, с. 95]. Тэндэнцыяй апошняга часу стаў разгляд імя ўласнага як згорнутага нацыянальна-культурнага тэксту, што дазваляе кваліфікаваць **анамастыкон** як "...аксіялагічную шкалу, міфалагізацыю, гераізацыю, ідэалізацыю, канцэптуальныя ўстаноўкі суб'екта, у канчатковым рахунку, духоўны стыль эпохі" [25, с. 56].

Погляды людзей, якія ствараюць імёны, на чалавека і навакольны свет становяцца асновай для фарміравання своеасаблівай ***карціны свету***. В. І. Карасік, звяртаючыся да праблемаў лінгвакультуралогіі, пісаў, што "***карціна свету*** ўяўляе сабой складаную сістэму вобразаў, якія адлюстроўваюць рэчаіснасць у свядомасці чалавека" [28, с. 88]. Адметныя прыметы сацыяльнага, духоўнага і матэрыяльнага жыцця людзей знаходзяць складанае адлюстраванне ва ўласных імёнах. Семантычныя прыметы, зафіксаваныя ў онімах, якія адлюстроўваюць асаблівасці іх паходжання і бытавання, ствараюць высокую ступень інфарматыўнасці іменаслову. Паколькі ў онімах заключана разнастайная інфармацыя, яны могуць быць крыніцай для мадэлявання карціны свету і апісання яе рэгіянальных асаблівасцяў. "Нацыянальныя традыцыі і фальклор, рэлігія і

сацыяльная ідэалогія, мадэлі выхавання і жыццёвага вопыту, сістэма каштоўнасцяў, спецыфіка сацыяльнай сферы і ладу жыцця, вобразаў мастацтва – усё гэта захоўвае ў сабе анамастыкон, і карэктна счытаць гэтую інфармацыю – наша задача” [24, с. 84].

Тэма 2. АНТРАПАНІМІКА ЯК РАЗДЗЕЛ АНАМАСТЫКІ

Антрапаніміка (грэч. ἄνθρωπος ‘чалавек’ і ὄνομα ‘імя’) – раздзел анамастыкі, які вывучае антрапонімы: імёны людзей (асабовыя імёны, імёны па бацьку, прозвішчы, псеўданімы, нікі і інш.); іх паходжанне, эвалюцыю, заканамернасці функцыянавання.

На самых старажытных этапах чалавечай гісторыі, у эпоху Антычнасці, імя ўяўлялася як адзін са складнікаў асобы. Вызначэннем адметнасці ўласных імён займаліся егіпецкія, рымскія, грэчаскія вучоныя. Як асобны клас слоў уласныя імёны былі вылучаны стоікамі, у прыватнасці Хрысіпам.

У пазнейшыя эпохі вывучэннем онімаў займаліся логікі, філосафы, псіхолагі, багасловы. “У ліку тых, хто заклаў асновы сучаснай анамастыкі, былі англійскія даследчыкі Х. Джозэф, Б. Расэл, А. Гардынер, дацкі лінгвіст О. Есперсен” [82, с. 3].

Апісанне і сістэматызацыя антрапонімаў на ўсходнеславянскіх землях сустракаецца ў такіх старажытнарускіх крыніцах, як наўгародскія слоўнікі XII–XV стст. і больш познія “азбукоўнікі” XVI–XVII стст. У гэтых зборніках асабовыя імёны займалі значнае месца. Адметнасцю падобных слоўнікаў было тое, што па прыкладзе грэчаскіх і лацінскіх лексікографаў укладальнікі першых рукапісных слоўнікаў-азбукоўнікаў не рабілі розніцы паміж тлумачэннямі слоў агульных і імён уласных.

Упершыню вылучыў уласныя імёны ў асобную лексічную групу ў XVII ст. вядомы ўкраінскі філолаг Памва Бярында. У яго працы “Лексикон славенороссский и имен толкование” былі выдзелены ў асобны раздзел іншамоўныя і славянскія асабовыя імёны. Онімы на працягу доўгага часу фіксаваліся толькі ў разнастайных календарах і месяцасловах.

Першым слоўнікам асабовых імён у Расіі прызнана праца М. М. Марошкіна “Славянский именослов, или Сбор славянских собственных имён”, які выйшаў у 1867 г. У слоўніку зафіксаваны як запазычаныя імёны, так і антрапонімы некаторых славянскіх моў (рускай, польскай, балгарскай і інш.). Пры стварэнні слоўніка аўтар імкнуўся да гістарычнага тлумачэння формаў імён. Важнай падзеяй у вывучэнні і сістэматызацыі антрапанімікону стала выданне “Словаря древнерусских личных собственных имён” М. М. Тупікава (1903 г.). У слоўніку былі размешчаны старажытныя асабовыя онімы, якія не мелі

сувязі з хрысціянскімі імёнамі. У зборнік уключаны каля 5300 мужчынскіх і каля 50 жаночых імён [29, с. 7].

Сярод рускіх даследчыкаў найважнейшых анамастычных праблем неабходна выдзеліць канцэптуальныя працы В. Бандалетава, Е. Беразовіч, А. Бялецкага, Я. Верашчагіна, М. Гарбанеўскага, В. Калінкіна, Т. Кандрацьевай, Ю. Карпенкі, В. Кастамарава, Ю. Лотмана, А. Мацвеева, У. Ніканава, Я. Оціна, В. Супруна, А. Супяранскай, М. Талстога, Н. Тупікава, В. Фаняковай, Б. Успенскага і інш. [82, с. 3].

Сучасная беларуская антрапаніміка – гэта галіна лінгвістыкі, якая мае фундаментальную навуковую базу: манаграфіі (В. В. Шур, Т. А. Карніеўская, Г. М. Мезенка, В. М. Ляшкевіч, Г. К. Семянькова), слоўнікі (А. Чыж, С. Барыс, А. К. Усціновіч, І. Я. Яшкін), навучальныя дапаможнікі (В. В. Шур, Г. М. Мезенка, В. М. Емельяновіч, А. Ф. Рогалеў, Г. М. Дзеравяга, Н. А. Багамольнікава), навукова-папулярныя выданні (У. С. Ліпскі). У даследаваннях, якія прадстаўляюць агляд развіцця айчыннай анамастыкі (працы Г. М. Мезенка, М. Кандрацюка), згадваецца каля пяцісот работ беларускіх анаматолагаў.

Антрапанімія Брэстчыны актыўна даследуецца лінгвістамі нашага рэгіёна. Л. В. Леванцэвіч ажыццявіла агляд даследаванняў анамастыкі мовы Брэсцка-Пінскага Палесся. Былі разгледжаны асабовыя імёны жыхароў горада Брэста, прааналізаваны прозвішчы жыхароў вёскі Здзітава Бярозаўскага раёна: вылучаны прозвішчы, утвораныя ад праваслаўных (*Васілеўскі, Данілковіч*), каталіцкіх (*Шымчык, Гавенчык*) імён, дахрысціянскіх імён-мянушак (*Бура, Вераціла, Чарняўскі*). Былі прааналізаваны мянушкі жыхароў вёскі Здзітава Бярозаўскага раёна: акрэслены сямейна-родавыя празванні, у прыватнасці андронімы (*Немчыха, Янычыха*). Характарыстычныя празванні былі сістэматызаваны ў групы, у аснове сэнсавай нагрузкі якіх характарыстыка паводзін чалавека, яго звычак, фізічных асаблівасцяў, рыс характару, сямейнага стану і інш. [32; 33].

У вучэбна-метадычным дапаможніку “Самабытныя моўныя адзінкі ў дыялектным і літаратурным кантэксце” В. М. Касцючык разгледзела прозвішчы і імёны шляхты Брэсцкага ваяводства; прааналізавала паходжанне сучасных прозвішчаў Брэстчыны: выдзеліла словаўтваральныя гнёзды ў сістэме прозвішчаў, акрэсліла прозвішчы, у аснове ўзнікнення якіх мянушкі, паказала багацце і разнастайнасць суфіксаў у структуры прозвішчаў, выявіла прадуктыўныя прозвішчаўтваральныя тыпы Брэстчыны. Даследчыца акрэсліла адметнасць мянушак і формаў асабовых імён у гаворках Брэстчыны, а таксама ў кантэксце мастацкай прозы берасцейскіх аўтараў. У дапаможніку прадстаўлены не толькі тэарэтычны матэрыял, але і сістэма практыкаванняў, якія дапамогуць студэнтам

замацаваць навыкі аналізу антрапанімічных адзінак. В. М. Касцючык вывучала паходжанне прозвішчаў жыхароў Маларытчыны. Даследчыцай разгледжаны адыменныя прозвішчы, у якіх быў адлюстраваны народны іменаслоў – шматлікія размоўна-бытавыя формы асабовых імён, В. М. Касцючык выявіла прадуктыўныя і непрадуктыўныя тыпы словаўтварэння прозвішчаў. Даследчыца разгледзела адлюстраваную ў прозвішчах жыхароў Маларытчыны інфармацыю пра асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры этнасу [30].

І. А. Шумская прааналізавала эмацыйна-ацэначныя формы мужчынскіх і жаночых асабовых імён Брэстчыны. Былі даследаваны фанетычныя і акцэнталагічныя варыянты поўных імён, апісаны так званыя неафіцыйныя варыянты асабовых імён: агульнаўжывальныя і абмежаваныя ва ўжыванні (якія сустракаюцца на асобных тэрыторыях). Асаблівая ўвага была звернута на антрапонімы з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі: разгледжана іх утварэнне і спектр эмацыйна-экспрэсіўных адценняў, выражаных такімі формамі: спачуванне, павага, ласка, пяшчота, знявага, насмешка і многія іншыя [79; 80]. Некалькі артыкулаў даследчыцы прысвечаны разгляду такога складніка антрапанімічнай лексікі, як мянушкі. І. А. Шумская прааналізавала распаўсюджаныя на Брэстчыне генесіянімічныя найменні асоб, утваральнай базай для якіх з'яўляюцца імёны, прозвішчы, мянушкі роднасных асоб – бацькі, дзеда, маці, бабулі, жонкі і інш. [78]. Даследчыцай былі разгледжаны антрапонімы, якія характарызуюць знешні выгляд чалавека (на матэрыяле гаворак Брэстчыны) [77]. Увага І. А. Шумскай была скіравана і на адпрозвішчныя мянушкі, якія складаюць прадуктыўны клас неафіцыйных імён, што ўжываюцца ў вёсках, а таксама ў моладзевым асяроддзі і, акрамя намінатыўнай, выконваюць інфарматыўную і кантактную функцыі [78].

У даследаванні "У родным слове адгукаецца душа…" М. І. Пашкевічам былі прааналізаваны рэдкаўжывальныя асабовыя імёны, "якія складаюць неад'емную частку рубельскага слоўніка: *Міхаліна, Савелій, Спірыдон, Панцялей, Тарас, Фёкла, Юлій.* Сёння шэраг рэдкаўжывальных імён можна ўзнавіць толькі на падставе мянушак" [48, с. 5]. Даследчыкам было адзначана, што "многія асабовыя імёны маюць адметныя дыялектныя формы: *Соф'я – Зоня, Зыня, Зонька, Уладзімір – Ладзё, Ладзік, Пятро – Пэлё, Пэлік, Сцяпан – Сцелё, Сцелько*" [48, с. 5]. Вучоным былі прааналізаваны мянушкі жыхароў роднай вёскі: "мянушкі засведчылі ўменне рубельцаў трапна ацэньваць, характарызаваць аднавяскоўцаў, вылучаць іх ва ўмовах, калі жыхары маюць адно і тое ж прозвішча" [48, с. 5].

У вучэбна-метадычным дапаможніку "Беларуская анамастыка (праграма спецкурса і спецсемінара)" В. М. Емельяновіч прапанавала

праграму факультатыву “Беларуская анамастыка”, складнікам якога з’яўляюцца заняткі па праблемах антрапанімікі [22].

У манаграфіі “Семантыка і прагматыка беларускай мовы” В. І. Сянкевіч разглядае ў рэчышчы лінгвапрагматычнага даследавання маўлення з’яву варыятыўнасці ўласных асабовых імён, а таксама спецыфіку мянушкі як аднаго са сродкаў аб’ектывуючага адчужэння індывіда [68].

Намі было зроблена апісанне ўжытых у гістарычнай і аўтабіяграфічнай прозе, аўтарскіх казках і гістарычнай драматургіі берасцейскіх пісьменнікаў антрапонімаў, якія з’яўляюцца неад’емным элементам ідэйна-тэматычнага зместу мастацкага тэксту. Намі акрэсліваецца дыяпазон фармальнага і сэнсавага вар’іравання ўласных асабовых імён, характарызуюцца гаваркія прозвішчы персанажаў твораў, вызначаюцца прыёмы актуалізацыі ўнутранай формы гэтага тыпу антрапонімаў, вылучаюцца тэматычныя групы мянушак, ужытых у творах пісьменнікаў, аналізуюцца спосабы ўтварэння гэтых ацэначна-характарыстычных найменняў персанажаў, разглядаюцца функцыі паэтонімаў у творах [16].

Уласныя імёны з’яўляюцца каштоўным помнікам матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў як аднаго са славянскіх народаў. У анамастычных даследаваннях не раз заўважалася, што імёны маюць важнае значэнне не толькі як матэрыял мовы, але і як помнік матэрыяльнай і духоўнай культуры.

Сучасная форма іменавання ва ўсходніх славян уключае тры элементы: імя, імя па бацьку, прозвішча. Фарміраванне адзначанай мадэлі адбывалася паступова. Многія вучоныя аналізавалі пытанне перыядызацыі ўсходнеславянскай антрапаніміі.

Г. У Суслава і А. В. Супяранская вылучаюць тры перыяды ў станаўленні ўсходнеславянскага іменаслову:

1) дахрысціянскі;

2) перыяд пасля ўвядзення хрысціянства на Русі;

3) новы (пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі) [64, с. 42].

В. Д. Бандалетаў лічыць больш апраўданым увесь шлях развіцця ўсходнеславянскай антрапаніміі падзяліць на чатыры асноўныя перыяды:

1) з самай старажытнай пары да канца X ст.;

2) з XI да XVIII ст. – перыяд барацьбы спрадвечнаславянскіх (усходнеславянскіх і рускіх) імён з візантыйска-грэчаскімі. У гэтым перыядзе вылучаюцца два падперыяды:

а) з XI па XIII стст. – выкарыстанне кананічных імён пры ўяўным функцыянальным панаванні неканонічных антрапанімных адзінак;

б) з XIV па XVII стст. – панаванне кананічных імён;

3) з пачатку XVIII ст. да 1917 г. – перыяд манапольнага існавання кананічных імён;

4) савецкі перыяд (з 1917 г. да нашага часу) – перыяд дэкананізацыі (дэхрысціянізацыі) традыцыйнага іменаслову [12, с. 40].

Т. А. Карніеўская прапануе наступную класіфікацыю гісторыі айчыннага іменаслову:

1) дахрысціянскі перыяд – са старажытнасці да хрышчэння Кіеўскай Русі ў 988 г. Уладзімірам;

2) XI–XVIII стст. – перыяд узаемадзеяння кананічных і неканапічных імён;

3) XVIII стагоддзе – 1917 г. – перыяд панавання кананічных імён;

4) 1917–1930 гг. – перыяд наватворчасці, калі ў выніку дэхрысціянізацыі традыцыйнага іменаслову і надання свабоды ў выбары імя назіраецца анамастычны бум. Гэта быў перыяд існавання самых гратэскных імён, адапелятыўных найменняў і г. д. Тады ўзнікла каля трох тысяч новых онімаў;

5) 1930–1990 гг. – перыяд традыцыйнасці, калі колькасць выкарыстоўваемых імён была досыць абмежаванай, а іменаванне ў значнай ступені адчувала ўплыў палітыкі;

6) 1990 г. – да цяперашняга часу – т. зв. перыяд перамен, калі адбываюцца найбольш значныя змены ў іменаслове. Мы вылучаем гэты перыяд на падставе таго, што ў апошняе дзесяцігоддзе XX стагоддзя іменаслоў пачаў значна змяняцца. Сталі з’яўляцца ў актыўным ужытку старыя імёны, актыўна запазычваюцца онімы з іншых моў, з’яўляюцца разнастайныя варыянты вядомых антрапонімаў. Актыўны іменаслоў паступова пашыраецца [29, с. 49].

Да ўвядзення хрысціянства асабовыя імёны на славянскіх тэрыторыях былі празваннямі, якія даваліся паводле пэўнай нагоды. У старажытнасці людзі ўспрымалі імёны матэрыяльна, як неад’емную частку чалавека. Яны хавалі свае імёны ад ворагаў, лічачы, што аднаго ведання імя дастаткова для таго, каб нашкодзіць каму-небудзь. Часам пісалі ў сябе на пятках імёны сваіх ворагаў, каб, ідучы, таптаць іх і тым самым рабіць зло носьбітам гэтых імён.

Багацце складу старажытных славянскіх імён адлюстравана ў слоўніку Н. М. Тупікава (“Слоўнік старажытнарускіх асабовых імён”), у якім сабрана 5300 мужчынскіх і каля 50 жаночых імён. У старажытнасці былі імёны ўнутрысямейныя, якія надаваліся дзецям у сям’і адразу пасля іх нараджэння. У адным са старажытных азбукоўнікаў гаворыцца: “Первых родов и времен человецы даяху детем своим имена, якоже отец и мать отрочати изволят: или от взора и естества, или от вещи, или от притчи. Такожде и словене прежде их крещения даяху имена детем своим сице: Бог-

дан, Божен, Первой, Второй, Любим и ина такова. Добра же суть и та” [64, с. 42].

Старажытныя імёны-празванні былі разнастайныя. Напрыклад, у лікавых імёнах падстаўлены ўвесь лічбавы рад ад 1 да 10: *Пярвак, Трацяк, Чацвяртак, Пятак, Шастак, Сямак, Асьмак, Дзявятка, Дзясяты.* Гэтыя імёны можна заўважыць у складзе сучасных прозвішчаў: *Трацяк, Пятакоў, Шастакоў, Дзявятаў.*

Вельмі папулярнымі былі імёны, якія даваліся па колеры валасоў і скуры: *Чарныш, Чарняй, Бел, Бяляй, Бялуха*. Імёны прысвойваліся і па іншых знешніх прыметах – росце, асаблівасцях целаскладу: *Сухі, Тоўсты, Малюта, Заяц, Бяспалы, Галавач* і да т. п.

Акрамя імён, якія даваліся паводле знешняга выгляду, былі такія, якія прысвойваліся ў залежнасці ад характару і паводзінаў дзіцяці: *Бяссон, Булгак* (неспакойны), *Моўчан, Смяяна, Несмяяна, Ціхі*. У некаторых імёнах адзначаліся пажаданасць ці непажаданасць з’яўлення дзіцяці ў сям’і і іншыя абставіны: *Бажэн* (жаданы, мілы), *Любім, Любава, Чаян* і *Нячай, Хацен* і інш. Асобныя імёны даваліся паводле часу нараджэння дзіцяці: *Зіма, Мароз, Вяшняк*.

Былі і іншага парадку імёны, якія ўзыходзілі да старажытных павер’яў. Гэта “дрэнныя” імёны, якія нібыта здольныя былі адштурхоўваць злых духаў, хваробы, смерць: *Няміл, Някрас, Нялюба, Злоба, Тугарын* (туга – смутак).

Вялікі інтарэс выклікаюць імёны, звязаныя з жывёльным і раслінным светам: *Воўк, Кот, Жарабя, Карова, Трава, Шчаўе* і інш. Уважлівае вывучэнне іх дазволіць прачытаць яшчэ адну старонку з жыцця старажытных славян – раннеславянскі татэмізм, вераванне ў боскасць асобных раслін і жывёл, відавочна, пераважна тых, якія адыгрывалі асаблівую ролю ў жыцці нашых продкаў. Прамых пасведчанняў гэтага боку іх духоўнага жыцця не захавалася, імёны павінны дапамагчы вывучэнню гэтага гістарычнага факта.

Імёны-характарыстыкі даваліся не толькі дзецям паводле акрэсленых прымет, але і дарослым у сувязі з рознымі абставінамі. Напрыклад, імёны паводле назваў жывёл маглі прысвойвацца паводле падабенства чалавека з імі: празванні *Воўк, Шчупак* даваліся людзям драпежным і вераломным па натуры і да т. п.

Унутрысямейныя імёны людзей часам замяняліся другімі празваннямі, якія даваліся ў грамадскім асяроддзі пасля ўступлення чалавека ў самастойнае жыццё ці пры змене месца жыхарства, працы. Падставаў для прысваення імён-празванняў дарослым было значна больш, таму і па колькасці, і па разнастайнасці такія імёны-празванні пераўзыходзяць унутрысямейныя празванні. Найменні-характарыстыкі

даваліся паводле разнастайных прымет: па знешнім выглядзе – *Бязнос*, па характары – *Блыха* (маленькі, часам злы чалавек), *Праўда* (праўдзівы), *Варона* (разявака); па грамадскім статусе: *Князь*, *Каваль*.

З некалькіх тысяч старажытных адметных імён, створаных на аснове побытавай лексікі, шырока распаўсюджанымі былі некалькі дзясяткаў: *Бажэн*, *Баран*, Белы, *Бык*, *Вяшняк*, *Воін*, *Воран*, *Гневаш*, *Дружына*, *Дабрыня*, *Лобан*, *Любім*, *Малыш*, *Маўчан*, *Мароз*, *Поснік*, *Паспел*, *Пуціла*, *Сокал*, *Субота*, *Шуміла*, *Ярэц*, *Яраслаў* і інш. Распаўсюджанасць менавіта гэтых імён дала штуршок да стварэння розных дадатковых іх форм – скарочаных, памяншальных, ласкальных.

Ад пералічаных асабовых імён з усімі іх дадатковымі формамі на пэўным этапе развіцця ўтварыліся прозвішчы. Аналіз гэтых прозвішчаў, рэканструкцыя іх асноў дазволілі выявіць формы славянскіх асабовых імён, якія існавалі ў тыя далёкія часы. Так, *Баранчык* было памяншальным ад імені *Баран*, *Бычко* – ад *Бык*. Памяншальна-ласкальныя формы мелі патранімічнае значэнне: *сын бацькі*.

Формаўтваральныя элементы такіх празванняў былі вельмі разнастайнымі. Паказальныя ў гэтым сэнсе імёны з асновай *-мал-*: *Мал*, *Малей*, *Малёна*, *Малёк*, *Малёнак*, *Малуха*, *Малуша*, *Малько*, *Малюга*, *Малява*, *Маляўка*.

Другі, вельмі працяглы перыяд у гісторыі асабовых імён прыйшоў пасля ўвядзення хрысціянства, разам з якім увайшлі ў практыку іменавання каляндарныя імёны. Яны даваліся людзям па царкоўным календары, у якім размяркоўваліся па ўсіх днях года.

Хрысціянскія імёны паводле царкоўных паданняў былі імёнамі падзвіжнікаў і пакутнікаў, якія загінулі за сцверджанне рэлігіі.

Прыняцце новых імён славянамі ішло павольна. Большасць з іх і пасля хрышчэння да XVII стагоддзя працягвала называць сваіх дзяцей славянскімі імёнамі. Каляндарнае імя (*рекло*) давалі святары па святцах у адпаведнасці з тым, якое імя прыходзілася на дзень нараджэння ці хрышчэння дзіцяці па календары, часам – на адзін з дзён паміж гэтымі датамі. Старажытныя славянскія імёны, у тым ліку і двухасноўныя княскія (*Уладзіслаў*, *Уладзімір*), царква не прызнавала, лічачы язычніцкімі. Вялікаму князю кіеўскаму *Уладзіміру Святаславічу* падчас хрышчэння было дадзена імя *Васіль*. Такім жа чынам была перайменавана кіеўская княгіня *Вольга*, якая ездзіла ў Візантыю для заключэння з ёй дагавору і адной з першых прыняла хрысціянства. Пры хрышчэнні ў 957 г. ёй было дадзена імя *Алена*. Малодшыя сыны Уладзіміра Святаславіча *Барыс* і *Глеб* былі названы пры хрышчэнні *Раман* і *Давід*, аднак у гісторыі захаваліся толькі іх дахрысціянскія імёны [64, с. 41–50].

Да канца XI ст. у большасці жыхароў Беларусі ўжо былі хрысціянскія імёны, якія нярэдка ўсведамляліся як культавыя і таму не выкарыстоўваліся ў паўсядзённых зносінах, часам нават трымаліся ў тайне. У грамадстве чалавек быў вядомы пад мірскім, штодзённым іменем, у якасці якога выступалі ранейшыя язычніцкія імёны.

Адным з фактараў, які спрыяў захаванню даволі шырокага і трывалага кола язычніцкіх іменаванняў да XVII ст., быў сімбіёз хрысціянства і язычніцтва. У беларускіх пісьмовых помніках XV–XVII стст. сярод шырокага кола антрапонімаў даследчыкі вылучаюць такія старыя язычніцкія імёны, як ***Багдана***, ***Багуміла***, ***Дабрыяна***, ***Ждана***, ***Нядзелька***, ***Таміла***, ***Багдан***, ***Волас***, ***Дабяслаў***, ***Міраслаў***, ***Прадслаў***, ***Хвалімір***, ***Яраслаў*** і інш.

Істотна тое, што хрысціянскія імёны праз абмежаванасць іх кананічнага спіса не забяспечвалі выразнага і адназначнага размежавання людзей. Дыферэнцыяльна-ідэнтыфікацыйная функцыя новых імён была аслаблена. У такой сітуацыі дахрысціянскія найменні нярэдка ліквідавалі недахоп хрысціянскіх імён. Таму яны не знікалі і не забываліся [53, с. 40].

А. К. Усціновіч адзначае: “Побач з поўнымі традыцыйна-царкоўнымі і размоўна-бытавымі імёнамі ў XVI–XVIII стагоддзях шырока былі прадстаўлены і эмацыйна-ацэначныя формы, якія ўзнікалі ў сувязі з неабходнасцю выказаць свае адносіны да іншай асобы або звярнуцца да пэўнай катэгорыі людзей. Ацэначныя формы ўтвараліся ад: 1) поўных каляндарных імён: *Адам – Адамка*, *Адамец*; 2) поўных размоўна-бытавых імён: *Остап – Остапко*; 3) усечаных форм, якія шырока выкарыстоўваліся ў гутарковай мове: *Місь* (усечаная форма ад Міхаіл) – *Місюта* і інш. Некаторыя эмацыйна-ацэначныя формы замацоўваліся за канкрэтнай асобай у якасці асноўнай формы імені. Гэта адбывалася тады, калі трэба было адрозніць асобы з адным і тым жа каляндарным імем. У сувязі з гэтым шмат якія эмацыйна-ацэначныя формы мелі нейтральнае значэнне. Пацверджаннем гэтаму з’яўляецца тое, што эмацыйна-ацэначныя формы нярэдка ўжываліся ў спалучэнні з патранімічнымі формамі, а таксама і тое, што ад іх утвараліся імёны па бацьку” [71, с. 11–12].

Сур’ёзнае ўмяшальніцтва ў развіццё айчыннага іменаслову адбылося пасля 1917 г., калі змянілася канцэпцыя імені. У 1920-я гг. XX ст. імёны разглядаліся як своеасаблівыя пропускі для новых грамадзян у новае жыццё. Людзі, якія давалі сваім дзецям новыя імёны ці мянялі свае, узгаднялі іменаванне з новай ідэалогіяй. Можна адзначыць некалькі накірункаў, паводле якіх ствараліся новыя імёны: 1) рэвалюцыя і рэвалюцыйная эпоха – *Рэўдзіт* (рэвалюцыйнае дзіця), *Рэво* (мужчынскае), *Люцыя* (жаночае) – часта даваліся блізнятам; *Камунар*, *Герой*, *Барыкада*; 2) планы развіцця краіны: *Электрофікацыя*, *Рэм*

(рэвалюцыя, электрыфікацыя, механізацыя), *Мартэн*; 3) дасягненні навукі і мастацтва: *Акадэма*, *Паліграфа*, *Геній*, *Эліта*; 4) назвы кветак і каштоўных камянёў: *Гартэнзія*, *Лілія*, *Алмаз*; 5) ажыццяўляючы салідарнасць з рабочымі замежных краін, людзі давалі дзецям імёны-запазычанні з заходнееўрапейскіх моў: *Эрнст* (у гонар Тэльмана), *Клара* (у гонар Цэткін), *Роза* (у гонар Люксембург).

У XX стагоддзі з'явіліся шматлікія абрэвіятуры ў многіх мовах свету. Яны актыўна выкарыстоўваліся і пры стварэнні новых імён: *Пятвчет* (Пятилетку в четыре года), *Восмарт* (восьмое марта), *Эдил* (Эта девочка имени Ленина) [62, с. 250].

У перыяд нацыянальнага нігілізму "з ужытку выштурхоўваліся спецыфічныя беларускія імёны: *Алесь* замяняецца *Аляксандрам*, *Паўлюк – Паўлам*, *Базыль – Васілём*, *Юрась – Юрыем*, *Міхась – Міхаілам*, *Мішам*, *Кастусь – Канстанцінам*, *Косцем*, *Юзік – Іосіфам* і г. д. Гэтай негатыўнай з'яве нярэдна садзейнічае і тое, што нават нарматыўныя даведнікі кваліфікуюць некаторыя спецыфічна беларускія імёны як гутарковыя, размоўныя, арыентуючы нас на чужы іменаслоў" [81, с. 29].

У эсэ "Незалежнасць – гэта" Уладзімір Арлоў з горкай іроніяй пісаў наступнае: "Незалежнасць – гэта калі твой бацька пойдзе ў загс, каб атрымаць дакумент, што ты сапраўды нарадзіўся і што цябе назвалі ў гонар дзеда *Рыгорам*, і кабета, якая сядзіць там, спакойна выпіша яму гэты дакумент, а не выцягне са стала «Справочник личных имён народов СССР» і не будзе, размахваючы ім, істэрычна тлумачыць твайму бацьку, што ён можа без праблем назваць сына Файзулой ці нават Мамаем, а вось Рыгорам – не можа, бо такога імя проста не існуе ў прыродзе (а существует нормальное человеческое имя Григорий" [81, с. 30].

З другой паловы XX ст. узрастае папулярнасць старых кананізаваных імён, такіх, як ***Ягор***, ***Дзяніс***, ***Арцём***, ***Даніла***, ***Кацярына***, ***Дар'я*** і інш., і старажытнаславянскіх (***Святаслаў***, ***Славамір***, ***Лада***, ***Рагнеда***) [5, с. 18].

Кожны храналагічны адрэзак развіцця соцыуму фарміруе свой анамастычны спектр, мадэлі наймення адпавядаюць традыцыям і звычаям гэтага часу. Онім з'яўляецца гісторыка-культурным і сацыяльным знакам і ўяўляе сабой каштоўную крыніцу інфармацыі аб светабачанні, побыце, абрадах і рэлігійных вераваннях народа. У анамастычных сістэмах краіны і асобных яе рэгіёнаў адлюстроўваюцца асаблівасці іх культурнага і гістарычнага развіцця.

Тэма 3. АСАБОВЫЯ ІМЁНЫ

Уласнае імя адыгрывае ў жыцці чалавека прыкметную ролю, суправаджаючы кожнага ад нараджэння да смерці, успрымаючыся як яго

неад'емная прыналежнасць. Апошні прадстаўнік "сярэбранага стагоддзя" рускай філасофіі А. Ф. Лосеў пісаў: "Усё жыве іменем і сведчыць пра яго. Кахаючы, мы паўтараем любімае імя. У нянавісці мы ганьбім і прыніжаем таго, каго ненавідзім, праз яго імя. І молімся мы, і клянём праз імёны. І няма межаў жыцця імені, няма меры яго магутнасці" [40, с. 166].

З самых старажытных часоў людзі мелі імёны. Яны ўзніклі паміж 50-м і 12-м тысячагоддзямі да н. э., калі аб'яднанне людзей уяўляла сабой першабытную групоўку неандэртальцаў. Ужо тады імя служыла для індывідуалізацыі кожнага асобнага члена грамадства.

Старажытныя людзі верылі ў рэальную магчымасць перадаць праз слова тыя якасці і ўласцівасці, якія выражаны ў яго значэнні. Імёны выконвалі пажадальную функцыю. Старажытныя славянскія *Дабрыня, Уладзіслаў, Яраслаў, Уладзімір,* кіргізскае *Бай-балсун* (няхай будзе багаты), марыйскае *Пайбарды* (няхай будзе багаты), якуцкае *Ньюргун* (лепшы, слаўны), чачэнскія *Леча* (сокал), *Жовхар* (жэмчуг), фінская *Тармо* (сіла), *Ульяс* (смелы), асецінскае *Зарына* (золата) – імёны-пажаданні. Асабліва часта давалі імёны-пажаданні тыя бацькі, у якіх раней паміралі дзеці – сербы, харваты: *Жыўка, Стоян, Станка*, казахі – *Тактамыс* (ён застаўся жывы), туркмены *Турсун* (няхай ён ацалее).

Многія народы свету ўспрымалі нараджэнне дзяўчат як няшчасце, таму гэтая падзея не адзначалася: афіцыйнага абраду надання імені для дзяўчат не праводзілі. Да замуства жанчыны насілі мянушкі, а потым муж зваў жонку "баба". Нядзіўна, што ў імёнах адлюстроўвалася нежаданне мець дзяўчат. Так, калі ў сербаў нараджаліся толькі дзяўчынкі, то ім давалі імёны *Доста, Стойна*, г. зн. "спыніцеся, дзяўчаты, нараджайцеся, хлопчыкі". У Дагестане ў такіх выпадках давалі імя *Кыз-таман* ("з дзяўчатамі закончана"), а кіргізы давалі імёны з пажаданнямі дзяўчынцы ператварыцца ў хлопчыка.

Ва ўсім свеце імя для чалавека было не проста выдзяляльным знакам. З ім у народнай свядомасці звязваліся лёс, шчасце, удача [31, с. 172].

На тэрыторыі Беларусі неаліт, ці новае каменнае стагоддзе, датуецца канцом V – пачаткам II тысячагоддзя да н. э. Беларусь насялялі розныя даіндаеўрапейскія плямёны, якія растварыліся ў канцы III – пачатку II тысячагоддзя да н. э. у новым этнамоўным асяроддзі. Уяўленні пра свет і соцыум у людзей каменнага стагоддзя грунтаваліся на татэмізме, г. зн. веры ў татэмнага продка і культ татэмаў – абагоўленых жывёл, раслін, а таксама геаграфічных аб'ектаў, якія лічыліся родапачынальнікамі, апекунамі і зберагальнікамі пэўнай групы людзей – роду, племені і г. д.

Антрапанімія роду ці племені фарміравалася ў залежнасці ад відавой прыналежнасці татэмнага продка і адпавядала яго магчымым "іпастасям" і часткам цела, прыметам, уласцівасцям, дзеянням. Татэмамі ў неалітычных

плямёнаў, якія жылі ў межах сучаснай Беларусі, маглі быць розныя жывёлы і птушкі (мядзведзь, лось, качка, сокал, бусел, вуж і інш.) і расліны (дуб, ліпа, сасна, бяроза).

У членаў роду, татэмам якога быў, напрыклад, лось, асабовымі імёнамі былі *Рог, Капыта, Нага, Вока, Шыя*. Калі татэмам была птушка, у якасці асабовых імён выбіралі *Крыло, Хвост, Дзюбу*. Імёны *Корань, Ліст, Кара* сведчылі пра татэм-дрэва. Такім чынам, імёны членаў першабытнага калектыву адлюстроўвалі бачанне татэма, прадстаўленне яго ўласцівасцей і якасцей, апісанне і характарыстыку яго дзеянняў і станаў.

У насельніцтва, якое жыло ў Верхнім Падняпроўі ў VII–III стст. да н. э. і пакінула пасля сябе сляды мілаградскай культуры, культавай жывёлай быў *воўк*. У гістарычных помніках захавалася калектыўнае імя (этнонім) гэтага насельніцтва – *неўры*, што значыць “людзі”, “народ”. Старажытнагрэчаскі гісторык Герадот, які жыў у V ст. да н. э., называў неўраў пярэваратнямі, таму што кожны неўр адзін раз у год ператвараўся ў ваўка. Гэтае паведамленне Герадота грунтавалася на паданнях, якія яму давялося пачуць падчас падарожжа ў Скіфію.

Славянскія этнадыялектныя групы, якія ўпершыню з’явіліся на тэрыторыі Беларусі ў пачатку новай эры, атрымалі ў спадчыну ад папярэдніх этнасаў татэмістычныя ў сваёй аснове матывы надання імені і спосабы ўтварэння асабовых імён, а таксама перадалі іх па традыцыі сваім пераемнікам. Ад неўраў славяне запазычылі веру ў магічную сілу і прарочыя ўласцівасці ваўка. Бясспрэчным неўрскім следам у беларускай міфалогіі з’яўляюцца паданні пра людзей-ваўкалакаў, людзей-пярэваратняў. У славянскай антрапаніміі ўжываліся “воўчыя” імёны: *Воўк*, а таксама апісальныя, табуіраваныя імёны *Шэры, Люты, Клык*. Імя *Воўчы Хвост* насіў кіеўскі ваявода, які разбіў радзімічаў на рацэ Пясчане ў 984 г.

На ранніх этапах развіцця ўсходнеславянскай іменнай сістэмы названыя антрапонімы былі непасрэдна звернуты да свету прыроды, часткай якой з’яўляўся і сам чалавек – носьбіт імені. Пра існаванне ў мінулым культу мядзведзя, які лічыўся татэмам у многіх этнадыялектных груп, пачынаючы з каменнага стагоддзя, сведчаць дадзеныя індаеўрапейскіх моў, у тым ліку і кампаненты іменаслову ўсходніх славян: асабовае імя *Мядзведзь* і цэлы шэраг антрапонімаў, утвораных ад назваў частак цела мядзведзя (*Мядзведжае Вока, Мядзведжая Лапа, Мядзведжы Клык*) ці ўласцівасцяў звера, яго рэальных ці ўяўных дзеянняў (*Буры, Моцны, Магутны, Паляўнічы, Абаронца, Тапатун* і да т. п.). У такіх імёнах – не толькі ўказанне на роднасць з татэмам, але і слоўная абарона ад знешніх злых сіл, ахоўная “замова”.

Усходнія славяне ў IX–X стст. актыўна выкарыстоўвалі пры ўтварэнні імён багатыя словаўтваральныя сродкі сваёй мовы. Аднымі з самых частотных суфіксаў у складзе імёнаў былі, у прыватнасці, памяншальныя суфіксы, якія надавалі імёнам значэнне “малодшы ў сям’і, родзе, сын”: *Беланожка* – сын *Беланога*, *Зубко* – сын *Зуба*, *Бобрык* – сын *Бабра*, *Лапаток* – сын *Лапця* [53, с. 17–22].

Многія язычніцкія імёны былі захаваны ў сучасных прозвішчах, што сведчыць пра актыўнае выкарыстанне язычніцкага іменаслову да таго часу, калі пачалі фарміравацца прозвішчныя празванні. На Беларусі дагэтуль жывуць прозвішчы *Лапін*, *Зубін*, *Зубкоў*, *Крылоў*, *Зайцаў*, *Казлоў*, *Быкаў*, *Лісіцын*, *Воранаў*, *Лебедзеў*, *Коласаў*, *Сустаў*, *Ступін*, *Чарнышоў*, *Бяляеў*, *Пярвухін*, *Траццякоў*, *Крыкуноў*, *Нячаеў*, *Паспелаў* і інш. У сваіх вытоках яны ўзыходзяць да дахрысціянскіх асабовых імён. У некаторых з іх адчуваецца водгалас неаліту [53, с. 17–22].

Хрысціянства ўзнікла на мяжы старой і новай эры ў пяці епархіях: Александрыйскай, Антыахійскай (Сірыя), Ерусалімскай, Канстанцінопальскай (Візантыйскай), Рымскай. Імёны хрысціян ва ўсіх епархіях былі народнымі імёнамі тых месцаў. Раннія хрысціяне перажылі жорсткія ганенні, многія загінулі за веру. Іх імёны ўносіліся ў *марціролагі* – апавяданні пра пакутнікаў і пакуты. Побач з марціролагамі ў першы перыяд хрысціянства (I–IV стст. н. э.) складаліся *сінодзікі*, ці *дыпціхі*, – кнігі, у якія ўсе жадаючыя запісвалі імёны сваіх родзічаў, жывых і памерлых, для пастаяннага памінання на літургіях і паніхідах. Дыпціхамі іх называлі таму, што яны складаліся з дзвюх звязаных дошчачак. Нованароджаным прапаноўвалася даваць імёны з сінодзікаў, каб не забываць імёны першых хрысціян.

У сувязі са складанай геаграфіяй хрысціянскага свету састаў царкоўных імён неаднародны. Можна вылучыць наступныя кампаненты:

1. **Антычны кампанент.** У грэкаў быў добра развіты пантэон, апісаны і ўпарадкаваны Гамерам у IX ст. і Гесіёдам у VIII ст. да н. э. Акрамя імён, багі мелі шматлікія эпітэты. У імёнах людзей паўтараліся імёны багоў і іх эпітэты. Напрыклад, *Георгій* (грэч. ‘*земляроб*’): адной з функцый Зеўса было спрыянне земляробству; *Сілуян* (лац. ‘лес’): адной з функцый Марса была ахова лесу.

Звяртае на сябе ўвагу група “марскіх” імён. Багіня кахання і прыгажосці *Афрадыта*, дачка Зеўса, паводле легенды, нарадзілася з марской пены (грэч. Aphos ‘пена’). На астравах Міжземнага мора былі свяцілішчы Афрадыты, дзе маракі пакідалі для яе дары: золата, жэмчуг, перламутравыя ракавіны, адсюль яе эпітэты: *Маргарыта* (грэч. ‘жамчужына’), *Пелагея* (грэч. ‘мора’), *Марына* (лац. ‘мора’).

2. Старазапаветны кампанент, які ўзыходзіць да Бібліі, арамейскай і старажытнаяўрэйскай моў. У склад каляндарных імён увайшлі імёны біблейскіх прарокаў, а таксама некаторых продкаў Ісуса Хрыста. Да старажытнаяўрэйскай мовы ўзыходзяць імёны Іаана Хрысціцеля і Дзевы Марыі. Паводле легенды, святару і прароку Захарыю з'явіўся архангел Гаўрыіл і абвясціў, што ў яго народзіцца сын і той назаве яго *Іаанам* (старажытнаяўрэйскае '*Бог мілуе*'). Паступова імя *Іван* стала папулярным нацыянальным імем тых краін, куды трапіла хрысціянства, імем-прэзентацыяй многіх народаў: французскае *Жан*, англійскае *Джон*, італьянскае *Джавані*, рускае *Іван*.

3. **Раманскі кампанент** больш істотны для імён Заходняй Еўропы. Пасля падзення Рымскай імперыі ў яе былых межах паступова складваюцца новыя самастойныя дзяржавы са сваімі нацыянальнымі мовамі пры значным уплыве лацінскай мовы, якая была агульнадзяржаўнай пісьмовай мовай імперыі, праваднікам культуры, палітыкі, асветы. Лацінская мова доўгі час заставалася мовай царквы і навукі. У сярэдзіне I тысячагоддзя Рымскай царквой быў створаны шэраг штучных імён, якія адлюстроўвалі рысы ідэальнага хрысціяніна: рахманасць, пакорлівасць (*Клімент*), набожнасць (*Пій*), пастаянства (*Канстанцін*).

4. **Германскі кампанент**. Нашэсце варвараў-германцаў на Рымскую імперыю ў сярэдзіне I тысячагоддзя прынесла з сабой вялікую колькасць германскіх імён. Паступова многія германскія імёны былі кананізаваныя, паколькі Рымская царква далучыла да ліку святых епіскапаў, князёў, каралёў: *Карл*, *Альберт*, *Эрхард*, *Адольф* і інш.

5. **Усходні кампанент**. У хрысціянскі анамастыкон увайшлі таксама словы і імёны, якія гучалі ў мовах Сірыі, Егіпта, Іарданіі, Палесціны, Лівана. Да мовы коптаў (хрысціян Егіпта) узыходзіць імя *Пафнуцій* 'той, хто належыць Богу' [62, с. 100].

А.Ф. Рогалеў заўважае, што "разгляд этымалогіі хрысціянскіх імён дазваляе выявіць язычніцкія карані многіх з іх. Так, з язычніцкімі *імёнамі-пажаданнямі* суадносяцца:

Канстанцін (лацінскае імя з этымалагічным значэннем "пастаянны, стойкі"),

Ганна (старажытнаяўрэйскае – "міласць, боская ласка"),

Віктар (лацінскае – "пераможца"),

Валянцін (лацінскае – "здаровы"),

Парамон (грэчаскае – "трывалы, надзейны, верны").

Засцерагальнымі імёнамі ў глыбокай старажытнасці былі:

Мірон (грэчаскае, паводле аднаго з тлумачэнняў – "той, хто плача"),

Іоў (старажытнаяўрэйскае – “вораг, той каго праследуюць, прыгнятаюць”).

Да імёнаў *татэмнага* тыпу ўзыходзяць:

Сусанна (старажытнаяўрэйскае – “лілея”),

Пётр (грэчаскае – “камень”),

Фрол (лацінскае – “кветка”),

Лія (лацінскае – “антылопа”),

Гурый (старажытнаяўрэйскае –“звераня, львяня”).

Просты пераклад (этымалагізацыя) хрысціянскіх імён збядняе іх змест. Стаўшы хрысціянскімі, гэтыя імёны пачалі звязвацца з іншымі каштоўнасцямі. Асноўным у іх змесце сталі подзвігі хрысціянскіх святых і іх маральная характарыстыка” [53, с. 30].

Царква і прадстаўнікі пануючага класа эпохі феадалізму ўводзілі новыя імёны ў многім прымусова. Аднак новыя асабовыя імёны, “цёмныя” ў семантычных адносінах, незразумелыя мясцоваму насельніцтву, чужыя па форме і цяжкія для вымаўлення, не маглі замяніць звыклыя імёны-мянушкі. Быў патрэбны час для асваення прапагандаваных царквой імён, якія паводле свайго паходжання з’яўляліся вельмі пярэстымі і разнароднымі (пераважна грэчаскімі, рымска-лацінскімі, старажытнаяўрэйскімі, персідскімі, халдзейскімі і інш.). Яны былі адабраны і зведзены ў спецыяльныя спісы толькі таму, што іх калісьці насілі людзі, якія мелі заслугі перад хрысціянскай рэлігіяй.

Хрысціянскія імёны, якія замацоўваліся царкоўнай традыцыяй, станавіліся кананічнымі імёнамі. Састаў кананічных імёнаў фарміраваўся паступова [53, с. 30].

Асабовыя імёны, якія пераходзілі з адной мовы ў іншую, зведвалі фанетычныя і марфалагічныя змены. Частка гэтых змен характэрная ўсім усходнеславянскім мовам: беларускай, рускай і ўкраінскай антрапаніміі. М. В. Бірыла ў даследаванні “Беларуская антрапанімія: Структура ўласных мужчынскіх імён” прааналізаваў вынікі фанетычнай і марфалагічнай адаптацыі хрысціянскіх імён. Г. М. Мезенка, В. М. Ляшкевіч, Г. К. Семянькова ў дапаможніку “Віцебшчына ва ўласных імёнах: мінулае і сучаснасць” разгледзелі адаптацыю іменаслову жыхароў Віцебска да фанетычных і марфалагічных асаблівасцяў, характэрных усходнеславянскім мовам: “З ліку фанетычных змен адзначым наступныя:

1. Замена пачатковага /е/ на /о/ з пераходам /о/ у /а/ у выніку акання: *Аўсей ← Евсевий, Астап ← Евстафий.*

2. Замена /ф/ на /п/, /х/: *Астап ← Евстафий, Астрахим ← Трофим, Пракоп ← Прокофий, Хама ← Фома, Піліп ← Филипп.*

3. Спрашчэнне груп галосных:

/аа/ → /а/: *Ісак ← Исаак;*

/ео/ → /о/: *Сямён ← Симеон, Фёдар ← Феодор;*
/иоа/ → /а/*: Якім ← Иоаким;*
/иил/ → /іла/, /ыла/*: Гаўрыла ← Гавриил, Даніла ← Даниил;*
/ио/ → /о/ з прыстаўным /в/ у пачатку слова: *Восіп ← Иосиф*;
/ои/ → /а/: *Масей ← Моисей;*
/иу/ → /у/: *Усцін ← Иустин.*
4. Спрашчэнне груп зычных:
/гг/ → /г/: *Агей ← Аггей;*
/лл/ → /л/: *Кірыл ← Кирилл*;
/пп/ → /п/: *Піліп ← Филипп;*
/тф/ → /ц/: *Мацвей ← Матфей.*

5. Агульнаславянскае спалучэнне “мяккі зычны + и + j” адлюстроўвае прыпадабненне /j/ да папярэдняга мяккага зычнага: *Ілля ← Илья ← Илия.*

6. Прыстаўны зычны /в/: *Верамей ← Еремей ← Иеремия.*

Марфалагічныя змены:

1. Страта канцавога склада -ий: *Арцём ← Артемий, Апанас ← Афанасий, Астап ← Евстафий, Василь ← Василий, Ігнат ← Игнатий, Пракоп ← Прокофий, Яфім ← Евфимий.*

2. Замена канцавога склада /ий/, /ей/, /ай/ на /а/: *Аверка ← Аверкий, Азарка ← Азарий, Амброза ← Амвросий, Карніла ← Корнилий, Ярмола ← Ермолай.*

Вынікам гэтых змен з’явілася ўтварэнне поўных размоўна-бытавых форм імён: *Кірыл* і *Курыла, Мікалай* і *Мікола* і да т. п.” [44, с. 35-37].

Да канца I тысячагоддзя н. э. найбольш магутнымі сталі дзве епархіі – Рымская і Візантыйская. Афіцыйнае іх размежаванне адбылося ў 1054 г. З таго часу пачалося аўтаномнае развіццё рымска-каталіцкага (ад грэчаскага слова *каталікос* у значэнні ‘агульны, усеагульны, сусветны’) і ўсходневізантыйскага спіса кананічных імён.

Папа Грыгорый XIII (1572–1585 гг.), які ўвёў новы каляндар, звязаў многія дні тыдня з імёнамі тых ці іншых святых. З гэтага часу хрысціянскія кананічныя імёны сталі называцца *каляндарнымі*.

Праваслаўная царква не прыняла грыгарыянскага календара, але пераняла традыцыю суадносіць дні года з імёнамі канкрэтных святых.

На Беларусі здаўна распаўсюджваліся дзве іменныя сістэмы: пераважна ва ўсходняй частцы – праваслаўная і пераважна ў заходняй частцы – рымска-каталіцкая. Гэтыя іменныя традыцыі суіснуюць і ў цяперашні час. За доўгі час іх функцыянавання яны папоўніліся разнастайнымі народнымі варыянтамі хрысціянскіх імён. У выніку з’явілася трэцяя іменная сістэма – *беларуская народная антрапанімічная сістэма*. “Імёны праваслаўнага календара прыйшлі ў беларускую мову з грэчаскай праз царкоўнаславянскую, а каталіцкага – з лацінскай праз польскую. Невялікая

частка імён праваслаўнага і каталіцкага календароў поўнасцю супадае па гучанні, параўнаем: *Адам*, *Павел*, *Пётр.* Большасць з іх мае неаднолькавае фанетычнае афармленне, параўнаем:

Праваслаўныя імёны	*Каталіцкія імёны*
Васіль	Базыль
Георгій	Ежы
Іван	Ян
Карл	Кароль
Міхаіл	Міхаіл
Севасцьян, Савосцік	Себасцьян
Сцяпан	Стэфан, Стафан
Іосіф, Восіп	Ёзэф, Юзаф, Юзэф
Фёдар	Тодар [44, с. 35].

Многія імёны з хрысціянскага календара засталіся малаўжывальнымі. У непапулярнасці шэрагу імёнаў прасочваюцца пэўныя заканамернасці моўнага парадку. Да ліку такіх онімаў адносяцца мужчынскія імёны, якія заканчваюцца на -ін і маюць падабенства з прыналежнымі прыметнікамі, а некаторыя таксама з прозвішчамі: ***Домнін***, ***Руфін***, ***Марын*** і інш.; доўгія, пяці- і шасціскладовыя імёны з немілагучным спалучэннем галосных і зычных: ***Екзуперанцый***, ***Ексакустодзіян***, ***Яздундокта***; імёны, якія выклікаюць непажаданыя асацыяцыі з агульнымі назоўнікамі: ***Вата***, ***Яўпсіхій***, ***Маг***, ***Мел***, ***Пуд***, ***Раждзен***, ***Сухій*** і інш.

Пасля Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі новыя імёны ствараліся для новага жыцця і адрозніваліся ад імён мінулай эпохі ідэалагічнай накіраванасцю і эмацыйнасцю. Хрэсьбіны замяняліся “*акцябрынамі*” – урачыстай цырымоніяй надання імені новаму члену новага грамадства. “Акцябрылі” не толькі немаўлят. Дарослыя людзі мянялі “мяшчанскія” імёны на тыя, “з якімі не сорамна ўвайсці ў будучыню”.

Дапамагаючы людзям у выбары “правільнага” імені, многія календары сталі прапаноўваць на сваіх старонках новыя імёны. Напрыклад, “Адрыўны каляндар Паўночна-Заходняга прамбюро” (Ленінград) у 1925 г. прыводзіў наступныя памятныя даты і звязаныя з імі імёны.

7 лютага (1478 г. – нарадзіўся аўтар “Утопіі” Томас Мор) прапанаваны імёны *Мора* і *Томас*;

25 лютага (1799 г. – заснаванне Медыка-хірургічнай акадэміі ў Пецярбургу) – імя *Акадэма*;

10 красавіка (1848 г. – дэманстрацыя чартыстаў у Лондане) – імя *Чарта*;

7 мая (1916 г. – Кінтальская канферэнцыя) – імя *Кінталіна*;

31 мая (1981 г. – пастанова Народнага камісарыята асветы аб абавязковым сумесным навучанні) – імёны *Навука* і *Луначар*;

27 верасня (1825 г. – адкрыта першая чыгунка ў Англіі; 1919 г. – чыгуначная забастоўка ў ЗША) імя *Желдора* [62, с. 250].

Пасля Вялікай Айчыннай вайны штучныя імёны з беларускага іменаслову знікаюць, у ім радзей сустракаюцца імёны, запазычаныя ў неславянскіх народаў.

З другой паловы XX ст. – пачатку XXI ст. узрастае папулярнасць старых царкоўных імён, такіх, як ***Таісія***, ***Серафім***, ***Арсеній***, ***Елісей***, ***Ева***, ***Сафія*** і інш. і старажытных славянскіх ***Зарана***, ***Злата*** і інш. [5, с.18].

У дакастрычніцкі перыяд айчыннай гісторыі імёны даваліся галоўным чынам па царкоўным календары. У адпаведнасці з хрысціянскай формулай "*па імені і жыціе*", "мы носім імёны святых, якія пражылі сваё жыццё і ажыццявілі на зямлі сваё прызначэнне, мы ім прысвечаны, як храмы прысвячаюцца таму ці іншаму святому. Гэтыя святыя не толькі з'яўляюцца нашымі малітоўнікамі, заступнікамі і абаронцамі, але і ў пэўнай меры і вобразам таго, кім мы маглі б быць. Паўтарыць нічыё жыццё нельга, але навучыцца ад жыцця таго ці іншага чалавека, святога, жыць больш годна сябе і больш годна Бога – можна" [45, с. 177].

У сучасным соцыуме, паводле дадзеных анкетавання, праведзенага лінгвістамі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта Г. М. Мезенка, В. М. Ляшкевіч, Г. К. Семяньковай, асноўнымі матывамі, якімі кіруюцца бацькі, выбіраючы імя дзіцяці, з'яўляюцца: асабістая ацэнка гукавой формы імені або асабістыя густавыя перавагі, імя можа даваццa ў гонар таго ці іншага сваяка або знаёмага; у гонар вядомага, папулярнага чалавека або па знешнім падабенстве дзіцяці з асобай, што носіць прэцэдэнтнае імя; з улікам значэння матывавальнага апелятыва імені; у адпаведнасці з імкненнем да рэдкага, малараспаўсюджанага імені, якога няма сярод сваякоў; па сугуччы імені і імені па бацьку або імені і прозвішча; у адпаведнасці з царкоўным календаром; у адпаведнасці з модай; у выніку прытрымлівання сямейных традыцый і інш. [7, с. 47–48]

І.А. Шумская даследавала формы ўласных асабовых імён (скарочаныя і эмацыйна-ацэначныя) у гаворках Брэстчыны. "Назвы асоб у сучаснай беларускай мове ўжываюцца ў дзвюх разнавіднасцях – афіцыйнай, юрыдычна ўзаконенай, пашпартнай і неафіцыйнай, размоўна-бытавой. Рэзкай мяжы паміж афіцыйнай і неафіцыйнай формамі імён няма. Звычайна афіцыйнае імя выступае ўтваральнай асновай для неафіцыйнага, таму колькасць неафіцыйных імён больш шматлікая.

Па сваім ужыванні неафіцыйныя імёны неаднародныя. Адны з іх агульнавядомыя і агульнаўжывальныя (*Ваня, Саша, Толя, Пеця*), выкарыстоўваюцца побач з поўнымі афіцыйнымі імёнамі ў вуснай і

пісьмовай мове. Іншыя (*Ванцё, Мышкэль, Алічок*) абмежаваныя ва ўжыванні, яны выкарыстоўваюцца асобнымі сем'ямі, паміж сябрамі, блізкімі, на асобнай тэрыторыі і да т.п. Так, на Століншчыне (в. Хатомель) вельмі шырока ўжываюцца формы імён на ненаціскное -о, -ё: ***Аркадзё, Володзё, Віталё, Ладзё, Гнатко, Мішо, Пэтро*** і інш.

Поўныя імёны таксама маюць варыянты, рэдка акцэнталагічныя (***Анатоль – Ана́толь, Барыс – Бо́рыс, Лявон – Ле́ван***), часцей фанетычныя: 1) ужыванне галоснага о замест а: ***Олыксандр, Олыксій, Онупрій, Орсень***; 2) прыстаўныя зычныя: ***Гандрій, Гантон***; 3) адпадзенне галосных у пачатку слова: ***Ляксандр, Лэксій, Нупрый***; 4) яканне: ***Яркадзь, Ярхіп;*** 5) ужыванне зычных ***х, п*** ці спалучэння ***хв*** замест ***ф: Матрыпан, Хвёдар, Хвэдось;*** 6) усячэнне ненаціскных элементаў у канцы слова: ***Лаўрэнцій – Лаўрэнт*** ці наадварот, дабаўленне суфікса ***ій, ый, ей*** да імёнаў, якія не мелі іх: ***Іванцій, Вікторый, Пылыпей***.

Поўнымі імёнамі называюць дарослых мужчын не толькі ў афіцыйных абставінах, але і ў побыце (часцей па-замежамі сям'і). Так, напрыклад, жанчына пытаецца: ***Гантон****, куды ты вчора йшоў под вэчор, як я каровы гнала?* (Купаўцы, Драг.).

Сярод неафіцыйных назваў асоб даследчыкі звычайна выдзяляюць скарочаныя імёны (*Саша, Ваня, Толя*) і ацэначныя, утвораныя пры дапамозе разнастайных суфіксаў суб'ектыўнай ацэнкі.

Трэба пагадзіцца з А.В. Суперанскай, што суб'ектыўна-ацэначнымі могуць быць і бываюць любыя формы любых імён у залежнасці ад таго, каму яны адрасаваны. Так, поўнае афіцыйнае імя, калі ім называюць дзяцей, можа быць іранічна-насмешлівым: *Ну,* ***Мыкалай****, як жывеш много двоек получыў?* (Маладзельчыцы Пінскі). Хлопчыку 7 гадоў.

Процілеглае значэнне набывае пашпартнае імя, калі ім, напрыклад, называюць вучні настаўніка: *Хутчэй у клас!* ***Іван*** *ідзе.* І наадварот, мужчынскія імёны, утвораныя пры дапамозе ацэначнага суфікса -к (а), у вёсках Цна Лунінецкага, Маркавічы Драгічынскага і інш. не маюць эмацыйнай афарбоўкі, калі так называюць дарослых і падлеткаў. Імёны тыпу ***Вася, Пеця*** ў гэтых вёсках набываюць ласкальнае значэнне.

Суб'ектыўная ацэнка – гэта фактар эмацыянальнага, псіхалагічнага, сацыяльнага і заўсёды суб'ектыўнага плана. Што ж датычыць скарачэння слоў, то гэта працэс структурны, марфалагічны, аб'ектыўны. Скарачаюцца словы і для аблягчэння іх ужывання.

Да неафіцыйных назваў мы адносім скарочаныя імёны без эмацыйна-ацэначных суфіксаў і імёны з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі.

Антрапонімы першай групы ўтвараюцца рознымі шляхамі: 1) скарачэннем канца слова: *Валя – Валянцін, Олэ – Олэксандр, Міха – Міхаіл.* Апошні галосны ўсечанай асновы ў такіх выпадках становіцца канчаткам.

Некаторыя антрапонімы гэтай групы заканчваюцца на зычны гук: ***Вась – Васіль, Здзісь – Здзіслаў, Олэк– Олэксандр.*** Іншыя імёны ўтвараюцца пры скарачэнні канца слова з дапамогай сінкрэтычнай марфемы -а /-я: ***Бора – Барыс, Вадзя – Вадзім, Даня – Даніла, Пілё, Піля – Піліп;*** 2) скарачэннем пачатку слова + суфікс-канчатак і без яго: ***Сей – Аляксей, Толь, Толя – Анатолій, Лерый – Валерый;*** 3) скарачэннем пачатку і канца слова + суфікс-канчатак -а,-я: ***Коля – Мікалай, Міць – Дзмітрый, Ладзё, Ладзя – Уладзімір;*** 4) скарачэннем сярэдзіны слова + суфікс-канчатак -а,-я: ***Сіма – Серафім, Кома – Косьма – Кузьма;*** 5) скарачэннем сярэдзіны і канца слова + суфікс-канчатак -а,-я і без канчатка: ***Лёня – Леанід, Зыма – Зігмунд, Мося – Майсей;*** 6) скарачэннем асновы + суфіксы -ня, -ша, -ура: ***Саша – Аляксандр, Алёша – Аляксей, Феня – Феафан***, 7) паўтарэннем пачатковага, сярэдняга ці апошняга складу: ***Вова – Валодзя – Уладзімір, Леня – Леанід, Гога – Георгій, Ігар.*** Часта ад адной і той жа асновы ўтвараюцца цвёрдыя і мяккія варыянты скарочаных імён: ***Гена – Геня – Гень – Генадзій, Віта, Віця – Віталій, Васа, Вася, Вась – Васіль, Каля, Кола, Коля – Мікалай, Стас – Стась – Станіслаў.***

Другую групу неафіцыйных імён складаюць антрапонімы з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі. Утвараюцца яны спосабам суфіксацыі ад розных асноў – поўных і ўсечаных. Гэта самы жывы і прадуктыўны спосаб утварэння неафіцыйных імён. Пры дапамозе разнастайных ацэначных суфіксаў выражаюцца эмацыйна-экспрэсіўныя ацэнкі часта з рознымі адценнямі: спачування, павагі, ласкі, пяшчоты, знявагі, насмешкі. Для ўтварэння неафіцыйных імён ужываецца багата суфіксаў. Некаторыя з іх вельмі прадуктыўныя, утвараюць мужчынскія і жаночыя імёны.

Самым прадуктыўным суфіксам, пры дапамозе якога ўтвараюцца антрапонімы мужчынскага роду, з'яўляецца суфікс -ка/-ко. Амаль ад кожнага імя на ***й*** тыпу ***Вікенцій, Гурый, Дзяменцій, Елісей*** і іншых у нашых матэрыялах ёсць утварэнні з гэтым суфіксам. Шырока ўтвараюцца імёны на -ка/-ко ад поўных асноў: ***Алег – Алежка, Арцём – Арцёмка, Васіль – Васылько, Гаўрыла – Гаўрылко, Герман – Гэрманко, Павэл – Павэлко.***

Антрапонімы на -ка/-ко, утвораныя ад поўных асноў, заўсёды маюць экспрэсіўна-эмацыйнае значэнне ласкальнасці. У абследаваным рэгіёне дэрываты на -ка і больш пашыраныя на -ко шырока ўжываюцца ў значэнні звароткаў: ***Гнатко****, пуйідэш тэпэр у гурот;* ***Мыхалко****, то дэ ты ўчоро буў?* (Ражное, Драгічынскі раён). ***Мыколайко****, тепэр будом садіть бульбу, бо заўтра трэба ехать по сено* (Беразцы, Столінскі раён).

Нярэдка носьбітамі такіх форм імені з'яўляюцца мужчыны малыя ростам, слабыя, з якімі-небудзь фізічнымі ці іншымі недахопамі. Больш прадуктыўныя формы імён на -ка/-ко ўтвораны ад скарочаных (усечаных)

асноў: ***Аляксандр – Олісь – Олісько, Анатоль – Толя – Толька***. Суфікс -ка/-ко ў адных выпадках далучаецца да цвёрдых асноў, у другіх – да мяккіх: ***Адам – Адамко, Акім – Акімко, Даніла – Данілка – Даня – Данька.*** Відаць, як адзначае акадэмік М.В. Бірыла, існавалі суфіксы –ъко/ -ько, першы з якіх служыў для ўтварэння эмацыйна-ацэначных назваў ад цвёрдых асноў, другі – ад мяккіх. Носьбітамі форм на -ка/-ко з'яўляюцца асобы розных узростаў. У адных вёсках гэта ў асноўным юнакі-школьнікі: ***Колька*** *нэ зовуть, бо вжэ стары* (п. Мухавец), у другіх – імёны з гэтымі суфіксамі захоўваюцца ў людзей старэйшага пакалення. Ні ў першых, ні ў другіх гэты суфікс у большасці вёсак не выклікае абразлівага пачуцця: старых называюць так па прывычцы, з маладосці (***Ванька*** – 70-гадовы чалавек у вёсцы Селяхі Брэсцкай вобласці). Тут суфікс, напэўна, лексікалізуецца. У імёнах школьнікаў ён мае эмацыйна-ацэначнае значэнне. У некаторых вёсках імёны з суфіксамі -ка/-ко выражаюць адмоўную экспрэсію пры звароце да дарослых, маюць адценне непрыязні, зневажання, іроніі: …***Голесько*** *учора зноў напыўся і бульбу нэ прывіз з поля* (Маладзельчыцы Пінскі раён). У адносінах да дзяцей гэтыя формы маюць памяншальна-ласкальнае значэнне.

Наступным па прадуктыўнасці з'яўляецца суфікс -ік/-ык. Формы імён на -ік/-ык утвараюцца: 1) ад поўных асноў: *Ананік, Антонык, Аркадзік, Барысік, Васэлык, Данылык, Пракопык, Романык* і інш.; 2) ад усечанай асновы, скарочанай у канцы слова: *Аляксандр, Альберт – Алік, Уладзімір – Валодзік, Андрэй – Андрык – Гэдрык – Энджык – Яндрык, Браніслаў – Бронык, Вячаслаў – Вячык, Гардзей – Гордык, Віктар – Віцік, Пётр – Пецік*; 3) ад усечанай асновы, скарочанай у пачатку слова: *Станіслаў – Славік, Анатоль – Толік, Антон – Тонік, Яўген – Жэнік, Валерый – Лерык* і інш.; 4) ад іншых скарочаных асноў: *Аляксандр – Санік, Сашык, Шурык, Уладзімір – Валодзя – Вова – Вовік – Ладзік, Мікалай – Колік, Іван – Ванік, Феафан – Феня – Фенік* і інш.

Імёны з суфіксамі -ік/-ык заўсёды эмацыйна-экспрэсіўныя, выражаюць ласкальнае значэнне. Формы на -ік/-ык, утвораныя ад поўных асноў, характэрныя для дарослых, часцей мужчын сталага ўзросту, утварэнні ад усечаных асноў выкарыстоўваюцца ў асноўным пры звароце да дзяцей.

Найбольшая экспрэсія, найбольшая ступень ласкальнасці і пяшчоты дасягаюцца пры спалучэнні суфіксаў -ік/-ык з іншымі суфіксамі ацэнкі -к, -ок, -ак: *Алік – Алічок, Толік – Толічок, Кадзік – Кадзічок, Валерык – Валерычок, Славік – Славічок, Пецік – Пецічка, Грышык – Грышачка – Лёнік – Лёнічок* і інш.

Суфікс -чык (-чук) складаны (ч з ьк+ік), для яго характэрна большая экспрэсія, чым для форм з суфіксам -ік/-ык. Мае памяншальна-ласкальнае значэнне. Пры дапамозе суфікса -чык мужчынскія неафіцыйныя імёны

ўтвараюцца: 1) ад поўных асноў: *Андрэй – Андрэйчык, Остап – Отсапчык, Мартын – Мартынчык, Міколай – Мыколайчук, Навум – Навумчык* і інш.; 2) ад розных тыпаў скарочаных асноў: *Віталь – Вітальчык, Яша – Яшчык, Лля (Ілья) – Ллячок, Лёня – Лёнчык, Сеня – Сенчык, Толя – Тольчык*.

Суфікс -чык можа ўскладняць іншыя суфіксы, далучаючыся да іх: *Славуня – Славунчык, Колюня – Колюнчык, Мішуня – Мішунчык*. Самі ж утварэнні з суфіксам *-чык* нясуць такую яркую экспрэсію, эмацыянальнасць, што суфікс -чык не абрастае ніякімі іншымі суфіксамі.

Блізкімі да суфіксаў *-ік, -ык, -чык* па значэнні і па выражаемай экспрэсіі з'яўляюцца суфіксы *-ак, -эк, -як, -ок, -ёк, -ек, -ук, -юк*, пры дапамозе якіх утвараюцца неафіцыйныя мужчынскія імёны: 1) ад поўных асноў: *Барыс – Барысок, Ігар – Ігарок, Лука – Люцэк, Пётр – Пэтрок – Пэтрук – Пітёк, Тарас – Тарасок, Ілья – Ільюк, Ціхон – Тыхоняка*; 2) ад усечаных асноў у канцы слова: *Віктар – Вітэк, Васіль – Вася – Васік, Леанід – Лёня – Лёняка, Раман – Рома – Ромак, Юрый – Юра – Юрак – Юрака, Аляксей – Лёша – Лешэка, Віктар – Віця – Віцёк, Канстанцін – Косця – Касцюк, Якаў – Яша – Яшук,* 3) ад іншых усечаных асноў: *Валянцін – Валёняка, Анатоль – Толя – Толяка, Ілья – Лля – Лляка – Мікалай – Коля – Колюк, Леанід – Лёня – Лёняка*.

Антрапонімы, утвораныя пры дапамозе гэтых суфіксаў, неаднолькавыя па значэнні. Дэрываты з суфіксамі -ок, -ёк, -ек выражаюць звычайна высокую ступень ласкальнасці, з суфіксамі -ак, -як маюць зневажальнае або іранічнае значэнне.

Вельмі прадуктыўны эмацыйна-ацэначны суфікс -ук, -юк на Брэстчыне. Дэрываты з гэтым суфіксам шырока ўтвараюцца і ад поўных, і ад усечаных асноў: *Апанас – Панасюк, Аркадзь – Клюдзюк, Гаўрыла – Гаўрылюк, Лёша – Лёшук, Васіль – Васюк, Міша – Мышук, Яша – Яшук*.

Найбольшую ступень ласкальнасці, экспрэсіі набываюць гэтыя суфіксы, калі яны ўскладняюцца суфіксам -ка. Тады атрымліваюцца складаныя суфіксы *-ачка, -ячка, -очка, -эчка, -ечка, -учка:* ***Максымочка, Ігорочак, Борачка, Лёвочка, Мішэчка, Марочка (Марк), Славочка, Санечка***. Суфіксы *-оньк, -аньк, -еньк, -уньк, -іньк*, пры дапамозе якіх утвараюцца неафіцыйныя формы мужчынскіх імён з памяншальна-ласкальным значэннем, з'яўляюцца малапрадуктыўнымі. У большасці выпадкаў такія формы ўтвараюцца ад усечаных асноў, радзей – ад поўных: *Пётр – Пэтрэнька, Вася – Васенька, Віця – Віценька, Міша – Мішэнька, Коля – Коленька, Павел – Паўлуша – Паўлушанька, Сцяпан – Сцёпонька* і да т.п. Так звяртаецца маці да сваіх дзяцей, так могуць называць адзін аднаго блізкія людзі. Пры дапамозе гэтых суфіксаў больш ярка падкрэсліваецца эмацыйная ацэнка, і не толькі станоўчая, але і іранічная, дакорлівая: *Во шчо наробыў твой* ***Колінька***! (Пугачова, Брэсцкі раён).

Наступным па прадуктыўнасці з'яўляецца суфікс -ш (-ша), які ў спалучэнні з галоснымі ўтварае варыянты -оша, -аша-, -уша, -еш, -ёш, -яш. Названыя суфіксы могуць далучацца да поўных асноў***: Багдан – Багдаша, Лука – Лукаш, Пётр – Пятруша, Піліп – Пылыпэш, Павел – Паўлуша, Паўлюша, Ігар – Ігаруша, Ілья – Ільюша – Ллюша*** – і да рознага тыпу ўсечаных: ***Антон – Антоша, Аркадзь – Аркаша, Гаўрыла – Гаўруша, Цімафей – Тымуш, Пятро – Пяцюша, Нічыпар – Нічыша, Харытон – Харытоша, Генадзь – Геша, Інакенцій – Выкеша, Ваня – Ванюш – Ванюша, Эдуард – Эда – Эдюша, Аляксей – Лёш – Лёша, Антон – Тоша, Дзмітрый – Мытёш, Ілья – Люша – Ляш – Галяш, Анатоль – Таляш, Святаслаў – Святоша*** і інш.

Калі да гэтых суфіксаў далучаецца суфікс -ка (рэдка -эк), то такія дэрываты выражаюць узмоцненую ступень ласкальнасці: *Адамушка, Васіляшка, Макарушка, Максімушка, Паўлушка, Ільюшка – Ількушка – Ільюўшэка, Ігарушка, Якімушка, Ванюшка*. У некаторых вёсках формы імён з гэтымі суфіксамі дыферэнцыруюцца націскам: з ненаціскным суфіксам звычайна выражаюць ласкальнае значэнне, з націскным – зневажальнае значэнне з адценнем іроніі: *Ва́нюшка – Ваню́шка – Ванюшэ́ка, Па́ўлушка – Паўлу́шка, Максі́мушка – Максіму́шка* і інш.

Да суфікса -яш- можа далучацца фармант -та, -таль, які надае зневажальнае значэнне: *Грыша – Грышталь, Толя – Таляш – Таляшта, Коля – Каляш – Каляшта*.

Яркую экспрэсіўную афарбоўку фамільярнасці, грубаватасці надаюць суфіксы *-аха-, -оха-, -ёха-, -уха-, -юха-*, пры дапамозе якіх утвараюцца формы мужчынскіх імён ад поўных і ўсечаных асноў: *Андруха, Васюха, Вікцюха, Кіруха, Мішуха, Рамаха, Лёха, Ванюха, Калюха*.

Інтымна-ласкальнымі з'яўляюцца малапрадуктыўўныя суфіксы-оля-, - ля-, якія далучаюцца часцей да ўсечаных асноў: *Генуля, Дзімуля, Пантоля (Панцялей), Якуля (Якаў)*. Эмацыйна-экспрэсіўная афарбоўка ўзмацняецца, калі названыя суфіксы ўскладняюцца суфіксамі -ка, -ік, -ык: *Дзімулька, Андрулік, Гандролык (Андрэй), Мытлік (Дзмітрый), Эндзюлік, Эндзюлька (Эдуард)*.

Больш нейтральнае значэнне маюць формы імён з суфіксамі -ль-, -аль, -ель, -эль, -уль: *Віталь (Вітольд), Вінцуль (Вікенцій), Грыль (Рыгор), Мыхаль (Міхаіл), Маркуль (Марка)*. Калі пры дапамозе -ель утвараецца форма імені ад асновы з суфіксам -к-, то такое імя мае адмоўную экспрэсію, зневажальную: *Мышкель*. Такое ж значэнне маюць формы мужчынскіх імён на -л, -ла, -лё, -чыла, -чал: *Гналё (Ігнат), Міхлё, Мыхайло, Міхалё, Сергало (Сяргей), Трухало (Трафім), Фэлё (Фелікс), Дымчыло (Дзям'ян), Франучал (Франц)*.

Экспрэсіўна-ацэначныя мужчынскія антрапонімы ўтвараюцца пры дапамозе суфіска *-ня* і яго варыянтаў *-аня, -яня, -уня, -юня, -іна, -ына*: *Выцюн (Віктар), Ігруня (Ігар), Васюн, Васюня (Вася), Грыня (Грыгорый), Грышуня, Грышан, Ладзюн, Ладзюнё (Уладзімір), Мысін (Майсей), Мішуня (Міхаіл), Калюн, Калюня (Мікалай), Талюн, Талюня, Талян, таляна (Анатоль), Пецюня (Пётр), Федраня (Фёдар)*. Найбольшую ступень экспрэсіі набываюць гэтыя формы, калі да іх далучаюцца іншыя ацэначныя суфіксы: *Васюнік, Мішунчык, Каляніца, Пецюнка* і інш.

Ацэначны суфікс *-та* для ўтварэння неафіцыйных назваў мужчынскіх асоб з'яўляецца непрадуктыўным. У спалучэнні з галоснымі ён утварае варыянты *-ат, -ят, -іт, -от, -ет, -ёт, -ут, -ют*, можа ўскладняцца суфіксам -ка. Утвараюцца такія формы імён часцей за ўсё ад усечаных асноў: *Ваня – Ванятка, Вася – Васьта, Васятка, Васькітко, Васінюта, Фёдар – Фядот, Фядут, Яўген – Жэня – Жэнёта.*

Суфіксы *-цё, тё, -ця, -ыца, -ыцё* таксама непрадуктыўныя. У нашых матэрыялах ёсць некалькі дэрыватаў з гэтымі суфіксамі: *Івантё (Іван), Кадынцё (Каліна), Ромця, Романыца, Романыцё (Раман).* Пры дапамозе гэтых суфіксаў выражаецца памяншальнае значэнне з адмоўнай экспрэсіяй.

Адзінкавыя антрапонімы з суфіксамі *-юр, -яр* маюць зневажальнае значэнне: *Гіняра (Генадзь), Максюра (Максім*), з суфіксам *-ар, -эр* – нейтральнае. Пераважна з адмоўнай экспрэсіяй – зневажальнай – ужываюцца антрапонімы, утвораныя з дапамогай суфіксаў *-іска, -ыска* ад поўных і ўсечаных асноў: *Астапіска, Іваныско, Паўлыска, Коліско*. Выкарыстоўваюцца такія формы імён, калі размова ідзе пра людзей, якіх не паважаюць, не любяць. Ужываюцца гэтыя формы часцей у эмацыйна-афарбаванай мове. Суфікс *-іска, -ыска* па паходжанні польскі. Ва ўсходнеславянскіх мовах яму адпавядае суфікс *-ішча, -ышча*. З такім жа значэннем сустракаюцца антрапонімы у форме прыметнікаў з суфіксамі *-ск, -цк, -эньк* і без суфіксаў*: Ваніскі (Іван), Кольскі (Коля), Мікольскі (Мікалай), Яшыньскый (Якаў), Сэрэнькі (Сяргей)*. Такія формы імён стаяць на мяжы з мянушкамі.

Адзінкавыя ўтварэнні з суфіксам *-ман, -шман*: *Грышман, Калюшман, Мішман, Тальман (Толя).* Некалькі антрапонімаў утворана пры дапамозе патранімічнага суфікса *-іч*: *Славіч, Толіч*. Адзін антрапонім мае ацэначны суфікс *-ча, -чо*: *Іванча, Іванчо*. Некалькі антрапонімаў утворана пры дапамозе эмацыйна-ацэначнага суфікса *-ец*: *Адамец, Васілец, Наумец, Раманец, Семеновэц, Тыхонэць.*

Звычайна нейтральнае значэнне маюць суфіксы *-эй, -ей, -ай, -яй*, якія часта ўскладняюцца суфіксам *-ка*. Утвараюцца неафіцыйныя формы з гэтымі суфіксамі ад поўных і ўсечаных асноў (відаць, пад уплывам імён

тыпу *Васілій, Аркадзій, Сяргей*): *Антосей (Антон), Аркадзей (Аркадзь), Астапій (Астап), Віцяй (Віця), Карпей (Карп), Ленцій (Леанід), Остапэйко (Астап), Тадэй (Тадэвуш), Талян (Толя), Яркадзей (Аркадзь).*

Пад уплывам польскай мовы на Брэстчыне пашыраны формы імёнаў на *-ас, -ась, -усь, -юсь, -ісь, -цёсь, -цусь*. Утвараюцца яны ад поўных і ўсечаных асноў, але больш ад усечаных асноў: *Адамусь, Адась – Адам, Андрусь, Гандрось – Андрэй, Антось, Гантусь – Антон, Бранісь – Браніслаў, Ванцёсь – Ваня – Іван, Вацусь – Вацлаў, Вінцусь – Вікенцій, Здзісь – Здзіслаў, Ігнась – Ігнат, Кандрась – Кандрат, Карпусь – Карп, Колюсь – Коля, Мэлюсь – Мэле (Емельян), Міхась – Міхаіл, Онась – Анісім, Паўлусь – Паўлюсь – Павел, Пыцюсь, Пэтрусь – Пётр, Ромусь –Раман, Рыгусь – Рыгор, Стадэсь – Стась – Станіслаў, Сергусь – Сяргей, Ферусь – Фірс, Янусь – Ян – Іван, Андрос – Андрэй*. Дэрываты з паказанымі суфіксамі звычайна маюць нейтральнае значэнне, за выключэннем тыпу ***Васюня, Генуся*** з інтымна-ласкальным значэннем, але такія формы мужчынскіх імён у нашых матэрыялах адзінкавыя.

Вельмі прадуктыўныя ў абследаваным рэгіёне формы мужчынскіх імён на *-о,-ё, -е, -э, -у*, асабліва на *-о, -ё*. Гэта былыя формы клічнага склону. Ужываюцца яны ў ролі звароткаў і ў функцыі дзейніка. Утвараюцца ад поўных і ад усечаных асноў: *Аркадзё, Васілё, Гаўрылё, Жоро – Георгій, Донылу, Марцінё, Вацё (Вячаслаў), Віто (Віталь), Косцё (Косця), Мосё (Максім), Міцё (Дзмітрай), Юлё (Юльян), Эдзё (Эдуард), Яно, Янё* і інш.

Такім чынам, неафійныя імёны вельмі багатыя варыянтамі. Імя *Міхаіл*, напрыклад, мае наступныя варыянты, у тым ліку і фанетычныя: *Меша, Мешка, Мілі, Міня, Мінька, Міха, Міхайло, Міхаіл, Міхаль, Міхань, Міхасечка, Міхась, Міхаська, Міхед, Міхай, Міхлё, Міхулё, Міхэль, Міш, Міша, Мішанька, Мішка, Мішман, Мішо, Мішун, Мішунчын, Мішуля, Мішурда, Мішутка, Мішуха, Мішунчык, Мішык, Мішэйка, Мішэль, Мішэчка, Мыхайло, Мыхалочко, Мыхалко, Мыхаль, Мыхась, Мыхель, Мышкель, Мэйко, Мэхал, Мэшка, Мэша, Мэшэк, Мялешко.*

Адзначаеца нямала прыкладаў, калі аднолькавае неафіцыйнае імя ўтвараецца ад розных афіцыйных: *Алесь* – ад *Аляксей, Аляксандр, Гень – Гена – Геня* ад *Георгій, Генадзь, Яўген, Лёша – Аляксей, Леанід, Ілья, Лёня – Леанід, Лявон, Аляксей* і інш.

Асноўны спосаб утварэння неафіцыйных імён – суфіксальны. Неафіцыйныя імёны ўтвараюцца па такіх жа тыпах і мадэлях, што і агульныя назоўнікі, апелятывы, прычым выкарыстоўваецца вялікая колькасць самых разнастайных эмацыйна-ацэначных суфіксаў, якія далучаюцца як да поўных, так і да ўсечаных асноў. Больш ацэначных антрапонімаў утвараецца ад рознага віду ўсечаных асноў, хоць цяжка

вызначыць пэўныя лінгвістычныя спосабы і заканамернасці іх выдзялення, напрыклад: *Павел – Паля, Вячаслаў – Ячык, Георгій – Гога*.

З узростам ацэначныя формы звычайна мяняюцца. Так, дашкольнікаў часцей называюць ***Кіруша, Васёк, Ванечка, Васечка, Стасік, Жэнік, Пеця***. Юнакоў называюць ***Васька, Ванька, Воўка, Мішка, Сашка***, дарослых і людзей сталага ўзросту – поўным іменем: ***Мыхал, Мыхайло, Мыколай, Васыль, Стыпан, Фэдур***, хоць такі звычай не заўсёды і не ва ўсіх вёсках вытрымліваецца. Напрыклад, у вёсцы Хомск Драгічынскага раёна чалавека 1900 года нараджэння завуць ***Юрыкам***, у вёсцы Сашыца Бярозаўскага раёна мужчыну такога ж узросту – ***Віцікам***. У такіх выпадках асобы, якіх так называюць, маюць пэўныя дадатковыя характарыстыкі: рысы характару – сціплы, ветлівы, добры або рост чалавека – ***Астапчык, Данік*** – в. В. Лес Драгічынскага раёна, ***Ванюшка*** – вёска Церабуць Брэсцкага раёна і інш.

У некаторых вёсках аднолькава называюць і дзяцей, і дарослых: могуць і старэйшых назваць ***Ваня, Андруша***” [80, с. 102–109].

Сучаснае афіцыйнае іменаванне асобы на Беларусі складаецца з трох элементаў: імені, імені па бацьку і прозвішча: *Кацярына Аляксандраўна Юнкевіч*. ***Імя па бацьку***, або ***патронім***, паходзіць ад старажытнага наймення чалавека паводле імёнаў яго продкаў па мужчынскай лініі.

Імя па бацьку – найменне паводле асабовага імені бацькі. Здаўна гэты від антрапонімаў выконваў функцыю персаніфікацыі асобы ў якасці дадатковага афіцыйнага наймення. Імёны па бацьку дапамагалі адрозніваць людзей, якія насілі аднолькавыя хрысціянскія імёны. А. Ф. Рогалеў адзначае, што імёны па бацьку з’яўляюцца водгукам найстаражытнейшых міфалагічных уяўленняў пра перасяленне ў дзяцей душ продкаў: бацька, чыё імя паўтараецца ў імені па бацьку сына ці дачкі, як бы працягвае жыць у сваіх дзецях.

Першыя імёны па бацьку з’явіліся яшчэ да прыняцця хрысціянства ў князёў і баяр. Патронімы ўтвараліся ад імені ці мянушкі бацькі ці продкаў па бацькаўскай лініі. У той час імёны па бацьку (патронімы) указвалі не проста на роднасць або адносіны да галавы сям’і (бацькі), але і на характар гэтых адносінаў. Імёны па бацьку выконвалі як індывідуальна-дыферэнцыяльную, так і юрыдычную функцыі, абазначаючы спадчыннікаў уладарных асоб.

У дахрысціянскі перыяд і нават пасля прыняцця хрысціянства жанчыну нярэдка называлі па імені бацькі. У “Слове пра паход Ігаравы” жонка ноўгарад-северскага князя Ігара Святаславіча, княгіня Еўфрасіння (па іншай версіі – Праскоўя), названа не па сваім асабовым імені, а па імені бацькі – ***Яраслаўна***.

Акрамя патронімаў, ва ўсходнеславянскай іменнай практыцы былі вядомыя ***матронімы***, ці ***матранімічныя імёны***, г.зн. абазначэнні па імені ці мянушцы маці. Многія сучасныя прозвішчы з'яўляюцца ў вытоках сваіх матронімамі: ***Любавін (ад Любава), Нялюбін (Нялюба), Русавін (Русава), Красавін (Красава), Аленін, Акуліч (Акуля), Меланіч (Мелання), Маўрын (Маўра), Малашкін (Малашка)*** і інш.

Паколькі пасля прыняцця хрысціянства адзін і той жа чалавек мог мець два імені – хрысціянскае і мірское (язычніцкае), былі магчымыя і два імені па бацьку – як ад хрысціянскага, так і ад мірскога імені, якое вельмі часта асэнсоўвалася як мянушка. Практыка двух імён па бацьку захоўвалася да XVII ст.

Старажытныя помнікі XV–XVII стст. фіксуюць наступныя іменныя формулы з выкарыстаннем двух імён па бацьку: ***Савелій Галакціёнаў*** сын ***Цаплін*** (бацька гэтага чалавека меў два імені – хрысціянскае ***Галакціён*** і мірское ***Цапля***); ***Гаўрыла Міхайлаў*** сын ***Какурын Кажух*** (бацька – ***Міхаіл***, па язычніцкім імені ***Какура***, сын –***Гаўрыла Кажух***).

У дапрозвішчны перыяд галоўным чынам у прадстаўнікоў вышэйшых саслоўяў, акрамя імені па бацьку, выкарыстоўвалася ***імя па дзеду*** (рус. ***дедичество***): ***Ярміл Савельеў*** сын ***Ступіна Колабава*** (бацька – ***Савелій Ступа***, мірское імя дзеда – ***Колаб***).

Імя па бацьку ад хрысціянскага імені пры называнні асобы заўсёды папярэднічала імені па бацьку ад мірскога імені (***Карп Іваноў*** сын ***Капусцін***; Бацька гэтага чалавека зваўся ***Іванам Капустай***). Другая пазіцыя імені па бацьку ад мірскога імені паступова прывяла да ўспрымання яго як дадатковага адрознівальнага знака не толькі асобнага чалавека, але і яго дзяцей.

Перадача ў спадчыну аднаго з імён па бацьку, па-першае, ператварала яго ў імя па дзеду (*дедичество*), па-другое, была рэальным крокам да з'яўлення прозвішчнага празвання. Імя па дзеду станавілася прозвішчам, як правіла, у выпадку захавання яго ў трэцім-чацвёртым пакаленнях.

Ужо ў XII ст. імёны па бацьку сталі звычайнымі ў прадстаўнікоў розных саслоўяў. З таго часу на першы план паступова выступіла сацыяльна-дыферэнцыруючая функцыя імён па бацьку, якая дапаўняла іх індывідуальна-дыферэнцыяльную функцыю. Формы імён па бацьку размяжоўваліся ў адпаведнасці з сацыяльным статусам асобы. Яны маглі заканчвацца на -іч, а таксама на -оў,-еў. Параўн.: ***Максім Фёдараў Кавалёў*** (бацька ***Фёдар Каваль***, прозвішча ўказвала на прафесію) і ***Іван Фёдаравіч Сабураў,*** г. зн. сын ***Сабурава*** (бацька – ***Фёдар***, па мянушцы ***Сабур***).

Ператварэнне імён па бацьку ў знак сацыяльнага расслаення спрыяла з'яўленню прыкладна ў XIV-XV стагоддзях першых прозвішчаў, якія паводле паходжання ўзыходзілі да родавых празванняў князёў і баяр.

У Маскоўскай дзяржаве размежаванне імён па бацьку на ***-віч***, з аднаго боку, і на ***-оў,-еў,-ін*** ажыццяўлялася вельмі паслядоўна. Вядома, што Іван Грозны ў XVI стагоддзі ўзнагароджваў правам звацца іменем па бацьку на -віч найбольш адданых і блізкіх яму людзей, у асноўным баяр.

У XVIII стагоддзі, у час праўлення Кацярыны II афіцыйна выкарыстоўваць поўныя імёны па бацьку на -іч маглі толькі асобы царскай сям'і, канцлер, тайныя саветнікі, стацкія саветнікі, а таксама генералы – ад генерал-фельдмаршала да генерал-маёра ўключна. Прадстаўнікі шостага, сёмага, восьмага класаў афіцыйна іменаваліся з выкарыстаннем толькі імён па бацьку на ***-оў, -еў, -ін***. Усе астатнія іменаваліся без імёнаў па бацьку.

Напрыклад, пры апісанні ў 1776 годзе мяшчанскіх двароў у мястэчку Гомлі, якое тады належала графу Пятру Аляксандравічу Румянцаву-Задунайскаму, імёнамі ўладальнікаў двароў, мяшчан былі ***Андрэй Іванаў Злотнік, Аляксей Ігнатаў Півавар, Грыгорый Андрэеў Спірыдонаў***. Гэтыя людзі афіцыйна іменаваліся з выкарыстаннем формаў імён па бацьку на ***-оў, -еў, -ёў*** (рус. ***полуотчества***).

Жонкі мяшчан і ўдовы, якія валодалі мяшчанскімі дварамі, запісваліся толькі па імені і прозвішчным празванні ці толькі па імені: двор удавы Анастасіі Сукалскай, двор Давыда Падасінавага, жонка яго Ганна. Побач з гэтымі іменаваннямі ў тым жа апісанні румянцаўскага маёнтка ёсць ужыванне ўсіх тытулаў і званняў самога Румянцава, а таксама іменаванне яго, як генерала-фельдмаршала, з поўным іменем па бацьку на ***-віч*** – ***Пётр Аляксандравіч.***

Калі форма імені па бацьку ў рускай дзяржаве ў розны час была істотным афіцыйным знакам сацыяльнага адрознення, то ў межах Вялікага Княства Літоўскага пры іменаванні ў афіцыйных дакументах любых асоб, нават сялян, выкарыстоўваліся поўныя формы імені па бацьку ў спалучэнні з асабовым іменем [53, с. 41–45].

Па пытанні паходжання і ўжывання імені па бацьку ў беларускай мове ў даследчыкаў ёсць розныя меркаванні. Так, Я. Станкевіч піша: "Ветлых зваротаў па бацьку («по имени и отчеству») у крывічоў няма і ніколі не было. Былі калісь назовы сыноў на -іч, -евіч, -овіч (***Ільініч***, ***Хадасевіч***, ***Пятровіч***), але яны не былі ветлымі зваротамі, а ўжываліся дзеля бліжэйшага азначэння. Аднак пазней гэтыя назовы станавіліся прозвішчамі, замерлі, перастаючы адначасна ўжывацца ў сваёй ранейшай ролі. Замест іх паўсталі іншыя назовы па бацьку, што ёсцека дагэтуль, але яны таксама не ёсць ветлымі зваротамі. Цяперашнія назовы па бацьку ў мужчын маюць суфікс -онак (-ёнак) або -анок (-янок), -анка (-янка) і -ышка (-ішка). Прыкладам, Васіль Міхневіч мае сына Пётру і дачку Ганну, дык дзеці ягоныя дзеля азначэння (у судзе і інш.) запішуць гэтак: ***Пётра Васілёнак Міхневіч*** (а калі гэта дзяцюк і чалавек несамастойны, дык

Пётра Васілёнак Міхневічык, ***Міхнеўчык***), а дачку ды яшчэ незамужнюю: ***Ганна Васілянка Міхневічанка*** або ***Ганна Васілішка Міхневічышка***. А калі б Ганна была замужам, дапусцім, за ***Апанасовічам***, дык запішуць гэтак: ***Ганна Васілянка*** (або ***Васілішка***) ***Апанасовічыха*** [61, с. 97].

У сучасным грамадстве імя па бацьку дадаюць да імені тады, калі хочуць падкрэсліць павагу да асобы. Напрыклад, героя рамана Георгія Марчука "Кветкі правінцыі", таленавітага мастака-самародка, аднавяскоўцы называюць толькі па імені па бацьку ***Глеб Іванавіч***, падкрэсліваючы шчырую павагу і сімпатыю да адоранага творы і шчырага, спагадлівага чалавека, гатовага заўсёды дапамагчы людзям: "***Глеб Іванавіч*** *распісваў у цэрквах алтары, пісаў іконы святых мучанікаў… Ён быў адзіны мастак на гарадок і знаў сабе цану, хоць і ніколі сваім талентам не хваліўся… Калі выпадала* ***Глебу Іванавічу*** *ўпрыгожваць дзе-небудзь на вёсцы старую царкву, згаджаўся з вялікай ахвотай і за невялікія грошы*".

Г. Мезенка заўважае: "Можна хіба толькі зазначыць, што, нягледзячы на дзяржаўнае заканадаўства, якое патрабуе, каб у дакументах усіх грамадзян былі імя, імя па бацьку і прозвішча, беларусы, у адрозненне ад рускіх, больш заўважальна імкнуліся і імкнуцца адштурхнуцца ад ужывання імені па бацьку. Мастацкая літаратура, перапіска вядомых людзей – таму пацверджанні. Беларускі афіцыйны пашпартны запіс даволі далёкі ад непасрэднага іменавання чалавека ў розных неафіцыйных сітуацыях, у розных сацыяльных палях. Для сучаснай беларускай анамастыкі, як дарэчы і для рускай, вельмі важна трымацца і разумець розніцу паміж афіцыйнай і неафіцыйнымі сферамі ўжывання імён" [43, с. 59].

Даследчыкі этыкету адзначаюць, што на Беларусі імёны па бацьку на -***віч*** – з'ява досыць позняя і з'явіліся яны пад уплывам рускай мовы. У рамане Г. Далідовіча "Заходнікі", у якім апісваецца жыццё беларускай вёскі ў першыя пасляваенныя гады, імёны па бацьку ўжываюцца для называння прадстаўнікоў савецкай улады: старшыні сельсавета ***Ананаса Лукіча,*** сакратара ***Валянціны Казіміраўны*** і інш. У творы ёсць паказальныя радкі: "*Франя не назвала Кураглядава* <u>*па імені па бацьку*</u>*. Цяжка прывыкаць заходнікам да гэтага: запомнілі змалку, што ў вёсцы маладых называюць толькі па імені, а калі трэба загаварыць да жанатых і замужніх, да пажылых, то да імені дадаюць словы* ***дзядзька*** *або* ***цётка"***.

У народным асяроддзі сродкам выказвання павагі малодшага да старэйшага, да шанаванага чалавека засталіся вакатывы ***дзядзька, цётка*** ў спалучэнні з асабовым іменем, пра што сведчаць успаміны вядомага беларускага вучонага і пісьменніка Уладзіміра Гніламёдава, выкладзеныя ў рамане "Уліс з Прускі": "*Словы* "***дзядзьку***" *і* "***цітку***" *(дзядзька і цётка) тут [у палескай вёсцы Прускі] здаўна ўжываліся пры звароце да старэйшага чалавека, і неабавязкова родзіча, і гэта лічылася выяўленнем*

ветлівасці і прыязнасці. Прускаўцы, як і ўсе ў наваколлі, захавалі ***даўняе, родавое адчуванне сваёй крэўнасці***".

У неславянскіх народаў зваць іменем па бацьку не прынята. Адносіны да бацькі ў асобных народаў адлюстроўваюцца ў прозвішчы: у нямецкай, англійскай, скандынаўскіх і іншых германскіх мовах яны выражаны праз частку *son* 'сын' (англ. *Джонсан*, ням. *Вольфсан*, дацк. *Андэрсен*, нарвежскае *Ібсен*, шведскае *Эрыксан*), у іранскіх задэ 'дзіця, патомак' (Турсун-задэ), у цюркскіх – словамі *аглы* '*хлопчык*' або *кыз* '*дзяўчынка*' (*Ахмед-аглы, Ахмед-кыз*) [5, с. 21].

Тэма 4. ПРОЗВІШЧЫ

Кожнае прозвішча – гэта спадчыннае імя сям'і, устойлівае не менш як у трох пакаленнях, інакш – спадчыннае афіцыйнае найменне. Прозвішчы ўказваюць на вытокі сям'і, роду, на знешнія і ўнутраныя рысы, заняткі, паходжанне продкаў, іх становішча ў грамадстве і месца жыхарства.

Прозвішчы як элемент іменавання людзей фарміраваліся паступова. "Першымі набылі прозвішчы князі, баяры, буйныя феадалы. На Беларусі і Украіне з XIV стагоддзя вядомы магнацкія роды ***Радзівілаў***, ***Хадкевічаў***, ***Тышкевічаў***, ***Вішнявецкіх***, ***Сапегаў***, ***Патоцкіх***, ***Аляльк­евічаў***, ***Чартарыйскіх***, ***Пацаў***, ***Кішак*** і інш." [81, с. 186].

«Ёсць і легенды пра ўзнікненне асобных прозвішчаў. Так, у сярэднія вякі на Беларусі быў знакамітым старажытны род магнатаў ***Храптовічаў***. З XII стагоддзя ў Прынёманскім краі бытуе легенда, у якой расказваецца, як новагародскі князь адбіваўся ад вялікай навалы ворагаў. Загінула амаль уся княжая дружына, паранены князь ды двое вояў засталіся жывымі. Доўга змучаныя воі неслі свайго гаспадара, уцякаючы ад ворагаў. І відаць ужо былі купалы царквы Барыса і Глеба ў Новагародку, але не вытрывала сэрца аднаго з дружыннікаў – ён памёр. Засталіся адзін малады вой і паранены, скалечаны князь… Яшчэ два дні поўз малады вой, трымаючы на спіне паміраючага князя… Адчуваючы спажыву, іх суправаджала вялізная чарада крумкачоў.

Але хапіла сілы і волі ў маладога і сумленнага воя. Удзячны быў за ўсё князь. Свайму выратавальніку ён дараваў вялікае паселішча на беразе паўнаводнай ракі. Разводзілі там многа авечак, выраблялі сукно, апрацоўвалі воўну. Адсюль і назва ***Шчорсы*** – нібыта ад «шэрсць часаць». Дружыннік за мужнасць, адвагу і сумленне атрымаў прозвішча ***Храптовіч***, за тое, што вынес князя на спіне, «***хрыпце***»" [81, с. 69].

У XVII–XVIII стст. прозвішчы з'явіліся ў гарадскіх мяшчан і заможных сялян. З канца XVII ст., але пераважна ў XVIII–XIX стст. прозвішчы

атрымлівалі прадстаўнікі праваслаўнага духавенства. Сярод іх многа штучных прозвішчаў, утвораных ад розных слоў царкоўнаславянскай, лацінскай, грэчаскай і іншых моў. Значную частку ўяўляюць прозвішчы, утвораныя ад назваў цэркваў і царкоўных свят: ***Успенскі***, ***Багаяўленскі***, ***Раждзественскі*** і інш. Шэраг прозвішчаў утвораны ад усходнеславянскіх онімаў шляхам перакладу іх асноў на лацінскую мову і далучэннем да лацінскай асновы суфіксаў *-оў, -ск* і канчаткаў: ***Баброў – Касторскі***, ***Гусеў – Ансераў***, ***Арлоў – Аквілеў***, ***Пяскоў – Арэнаў***. З падобнымі перакладамі асноў прозвішчаў на грэчаскую мову сустракаемся ў выпадках: ***Хлебнікаў – Артабалеўскі***, ***Холмскі – Лафіцкі***, ***Крэстоўскі – Стаўроўскі***. Многія з прозвішчаў прыдумваліся спецыяльна для асоб, якія навучаліся ў духоўных вучылішчах. Так, напрыклад, кіраўніцтва Маскоўскай духоўнай акадэміі змяніла ў 1838 г. прозвішча навучэнцу *П'янкову* на *Сабрыеўскі* ад лацінскага *собрыус* – цвярозы. Мяняла яно і іншыя прозвішчы: *Любоўнікаў*, *Прапойкін*, таму што лічыла іх недапушчальнымі для служыцеляў культу. Святары часам утваралі свае прозвішчы ад назваў паўднёвых раслін ці тапонімаў: *Вінаградаў, Міртаў, Кіпарысаў, Крыцкі* і інш.[65, с. 123].

У XIX ст. прозвішчы атрымала асноўная маса сялян. На ўскраіне (напрыклад, у беларускім Палессі) набыццё прозвішчаў жыхарамі тых ці іншых вёсак адбывалася нават у савецкі час, у перыяд утварэння калгасаў. Сяляне ў мінулым пастаянна жылі ў адной і той жа вёсцы, нікуды не выязджалі і не мелі патрэбы ў афіцыйным іменаванні. Яны абыходзіліся асабовым іменем і "вулічным" прозвішчам, якое далей нярэдка станавілася сапраўдным прозвішчам.

Перш чым тлумачыць сучасныя прозвішчы, патрэбна абавязкова звярнуцца да іх гісторыі. Ні адно з сучасных прозвішчаў не ўтварылася на аснове агульнага назоўніка (апелятыва). Любому прозвішчу папярэднічала імя ўласнае – асабовае імя продка, імя-мянушка, тая ці іншая форма імені па бацьку, геаграфічная назва [53, с. 6].

Этымалагічнае значэнне прозвішча не мае адносінаў да яго сучасных носьбітаў. Нашы прозвішчы – гэта толькі ідэнтыфікацыйныя знакі з рэдукаванай семантыкай, прынятыя па традыцыі. Жывы іх сэнс быў актуальны толькі ў момант з'яўлення прозвішча і ў дачыненні да самага першага яго носьбіта. Прозвішча характарызавала ў тых ці іншых адносінах яго родапачынальніка, а пры пераносе на яго дзяцей і тым больш унукаў зыходнае значэнне прозвішча спярша зацямнялася, а затым забывалася [53, с. 10].

Усе сучасныя прозвішчы, якія фіксуюцца ў межах Рэспублікі Беларусь і ва ўсім усходнеславянскім арэале ў цэлым, размяжоўваюцца на дзве вялікія групы, на два прозвішчныя тыпы – ***патранімічныя***

і ***непатранімічныя***. Аб'ядноўвае гэтыя тэрміны паняцце ***патронім*** – імя бацькі, якое далучаецца да імён дзяцей, імя па бацьку.

На рускай этнамоўнай тэрыторыі пераважным тыпам прозвішчаў, якія сфарміраваліся ў сярэдзіне XVI ст., з'яўляюцца ***патранімічныя*** прозвішчы з суфіксамі -оў,-еў, -ін, -ын. Такія прозвішчы ў сваіх вытоках былі прыналежнымі прыметнікамі і першапачаткова выконвалі функцыю імён па бацьку – указвалі на прыналежнасць чалавека да пэўнага бацькі (***Пятроў*** – 'сын Пятра', ***Шубін*** – 'сын Шубы', ***Лісіцын*** – 'сын Лісіцы').

Аднак цэлы шэраг прозвішчаў звязаны не з **патронімамі**, а з **матронімамі**, г. зн. іменаваннямі па маці. Матронімы з'яўляліся ў такіх выпадках, калі па пэўных прычынах адсутнічаў бацька (загінуў, памёр, быў запісаны ў рэкруты, сасланы на катаргу) і роля юрыдычнай асобы ў сям'і перахадзіла да маці.

Рускі тып прозвішчаў вядомы ў Беларусі, але прозвішчы на -оў, -еў складаюць тут, паводле падлікаў С. І. Зініна, толькі 19,5 % прозвішчнага фонду, а прозвішчы на -ін, -ын – 6 %.

Патранімічныя прозвішчы гэтага тыпу ўтвараліся пераважна паводле наступных дзвюх схемаў: а) мірское імя > імя па бацьку ад мірскога імені > прозвішчнае празванне > прозвішча; б) хрысціянскае імя > імя па бацьку ад хрысціянскага імені > прозвішчнае празванне > прозвішча.

Да патранімічных адносяцца таксама прозвішчы з памяншальнымі суфіксамі, якія выступалі ў ролі патронімаў (патранімічных імён) яшчэ ва ўсходнеславянскі час. Такія формы шырока распаўсюджаны ў беларускай і ўкраінскай мовах. Так, характэрнымі для беларусаў з'яўляюцца, напрыклад, патранімічныя іменаванні *Максімёнак* і *Найдзёнак* (сыны людзей па імені *Максім* і *Найдзен*), а для ўкраінцаў – *Жданенка* і *Гардзіенка* (дзеці *Ждана* і *Гордзія*). Памяншальныя формы імён абазначалі перш за ўсё патранімічныя сувязі [53, с. 60–61].

Патранімічнымі з'яўляюцца таксама наступныя прозвішчы:

прозвішчы на -іч, утвораныя лексіка-семантычным спосабам на аснове імён па бацьку ад хрысціянскіх асабовых імён у розных іх формах – афіцыйных і народна-размоўных (***Кузьміч***, ***Паўловіч***, ***Алексіевіч***, ***Багдановіч***, ***Хадасевіч***, ***Петрусевіч***, ***Федасевіч***);

прозвішчы на -іч ад імён па бацьку ад мірскіх імён (***Варановіч***, ***Галубовіч***, ***Сабалевіч***, ***Буйновіч***). Прозвішчы на -іч на ўсходнеславянскім арэале характэрныя галоўным чынам для тэрыторыі Беларусі;

некаторыя неславянскія па паходжанні і афармленні прозвішчы тыпу ***Якабсон*** ("сын Якаба"), ***Міхельсон*** ("сын Міхеля"), ***Фуксон*** ("сын Фука").

Зрэдку можна сустрэць патранімічныя прозвішчы, якія маюць суфікс прыналежнасці -j-: ***Баброўнічы*** ("сын баброўніка"), ***Бабій*** ("сын Бабы").

Непатранімічныя прозвішчы, у адрозненне ад патранімічных, не з'яўляюцца найменнямі па бацьку і характарызуюць у тых ці іншых адносінах самога родапачынальніка прозвішча. Выдзяляюцца наступныя тэматычныя групы **непатранімічных прозвішчаў**:

непатранімічныя прозвішчы, якія ўказваюць на знешнія рысы, аблічча, фізічныя асаблівасці першага носьбіта наймення (***Белавус***, ***Галавач***, ***Крывалап***, ***Чарнавок*** і да т. п.);

непатранімічныя прозвішчы, якія ўказваюць на ўнутраныя якасці, асаблівасці і здольнасці родапачынальніка прозвішча (***Уюн***, ***Маўчан***, ***Шуміла*** і да т. п.);

непатранімічныя прозвішчы, якія ўказваюць на лад жыцця, сацыяльны статус чалавека і розныя жыццёвыя абставіны (***Баяр***, ***Прымак***, ***Фабрыкант*** і да т. п.);

непатранімічныя прозвішчы, звязаныя з абазначэннем прафесіі (***Бондар***, ***Бортнік***, ***Вінакур*** і інш.) [53, с. 60–61].

Назвы многіх прафесій, адлюстраваных у прозвішчах, вядомыя сучасным носьбітам мовы. Асобныя лексемы ў сучаснай мове маюць іншую, чым у час прозвішчаўтварэння, семантыку. А. Бензярук адзначае: "У многіх раёнах Брэсцкай вобласці ёсць вёскі з аднолькавай назвай – ***Агароднікі***. Чаму так адбылося? Час іх заснавання аднолькавы – сярэдзіна XVI стагоддзя. Па загаду каралевы некаторыя сяляне атрымоўвалі надзелы-агароды. Іх вёскі сталі называць ***Агароднікамі***" [10, с. 46]. ***Дэпутат*** раней '*выбарны павераны ад урада або ад грамадства для назірання за ходам справы, для прынясення просьбы, віншавання, удзячнасці*' [7, с. 91].

Выдзяляюцца непатранімічныя прозвішчы, у якіх выражаецца характарыстыка чалавека па асаблівасцях мясцовасці, дзе ён нарадзіўся і (ці) жыве (***Забалотны***, ***Падгорны***); непатранімічныя прозвішчы, якія адлюстроўваюць поўныя і народна-размоўныя формы хрысціянскіх асабовых імён (***Урбан***, ***Анікей***).

У кнізе "Касцюшкі-Сяхновіцкія: гісторыя старажытнага роду" пісьменнік-краязнаўца Анатоль Бензярук расказвае пра паходжанне прозвішча сям'і нацыянальнага героя Беларусі. У раздзеле "Імя становіцца прозвішчам" аўтар адзначае, што ўсе дакументы, складзеныя пры жыцці першага ўладара маёнтка Сяхновічы, што на Жабінкаўшчыне, называюць яго "***КОСТЮШКО***". Гэта памяншальная форма хрысціянскага імені Канстанцін. Прадстаўнікі сярэдняга і дробнага баярства ў старажытасці іменаваліся менавіта такімі памяншальнымі формамі: ***Тишко*** (замест Цімафей), ***Васко*** (замест Васіль), ***Гурко*** (замест Рыгор). Гэтыя формы ў XV–XVI стст. лічыліся нарматыўнымі, зацверджанымі ў шматлікіх справаводчых паперах. Вышэйшае ж дваранства называлася поўнымі,

кананічнымі формамі імён. Імя ***Касцюшкі*** Фёдаравіча ператварылася ў сямейнае прозвішча, таму што з 15 студзеня 1515 г. "*ён зрабіўся дваранінам гаспадарскім, выканаўцам даручэнняў вялікага князя*" [8, с. 21]. "*Да таго ж* ***Касцюшка*** *Фёдаравіч сумяшчаў пасады камянецкага суддзі і гараднічага. Апроч таго, у 1543 годзе ён быў вялікакняскім камісарам пры размеркаванні спрэчных земляў, а прыкладна ў той жа час (да 1549 года) удзельнічае ў размеркаванні каралеўскіх і шляхецкіх надзелаў каля Старога Сяла (Жабінкаўскі раён) на Берасцейшчыне*" [8, с. 22]. Такім чынам, грамадская дзейнасць **Касцюшкі** Фёдаравіча стала ўзорам для яго нашчадкаў. Бліскучая кар'ера – узвышэнне звычайнага баярына ў фактычнага кіраўніка старажытнага горада Камянца – адыграла вызначальную ролю ў замацаванні імені Касцюшкі за яго нашчадкамі як прозвішча: "*Імя слыннага продка стала часткаю спадчыны, якая трывала замацавалася за радзінаю*" [8, с. 22].

Асобна выдзяляюцца непатранімічныя прозвішчы-этнонімы (***Паляк***, ***Швед*** і інш.);

непатранімічныя прозвішчы, утвораныя ад назваў жыхароў той ці іншай мясцовасці (***Белацарковец***, ***Каламіец***, ***Магілёвец*** і да т. п.);

непатранімічныя прозвішчы, утвораныя ад геаграфічных назваў, галоўным чынам назваў населеных пунктаў (***Жлобінскі***, ***Альшанскі***, ***Пінскі***). У айчынную гісторыю прадстаўнікі роду ***Касцюшкаў*** увайшлі пад прозвішчам ***Касцюшкі-Сяхновіцкія***. Другая частка прозвішча – **прыдомак *Сяхновіцкія*** – утрымлівае інфармацыю пра спадчыннае валоданне і ўжываецца ў афіцыйным справаводстве з XVI стагоддзя: "*На старонках справы 1589 года сын і ўнук Касцюшкі Фёдаравіча зваліся* ***Касцюшкамі-Сяхновіцкімі****. У XVII стагоддзі пад урадавымі дакументамі, у прыватнасці, пад інструкцыямі,* ***Касцюшкі*** *падпісваліся найчасцей як* ***Касцюшкі-Сяхновіцкія***" [8, с. 23].

Выдзяляюцца непатранімічныя прозвішчы неславянскага паходжання (***Азарх***, ***Сегал***, ***Сулім***, ***Хазан***, ***Шульц***, ***Эрліх*** інш.) [53, с. 60].

Непатранімічныя прозвішчы з'яўляюцца яркай асаблівасцю антрапанімікону Беларусі. Прычыны шматлікасці непатранімічных прозвішчаў у беларускім этнамоўным арэале заключаюцца, на думку А. Ф. Рогалева, у тым, што на Беларусі да новага часу захоўвалася сялянская абшчына (суполка), якая жыла паводле звычаяў і законаў сваіх продкаў, што шмат стагоддзяў зберагала традыцыі і культурныя элементы мінуўшчыны [53, с. 63].

Васіль Шур акрэслівае паходжанне двайных прозвішчаў прадстаўнікоў беларускай шляхты: "Шматлікія нашчадкі шляхецкага роду ***Нарбутаў*** падпісваліся двайным прозвішчам ***Остык-Нарбут*** хутчэй за ўсё, як лічаць даследчыкі, каб лішні раз падкрэсліць старажытнасць

свайго паходжання і засведчыць непасрэдную сувязь з некалі вельмі магутным родам Остыкаў, які сапернічаў у багацці нават з Радзівіламі – самымі ўплывовымі магнатамі Вялікага Княства Літоўскага. З'яўленне двайных ці нават трайных прозвішчаў у XVI–XVIII стст. сярод шляхты не было рэдкасцю. Найчасцей шляхецкі гонар, маёмасны статус станавіліся прычынаю таго, што пры заключэнні шлюбу ніводзін з маладых не хацеў развітвацца са сваім прозвішчам, у выніку чаго з'яўляліся **прыдомкі**. У частцы такіх шляхецкіх прозвішчаў адзін з прыдомкаў указваў на вотчынную прыналежнасць, паселішча, якім валодалі першыя носьбіты такога складанага прозвішча: ***Ляшкевіч-Альпенскі*** (***Альпень*** – сяло пад Слонімам), ***Друцкі-Падбярэзскі*** (***Друцк*** – у свой час адміністрацыйны цэнтр княства, цяпер – звычайная вёска), ***Бялыніцкі-Біруля*** (***Бялынічы*** – мястэчка на Магілёўшчыне) і інш." [81, с. 63].

В. Шур адзначае: "Сярод беларусаў да нашых дзён існуе нігілістычная тэндэнцыя перайначваць, скажаць прозвішчы на -а тыпу ***Ношка***, ***Кукса***, ***Масла***, ***Буйла***, ***Юха***, ***Чэчка***, ***Крыўка*** і інш. Жаночы варыянт прозвішча ***Булава*** гучыць часам з націскам на першым складзе і г. д. Хвалявала гэтая прыкрая з'ява многіх пісьменнікаў. Так, Уладзімір Дубоўка, які балюча перажываў, што ў жывой мове можна назіраць мноства прыкладаў непажаданага перакручвання асобных беларускіх прозвішчаў, што цяпер не толькі пішуць, але і вымаўляюць не «***Скрыпка***», а «***Скрыпко***», не «***Дуда***», а «***Дудо***». Прыгожае беларускае прозвішча «***Галоўка***» пішуць і вымаўляюць «***Галаўко***». Выказаў занепакоенасць такой непажаданай з'явай з беларускімі прозвішчамі і пісьменнік Ян Скрыган: «У беларускіх прозвішчах свая завядзёнка: калі яны прадметныя, то гэтак і выгаворваюцца – ***Касіла***, ***Кукса***, ***Лялька***, ***Цвірка***, ***Хоцька***, ***Лапа***. Але як толькі даходзіць справа да напісання, яны адразу набываюць кніжнасць, якая, трэба меркаваць, пайшла ад царкоўна-папоўскага запісвання ў метрыкі. І прозвішчы пачыналі гучаць іначай: ***Касіло́***, ***Куксо́***, ***Лялько́***, ***Цвірко́***, ***Хацько́***, ***Лапо́***. Першааснова прападала, сэнс зацямняўся, у канцы ставілася заўсёды націскное «о», прозвішча рабілася проста біркаю. А такім прозвішчам, як ***Сукала***, ***Забела***, ***Спрытула***, часта надавалася акраса замежнага паходжання, іх пачыналі пісаць праз падвоеныя зычныя: ***Забелло***, ***Сукалло***, ***Спрытулло***»" [81, с. 110–111].

Н. Багамольнікава адзначае: "Гісторыя сведчыць, што на працягу многіх стагоддзяў побач з беларусамі пражывалі іншыя народы: рускія, палякі, яўрэі, цыганы, украінцы, латышы, літоўцы, татары, чэхі. Землі тагачаснай Беларусі ў свой час уваходзілі ў склад ВКЛ, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі. Адзначаныя дзяржавы былі многанацыянальнымі, і гэта адбілася як на складзе беларускай апелятыўнай лексікі, так і на

анамастычнай сістэме, у тым ліку і ў антрапонімах. Аб замацаванні прозвішчаў гэтых народаў у беларускім іменаслове гавораць іх нацыянальныя рысы (марфемы, гукі). Прозвішчы на *-са, -да, -ба, -та,-ля* – балцкія (***Дукса***, ***Роўда***, ***Стульба***, ***Жамойта***, ***Жвірбля***), на *-ас* – літоўскія (***Дайлідас***). Нямецкія і яўрэйскія прозвішчы заканчваюцца на *-баум* (***Лебенбаум***), *-бах* (***Штэмбах***), *-берг* (***Файберг***, ***Фінберг***), *-бург* (***Гамбург***), *лах* (***Петлах***, ***Фрэнклах***), *-ман* (***Гофман***, ***Гутман***, ***Фрыдман***), *фельд* (***Зэфельд***), *-штэйн* (***Гафштэйн***). Некаторыя беларусы маюць прозвішчы, якія ўтварыліся ад цюркскіх, найчасцей татарскіх каранёў: ***Букаты***, ***Калдай***, ***Кураш***. У цюркскіх, як бачна, паўтараюцца аднолькавыя гукі (***Бузук***, ***Камай***, ***Салтан***)" [5, с. 26–27].

Адным з важных накірункаў анамастычнай працы з'яўляецца **прыкладная анамастыка**, звязаная з практыкай вызначэння формы, націску, вымаўлення, транскрыпцыі, арфаграфіі, нормаў скланення ўласных імён. Да складаных пытанняў прыкладной анамастыкі адносіцца пытанне скланення прозвішчаў. Г. У. Арашонкава і В. П. Лемцюгова наступным чынам акрэсліваюць правілы скланення беларускіх прозвішчаў.

1. Беларускія і іншамоўныя прозвішчы на зычны і *-й* (*Бусел*, *Гусак*, *Галай*, *Дзяргай*) скланяюцца, калі яны належаць мужчынам, і не скланяюцца, калі іх носьбітамі з'яўляюцца жанчыны: *Дрозд* – РВ *Дразда* – Д *Дразду*, Т *Драздом*, але Алены *Дрозд*, Алене *Дрозд*; *Нячай* – РВ *Нечая* – Д *Нечаю* – Т *Нечаём* – М *Нечаю*, але Надзея *Нячай*, Надзеі *Нячай*.

Па гэтым прынцыпе скланяюцца і прозвішчы, якія паходзяць ад уласных асабовых імёнаў і мянушак на зычны і *-й: Ахрэм* – РВ *Ахрэма* – Д *Ахрэму* – Т *Ахрэмам*, але *Людмілы Ахрэм*, *Людміле Ахрэм.*

2. Прозвішчы, якія паходзяць ад назваў жывёл, птушак, прадметаў жаночага роду на націскное і ненаціскное *-а* (*Лісіца*, *Зязюля*, *Гушча*, *Дзяжа*, *Каза*, *Крапіва*, *Мятла*, *Пушча*, *Рагуля*, *Рэдзька*, *Сіла*, *Скарына*, *Торба*) скланяюцца незалежна ад полу іх носьбітаў. Напрыклад: *Сініца* – РД *Сініцы* – Т *Сініцай* (*-аю*) – М (пры) *Сініцы*; *Рагуля* – РД *Рагулі* –Т *Рагуляй* (*-яю*) – М (пры) *Рагулі.* Выключэнне складаюць прозвішчы на ненаціскныя *-га*, *-ка*, *-ха* (*Мурашка*, *Сарока*, *Кулага*, *Сядуха*), якія ў Д, Т і М склонах маюць канчаткі ў залежнасці ад таго, хто з'яўляецца іх носьбітам – асоба мужчынскага ці жаночага полу: Д *Сароку*, *Сядуху* (носьбіт мужчына) і *Сароцы*, *Сядусе* (носьбіт жанчына); адпаведна Т *Сарокам* і *Сарокай* (*-аю*), *Сядухам* і *Сядухай* (*-аю*), М (пры) *Сароку* і *Сароцы*, *Сядуху* і *Сядусе.* Мужчынскі варыянт прозвішча скланяецца як назоўнік мужчынскага роду н *-а* з адпаведнай асновай, жаночы як агульны назоўнік жаночага роду з адпаведнай асновай.

3. Мужчынскія прозвішчы на цвёрды зычны і *ў* у М склоне маюць канчатак *-е* (пры *Галадзедзе*, *Кажадубе*, *Калумбе*, *Куляшове*, *Леніне*,

Марксе, *Берліёзе*). Гэтак скланяюцца і прозвішчы, суадносныя з назоўнікамі агульнага роду (*Плакса*, *Ціхоня*).

Іншамоўныя прозвішчы на *-а(-я)* націскное не скланяюцца.

Незалежна ад полу носьбітаў па тыпе назоўнікаў жаночага роду з мяккай асновай скланяюцца беларускія прозвішчы на *-еня*, *-уня* (*-юня*): *Адаменя*, *Варвашэня*, *Шабуня*, *Бацюня*: *Варвашэня* – РД *Варвашэні* – В *Варвашэню* – Т *Варвашэняй* (*-яю*) – М (пры) *Варвашэні.*

4. Прозвішчы на *-а* ненаціскное, якія не суадносяцца з назвамі прадметаў, прозвішчы на *-іч* (*-ыч*), *-овіч* (*-евіч*) скланяюцца толькі ў тым выпадку, калі яны належаць мужчынам: *Глебка* – Р *Глебкі* – ВДМ *Глебку* – Т *Глебкам*, але *Алены Глебка, Алене Глебка*; *Адамовіч* – РВ *Адамовіча* – ДМ *Адамовічу* – Т *Адамовічам*, але *Ніны Адамовіч*, *Ніне Адамовіч.*

5. Прозвішчы на мяккі зычны, суадносныя з назоўнікамі мужчынскага роду (*Кісель*, *Князь*, *Лось*, *Мазоль*, *Матыль*, *Свірасцель*), скланяюцца толькі ў выпадку, калі яны адносяцца да мужчын: *Матыль* – РВ *Матыля* – ДМ *Матылю* – Т *Матылём*, але *Антаніны Матыль.*

6. Мужчынскія прозвішчы на *-аў (-оў, -еў, -ёў)*, *-ін (-ын)* і жаночыя прозвішчы на *-ав (-а)*, *-ев (-а)*, *-ін (-а)*, *-ын (-а)* скланяюцца па змешаным тыпе скланення (маюць склонавыя формы назоўнікаў і прыметнікаў): *Антонаў* – РВ *Антонава* – Д *Антонаву* – Т *Антонавым* – М *Антонаве*; *Кузьмін* – РВ *Кузьміна* – Д *Кузьміну* – Т *Кузьміным* – М *Кузьміне*; *Кушнярова* – РДТМ *Кушняровай* – В *Кушнярову*; *Ільіна* – РДТМ *Ільіной* – В *Ільіну.*

7. Польскія жаночыя прозвішчы на *-а* скланяюцца на ўзор беларускіх прозвішчаў на *-ая*: *Багроўска*, *Віткоўска* – РДТМ *Багроўскай*, *Віткоўскай* – В *Багроўскую*, *Віткоўскую.*

8. У беларускіх, рускіх і ўкраінскіх двайных прозвішчах першая частка скланяецца, калі яна сама па сабе можа з'яўляцца самастойным прозвішчам: *Лучыц-Федарэц – Лучыца-Федарца*, *Лебедзеў-Кумач – Лебедзева-Кумача.*

9. У складаных карэйскіх, в'етнамскіх, кітайскіх імёнах і прозвішчах скланяецца апошняя частка (калі яна канчаецца на зычны): *Кім Ір Сен – Кім Ір Сена*, *Сунь Ятсен – Сунь Ятсена*, *Фам Ван Донг – Фам Ван Донга*, *Мао Дунь – Мао Дуня*.

Не скланяюцца:

1. Прозвішчы на *-ко*: *Будзько*, *Красько*, *Крыўко*, *Малько*, *Ралько*.

2. Прозвішчы, суадносныя з назоўнікамі ніякага роду*: Калена*, *Масла*, *Рыла*, *Сала*, *Скрабло*.

3. Прозвішчы на *-ых (-іх)*: *Мялкіх*, *Святых*, *Чарных*, *Фаміных*.

4. Іншамоўныя прозвішчы на *-і (-ы)*, *-а (-я)*, *-е (-э)*, *-у (-ю)*: *Гандзі*, *Нізамі*, *Кюры*, *Сальеры*, *Джардана Бруна*, *Дзюма*, *Заля*, *Гацье*, *Гейне*,

Гётэ, Дантэ, Фур'е, Амаду, Нэру, Шэню, а таксама прозвішчы на націскное *о*: *Гюго, Дзідро, Русо*; на націскныя або ненацiскныя *о, ё* пасля галосных і ь: *Бакачыё, Відлао, Мільё* [2, с. 344–346].

Сучасны прозвішчны фонд беларусаў фарміраваўся на працягу многіх стагоддзяў. Паводле паходжання сістэма прозвішчаў, якія ўжываюцца на Беларусі, з'яўляецца неаднароднай. Гэты разрад антрапонімаў утрымлівае каштоўную інфармацыю пра асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры нашых продкаў.

Тэма 5. МЯНУШКІ. ПСЕЎДАНІМЫ

Адным з самых старажытных разрадаў уласных імён з'яўляюцца мянушкі. Да прыняцця хрысціянства асноўнай адзінкай называння чалавека было празванне (яго называлі "***рекло***", "***назвище***"), якое акрэслівала індывіда паводле знешнасці (***Чарныш***, ***Бяляк***), характару (***Бяссон***, ***Маўчан***), парадку нараджэння ў сям'і (***Трацяк***, ***Сямак***). Некаторыя імёны былі звязаны з жывёльным і раслінным светам (***Кот***, ***Жарабя***, ***Бяроза***). "Такія празванні былі абумоўлены верай у боскасць жывых істот, якія адыгрывалі асаблівую ролю ў жыцці нашых продкаў" [11, с. 4].

Пасля таго, як на нашы землі прыйшло хрысціянства, у якасці афіцыйных сталі замацоўвацца новыя царкоўныя імёны. З цягам часу на Беларусі з'явіліся такія віды антрапонімаў, як імёны па бацьку, прозвішчы, што паспяхова выконваюць у грамадстве функцыі вылучэння, ідэнтыфікацыі асобы і перадачы сацыяльна значнай інфармацыі пра яе. Але пры гэтым такі складнік антрапанімічнай лексікі, як мянушкі, працягвае існаваць у розных сферах чалавечага жыцця. Функцыяй вылучэння і называння чалавека як члена грамадства, якой бы яна ні была важнай, не вычэрпваецца сутнасць моўнай творчасці. Кожнаму з нас важна не толькі назваць індывіда, але і даць яму характарыстыку, выдзеліць самыя важныя рысы чалавека, ацаніць яго, выразіць пачуцці. Гэтыя задачы і выконваюць ***мянушкі*** – неафіцыйныя ацэнча-характарыстычныя найменні асобнага чалавека, а таксама прадстаўнікоў пэўнай сям'і і жыхароў пэўнай вёскі.

Ва ўжыванні мянушкі праяўляецца працэс **адчужэння**, якое адбываецца ў выніку "прадстаўлення суб'екта аб'ектам, унутранага знешнім, духоўнага прадметным" [68, с. 8]. У аснове **адчужэння** – падмена паняцця "асоба (суб'ект)" паняццем "індывід (аб'ект, рэч)". У чалавечай практыцы выпрацаваны багаты арсенал сродкаў індывідуалізацыі *аб'ектаў*, уключаных у кола практычнай дзейнасці людзей. Такія аб'екты-рэчы вылучаюцца пэўнымі адзнакамі-меткамі: зарубкамі, засечкамі і інш.

Мянушка – свайго роду індывідуалізуючая метка, якой чалавек пераводзіцца ў свет рэчаў, напр.: “*Новы Маісей, у прастамоўі Мішка* ***Мечаны*** */Гарбачоў/, узняў свой народ з наседжанага месца, узняў і вёў яго па пустыні*” (В. Казько); “*Я* ***Мечанага*** *хацеў*”. – *“Хопіць абзывацца! Наабзываліся ўжо!.. У яго хваміль ёсць. Круглікаў. Васіль Круглікаў*”. – “*Хы-хы…* ***Пляскаты*** *Круглікаў!*” – “*Сказана – без мянушак*” (П. Місько).

Успрымаючы свет, чалавек фіксуе найперш анамальныя з’явы, якія вылучаюцца з любога фону. Н. Д. Аруцюнава заўважае: “Абазначаючы чалавека, робяць выбар не з бясконцага мноства яго нарматыўных уласцівасцей, а з малой колькасці яго індывідуальных прымет, пры гэтым выбіраецца найбольш распазнавальная, тое, чым чалавека адзначыла Прырода. Дэскрыпцыі і прозвішчы, не гаворачы пра мянушкі, часта выводзяцца з назваў ненарматыўных уласцівасцей: *Бяспалаў* і *Бязухаў*, *Далгарукаў* і *Калчаногаў*, *Пагарэльскі* і *Скалазуб*, *Безабразаў* і *Безбародзька*, *Касалапаў* і *Крывашэін*, *Ламака* і *Плявака*. І калі б гэта не крыўдзіла чалавека, тэндэнцыя да анамальных празванняў была б выражана яшчэ ярчэй” [3, с. 11].

У мянушцы чалавек прадстаўляецца як “іншы”, нечым непадобны на другіх людзей. Яго інакшасць выяўляецца ў несіметрычнасці аблічча, незвычайнасці паводзінаў, і такая інакшасць усведамляецца як загана, недахоп, напр.: “*Міця, калі быў малы, уздумаў пагладзіць жарабятка на выгане. Падкраўся, а яно ўзбрыкнула і скалечыла яго. Нос так на ўсё жыццё і застаўся прыплюснутым. З маленства яму мянушку прыляпілі,* ***Гарбаносікам*** *называлі*” (В. Гігевіч); “*За плітою сядзеў Бронік Літавар, па мянушцы* ***Чад****: меў ён ганьбу, бо ў яго, як ва ўсіх Чадаў, смярдзела з рота*” (В. Адамчык); “*Дзядзька Іван, здаравенны і дабрадушны* ***Чапдрэп****, да сарака гадоў кавалер са зламанай у лесе нагой*” (Я. Брыль); “*Мянушка* ***Глушак*** *была вельмі простая: ад выбуху той «бомбачкі» Шура аглух больш на правае вуха*” (Я.Брыль).

Праз мянушку недахопы індывіда становяцца прадметам публічнага выкрыцця і абсмейвання. Таму ва ўжыванні ацэначна-характарыстычных назваў выяўляецца бязлітаснасць да людзей, напр.: “*З дарослай дзеўкай, работніцай, весялухай, здарыўся прыступ апендыцыту. Завезлі ў Мілтачы, доктар зрабіў аперацыю. Тую спраўную вясёлую Ліду празвалі потым* ***Рэзаны Жывот****. Недабітая выбухам Маня стала* ***Варонай****, Шура* ***Сцягачом****,* ***Глушаком****. У каго баляць вочы –* ***Сляпы****, трохі сутуліцца –* ***Гарбач****, накульгвае –* ***Клышаногі****,* ***Кундыба****. Што гэта – натуральны адбор ці проста грубая бязлітасная цемра*” (Я. Брыль).

Мянушка мае, як правіла, дэскрыптыўную прыроду. Яна ўяўляе сабою свайго роду згорнутае апісанне, слоўны малюнак, у якім на першы план выходзіць “асаблівая прымета” індывіда. Гэтая прымета часцей за ўсё

мае аб’ектыўна-рэальную прыроду і не з’яўляецца сацыяльным азначэннем чалавека. К. Маркс адзначаў: “Сутнасцю асобы з’яўляецца не яе барада, не яе кроў, не яе фізічная прырода, а яе сацыяльныя якасці” [73, с. 238]. Біялагічныя ўласцівасці чалавека (рысы твару, велічыня вушэй, колер вачэй і валасоў) не ўключаюцца ў паняцце “асоба”. Паводле “асаблівых” прымет даюцца звычайна мянушкі жывёлам, напр.: “*Хлопчык усё дзівіўся, што ў яго ласняці такая губатая морда, а пасля выдумаў: «**Губаты**». Спачатку называлі так дзеці, а пасля пачалі падклікаць сталыя*” (Г. Далідовіч). Калі ж па “асаблівай прымеце” даецца імя чалавеку, то гэтым самым ён зводзіцца на ўзровень аб’екта-рэчы, напр.: “***Чорным** аднакурснікі празвалі ў інстытуце – за чорныя валасы і гарачыя цыганскія вочы* (Жук); “*«Мы мецілі», – замармытаў **Рабы***” (К. Каліна); “***Сівым** яго празвалі за валасы, зусім белыя, асабліва ўлетку, калі яны выгаралі на сонцы*” (Я. Брыль).

Працэс узнікнення абразлівых характарыстычных назваў адлюстроўваецца ў семантыцы дзеясловаў, якія абазначаюць зняважлівы для чалавека акт намінацыі пры дапамозе мянушкі. У адрозненне ад асабовага імя мянушка не даецца (прэзентуецца), а выпадкова прыстае, прыліпае, прыклейваецца, напр.: “*У вёсцы так было спрадвеку: калі дасціпнае імя **прышпіліць** нехта чалавеку – то не здзярэ і смерць сама*” (Н. Гілевіч); “*Клікуха **прыліпла** да хлопца, як сала да падэшвы, каб болей не развітвацца з ім ніколі*” (У. Міхно); “*А калі мянушка **прыклеіцца** – да самай смерці можаш хадзіць з ёй*” (М. Гамолка). У літаральным сэнсе “прыляпіць”, “прыклеіць” можна этыкетку да пэўнага аб’екта-рэчы.

Мянушкамі могуць стаць назвы прадметаў матэрыяльнай культуры. Пагардліва-абразлівая экспрэсія найменняў асобы, якія ўтвораны на аснове назваў прадметна-ўтылітарнага тыпу, узмацняецца тым, што чалавек прадстаўляецца прыладай, напр.: “***Чыгунок** – гэта мянушка Алеся. Хлопчык вельмі ўжо марудна рос, быў маленькі і чорны”* (Я. Брыль); “*Убачыўшы гэты востры носік, я пачаў падазраваць, што **Свярдзёлак** – гэта не прозвішча, а мянушка”* (Я. Брыль); “*Боўдзіла гэты – Крушына, па прозвішчы пан Самацэвіч, а **Бязменам** мы ўжо самі яго ахрысцілі”* (Я. Брыль); “*Раман Чачотка, па мянушцы **Свісток**, высокі, лёгкі мужчына ў скураных лапціках, служыў пры цару гарадавым і дагэтуль яшчэ не мог прывыкнуць да працы па гаспадарцы”* (Я. Брыль).

Па сутнасці ў аснове мянушкі ляжыць мімесіс – сацыяльнае перайманне, якое выўляецца ў сваёй антыподнасці. У мянушцы мае месца не перайманне, а перайначванне (перадражніванне, перакрыўліванне). Імкненне перадражніць выразна праяўляецца, напрыклад, калі мянушка ўяўляе сабой перайначанае прозвішча, напр.: “*Сучкоў з суседняга Зарэчча прыйшоў… Яго звалі **Сучком”*** (А. Кажадуб); “*Ох і давалі ў косці на бюро, і*

на пленумах райкома таму залётнаму ***Бусляку*** *(па прозвішчы ён Буслякоў)”* (М.Гроднеў); “*Гэта Яжоў, сука, стараецца, выслужваецца. Як быў Ягода, то давалі тры года, а як стаў* ***Ёж****, дык пакуль не памрош”* (М. Харошка); “***МАКІТРА*** *– Марыя Кірылаўна ТРАўкіна – была, зрэшты, не мастацтвазнаўцам, а ўсяго толькі шэраговым дырэктарам сціплае правінцыяльнае школы-інтэрната”* (У. Міхно).

Перайманне-перакрыўліванне (антымімесіс) выразна выяўляецца ў мянушках, утвораных як вынік імітацыі чужога маўлення, яго манеры, асаблівасцей, найбольш паўтаральных слоў-паразітаў і цэлых фраз. Гэта своеасаблівыя дэлакутывы – адфразавыя ўтварэнні, напр.: *“Мне трэба абдумаць рэцэпт. Гэта, браток, складаная працадура. Адгэтуль і пайшла яго мянушка* ***Працадура”*** (Я. Брыль); “*Сярод перароскаў найцікавейшы быў* ***Сашка-Кі****, якога называлі так за пацешнае заіканне ў маленстве”* (Я. Брыль); “*Яго* ***Братачкам*** *дражняць у Шоўкавічах, бо ўсіх “братухамі” заве”* (У. Ліпскі); “*Іванам зваўся, а празывалі* ***Думка****. Усё казаў: “У мяне ёсць думка*” (У. Ліпскі); “*У хатцы жыў дзед* ***Карашок****, якога так празвалі за прыгаворку “ідры твае карашкі”* (Я. Брыль).

Мянушка – сфера маўленчага э т а с у. У грамадстве лічыцца непрыстойным выказвацца пра заганы чалавека: такія выказванні могуць яго пакрыўдзіць. Таму мянушка, як правіла, ужываецца “завочна”, “за вочы”, напр.: “*Маруся расказвала яму /Івану/ – і ўжо не раз, – што той, за вочы Курашчуп (прозвішча Кураглядаў), на пачатку года загаворваў гулліва ды непрыстойна…”* (Г. Далідовіч); “*Яго звалі ў нашай вёсцы двума імёнамі – Грышка і Крымінальнік. Другім заўсёды звалі за вочы”* (“Зара”).

Мянушкі належаць да разраду сацыяльна абмежаванай лексікі. Яны бытуюць у неідэалагізаваным (“дэкласаваным”) грамадстве (сярод дзяцей, злодзеяў, простага вясковага люду). Найбольш тыповы с о ц ы у м, дзе ўжываецца мянушка, – вуліца, напр.: “*Воўку, як быў малы, дражнілі на вуліцы байструком”* (А. Кажадуб); “*У яго /Мікалая/ быў сусед-аднагодак Лявон, па-вулічнаму Шлёп”* (А. Кажадуб); “*Былая школьная тэхнічка Арына Мікітаўна, па-вулічнаму Байстручыха…”* (А. Кажадуб); “*Абдураны ўладальнік траячкі – Халімон, па-вулічнаму Шукайлік”* (П. Місько). Мянушка распаўсюджана ў асяроддзі, дзе пад увагу не бярэцца асоба чалавека. Напрыклад, сярод злодзеяў яна выступае асноўным сродкам ідэнтыфікацыі індывіда, напр.: *“Гэта во* ***Певень****, а гэта –* ***Зубіла****”, – пазнаёміў з імі Серафіма* ***Хан****. Серафім дзейнічаў асцярожна і неўзабаве абжыўся клічкай* ***Хухцік****, якая, паводле* ***Чыжыка****, паходзіла ад назвы дужа асцярожнага звярка, якога ніхто не бачыў”* (А. Асіпенка).

Дапускаць мянушку ў зносіны неэтычна, як неэтычна лішні раз нагадваць чалавеку пра яго недахопы. Аднак гэтае правіла этыкету парушаецца ў надзвычайных сітуацыях высвятлення адносінаў, публічнага

прыніжэння годнасці асобы, напр.: “*Але следам паявілася злосць на Ігара – той нахабна смяяўся, і ягоны твар нагадваў велікодны піражок, намазаны яечным жаўтком. “А ты – **Піражок**, во!” – крыкнуў Серафім і шыбануў па вінтавой лесвіцы ўніз”* (А. Асіпенка); “***Бом-ба**! **Бом-ба**! Каб ты да свайго Пінска не даехаў! Каб ты ўтапіўся! **Бомба**! Каб табе вушы начальства адарвала, **Бомба**! Каб цябе дзеўкі не любілі! **Бомба**! **Бомба**!”* (Г. Марчук).

Мянушка – маўленчае дзеянне. І як усякае дзеянне, яна не можа не быць інтэнцыянальнай – мець мэту і прадметную накіраванасць. Чалавек, як правіла, калі не ўлічваць выпадкі псіхічных афазій, гаворыць з пэўнай мэтай. Нават канстатацыя факта адбываецца з намерам. Той, хто ўжывае мянушку, не проста канстатуе наяўнасць у суразмоўніка “асаблівай (часта заганнай) прыметы”, а робіць гэта наўмысна, імкнучыся пакпіць, пасмяяцца з яго. Называючы каго-небудзь па мянушцы, суб’ект маўлення адчужаецца ад яе носьбіта, дэманструе сваю перавагу над ім. Адносячы чалавека да ліку рэчаў-аб’ектаў, мянушка прыніжае яго грамадскую значнасць.

І. А. Шумская прааналізавала ***індывідуальныя*** і ***сямейна-родавыя*** (***генесіянімічныя***) мянушкі на матэрыяле гаворак Брэстчыны. Так, даследчыца разгледзела дэрывацыю мужчынскіх асабовых найменняў. На Брэстчыне шырока распаўсюджаны ***генесіянімічныя найменні асоб***. Яны не паказваюць на якую-небудзь рысу характару, паводзін чалавека, на яго знешні выгляд, не характарызуюць яго дзейнасць, як ацэначныя імёны-мянушкі, а выражаюць пэўную сувязь з іншым аб’ектам. Утваральнай базай для генесіянімічных мянушак служаць імёны, прозвішчы, мянушкі роднасных асоб (бацькі, дзеда, маці, бабулі, жонкі і інш.). Вылучаецца некалькі дэрывацыйных тыпаў генесіянімічных намінацый.

1. Назва сына, унука па імені і мянушцы бацькі, дзеда, прадзеда (**патронім**). Уласнае імя, мянушка бацькі, дзеда звычайна непасрэдна пераходзяць на сына, унука: ***Багуміл***, ***Дымян***, ***Амэрыканець***, ***Коваль***, ***Гнацій*** ← дзед Ігнацій, ***Купец*** ← прадзед быў купцом. Большасць такіх найменняў утвараецца пры дапамозе разнастайных дэмінутыўных суфіксаў, якія адначасова з’яўляюцца і паказчыкамі кроўнароднасных адносін: -ка (-ко), -ік, -ык, -чык, -ук, -юк, -чук, -ак, -як, -ок, -ёк, -эк, -ачка, -очка, -ечка, -эчка, -ушка, -юська, -юсько, -эц, -іско, -іска, -ась, -дэсь, -усь, -ыс, -уша, -ыш, -ан, -ян, -юн і інш.: ***Хэмка***, ***Алесік***, ***Якімчык***, ***Мойсак***, ***Сымынэць***, ***Юрыс***, ***Якуша***, ***Пытроля*** і інш.

2. Назва сына, унука па імені і мянушцы маці, бабулі (**матронім**). Гэты тып намінацый менш прадуктыўны. Відаць, складалася гістарычна, што прозвішча звычайна атрымлівалі ад бацькі, дзеда. Тое самае

назіраецца і з мянушкамі. У шматлікіх вёсках сына, унука называюць поўным імем або дэмінутывам маці, бабулі: ***Гонісько***, ***Малашка***, ***Юлька***, ***Анэлька***, ***Настуся***, ***Тэкля***, ***Кацюшка*** і інш. Часцей назвы-мянушкі па імені маці, бабулі ўтвараюцца пры дапамозе такіх жа суфіксаў, што і найменні першага тыпу: -ік, -ык, -чык, -ук, -іч, -ыч і інш.: ***Грунік***, ***Люцык***, ***Гандзюк***, ***Марысюк***, ***Дарчук***, ***Агапыч***, ***Гэліч***, ***Сарафінец*** – бабуля Сарафіна.

3. Назва мужа па імені, прозвішчы ці мянушцы жонкі (**гінонім**). Гэты тып малапрадуктыўны. Імя, прозвішча ці мянушка жонкі могуць непасрэдна пераходзіць на мужа: ***Бушко***, ***Дрыгов*** – прозвішчы жонак, ***Хахол*** – жонка-хахлушка, або ўтвараюцца пры дапамозе такіх жа суфіксаў, што і назва першага і другога тыпаў: ***Лідык***, ***Лілік***, ***Манькут***, ***Марынковыч***. Усе тры тыпы найменняў могуць мець форму прыметнікаў з суфіксамі -аў, -оў, -еў, -ёў, -уў, -юў, -ін, -ын: ***Анэлін***, ***Фанін***, ***Грыпын***, ***Антолькін***, ***Манькаўчын***.

Найбольш прадуктыўнымі з'яўляюцца назвы па мянушцы бацькі, дзеда, прадзеда. Такая з'ява тлумачыцца сілай мянушак, іх жывучасцю, здольнасцю пераходзіць з аднаго чалавека на другога: з бацькі на сына ці дачку, з жонкі на мужа, з дзеда на ўнука ці ўнучку і г. д. Хоць атрыманая ў спадчыну мянушка сына ці ўнука ўжо зусім не адпавядае ім: ***Балік*** ← бацька сплаўляў лес, ездзіў на балі, сын такой працай не займаецца, ***Галаўчак*** ← бацька з вёскі Галоўчыцы, сын нарадзіўся ў іншай вёсцы; ***Грушко*** ← дзед жыў пад грушай, унук – у іншым месцы [78, с. 26–27].

І.А. Шумская разгледзела антрапонімы, якія характарызуюць знешні выгляд чалавека (на матэрыяле гаворак Брэстчыны).

Антрапонімы, якія характарызуюць знешні выгляд чалавека – самая шматлікая і разнастайная ў лексіка-семантычных адносінах група найменняў, даступных для назірання. У мянушках гэтага тыпу адлюстроўваюцца розныя прыметы і ўласцівасці знешнасці чалавека. У залежнасці ад семантычнай матывіроўкі, прымет аб'ектаў, што ляжаць у аснове намінацыі, выдзяляецца некалькі падгруп мянушак.

1. Імёны-мянушкі, якія паказваюць на рост і асаблівасці складу: *Аглобля, Антэна, Жэрд, Рубель, Баразна, Вышка, Лыжа, Коніско, Лось, Мамант, Страус, Цыбель, Чарвяк, Гарошына, Гузік, Грамік, Блыха, Махорка, Карлік, Кусцік, Мышка, Мурашка, Малка, Метрык, Вузлік, Батарэя, Тумба*.

2. Мянушкі, якія характарызуюць постаць, фігуру: *Кракадзіл, Выдмідзь, Вярблюд (гарбатая жанчына), Гарбацік, Лапатыч, Шырачко (за шырокія плечы)*. Паўната адзначаецца наступнымі найменнямі: *Вулей, Квадратны, Бочка, Бык, Гарбуз, Гора, Калхіда, Пухця, Рапуха, Слон*; худзізна – *Бэрда, Кашчэй, Шкілет, Саломка, Сухар, Плотка, Здохля,*

Кастыль, Хамуцік, Сінічка, Сайка, Мынёк, Мяшок, Качалачка, Колочок, Гляк.

3. Мянушкі, якія характарызуюць чалавека паводле адзення: *Светафор (за вельмі яркую вопратку), Бусько (яшчэ малым хадзіў у чырвоных зрэбных штанах), Гулувяшка, Ануча, Мурза, Мурка, Брудас, Чухча, Пуцкель, Шмуйліха, Зыма, Капусціна (шмат адзення), Дамачка (самая модная сярод пенсіянерак), Нямытая, Квыча.*

4. Мянушкі, якія паказваюць на асаблівасць паходкі: *Зайчык, Вітрыха, Спутнік, Шмэткій, Шпарко, Качка, Качмэрыха, Калувайка (ходзяць, перавальваючыся з нагі на нагу), Жаба, Падляток, Стракоза (ходзяць, прадскокваючы), Джогол (пры хадзьбе стукае абуткам, джогае), Спутаны, Букса (ад буксаваць), Калясочка, Кундэбэ.*

5. Мянушкі, якія характарызуюць асобныя часткі цела:

твар: *Мардацік, Памідор, Пончык, Рабчык, Зацяглованы, Мечаны, Парваны (на твары шрам), Выдра, Пудзё, Лялька, Чырвунэц, Красько, Зэльман (зялёны), Рататы, Лобічыха, Цыган, Латка, Пляма*;

вочы: *Касая, Косынькій, Лупата, Камбала (мае адно вока), Сава, Савук, Совка, Бельскі (ад бяльма), Вочка (маленькія вочы), Зэркач (вялікія вочы), Ачкарык, Гочкарык, Касун, Пацук, Кролік*;

валасы: *Аўсяны, Жоўты, Рыжы, Рэдкі, Волосатый, Волосатык, Кудаса, Ворон, Голуб, Кудзеля, Віла, Чорна, Смольняк, Цыганка*;

форму і памер галавы: *Вазон, Кацялок, Ражка, Бруквіна, Молат, Башкір (башка), Галаваты, Галушка, Пудполонок (аладка), Цэбрык*;

памер і форму носа: *Дудка, Дудзік, (чалавек з кірпатым носам), Дзюба, Дзяўба, Паяльнік, Насач, Насуля, Бязноска, Клюшка, Лыч, Арол, Каршун, Крот, Лэман, Сурока, Пушка, Курносы*;

губы: *Заяц (заячая губа),Губор, Гублэй, Губаня, Губаты, Губаль*;

зубы: *Зубаты, Нутрыя (за вялікія пярэднія зубы), Бабёр (за крэпкія), Крыса (дробныя), Клык, Шчырбач, Шчука (за крывыя зубы)*;

вушы: *Заяц (доўгія), Слон (вялікія), Лапавухі, Вуха, Вушкала, Вушаты, Бэзвухі, Ослік (за доўгія вушы)*;

шыю: *Бусёк, Гусак, Лійка (за доўгуб шыю), Карась (за кароткую)*;

бараду: *Барада, Бэлавус, Гусатый, Вусаты, Чарногус*;

жывот: *Бэбах, Кысіль, Пузач, Чэрво, Чаравайчык, Калук*;

ногі: *Заец (кароткія ногі), Бусел, Цапля, Цыба, Цыбла, Лапа, Качэр, Крывый, Крывач, Рачко, Ступа (тоўстыя ногі), Козлык, Ціпця*;

рукі: *Долгорука, Леўка, Леванцаў, Манькавіч (левая рука – манька), Кукса, Пісталет (зламаная рука), Шостак (мае шэсць пальцаў)*.

Самыя ўжывальныя з пералічаных падгруп найменні, якія паказваюць на рост і асаблівасці твару, вачэй, валасоў: напэўна, гэта самыя істотныя і кідкія абрысы чалавека.

Намінацыя асоб па знешнім выглядзе адбываецца паводле разнастайных асацыяцый, іншы раз няўлоўных і зразумелых толькі тым, хто даў імя: ***Каўтун*** – маленькі чалавек. Пераносныя значэнні апелятываў пры гэтым рэдукуюцца, страчваюць частку сваёй паняційнасці, звязваюцца з прадметам якой-небудзь характэрнай рысай: ***Зонт*** – за высокі рост (Альшаны Столінскага раёна), ***Зонт*** – за густыя і кучаравыя валасы, якія надаюць галаве форму парасона (Ляскавічы Бярозаўскага раёна), хоць нярэдка сустракаюцца найменні, якія суадносяцца з аб'ектам не па адной, а па некалькіх прыметах: ***Шчурык*** – малы, поўны, з пісклявым голасам, ***Струна*** – высокая, худая, галасістая жанчына, ***Канёк*** – за рост і паходку, ***Шымпанзэ*** – маленькая, злая, сварлівая.

Вылучаецца група найменняў, якія дадзены па процілеглай, кантраснай прымеце: ***Дужы*** – зусім слабенькі чалавек (Радастава Драгічынскі раён), ***Красавец*** – непрыгожы хлопец (Хомск Драгічынскі раён), ***Чарнабровы*** – вогненна-рыжы чалавек (Любішчыцы Івацэвіцкага раёна).

Унутраная форма мянушак у розных асоб можа і не супадаць: ***Белка*** – за белыя валасы (Спорава Бярозаўскага раёна), ***Белка*** (вавёрка) за рыжыя валасы (Маркавічы Драгічынскага раёна).

Некаторыя апелятывы непасрэдна ўказваюць на пэўную прымету ці ўласцівасць асобы: ***Вэлікан, Жырны, Лысый, Бэлясов, Маленькі, Доўгі, Прэкрасна, Кучыравы, Сывы***.

Нашы матэрыялы сведчаць, што прыметы або прадметы, калісьці пакладзеныя ў аснову мянушак, з цягам часу з'яўляюцца поўнай процілегласцю іх носьбітам: ***Сіўка*** – мянушка атрымана яшчэ ў дзяцінстве за белыя, амаль сівыя валасы, пазней валасы пацямнелі, а празываецца жанчына ўсё роўна ***Сіўка*** (Клепачы Пружанскага раёна). Тое ж самае з мянушкай ***Магучы***, хоць носьбіт мянушкі даўно страціў сілы, а мянушка засталася (Ятвезь Баранавіцкага раёна).

Мянушкі ўваходзяць у склад агульнанароднай лексікі, яны, як і апелятывы, у межах груп уступаюць у разнастайныя сістэмныя сувязі: аманімічныя, антанімічныя, сінанімічныя.

Пры аманімічных сувязях суадносяцца назвы з рознымі семантычнымі палямі: ***Мошка*** – за маленькі рост (Шумакі Брэсцкі арён), ***Мошка*** – за маленькія вочы (Бельск Кобрынскі раён).

Пры антанімічных сувязях назвы супрацьпастаўляюцца паводле адной з дыферэнцыяльных прымет: высокі – нізкі (***Шнур – Дроцік***), тоўсты – худы (***Налэванка – Шкварка***), высокі худы – нізкі тоўсты (***Смык – Віні Пух)***.

Пры сінанімічных сувязях мянушкі ўтвараюць сінанімічныя рады па якой-небудзь прымеце: ***Рыжы – Рыжанькі, Рыжук, Рыжко, Рыжман,***

Ржавы, Руды, Руднік, Рудзін, Рыжэўскі, Аганёк; Рабы, Рабінец, Рабка, Рабчук, Рабчык, Рыжык, Рабаціністы, Пэрэста, Строк, Цецера, Чырвоны, Чырвунэц, Краснюк, Буряк, Рак, Мухамор.

Паводле структуры гэта ў асноўным аднаслоўныя найменні, хоць ужываюцца атрыбутыўныя і субстантыўныя спалучэнні слоў: ***Тонкая рабіна, Чырвоны нос, Кульгавы Зубор, Манька-квіточка*** [77, с.190–191].

Прадметам аналізу ў даследаваннях брэсцкага даследчыка Ірыны Антонаўны Шумскай сталі найменні, утвораныя ад прозвішчаў. Неафіцыйнае прозвішча – гэта другое, бытавое прозвішча, якое існуе паралельна з афіцыйным, толькі не замацоўваецца ў дакументах. Адны даследчыкі адносяць іх да мянушак, другія вылучаюць у асобную групу. Так, О.Н. Аляксандрава імёны тыпу *Куба (Якубава), Ціхоня (Ціханаў)* не адносіць да мянушак, а вылучае ў асобную групу “фатычных” імён, якія выконваюць кантактную функцыю, дапамагаюць устанаўліваць кантакт “паміж сваімі”. З.П. Нікуліна адпрозвішчныя дэрываты адносіць да мянушак, але заўважае, што ў семантычным плане яны “немаркіраваныя” і характарызуюцца нулявой унутранай формай: *Дуб (Дубаў*). Адзначаючы своеасаблівы лексіка-семантычны характар адпрозвішчных мянушак, яна падкрэслівае, што іх функцыя выключна намінатыўная, яны нічога не могуць характарызаваць, з’яўляюцца асемантычнымі. І сапраўды, адпрозвішчныя мянушкі ў адрозненне ад ацэнача-характарыстычных не заўсёды паказваюць на пэўныя прыкметы і ўласцівасці чалавека. Але ўсякая мянушка ёсць моўны знак, і ён, як і іншыя словы-знакі, мае багатую гаму адценняў. Таму і адпрозвішчныя мянушкі не могуць быць асемантычнымі, гэта супярэчыла б іх прызначэнню. У адной вёсцы, напрыклад, ад прозвішча Баранаў утворана дзве мянушкі – ***Баран*** і ***Баранчык***, ад прозвішча *Сцепанюк* – ***Сцепанючка і Сцепанючыха, Гайдучышка і Гайдучка*** – ад *Гайдук*. Няцяжка заўважыць розніцу ў семантычных адценнях гэтых слоў. Тут інфарматыўная характарыстыка звязана не з апелятывам, як у ацэначных мянушках, а выражаецца пры дапамозе розных экспрэсіўна-эмацыянальных суфіксаў.

Мянушкі – гэта не статычная катэгорыя, яны разнародныя па сваёй сутнасці, па спосабах утварэння, нельга бачыць у іх толькі негатыўныя рысы. Напрыклад, у адной з вёсак Пружанскага раёна ёсць дзве сястры, па прозвішчы *Кімок*. Адна з іх мае мянушку *Кімочыха*, другая – *Прыгажуня*.

У працэсе ўжывання звычайна з’яўляецца новая матывацыя мянушкі, якая ўзаемадзейнічае з асноўнай, але асацыюецца з ёю ўжо па іншых прыметах, звязаных з характарам чалавека, яго паводзінамі, знешнім выглядам і інш. Напрыклад: ***Баран*** – адпрозвішчная мянушка ад Бараноўскі, але носьбіта мянушкі называюць так і таму, што ён упарты, не зусім кемлівы чалавек. Тое ж самае назіраем і ў іншых прыкладах. ***Рапуха***

– адпрозвішчная мянушка ад ***Рапута***, дадатковая матывацыя: малады, але тоўсты хлопец; ***Малышка*** – мянушка ад прозвішча ***Малышчыц***, асацыюецца яшчэ з ростам жанчыны; ***Ліса*** – адпрозвішчная мянушка ад ***Лісіцкая***, акрамя таго, хітраватая жанчына. І чым шырэйшае кола тых, хто выкарыстоўвае такія найменні, тым больш магчымасцей для ўдакладнення першапачатковай матывацыі.

Некаторыя назвы-мянушкі ўзніклі ў выніку пераасэнсавання прозвішча на аснове аманімічнасці з апелятывам і нясуць дадатковую семантычную нагрузку. Так, прозвішча Дубіна вядзе свой пачатак ад апелятыва, спачатку на яго аснове ўзнікла мянушка, затым прозвішча, а зараз яно паслужыла базай для ўтварэння прозвішча-мянушкі. Такім жа шляхам узніклі прозвішчы-мянушкі ***Сарока, Блаха, Манішка, Шчотка***. Адбыўся адваротны працэс: прозвішча ўзнікла з мянушкі і ператварылася зноў у мянушку.

Спецыфічнай асаблівасцю адпрозвішчных мянушак, на думку некаторых даследчыкаў, з'яўляецца тое, што яны не выклікаюць негатыўных эмоцый, рэакцый, на іх адгукаюцца, як на імя ці прозвішча. Сапраўды, ёсць такія формы, якія не выклікаюць непрыемных эмоцый: ***Бобкава (Бобка), Гайдучок (Гайдук), Дроздзік (Дрозд)***. А такія мянушкі, як ***Сава (Савіцкая), Торба (Тарабанскі), Халуй (Хала)*** выклікаць станоўчай рэакцыі не могуць, бо ў мове існуюць амонімы да іх з адмоўнай экспрэсіяй.

Утвараюцца адпрозвішчныя мянушкі рознымі спосабамі. Асноўным з іх з'яўляецца марфалагічны – суфіксальны. Адрозніваюцца жаночыя і мужчынскія мянушкі.

Пераважная большасць жаночых адпрозвішчных найменняў утварылася пры дапамозе суфіксаў *-іха-, -ыха-*. У шасці раёнах Брэсцкай вобласці выяўлена больш за 100 мянушак гэтага тыпу. Прывядзём некаторыя з іх у алфавітным парадку: ***Басачыха*** ← Басавец (Столінскі), ***Баярчыха*** ← Баярчук, ***Баркуныха*** ← Баркун (Пінскі), ***Гаруніха*** ← Гарун, ***Заньчыха*** ← Занько (Брэсцкі), ***Качаніха*** ← Качан (Лунінецкі), ***Котыха*** ← Кот, ***Кулешыха*** ← Кулеш (Пінскі), ***Ключыха*** ← Ключко (Драгічынскі), ***Лапчыха*** ← Лапец, ***Лашчыха*** ← Лашко, ***Малінчыха*** ← Малінчык, ***Марозіха*** ← Мароз (Івацэвіцкі), ***Мулярчыха*** ← Мулярчык (Драгічынскі), ***Поўшыха*** ← Поўх (Лунінецкі), ***Рачыха*** ← Рак, ***Рэдчыха*** ← Радзько (Івацэвіцкі), ***Рэмчыха*** ← Рэмко (Драгічынскі), ***Сухарэвічыха*** ← Сухарэвіч (Драгічынскі), ***Турочыха*** ← Турок (Брэсцкі), ***Чопайлыха*** ←Чапайла (Драгічынскі), ***Чэчуніха*** ← Чачун (Драгічынскі), ***Шыбуніха*** ← Шабун (Івацэвіцкі). Антрапонімы з суфіксамі -іха-, -ыха- шырокаўжывальныя. Яны ўтвараюцца не толькі ад прозвішчаў, але і ад імён мужа, бацькі, маці,

дзеда і інш. і ствараюць новы тып найменняў, якія прынята называць генесіянімічнымі, бо паказваюць яны на адносіны да іншай асобы.

Ад прозвішчаў часта ўтвараюцца на Брэстчыне жаночыя назвы і пры дапамозе ацэначнага суфікса -ка: ***Остапчучка*** ← Астапук, ***Байдучка*** ← Байдук (Драгічынскі), ***Белка*** ← Бяляўская (Івацэвіцкі), ***Быльчучка*** ← Бяльчук (Брэсцкі), ***Гуцэвічка*** ← Гуцэвіч (Камянецкі), ***Грыцучка*** ← Грыцук (Брэсцкі), ***Жучко*** ← Жук (Столінскі), ***Ковальчучка*** ← Кавальчук (Брэсцкі), ***Кавроська*** ← Каўрось (Маларыцкі), ***Кіслячка*** ← Кісляк (Камянецкі), ***Ляшучка*** ← Ляшук (Юрэсцкі), ***Мазурка*** ← Мазурэвіч (Столінскі), ***Мартысючка*** ← Мартысюк (Камянецкі), ***Сайка*** ← Сай (Маларыцкі), ***Ткачучка*** ← Ткачук (Брэсцкі) і інш. Трэба зазначыць, што ўжывальнасць дэрыватаў з суфіксам -ка на Брэстчыне не аднолькавая. Найбольш ужывальныя яны ў Брэсцкім, Драгічынскім, Камянецкім, Маларыцкім раёнах. Спарадычна ўжываюцца ў Бярозаўскім, Івацэвіцкім, Кобрынскім, Лунінецкім, Столінскім і інш. Дэрываты тыпу ***Грыцучка, Ляшучка*** маюць зневажальнае значэнне. Пры ўтварэнні мянушак выкарыстоўваюцца і некаторыя іншыя суфіксы:

-ішка, -ышка, -ушка: ***Бандарчышка*** ← Бандарэц, ***Гайдучышка*** ← Гайдук, ***Каньчышка*** ← Канько (Пружанскі), ***Коволышка*** ← Коваль (Іванаўскі) і інш. Звычайна суфікс -іха-, -ыха- – паказчык назваў дарослых жанчын; -ішка-, -ышка- – дзяўчат: маці ***Бараніха***, дачка – ***Баранішка***.

-на, -ыня: ***Королевна*** ← Каралевіч, ***Марчыня*** ← Марчук (Кобрынскі);

-ок: ***Грыбок*** ← Грыб (Івацэвічкі);

-яка: ***Капузяка*** ← Каруза (Драгічынскі);

-уля: ***Грыбуля*** ← Грыбок (Баранавіцкі);

-ча: ***Джыгунча*** ← Джыгун (Івацэвіцкі), ***Стрыхарча*** ← Стрыхар (Ляхавіцкі);

-ша: ***Караваша*** ← Каравай (Івацэвіцкі).

Сустрэліся некалькі адпрозвішчных імён-мянушак бязафікснага ўтварэння: ***Цімошка*** ← Цімашок, ***Пляшка*** ← Пляшко (Ляхавіцкі). У екаторых выпадках адбылося скарачэнне асновы: ***Воўк*** ← Ваўчок, ***Брына*** ← Брынка ← Брынковіч, ***Каза*** ← Казека (Бярозаўскі), ***Крыса*** ← Крысюк (Івацэвіцкі), ***Ліса*** ← Лісіцкая (Іванаўскі), ***Ліска*** ← Лісковіч (Іванаўскі), ***Рыба*** ← Рыбакова (Камянецкі), ***Скіба*** ← Скібінская (Бярозаўскі), ***Шуня*** ← Шунькіна (Брэсцкі).

Даволі шырока ўжываюцца на Брэстчыне адпрозвішчныя жаночыя найменні ў форме прыметнікаў, утвораныя пры дапамозе суфіксаў -ова, -ёва, -іна, -ына: ***Баварчкова*** ← Баварчук (іванаўскі), ***Борысюкова*** ← Барысюк (Кобрынскі), ***Бабкова*** ← Бобка (Столінскі), ***Прынькова*** ← Прынько (Івацэвіцкі), ***Власкова*** ← Власко, ***Гулява*** ← Гуль (Бярозаўскі),

Жылкова ← Жылко (Пінскі), ***Лянчукова*** ← Лянчук, ***Музалёва*** ← Мазоль (Столінскі), ***Прадунова*** ← Прадун (Іванаўскі), ***Грыбішчына*** ← Грыбок (Івацэвіцкі), ***Калядзіна*** ← Каляда (Столінскі), ***Савчукова*** ← Саўчук (Кобрынскі) і інш.

Сродкі ўтварэння мужчынскіх назваў-мянушак больш разнастайныя. Сярод іх пераважаюць суфіксальныя ўтварэнні. Найбольш характэрныя суфіксы -ік, -ык, -чык, -ок, -онак, -ёнак, -ка, -ачка і інш. Суфіксы -ік, -ык, -чык – ацэначныя, эмацыйна-экспрэсіўныя, разам з тым яны паказваюць на ўзрост носьбітаў гэтых імён, на дзяцей: ***Бурык*** ← *Бура* (Кобрынскі), ***Гупік*** ← *Гупола,* ***Козлік*** ← *Казлоў* (Іванаўскі), ***Кузнечык*** ← *Кузняоў* (Ляхавіцкі), ***Мурзік*** ← *Мурза* (Кобрынскі), ***Швэдзік*** ← *Швед* (Пружанскі), ***Шылік*** ← *Шыла* (Драгічынскі), ***Баранчык*** ← *Баранаў* (Лунінецкі), ***Варывончык*** ← *Ларыёнец* (Кобрынскі), ***Бакульчык*** ← *Бакульманаў* (Івацэвіцкі), ***Мазолік*** ← *Мазоль* (Столінскі), ***Пытрончык*** ← *Пятручык* (Драгічынскі), ***Чыжак*** ← *Чыжэўскі* (Пінскі), ***Харытончык*** ← *Харытановіч* (Лунінецкі). За некаторымі жыхарамі такія мянушкі замацоўваюцца на ўсё жыццё. Такое ж значэнне маюць суфіксы -ок, -ёк: ***Гайдучок*** ← *Гайдук* (Пружанскі), ***Раёк*** ← *Раеўскі,* ***Сабалёк*** ← *Собалеў* (Лунінецкі), ***Марзючок*** ← *Морза* (Ганцавіцкі). Суфіксы -онак, -ёнак, -ук, -юк – патранімічныя: ***Дарачонак*** ← *Дарачук* (Камянецкі), ***Карпучонак*** ← *Карпук,* ***Мозолёнак*** ← *Мазоль,* ***Мерончонок*** ← *Меранчук,* ***Страчонок*** ← *Страчук* (Брэсцкі), ***Калядзюк*** ← *Каляда* (Пружанскі). Дэмінутыўныя суфіксы -ка, -очка змяшчаюць значэнне памяншальнасці: ***Калінка*** ← *Калінічаў* (Баранавіцкі), ***Каўроська*** ← *Каўрось* (Івацэвіцкі), ***Мартышка*** ← *Мартысевіч* (Бярозаўскі), ***Сенютка*** ← *Сенюта* (Івацэвіцкі), ***Кундачка*** ← *Кунда,* ***Копачка*** ← *Капанько* (Івацэвіцкі), ***Шчэрбачка*** ← *Шчэрба* (Пружанскі).

Дэрываты з суфіксамі *-ар, -уль, -ун, уй, -ла* маюць зневажальнае значэнне: ***Глухар*** ← *Глухоўскі,* ***Сухар*** ← *Сухарэвіч* (Брэсцкі), ***Корзуль*** ← *Корзун* (Пінскі), ***Скрыпала*** ← *Скрыпнік* (Столінскі).

Другую групу складаюць адпрозвішчныя мянушкі, утвораныя бязафіксным спосабам. Па семантыцы гэтыя ўтварэнні разнастайныя, як і разнастайныя ўтваральныя асновы прозвішчаў. Вызначаюцца наступныя семантычныя групы: мянушкі, у аснове якіх ляжаць назвы жывёл: ***Баран*** ← *Баранаў, Бараноўскі* (Лунінецкі, Івацэвіцкі), ***Казёл*** ← *Козік* (Івацэвіцкі), ***Кузёл*** ← *Казлоўскі, Казловіч* (Бярозаўскі, Кобрынскі), ***Вовк*** ← *Впаўчок,* ***Мыдведь*** ← *Мядзведзеў* (Брэсцкі), ***Быця*** ← *Бык* (Бярозаўскі), ***Заяц*** ← *Зайко* (Пінскі), ***Ліс*** ← *Лісок* (Ляхавіцкі).

Назвы грызуноў: ***Бабёр*** ← *Бабрук* (Бярозаўскі), ***Бобэр*** ← *Баброўнік* (Столінскі), ***Крот*** ← *Кротаў* (Брэсцкі), ***Крыса*** ← *Крысюк* (Івацэвіцкі), ***Суслік*** ← *Суслікаў* (Іванаўскі), ***Шчур*** ← *Шчурко* (Бярозаўскі).

Назвы птушак, насякомых, рыб: ***Голуб*** ← *Галубко* (Баранавіцкі), ***Гусь*** ← *Гусеў* (Камянецкі), ***Жук*** ← *Жукаў* (Бярозаўскі), ***Камар*** ← *Комар* (Камянецкі), ***Крук*** ← *Круковіч* (Бярозаўскі), ***Лешч*** ← *Ляшчук* (Івацэвіцкі), ***Лінь*** ← *Лінавіцкі* (Камянецкі).

Этнічныя назвы, назвы асоб па прафесіі: ***Лях*** ← *Ляховіч* (Івацэвіцкі), ***Паляк*** ← *Палякоў* (Пінскі), ***Плужнік*** ← *Плужнікаў* (Пружанскі), ***Поп*** ← *Папоў* (Камянецкі), ***Козак*** ← *Казакевіч* (Іванаўскі), ***Лытвын*** ← *Літвінец* (Драгічынскі).

Назвы іншых прадметаў: ***Бубен*** ← *Бубноў* (Ганцавіцкі), ***Банцік*** ← *Банцікаў* (Пружанскі), ***Дым*** ← *Дымковіч* (Бярозаўскі), ***Колысо*** ← *Калеснік* (Драгічынскі), ***Ліпа*** ← *Ліпскі* (Бярозаўскі), ***Сайка*** ← *Сайкоўскі* (Ляхавіцкі), ***Таўкач*** ← *Таўкачоў* (Столінскі), ***Торба*** – *Тарабанскі* (Маларыцкі), ***Цэбрык*** ← *Цабрук* (Пружанскі) і інш.

Асобную групу складаюць мянушкі-імёны, утвораныя ад прозвішчаў: ***Антон*** ← *Антонаў* (Брэсцкі), ***Борыс, Борысік, Борка*** ←*Барысюк* (Брэсцкі, Кобрынскі), ***Марко*** ← *Марковіч* (Маларыцкі), ***Мыкіта*** ← *Нікіцюк* (Камянецкі), ***Пашко*** ← *Пашкевіч* (Бярозаўскі), ***Гардзей*** ← *Гардзіевіч* (Лунінецкі), ***Гера*** ← *Герасімаў* (Бярозаўскі, Іванаўскі), ***Герман*** ← *Германовіч* (Лунінецкі), ***Лывон*** ← *Леванюк* (Кобрынскі), ***Улас*** ← *Уласаў* (Драгічынскі), ***Філька*** ← *Філюта* (Бярозаўскі), ***Франэк*** ← *Франчук* (Камянецкі), ***Харытон*** ← *Харытановіч* (Лунінецкі), ***Яраш*** ← *Ярашук* (Івацэвіцкі, Пружанскі) і інш.

Пашыраны на Брэстчыне адпрозвішчныя найменніў форме –аў, -оў, -ёў, -ін, -ын: ***Бобкаў*** ← *Бабко* (Столінскі), ***Гулёў*** ← *Гуль* (Бярозаўскі), ***Зайцаў*** ← *Зайко,* ***Ракаў*** ← *Рак* (Столінскі), ***Калядзін*** ← *Каляда* (Столінскі), ***Кніжын*** ← *Кніга* (Пружанскі) і інш. У гэтай падгрупе назіраецца нарашчэнне асноў, відаць, па аналогіі з прозвішчамі на –аў, -оў, -ёў: *Бялоў, Вараб'ёў*.

Адпрозвішчныя мянушкі лёгка спалучаюцца з рознымі формамі імён, утвараючы двухслоўныя найменні: *Нюра Брычыкава* ← *Брыч* (Драгічынскі), *Вова Кудачын, Ала Кудачына* ← *Кудака* (Бярозаўскі), *Адара Грыбішчына* ← *Грыб* (Івацэвіцкі), *Вера Барысюкова* ← *Барысюк* (Кобрынскі), *Гэля Шаркотава* ← *Шаркота* (Пружанскі) і інш.

Сярод адпрозвішчных мянушак немарфалагічнага ўтварэння цяжка вызначыць пэўныя тыпы. Адны з мянушак утвараюцца па прынцыпе антанімічнасці з прозвішчам: ***Мяккая*** ← *Цвёрдая* (Камянецкі), ***Мароз*** ← *Папека* (Івацэвіцкі), другія – на аснове сінанімічнасці: ***Клёцка*** ← *Галушкін* ← *Галушка* (Бярозаўскі), ***Поцера*** ← *Утрата* (Драгічынскі), трэція ўзнікаюць у залежнасці ад разнастайных асацыяцый, звязаных з прозвішчам: ***Бабовы*** ← *Гарох* (Івацэвіцкі), ***Блыхасты*** ← *Кот,* ***Вішынька*** ← *Слівко* (Брэсцкі), ***Белабока*** ← *Сарока,* ***Малінка*** ← *Калінка* (Івацэвіцкі),

Курыця ← *Крачка* (Кобрынскі). Некаторыя мянушкі з'яіліся ў выніку дзіцячых каламбураў: ***Апалоніч*** ← *Апановіч,* ***Балалайка*** ← *Лабай* (Кобрынскі), ***Гладыш*** ← *Гладкі* (Баранавіцкі), ***Лапша*** ← *Ляўшня,* ***Кадушка*** ← *Калдушка,* ***Зажыгалка*** ← *Жыгар* (Івацэвіцкі).

Адпрозвішчныя мянушкі складаюць прадуктыўны клас неафіцыйных імён. Яны шырока ўжываюцца ва ўсіх раёнах Брэстчыны. Характэрнай лексіка-семантычнай асаблівасцю іх з'яўляецца сувязь з прозвішчам. Яны індывідуальныя па сваім утварэнні, узнікаюць у выніку самых розных адступленняў ад прынятых норм маўлення. Па характары яны, як і ўсе тыпы мянушак, карпарацыйныя, ужываюцца ў пэўным асяроддзі, абмежаваным пэўнай групай людзей (вёска, школьны клас і інш.). Акрамя асноўнай анамастычнай функцыі – намінатыўнай, яны выконваюць інфарматыўную і кантактную функцыі [78, с. 26–31].

У маўленні вяскоўцаў выкарыстоўваюцца таксама **калектыўна-тэрытарыяльныя мянушкі**: празванні жыхароў пэўных вёсак. Так, жыхароў вёскі Калауравічы Пінскага раёна называюць ***Кобылныкы***. Старыя людзі расказваюць, што раней у вёсцы жыла шляхта. Паказчыкам высокага сацыяльнага статусу было тое, што шляхціц ездзіў на кані. А дбайны гаспадар, клапоцячыся пра прыбытак, стараўся трымаць кабылу, ад якой маглі нарадзіцца жарабяты, што ішлі на продаж. Жыхароў суседняй з Калауравічамі вёскі Паросцы празываюць ***Вороны***. Каля гэтай вёскі раней раслі высокія старыя вербы, на якіх гняздзілася шмат варон. Асаблівасці гаворкі жыхароў вёскі Барычавічы, у якой селядзец называюць '***осэлэнэц***', акрэслівае празванне ***Осэлэнцы***. Многія жыхары вёскі Асобавічы, што знаходзіцца на беразе ракі, займаюцца рыбнай лоўляй, таму асобаўцаў празываюць ***Вудярі***. Часцей за ўсё калектыўна-тэрытарыяльныя празванні выкарыстоўваюцца ў множным ліку. Ужытая ў адзіночным ліку, такая мянушка абазначае аднаго жыхара вёскі: ***Осэлэнэц***, ***Кіт***, ***Ворона***, ***Кобылнык***. Згаданыя характарыстычныя празванні знаходзяцца ў пасіўным слоўніку старых вяскоўцаў. Што да маладога пакалення калауравцаў, то моладзь амаль не ведае калектыўна-тэрытарыяльных мянушак і іх матывацыі [17, с. 18].

З'яўляючыся найбольш старажытным разрадам антрапанімічнай лексікі, мянушкі працягваюць сваё жыццё ў сучасным грамадстве, даючы магчымасць ярка абмаляваць найбольш кідкія рысы знешнасці чалавека, апісаць і ацаніць яго характар і маўленне, акрэсліць сваяцкія адносіны паміж людзьмі. А каштоўнасць калектыўна-тэрытарыяльных мянушак у тым, што яны захоўваюць і перадаюць ад продкаў да нашчадкаў інфармацыю пра гісторыю пэўнага населенага пункта.

Псеўданім (грэч. ψευδής 'несапраўднае' і όνομα – 'імя') – імя, якое выкарыстоўваецца чалавекам у той ці іншый публічнай дзейнасці замест

сапраўднага (дадзенага пры нараджэнні, зафіксаванага ў афіцыйных дакументах) імені. Псеўданімамі карысталіся і карыстаюцца дзеячы культуры, навукі, палітыкі. Апошнім часам з узнікненнем інтэрнэт-зносін да псеўданімаў далучыліся **нікі**, або **сеткавыя псеўданімы**. “Нікі маюць індывідуальнае графічнае афармленне і не паўтараюцца: ***зЮлЁная***, ***КсюША***” [5, с. 39].

Псеўданімы выкарыстоўваюць найперш пісьменнікі, нярэдка яны не абмяжоўваюцца адным псеўданімам. Напрыклад, ***Якуб Колас*** (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч) меў псеўданімы ***Адзінокі***, ***Альбуцкі***, ***Андрэй “Социаліст”***, ***Дзядзька Карусь***, ***Колас***, ***Лесавік***, ***Тамаш Булава***, ***Тарас Гушча***. Французскі пісьменнік, філосаф, асветнік ***Вальтэр*** (***Вальтэр*** – гэта адзін з псеўданімаў Мары Франсуа Аруэ) меў каля 200 псеўданімаў, у ліку якіх – псеўдаславянскія імёны ***Іван Алятаў*** і ***Жан Плокаў*** [15, с. 22]. Адзін псеўданім маглі мець некалькі асоб (калектыўны псеўданім). Так, псеўданімам ***Кукрыніксы*** падпісваліся мастакі Купрыянаў Міхаіл Васільевіч, Крылоў Парфірый Мікалаевіч, Сакалоў Мікалай Аляксандравіч. Група рускіх пісьменнікаў у складзе Аляксея Канстанцінавіча Талстога і братоў Аляксея, Аляксандра і Уладзіміра Жамчужнікавых выкарыстоўвала псеўданім ***Казьма Пруткоў***. Пад псеўданімам ***Я. Лупаты*** былі схаваны імёны беларускіх пісьменнікаў Я. Брыля, П. Панчанкі, Я. Скурко, М. Лужаніна. “Упершыню названы псеўданім быў засведчаны ў 1946 годзе ў часопісе «Вожык». Гэтыя аўтары апублікавалі гумарыстычны рэпартаж пра чарговы пленум Саюза пісьменнікаў: ад Янкі Брыля замацавалася ў псеўданіме «Я», ад Пімена Панчанкі – «па», ад Макісма Лужаніна – «лу», ад Максіма Танка – «т»” [82, с. 62].

Я. Саламевіч выдзеліў наступныя тыпы псеўданімаў з пункту гледжання відаўтварэння і графічнай перадачы.

1. *Уласна псеўданімы (сапраўдныя псеўданімы), або фіктонімы*. Гэта формы, якія ствараюць поўнае ўражанне імя і прозвішча аўтара: ***Янка Купала***, ***Янка Бяздольны*** (І. Луцэвіч), ***Якуб Колас***, ***Тамаш Булава***, ***Тарас Гушча*** (К. Міцкевіч), ***Міхась Чарот*** (М. Кудзелька), ***Гальяш Леўчык*** (І. Ляўковіч) і інш.

2. *Абагульняльныя псеўданімы*. У іх сапраўднае імя і прозвішча аўтара заменены ўказаннем на яго:

а) нацыянальнасць (*Беларус* – П. Дземідовіч, *Пётра Беларус* – П. Яленскі);

б) тэрытарыяльную прыналежнасць (***С. Полацкі*** – С. Пятроўскі-Сітніяновіч, ***Янук з-пад Мінска*** – І. Луцэвіч);

в) сацыяльнае становішча (***Сярожа пастушок*** – С. Крывец).

3. *Крыптонімы*. Яны ўтвараюцца з ініцыялаў імя або прозвішча, імя і прозвішча, часам імя, імя па бацьку і прозвішча, а таксама пачатковых літар псеўданіма аўтара (І. Л. – І. Луцэвіч, А. – А. Шлюбскі, Б. – М. Багдановіч, В. Т. – В. Таўлай, Е. Р. Р. – Е. Раманаў).

4. *Анаграмы*: змешванне літар і складоў імя і прозвішча і прачытання прозвішча ззаду наперад (***А. Рэка*** – А. Бабарэка, ***В. Нэдбэ*** – Л. Бэндэ, ***Горбах Р***. – Рыгор Бахта, ***Чабола*** – А. Лобач, ***П. Уёлавак*** – П. Кавалёў). [57, с. 3–4].

Н. У. Падольская ў “Слоўніку рускай анамастычнай тэрміналогіі” акрэслівае два віды псеўданімаў: ***псеўдаандронімы*** – мужчынскія імёны, выкарыстаныя ў якасці псеўданіма жанчынамі (напрыклад, ***Мацей Крапіўка***, ***Гаўрыла***, ***Гаўрыла з Полацка*** – Алаіза Пашкевіч, ***Адам Шкіляр*** – Ванда Лявіцкая, ***Марка Ваўчок*** – М. А. Вілінская (Марковіч), ***Жорж Санд*** – Аўрора Дзюпэн), і ***псеўдагінімы*** – жаночыя імёны, выкарыстаныя ў якасці псеўданіма мужчынамі (напрыклад, ***Ганна Аршыца*** – Уладзімір Дубоўка, ***Алеся Гаротная*** – Аляксандр Шлюбскі) [52, с. 114–115].

У сусветнай літаратуры нямала прыкладаў **псеўдагінімаў**, якія даследаваў Я. Саламевіч.

“Сярод шматлікіх псеўданімаў Вальтэра сустракаюцца і жаночыя: ***Удава Дэні*** (так называлі яго пляменніцу), ***Фаціма, Прыгожая дама, Катрын Вадэ.*** Стэфан Малармэ, паэт-сімваліст, як рэдактар часопіса “Апошняя мода” падпісваўся як мадам ***Маргерыт дэ Понці***.

Часта такія містыфікацыі сустракаюцца і ў рускай літаратуры XVIII-XIX стагоддзяў. Так, у сатырычных часопісах кацярынінскага часу статс-сакратар імператрыцы А. Храпавіцкі падпісваўся ***Агаф’я Хрыпухіна, Алімпіяда Сэрцакрадава, Акіліна Трашчоткіна, Васіліса Таптаногава***.

Рэдакцыя “Пантэона” ў 1853 годзе вярнула вершы паэту Р. Данілеўскаму (1829– 1890). Праз некаторы час у рэдакцыю прыйшла паэма “Адвакацтва жанчыны” і такі ліст: “Шаноўны пане! Мне ўсяго 16 гадоў. Я жыву бязвыезна ў глухамані старой вёсачкі. Сама сябе адукавала шляхам вучэння. Я абажаю кнігі. І мне засвяціла думка паказаць вам свае спробы ў вершах. Над паэмай, якую вам дасылаю, я шмат думала, многа працавала. Я некалькі разоў перарабляла яе. Мой знаёмы, адзін настаўнік, які крыху мае адносіны да літаратуры і бываў у Пецярбургу, расказаў мне, што вы спрыяеце жанчынам, якія спрабуюць свае сілы ў літаратуры. Скажу вам шчыра, што гэта яшчэ больш натхніла мяне адаслаць вам маё сачыненне. Аддаю яго на суд ваш. Будзьце паблажлівыя да 16-гадовай сціплай паэткі.

З павагай да вас паклонніца ваша Яўгенія Сарафанава.

Адказу мне не трэба. Надрукуеце – буду радавацца, адпрэчыце – ціха перапакутую”.

Гэтым разам рэдакцыя змясціла ўрыўкі з “Адвакацтва жанчыны”. Неўзабаве з’явіўся новы ліст ад “аўтара”, яго прынёс сам Р. Данілеўскі: “Плакала да шчасця. Дзякую, дзякую. Напішу многа, калі хваляванне маё прыціхне. А пакуль, калі можна, прышліце мне якую-небудзь узнагароду: я – дзяўчына бедная. Адданая Сарафанава”. Данілеўскаму выдалі ганарар, каб пераслаў яго аўтару. Пасля ён усё-ткі не вытрымаў і прызнаўся ў містыфікацыі. Паэма “Адвакацтва жанчыны” ўвайшла ў збор яго твораў.

Зборнік “Аўто ў воблаках” (Адэса, 1915) змяшчаў вершы нейкай ***Ніны Васкрасенскай***. Чытачы не сумняваліся, што аўтар – жанчына. Адзін верш пачынаўся: “Я в него влюблена”. Іншы заканчваўся: “И у Дерибасовской есть поэтесса!”. “Поэтессой” быў Эдуард Багрыцкі. Вершы Ніны Васкрасенскай пасля ўвайшлі ў яго зборнікі. У айчыннай літаратуры такіх выпадкаў таксама нямала, хоць часам прозвішчы прымушаюць задумацца, хто аўтар твора – мужчына ці жанчына.

Ян Чачот (1796–1847) у часопісе “Wiadomości Brukowe” друкаваўся як Zefiryna.

Якуб Колас – Канстанцін Міцкевіч – у газеце “Наша ніва” друкаваўся як Ганна Крум і Ганна Груд.

Янка Купала – Іван Луцэвіч – у “Нашай ніве” гумарыстычны верш “Страх” падпісаў жаночым псеўданімам Вайдэльота.

Паводле некаторых звестак, Антон Лявіцкі (Ядвігін Ш,) меў жаночы псеўданім Муха.

Рыхтуючы матэрыялы ў “Аршанскі маладняк” (1925), № 1), нехта заўважыў, што ўсе аўтары – мужчыны. Уладзімір Дубоўка пад адным сваім творам закрэсліў уласнае імя і вывеў – ***Ганна Аршыца*** (ад назвы рэчкі, што працякае праз Оршу)” [56, с. 34–35].

Янка Саламевіч стварыў “Слоўнік беларускіх псеўданімаў і крыптанімаў (XVI–XX стагоддзі)” (Мінск, 1983). Слоўнік утрымлівае матэрыялы не толькі з прэсы на беларускай мове, але і з выданняў на рускай і польскай мовах, якія выходзілі на Беларусі, а таксама псеўданімы, якімі падпісаны матэрыялы, звязаныя з гісторыяй беларускага народа, яго культурай, літаратурай, мастацтвам, этнаграфіяй, фальклорам, надрукаваныя на рускай і польскай мовах у розных выданнях і за межамі рэспублікі як у дарэвалюцыйны, так і ў наш час [43, с. 71].

У сучасным грамадстве псеўданімы-маскі найчасцей выкарыстоўваюцца дзеячамі культуры, мастацтва, шоу-бізнесу.

Тэма 6. АСНОВЫ ЛІТАРАТУРНАЙ АНАМАСТЫКІ

Літаратурная (паэтычная) анамастыка сярод іншых філалагічных навук адна з самых маладых. Яна аформілася ў 50-х гг. XX ст. Маючы ў наш час поўны набор метадалагічных прыёмаў, а таксама строга вызначаны аб'ект і прадмет даследавання, яна з'яўляецца самастойнай навуковай дысцыплінай, якая развіваецца на стыку літаратуразнаўства, лінгвістычнай паэтыкі і стылістыкі. Паэтычная анамастыка прадугледжвае ўзаемадзеянне філалагічных і іншых гуманітарных дысцыплін, зварот да якіх садзейнічае шматбаковаму аналізу функцыянавання імені ўласнага ў мастацкім тэксце.

Нягледзячы на станаўленне літаратурнай (паэтычнай) анамастыкі як галіны мовазнаўства, яе тэрміналогія дагэтуль не акрэслілася. У шэрагу прац (А. Ф. Рогалеў, В. Г. Гарбачова, І. М. Петрачкова) пераважае тэрмін ***паэтычная анамастыка***, таму што ён, на погляд навукоўцаў, найбольш поўна абазначае галіну славеснай мастацкай творчасці, дзе выкарыстоўваюцца імёны ўласныя. Гэтая галіна павінна ахопліваць не толькі літаратурныя (аўтарскія), але і фальклорныя творы. "***Паэтычнай анамастыкай*** называецца раздзел анамастыкі, які вывучае ў розных аспектах любыя імёны ўласныя (паэтонімы) у мастацкіх тэкстах. Варыянтам тэрміна ***паэтычная анамастыка*** з'яўляецца больш частотны ў выкарыстанні тэрмін ***анаматапаэтыка***" [20, с. 21].

Паэтычная анамастыка даследуе адлюстраванне элементаў рэальнай і выдуманай анамастыкі (іх сукупнасць складае ***анамастыкон*** мастацкага тэксту) на аснове іх індывідуальнага пераламлення і выкарыстання ў створаным пісьменнікам тэксце, элементам якога з'яўляюцца імёны ўласныя.

Выдзяленне ***паэтычнай анамастыкі*** ў самастойную навуковую дысцыпліну прадугледжвае замацаванне за ёй неабходнай сістэмы тэрмінаў, суадносных з яе спецыфікай, а таксама вызначэнне асноўнага тэрміна. Традыцыйна пры аналізе ўласных імён у мастацкай літаратуры і персаніфікацыі мастацкага вобраза ўжывалі тэрмін ***імя*** або ***імя ўласнае***. У дачыненні да мастацкіх тэкстаў тэрмін канкрэтызаваўся: ***імя дзейнай асобы***, ***імя літаратурнага персанажа***, ***імя персанажа.*** Аднак неабходны быў універсальны тэрмін, суадносны з усімі разрадамі імён уласных у мастацкім тэксце. Для літаратурнай анамастыкі такім тэрмінам з'яўляецца ***паэтонім***. У "Слоўніку рускай анамастычнай тэрміналогіі" даецца наступнае тлумачэнне: "***Паэтычнае імя*** (***паэтонім***) – імя ў мастацкай літаратуры, якое мае ў мове твора акрамя намінатыўнай характарыстычную, стылістычную і ідэалагічную функцыі. Як правіла, адносіцца

да катэгорыі прыдуманых імён, але часта пісьменнікам выкарыстоўваюцца рэальна існуючыя імёны ці камбінацыя тых і іншых” [52, с. 108].

З улікам стылістычнай функцыі ***паэтонімы*** вельмі блізкія да імёнаў уласных на ўзроўні маўлення. Яны надзелены энцыклапедычнай інфармацыяй, якая ўяўляе сабой пазамаўленчыя звесткі пра дэнатат імені ўласнага. У той жа час маўленчая інфармацыя ўстанаўлівае сувязь імені з яго носьбітам, сацыяльнае поле дэнатата і яго імені і выяўляе адносіны моўцы да іменаванага [69, с. 121]. Значэнне паэтонімаў складаецца з тых звестак, якія выяўляюцца пры выражэнні імі стылістычных функцый, адначасова падпарадкоўваючы маўленчую, энцыклапедычную і моўную інфарматыўнасць імені, што дае падставы гаварыць аб наяўнасці ў паэтонімаў значэння.

В. М. Калінкін абгрунтоўвае розніцу паміж ***іменем уласным*** і ***паэтонімам***: “Агульная тэорыя лексікаграфіі, зразумела, павінна быць у поўнай меры выкарыстана, аднак сур’ёзна трансфармавана з улікам як прынцыповага адрознення семантыкі імені ўласнага і агульнага назоўніка, так і не менш прынцыповага адрознення паміж прапрыяльнай семантыкай у мове і значэннем паэтоніма ў мастацкім творы” [27, с. 8]. Пры гэтым В. М. Калінкін выдзяляе асноўныя адрозненні паэтоніма ад імені ўласнага [27, с. 62]:

1. ***Паэтонімамі***, як правіла, абазначаюцца не рэальныя, а існуючыя ў творчай свядомасці аўтара і (праз тэкст твора) ва ўспрымальнай свядомасці чытачоў ідэальныя вобразы прыдуманых ці рэальных аб’ектаў, названых іменем уласным.

2. ***Паэтонімы*** адрозніваюцца дынамічнасцю зместу, няўстойлівасцю адносна прыналежнасці да анамастычнай ці апелятыўнай лексікі.

3. Гегемонія эстэтычнай функцыі і дамінаванне ў семантычнай сферы “паэтычных” канатацый.

Імёны персанажаў мастацкіх твораў могуць несці ярка выражаную сэнсавую нагрузку або мець схаваны асацыятыўны фон. Аўтары прац па літаратурнай анамастыцы А. Ф. Рогалеў [54, с. 61–72] і І. М. Петрачкова [49; 50] вылучаюць наступныя тыпы паэтонімаў з пункту гледжання ступені іх семантычнай актыўнасці.

Мінімальная ступень семантычнай актыўнасці ў так званых ***нейтральных імён***, значэнне асновы якіх, іх этымалогія не нясуць інфармацыі пра асаблівасці характару персанажа, не выражаюць ацэнкі літаратурнага героя. Яны выконваюць выключна ***намінатыўна-ідэнтыфікуючую*** функцыю. Варта адзначыць, што нейтральнасць такіх імён адносная. Нейтральнае імя можа стаць характарыстычным для таго ці іншага чытача. Напрыклад, адна з гераінь аўтабіяграфічнага рамана Г. Марчука “Кветкі правінцыі” носіць, на першы погляд, нейтральнае імя

Насця (***Настася***), якое паходзіць ад грэчаскіх слоў ‘адроджаная, уваскрослая’ [75, с. 55]. На нашу думку, этымалагічнае значэнне імені з’яўляецца своеасаблівай гранню ў характарыстыцы гераіні твора. Баба ***Насця*** выгадавала, выхавала, дапамагла стаць на ногі сіраце-ўнуку. Юнак упэўнены, што бабуля застанецца жыць у душах блізкіх людзей нават пасля смерці. Унутраная форма імені актуалізуецца ў прамове ўнука на пахаванні бабулі: “*І калі ёсць бессмяротнасць душы на зямлі, калі гэта праўда, то папрашу Бога, каб ён аддаў душу маёй бабы майму сыну*”.

Максімальнай ступенню семантычнай актыўнасці характарызуюцца ***прамагаваркія антрапонімы***. Гэтыя імёны маюць празрыстую семантыку, яны характарызуюць прама, непасрэдна, з’яўляючыся свайго роду ярлыкамі, этыкеткамі, якія прадвызначаюць характар успрымання і ацэнкі героя. В. Фанякова адзначае: “Гэтыя імёны падобныя да масак героя ці злачынцы ў сярэдневяковым тэатры, па якіх глядач адразу ведаў: хто перад ім” [74, с. 44]. Так, ***прамагаваркім*** антрапонімам з’яўляецца прозвішча героя рамана Г. Марчука “Вочы і сон” Авяр’яна Паўлавіча ***Ліхадзея***. Онім гэты паходзіць ад агульнага назоўніка са значэннем ‘*той, хто чыніць ліха, зло, бяду, гора; вораг*’ [70, с. 320]. Такое відавочна адмоўнае ацэначнае значэнне ўтваральнай базы антрапоніма адпавядае вобразу чалавека жорсткага, эгаістычнага, помслівага. ***Ліхадзей*** для дасягнення ўласных карыслівых мэт без роздуму і шкадавання ахвяруе лёсамі і жыццямі людзей: доктаркі Аляксандры Батура і яе сыноў, сваіх падначаленых і нават жонкі і сына. Нездарма на старонках твора ***Ліхадзей*** паўстае ў вобразе Люцыфера.

Ускоснагаваркія імёны пазбаўлены зададзенасці і просталінейнасці прамагаваркіх онімаў. Антрапонімы гэтага тыпу маюць “зацемненую” ўнутраную форму, для высвятлення якой патрэбны кантэкст. Нярэдка кантэкстам выступае тэкст усяго твора, які спрыяе раскрыццю характарыстыкі, закладзенай у паэтоніме. Да ліку ўскоснагаваркіх онімаў належыць, на нашу думку, прозвішча галоўнага персанажа рамана Г. Марчука “Сава ***Дым*** і яго палюбоўніцы”. Носьбіт прозвішча вызначаецца непастаянствам (як дым), хутка мяняючы перакананні, погляды, кірунак дзейнасці, прыстасоўваючыся да зменлівых абставін. Акрамя таго, прозвішча ***Дым*** асацыятыўна звязваецца з паняццем “сатанінскі (пякельны) агонь” (дыму без агню не бывае). Сава калечыць душы і жыцці жанчын, якія мелі няшчасце закахацца ў яго. Нездарма юродзівая, якой Бог даў здольнасць бачыць існасць чалавека, так характарызуе Саву: “*На ім агонь! Я бачу на ім агонь! Ізыдзі, сатана! Ізыдзі, на ім агонь!*”.

Ужыванне ***імён-рэмінісцэнцый*** заснавана на “перанясенні пэўных рыс асобы, названай іменем-арыгіналам, на іншы персанаж, у адносінах да

якога наўмысна выкарыстоўваецца імя вобраза-“першакрыніцы” [50, с. 11]. Адзін з герояў рамана Г. Марчука “Без ангелаў” названы ***Самсонам Гарошкам***. ***Самсон*** – імя мужнага біблейскага героя, які валодаў надзвычайнай сілай. ***Гарошак*** (Пакацігарошак) – найменне смелага асілка, персанажа славянскіх казак. Сутнасць марчукоўскага героя супрацьлеглая семантыцы такіх сімвалічных імені і прозвішча. Аўтар падкрэслівае, што ***Самсон Гарошка*** палахлівы, мітуслівы. Ён пастаянна ўзгадняе свае ўчынкі з ацэнкамі і меркаваннямі начальства, імкнецца абаперціся на больш моцных па характары людзей. Між іншым менавіта такі чалавек здолеў не толькі ўтрымацца на пасадзе старшыні сельсавета, але і атрымаць павышэнне па службе. Аўтар найменнем свайго героя падказвае чытачу: вось “багатыры”, “героі” нашага часу. Яны не маюць цвёрдых перакананняў, падпарадкоўваюцца ўладзе, прыстасоўваюцца да абставін. Толькі такія людзі маглі вытрываць жыццёвыя выпрабаванні і ўзвысіцца ў таталітарнай дзяржаве.

Паэтонімы-вобразы ілюструюць магчымасць развіцця ў імёнах рэальных гістарычных асоб і персанажаў літаратурных твораў ***пераносных (метафарычных) значэнняў***. У аснове ***анамастычнай метафары*** (***антанамазіі***) – імкненне аўтараў да супастаўлення з мэтай больш яркай і лаканічнай характарыстыкі героя. Найбольш трапна творца можа выразіць думку, параўнаўшы чалавека з вядомай гістарычнай асобай або літаратурным персанажам, якія сталі ўвасабленнем пэўных чалавечых якасцей і імёны якіх могуць сказаць чытачу больш, чым шматслоўныя гістарычныя і літаратурныя экскурсы. У аснове характарыстыкі персанажа рамана Валянціны Коўтун “Крыж міласэрнасці” Рамана Малецкага (ён забіў стрыечнага брата, каб заваладаць грашыма рэвалюцыянераў) імя біблейскага героя: “*Ён – **Каін**, які на следстве ўжо прызнаў сябе вінаватым у забойстве Тамашэўскага менавіта з-за грошай*”. А незвычайную прыгажосць сялянкі Хрысці, гераіні рамана А. Наварыча “Літоўскі воўк”, можна паказаць праз характарыстыку-метафару, аснову якой складае імя багіні прыгажосці і кахання: “*Хрысця – німфа, якую паслаў мне Бог, ранішняя кветка, **Афрадыта***”.

Ствараючы найменні персанажаў, пісьменнікі могуць “затушоўваць” характарыстыку літаратурных герояў за кошт выкарыстання дыялектных і іншамоўных лексем. Такія антрапонімы адносяцца да ліку ***схаванагаваркіх***. ***Схаванагаваркім онімам*** з’яўляецца прозвішча галоўнай гераіні навелы Г. Марчука “Яўдоха ***Шабуня***”. Онім гэты пераклікаецца з дыялектнай лексемай ***шабуніць*** ‘*хутка ісці*’ [66, с. 102]. Антрапонім адпавядае паводзінам гераіні: “*Яўдоха інакш і не хадзіла, як подбегам, такая жвавая, рухавая бабка*”.

Класіфікацыя, якая ўлічвае сэнсавую нагрузку імён уласных, іх мастацкую функцыю, з'яўляецца асабліва значнай для разумення ролі паэтонімаў у мастацкім тэксце.

Асноўнай і першаснай функцыяй імені ўласнага ў мове ў цэлым і ў мастацкім тэксце ў прыватнасці, мы лічым ***намінацыйна-ідэнтыфікацыйна-дыферэнцыйную функцыю.***

На думку А. Ф. Рогалева, В. Г. Гарбачовай. І. М. Петрачковай, ***эстэтычная*** (***мастацкая***) ***функцыя*** імён уласных у мастацкім тэксце накладваецца на ***намінатыўна-ідэнтыфікацыйна-дыферэнцыйную,*** паколькі асноўнае прызначэнне паэтоніма заключаецца ў тым, каб іменаваць герояў і адрозніваць іх. Толькі на гэтай падставе становіцца магчымым удзел імені ўласнага ў стварэнні вобразаў. Эстэтычную ж функцыю (другую галоўную функцыю паэтоніма) трэба разумець як абагульненне некалькіх прыватных функцый, якія рэалізуюцца на ўсіх узроўнях тэксту – моўным, структурна-кампазіцыйным, ідэйным – у сувязі з задачамі стварэння вобразнасці [20; 50; 54].

Складнікамі ***эстэтычнай (мастацкай) функцыі*** з'яўляюцца наступныя кампаненты: характарыстычны, стылістычны, ідэалагічны, сацыяльны, культурна-гістарычны [20, с. 28; 50, с. 6–8]. Кожны з названых кампанентаў праяўляецца ў большай ці меншай ступені ў канкрэтных паэтонімах.

Характарыстычны кампанент абумоўлены невыпадковасцю выбару імені ўласнага ў мастацкім творы. Здольнасць паэтонімаў "гаварыць" аблягчае раскрыццё ідэйнай задумы твора і аўтарскіх адносінаў да герояў. Напаўняючыся "абертонамі сэнсу" [20, с. 28], імя ўласнае ўдзельнічае, побач з іншымі элементамі, у стварэнні ідэйна-вобразнай "тканіны" твора. Напрыклад, выконваючы ***характарыстычную*** функцыю, антрапонімы ў прозе Г. Марчука даюць чытачу інфармацыю пра знешнасць аб'екта характарыстыкі (прозвішчы ***Грыва***, ***Багатырэвіч***, мянушкі ***Крываножка***, ***Барадулька***), пра маральныя якасці героя (прозвішчы ***Ліхадзей***, ***Нядбайла***, ***Злобін***, мянушкі ***Капрызная***, ***Ціхая***, ***Бомба***), пра асаблівасці маўлення індывіда (мянушка ***Мэко***, прозвішча ***Балаболка***), пра род заняткаў персанажа (мянушкі ***Кіншчык***, ***Цаліна***, ***Гурок***, ***Барка***).

"Некаторыя імёны ў самім значэнні зыходнай апелятыўнай асновы (гэта датычыцца, галоўным чынам, мянушак) і ў сваім афармленні (у суфіксальнай частцы) заключаюць тыя ці іншыя эмацыйна-экспрэсіўныя адценні, што складае ***стылістычны кампанент*** мастацкай функцыі паэтонімаў, які выступае часцей за ўсё ў спалучэнні з характарыстычным кампанентам [50, с. 7]. На прыкладзе анамастыкону прозы Георгія Марчука можна паказаць, што ***стылістычны*** кампанент

мастацкай функцыі паэтонімаў заключаецца ў тым, што характарыстычныя онімы не толькі называюць персанажаў, але і даюць ім станоўчую (прозвішча ***Харашун***, мянушка ***Акадэмік***) або адмоўную (прозвішчы ***Булька***, ***Свістун***, ***Тушканчыкаў***, мянушкі ***Кобра***, ***Капрызная***, ***Рыла ты, рыла***) ацэнку. Акрамя таго, паэтонімы перадаюць дастаткова шырокі спектр эмоцый. У мянушках і прозвішчах эмоцыі і пачуцці выражаюцца праз лексічнае значэнне асновы онімаў. Гэта захапленне (***Акадэмік***), жартаўлівасць (***Тушканчыкаў***, ***Рыла ты, рыла***), пагарда (***Кобра***, ***Бражка***, ***Карыта з чырвонцамі***) і інш. Ва ўласных асабовых імёнах эмоцыі і пачуцці выражаюцца дзякуючы багатаму набору суфіксаў суб'ектыўнай ацэнкі. Толькі ў кантэксце мастацкага твора можна вызначыць, якія пачуцці выражаюцца тым ці іншым варыянтам імені. Напрыклад, у рамане "Сава Дым і яго палюбоўніцы" адна з гераінь паслядоўна называецца ***Томкай***. Праз гэтую форму аўтар выражае пагарду да дзяўчыны, якая падманвае людзей і з лёгкасцю ўступае ў любоўныя адносіны з мужчынамі: "*І ўсё ў гэтай* ***Томкі*** *было на продаж: усмешка, вычварныя манеры, смех з прычыны і без прычыны*".

Сацыяльная функцыя паэтонімаў заключаецца ва ўказанні праз пасрэдніцтва імён на месца персанажаў у сацыяльнай іерархіі. Так, у рамане З. Дудзюк "Велясіты" прадстаўнікі вышэйшых саслоўяў маюць складаныя імёны (***Святаслаў***, ***Веляслаў***, ***Міраслава***), што прадвызначаюць жыццёвы шлях слаўных і магутных валадароў, якім спрыяюць багі. Прадстаўнікі ніжэйшых саслоўяў названы празваннямі-мянушкамі, якія акрэсліваюць знешнасць (***Агнян***, ***Злаціца***, ***Лілея***), унутраную сутнасць чалавека (***Весяліна***, ***Радуня***, ***Гаразд***), абставіны нараджэння (***Обрыч*** – дзіця, народжанае ад обра) і інш. У рамане З. Дудзюк "Год 1812" паказчыкам сацыяльнай прыналежнасці герояў з'яўляюцца іх прозвішчы. Так, прадстаўнікі шляхты маюць прозвішчы на ***-скі*** (***Дабжынскі***, ***Ажахоўскі***, ***Ляснеўскі***, ***Маеўскі***), а расейскія вайскоўцы і чыноўнікі носяць патранімічныя прозвішчы з суфіксамі ***-оў-***, ***-еў-***, ***-ін-*** (***Лавашоў***, ***Катухоў***, ***Шувалаў***, ***Нарышкін***). Прозвішчы сялян прыгадваюцца толькі тройчы, што з'яўляецца сведчаннем таго, што ў XIX ст. прозвішчы сялянства працягваюць фарміраванне і пакуль не ахопліваюць усіх прадстаўнікоў ніжэйшых саслоўяў.

Культурна-гістарычны кампанент эстэтычнай (мастацкай) функцыі абумоўлены тым, што любое імя ўласнае адпавядае спецыфіцы анамастычнай сістэмы адлюстраваных часу і прасторы. Паэтонім называюць культурна-гістарычным феноменам, носьбітам гістарычнай і этнакультурнай інфармацыі, выразнікам нацыянальнай ментальнасці. Паэтонім "упісаны" ў пэўны сацыякультурны кантэкст, інакш кажучы, ён культурна-гістарычна абумоўлены. Імя персанажа перадае светаўспры-

манне і светапогляд чалавека пэўнага часу. Напрыклад, у антрапанімічнай прасторы твораў З. Дудзюк, якія адлюстроўваюць дахрысціянскі этап гісторыі славянскіх плямёнаў, прысутнічаюць празванні-мянушкі славянскага паходжання, што выражаюць веру людзей у паяднанасць з прыродай праз продка-татэма (***Лілея***, ***Дубраўка***, ***Дзірван***, ***Прыгожы Сокал***), імкненне праз імя атрымаць дапамогу багоў (***Веляслаў***, ***Ардагаст***), накрэсліць шчаслівы лёс (***Валук***, ***Славун***), зберагчы ад хвароб і няўдач (***Неўдах***, ***Нябул***).

Ідэалагічны складнік мастацкай функцыі заключаецца ў тым, што праз імёны персанажаў аўтар выражае ідэю твора. У раманах Георгія Марчука “Вочы і сон”, “Без ангелаў”, “Год дэманаў” праз пасрэдніцтва прамагаваркіх прозвішчаў, якія называюць прадстаўнікоў савецкай улады (***Ліхадзей***, ***Старадарожац***, ***Нядбайла***, ***Свістун***, ***Злобін***), аўтар паказвае, што кіруюць дзяржавай амаральныя, бязлітасныя, абыякавыя да чалавечых праблем людзі. Прозвішча ***Бяда***, якое мае галоўны герой рамана Георгія Марчука “Без ангелаў”, – адзін са сродкаў, што дапамагае перадаць трагедыю пакалення духоўна скалечаных, атручаных ідэалогіяй людзей-рабоў.

Такім чынам, літаратурныя паэтонімы, якія ўдзельнічаюць у стварэнні другаснай семіятычнай сістэмы, мастацкага дыскурсу, акрамя асноўнай (ідэнтыфікацыйнай, дыферэнцыйнай) функцыі, выконваюць эстэтычную (выяўленча-характарыстычную, уласна мастацкую) функцыю, прадстаўленую сістэмай прыватных функцый – ***характарыстычнай***, ***стылістычнай***, ***сацыяльнай***, ***ідэалагічнай***, ***культурна-гістарычнай***.

Даследчыкамі беларускай літаратурнай анамастыкі створаны слоўнікі ўласных імёнаў мастацкіх твораў беларускіх пісьменнікаў: “Анамастычны слоўнік твораў Якуба Коласа” [1], шосты том “Слоўніка мовы Янкі Купалы” [60], трэці том “Слоўніка мовы Скарыны” [59]. Слоўнікі змяшчаюць тлумачэнне паэтонімаў твораў беларускіх класікаў (найперш антрапонімаў і тапонімаў), раскрываюць іх семантыку і кантэкстуальныя функцыі.

Тэма 7. ТАПАНІМІКА ЯК РАЗДЗЕЛ АНАМАСТЫКІ

Слова **тапаніміка** паходзіць з грэчаскай мовы: τόπος ‘мясцовасць’, ὄνομα ‘імя’. Прадметам вывучэння ў тапаніміцы з’яўляюцца тапонімы – уласныя назвы розных геаграфічных аб’ектаў: **гідронімы** – назвы рэк і азёраў; **айконімы** – назвы паселішчаў; **урбанонімы** – назвы ўнутрыгарадскіх аб’ектаў (вуліц, паркаў, сквераў, кінатэатраў); **аронімы** – назвы ўзвышшаў; **мікратапонімы** – назвы малых геаграфічных аб’ектаў (палёў, лугоў, сенажацяў, дарог, лясных урочышчаў); **асціонімы** – уласныя

імёны гарадоў; **камонімы** – уласныя імёны сельскіх паселішчаў; **патамонімы** – уласныя імёны рэк; **лімнонімы** – уласныя імёны азёр, сажалак; **гелонімы** – уласныя імёны балот, забалочаных мясцовасцей; **аронімы** – назвы любых элементаў рэльефу зямной паверхні: гары, даліны, нізіны, піку, хрыбта, паляны. **Тапаніміка** вывучае іх паходжанне, тэрытарыяльнае пашырэнне, заканамернасці развіцця і спосабы ўтварэння.

“Вывучэнне тапонімаў карыснае для многіх навук. Па іх можна аднавіць старажытную мову, засяленне і этнагенез асобных народаў на пэўнай тэрыторыі і акрэсліць межы распаўсюджання мовы і тэрыторыю гістарычнага рассялення славян. Яны захоўваюць шматлікія словы, іх формы, гукавое афармленне, што зніклі і не выкарыстоўваюцца ў сучаснай беларускай мове, і інш. У гэтых адносінах цікавасць уяўляе гісторыя ўзнікнення таго ці іншага тапоніма”[15, с. 26]. В. П. Лемцюгова такім чынам акрэслівае нацыянальна-культурную інфармацыю тапоніма “Драгічын”: “**Драгічын** – старадаўняе паселішча яцвягаў, згадваецца ў летапісе пад 1142 г. У старабеларускіх пісьмовых помніках XVI ст. (пачынаючы з 1523 года) адзначаецца ў форме **Дорогичин**. Назва ўзыходзіць да старажытнага славянскага імя **Дорож**, якое ў старарускіх пісьмовых крыніцах засведчана ў 1238 г. і ў сваю чаргу з’яўляецца скарочанай формай двухсастаўных імёнаў **Дорогомир**, **Дорогомилъ**, **Дорогобудъ**, што функцыянавалі ў той гістарычны перыяд. Першае з іх упамінаецца ў XII ст., другое – у XIV ст. У тапанімію, магчыма, трапіла праз стадыю наймення сына па бацьку **Дорожич**. Пад уплывам вуснага вымаўлення назва была пераагучана з **Даражычын** у **Дарагічын**, а пад уплывам польскай мовы – у **Драгічын**. Фармант -ын абазначае індывідуальную прыналежнасць” [36, с. 38].

В. В. Шур адзначае: “Прадстаўнікі кожнай навукі глядзяць на тапонімы кожны па-свойму, звяртаючы ўвагу на разнастайныя іх асаблівасці і робячы вывады зусім рознага характару, пацвярджаючы канцэнтрацыю зямель у руках невялікай групы зямельных магнатаў (гісторык, сацыёлаг), а таксама пацвярджаючы наяўнасць карысных выкапняў (геолаг, географ). І першае, і другое будзе толькі ўскосна цікавіць вучонага-тапаніміста, які вывучае законы ўзнікнення і змянення слоў-тапонімаў, спецыфіку накаплення асобных характарыстык аднаго тыпу і страту пэўных асаблівасцей у выніку розных абставін” [81, с. 130].

А. Літвіноўская наступным чынам акрэслівае паходжанне такога разраду тапонімаў, як айконімы: “Часцей за ўсё назвы населеных пунктаў гістарычна ўтвараліся ад:

- назваў рэк і азёраў (в. *Бесядзь* ад р. Бесядзь, г. *Вілейка* ад р. Вілія, мястэчка *Зэльва* ад р. Зальвянка);

• прозвішчаў, мянушак людзей (в. *Александрыя*, г. *Дзяржынск*, в. *Бародзічы*, в. *Няверавічы*);

• роду дзейнасці людзей (г. *Чаўсы* – ад цюркск. назвы *чаус* ‘ніжэйшы ранг ваеначальніка’, в. *Бортнікі*, в. *Ганчары*, в. *Муляры*, в. *Ткачы*)

• назваў плямёнаў, народаў (с. *Шведы*, с. *Жэймяны* – ад назвы выхадцаў з гістарычнай вобласці Літвы Жэмайціі, с. *Пруска*);

• асаблівасцяў рэльефу, мясцовасці (г. *Рэчыца*, в. *Плёсы*, в. *Балотная*, в. *Роўнядзь*);

• тыпаў паселішчаў, пабудоваў (*Гродна*, в. *Свіраны*, г. *Паставы*)

• назваў жывёлаў і птушак (г. п. *Бобр*, с. *Жораўка*, *Дразды*, в. *Казяброддзе*, *Казейкі*, *Казлы*);

• назваў раслін (г. *Дуброўна*, с. *Дубрава*, с. *Дубровіца*, с. *Крапіўна*, с. *Рэпкі*, *Рэппікі*)

• назваў аб’ектаў матэрыяльнай культуры (с. *Жорнаўка – жорнаў*, г. *Шклоў*) і інш.

Большая частка айконімаў узнікла ў глыбокай старажытнасці. Паколькі да прыходу і рассялення славянаў значную частку тэрыторыі сучаснай Беларусі засялялі балты, захаваўся цэлы шэраг балцкіх па паходжанні назваў населеных пунктаў:

• вёска ***Бакшты*** – балт. ‘вежа, высокая прыбудова’;

• сяло ***Балойкі*** – ад *balá* ‘балота’;

• вёскі ***Кімяны*** і ***Кемяны*** – ад балт. *kiminas* ‘мох’;

• сяло ***Домуці*** – ад *domús* ‘цікаўны’, *domèjimasis* ‘праяўляць цікаўнасць’;

• сяло ***Жвірблі*** – ад *žvirblis* ‘верабей’.

У Беларусі існуюць таксама айконімы цюркскага (***Канашы***, ***Карацк***, ***Кобызі***, ***Мурза***) і фіна-ўгорскага (***Еўлашы***, ***Іжа***, ***Іканы***, ***Іса***, ***Койры***) паходжання” [39, с. 146].

В. В. Шур такім чынам акрэслівае гісторыю тыпаў пасяленняў на Беларусі і адпаведных ім тыпаў тапонімаў: “У дарэвалюцыйныя часы даволі пашыраным тыпам пасяленняў на Беларусі былі ***слабоды***. Жыхары слабод вызваляліся ад розных дзяржаўных або феадальных павіннасцей (падаткаў). Насельніцтва такіх пасяленняў не ведала прыгону. Служылыя людзі ў слабодах пераважна займаліся рознымі рамёствамі, рыхтавалі самыя разнастайныя прадметы побыту для феадалаў і гараджан. З XVIII ст.слабоды як асобны тып спецыфічных пасяленняў на Беларусі пачынаюць знікаць: яны паступова ператвараюцца ў больш тыповыя для Беларусі вёскі або мястэчкі. У радзе выпадкаў былыя агульныя назвы (***слабада***, ***слабодка***, ***слабажанка*** і інш.) становяцца **тапонімамі**, уласнымі назоўнікамі. Сёлы або вёскі з назвай ***Слабада*** ў наш час ёсць у Віцебскім, Касцюковіцкім, Лепельскім, Мазырскім, Петрыкаўскім, Смалявіцкім,

Ушацкім, Шумілінскім раёнах. Са словам ***Слабада*** і рознымі азначэннямі да яго на Беларусі, як падлічана, ужываецца болей за 150 назваў-тапонімаў. Гэта ***Берагавая Слабада***, ***Вялікая Слабада***, ***Глінная Слабада***, ***Іванава Слабада***, ***Чудзянская Слабада*** і інш. Этымалогія слоў-тапонімаў Слабада, Слабожка і іншых даволі празрыстая: у аснову такіх найменняў пакладзены назоўнік ***свабода***, які ў народна-дыялектнай мове трансфармаваўся ў слова ***слабода***.

Спецыфічным тыпам пасяленняў на Беларусі ў мінулыя часы (з XIV ст.) былі ***мястэчкі*** (ад агульнаславянскага назоўніка ***место*** – горад, пасяленне). Большасць мястэчак узнікла каля манастыроў, маёнткаў феадалаў, торных дарог, пры якіх існавалі таргі. Жыхары мястэчак – ***мяшчане*** – былі ў асноўным гандлярамі і рамеснікамі, але некаторыя займаліся сельскай гаспадаркай. Беларускія мястэчкі характарызаваліся ў мінулым разнастайным нацыянальным складам насельніцтва, дзе, апрача беларусаў, асобнымі калоніямі жылі ў вялікай колькасці яўрэі, палякі, татары, цыганы. Асаблівасцю мястэчак былі разнастайныя лаўкі, магазіны, школы, ешыботы, буйныя мястэчкі мелі пошту, медпункты. У мястэчках звычайна праводзіліся разнастайныя кірмашы. У розныя часы мястэчкамі былі такія сучасныя беларускія пасяленні, як Каралішчавічы, Дзісна, Жыровічы, Моталь, Барань, Вілейка, Паставы, Клецк. У 1938 г. у адпаведнасці з Указам прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР былыя мястэчкі былі скасаваны па той прычыне, што частка з іх у выніку хуткага росту ператварылася ў гарады з іх асноўнымі прыкметамі, меншая ж частка мястэчак у выніку заняпаду, наадварот, стала вёскамі. Як уласны назоўнік назва вёскі ***Мястэчка*** ўжываецца ў Езярышчанскім пасялковым Савеце на Віцебшчыне.

З XVI ст. на Беларусі вядомы як асобны тып пасялення ***фальваркі*** (ад нямецкага Vorwerk – хутар, невялікае паселішча, маёнтак, панскі двор). Першапачаткова тэрмін ***фальварак*** абазначаў асобную феадальную гаспадарку, якая вырошчвала хлеб для патрэб феадала. Характэрнай асаблівасцю тыповага фальварка была наяўнасць вялікай колькасці будынкаў феадала: сядзібнага дома, з калонамі або ганкам, абнесенага дубовым тынам і брамай, з комплексам самых разнастайных жылых памяшканняў, часам двухпавярховых, з надворнымі галерэямі і інш. Словы-тапонімы ***фальварак*** або яго варыянты як уласныя назвы вядомы цяпер у розных частках Беларусі. ***Фальварак*** – вёскі ў Докшыцкім, Краснапольскім, Любанскім, Салігорскім раёнах.

Засценак – невялікае, тыповае для Беларусі пасяленне ў мінулыя часы. Спачатку ў XVI ст. засценкамі называлі ворныя і сенакосныя землі, якія апынуліся па-за межамі, за сцяной сялянскіх надзелаў пасля “Устава на валокі” 1557 г. Пазней ***засценкамі*** сталі называць невялікія (некалькі

двароў) пасяленні, у якіх, арандуючы такія землі, жыла засцянковая шляхта. У якасці ўласнай тапанімічнай назвы слова ***Засценак*** ужываецца для абазначэння вёсак у Докшыцкім, Сенненскім, Ушацкім, Лагойскім, Валожынскім раёнах.

З канца XIX стагоддзя на Беларусі як асобны тып пасяленняў былі вядомы ***хутары***. Хутар на Беларусі – невялікае, часцей аднадворнае пасяленне з зямельным надзелам (участкам) і сядзібай уладальніка. Утворана гэта найменне ад слоў ***кут***, ***кутар***, што літаральна – мясцовасць, звычайна глухая, далёкая. Зараз слова ***Хутар*** як уласная назва паселішча вясковага тыпу ўжываецца ў Быхаўскім, Мсціслаўскім, Гомельскім, Петрыкаўскім, Бярэзінскім і іншых раёнах [81, с. 167–175].

Прафесар Васіль Васільевіч Шур піша пра зніклыя беларускія паселішчы і іх назвы: “Толькі ў апошнія гады вайны нямецка-фашысцкімі захопнікамі было знішчана 9200 беларускіх вёсак і сёл, 209 гарадоў, гарадскіх пасёлкаў, мястэчак, з іх 186 пасяленняў напаткаў лёс Хатыні і Арадура: яны не адрадзіліся пасля вайны. Вынішчаны былі цэлыя вобласці.

Другая прычына змяншэння колькасці населеных пунктаў, іх назваў – далучэнне малых населеных пунктаў да гарадоў ці гарадскіх пасёлкаў, аб’яднанне вёсак, ссяленне хутароў, што абумоўлена развіццём прамысловасці, калектывізацыяй у 30–50-я гг.

Толькі за пасляваенныя гады зніклі, зліліся з гарадамі сотні вёсак Беларусі. У лепшым выпадку назва вёскі станавілася назвай вуліцы горада, а найчасцей атрымлівалася так, што і сама вёска, і яе назва знікалі назаўсёды. Так, да Віцебска адышлі вёскі ***Журжава***, ***Мішкава***, ***Ціраспoль***, ***Віцьба***, ***Давыдаўка***, ***Сакалоўка***, ***Себяхі***; да Мінска – ***Сляпянка***, ***Старажоўка***, ***Пярэспа***, ***Козырава***, ***Курасоўшчына*** і інш.

І, нарэшце, яшчэ адна прычына знікнення беларускіх паселішчаў і іх назваў. У 1986 годзе адбылася Чарнобыльская катастрофа, шматпакутная Беларусь у каторы раз зноў апынулася ў самым цэнтры небывалай бяды. Пісьменнік Барыс Сачанка, родам з Хойніцкага раёна, са смуткам і болем у сэрцы, разважаючы пра трагедыю свайго краю, нагадваў: «***Ламачы***, ***Падкаменне***, ***Дуброўка***, ***Новае Зарэчча***, ***Сяброўічы***, ***Ліпа***, ***Вязок***, ***Гута***, ***Пацёсы***, ***Сівінка***, ***Ляскі***, ***Асінаўка***, ***Струмень***, ***Пасека***, ***Мікулічы***, ***Заціша***, ***Курган***, ***Селішча***… Якія прыгожыя назвы беларускіх вёсак! Усіх іх ды і сотні іншых у бліжэйшыя гады не будзе… Перастануць існаваць і ***Брагін***, які ўпершыню ўспамінаецца ў летапісе ў 1147 годзе і дзе ў 1601 г. з’явіўся і аб’явіў сябе Дзмітры Самазванец, і ***Ветка*** – адно з самых вялікіх пасяленняў стараверaў у Беларусі, і ***Чачэрск*** – горад з такім багатым мінулым, то яго хапіла б для славы некалькіх гарадоў»” [81, с. 175–180].

Берасцейскі пісьменнік, публіцыст, краязнаўца Анатоль Бензярук у серыі артыкулаў, апублікаваных у газеце “Сельская праўда”, даследаваў гісторыю зніклых населеных пунктаў Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці. А. Бензярук адзначае: “За апошнія сто гадоў на Жабінкаўшчыне знікла больш за сотню населеных пунктаў. Многія жыхары нават не ведаюць, што такія калісь існавалі. Калі раней у межах сучаснага раёна налічвалася 212 паселішчаў, дык цяпер усяго 95. Зараз даведацца пра зніклыя вёскі і хутары, маёнткі і фальваркі, пасёлкі і ваколіцы, сялібы і асады можна хіба што ад састарэлых сведкаў ці з гістарычных дакументаў ды карт, хоць колішнія ***Мышчыцы*** вось ужо амаль паўстагоддзя ў межах Жабінкі, аднак для мясцовых назва працягвае існаваць у імені храма. Некаторыя былыя вёскі згадваюцца дзякуючы памяткам мінулых часоў. Прыкладам, мемарыяльны комплекс «***Драмлёва***» – памяць пра сяло, цалкам знішчанае карнікамі. Крупчыцкая капліца, са свайго боку, вяртае нас у далёкі 1794 год, калі паблізу сяла ***Крупчыцы*** адбылася знакамітая Крупчыцкая бітва. На аўтобусным прыпынку пабачылі назву «***Абрамавічы***»? Вы ўсё яшчэ ў Жабінцы, прынамсі, у той яе частцы, што звалася некалі ***Абрамавічамі***. Альбо біялагічны заказнік «***Непакойчыцы***». Ён «закансерваваў» назву аднайменнага маёнтка. У 2017 годзе, калі вёскі ***Здзітава***, ***Курпічы***, ***Сцяброва*** і ***Шчэглікі*** ўвайшлі ў склад Жабінкі, згадкі пра іх працягваюць жыць у назвах ужо гарадскіх вуліц – ***Здзітаўскай***, ***Курпіцкай***, ***Сцяброўскай***, ***Шчэглікаўскай***” [9, с. 5].

Прафесар В. Шур акрэслівае гісторыю тапонімаў-мігрантаў на карце свету: “Назвамі-мігрантамі могуць быць не толькі **айконімы** – найменні гарадоў, вёсак, а нават і **этнонімы**, г. зн. словы, якімі называюць цэлыя этнічныя родаплемянныя аб’яднанні людзей. Так, геаграфічнай, гістарычнай, лінгвістычнай навукамі даказана, што словам ***Літва*** ў XII–XIII стст. абазначалі тэрыторыю сучаснай цэнтральнай і паўночна-заходняй часткі Беларусі, а яе жыхароў, карэннае славянскае насельніцтва, называлі ***ліцвінамі***. Сталіцай тагачаснай ***Літвы*** быў Наваградак. Затым гэтая назва па раду абставін пашырылася на тэрыторыю аб’яднанай Жэмайціі і Аўкштайціі – этнічных абласцей сучаснай ***Літвы***. Яшчэ ў XVIII – XIX стст. этнонім Літва шырока ўжываўся ў дачыненні да заходняй і цэнтральнай Беларусі. Як адзначалі С. Паўлоўскі і Г. Сагановіч, яшчэ ў недалёкім мінулым землі заходняй Беларусі мелі сваю выразную назву – ***Літва***.

У наш час даследчыкамі важкімі аргументамі пераканальна даказана, што этнонім «***літвіны***» (***ліцьвіны***) з’яўляўся ранейшай гістарычнай назвай беларусаў, асабліва ўжывальнай назва ***ліцьвіны*** была пасля далучэння нашага краю да Расійскай імперыі (канец XVIII ст.). І ў наш час жыхары паўночна-ўсходняй часткі Валынскай вобласці Украіны называюць

літвінамі насельніцтва, што жыве паўночней, г. зн. тых беларусаў, якія гавораць на палескіх дыялектах. А тыя, у сваю чаргу, лічаць ***літвінамі*** насельніцтва басейна верхняй Ясельды, паўночнай часткі Брэсцкай вобласці і раёна Гродна – Баранавічы. Нават цяпер у некаторых рэгіёнах Расіі, Украіны і Польшчы ***літвінамі*** (***ліцвінамі***) называюць спрадвечных жыхароў сучаснай беларускай рэспублікі” [81, с. 216–221].

Валянціна Пятроўна Лемцюгова ў кнізе “Тапонімы распавядаюць” сістэматызуе меркаванні гісторыкаў, этнографаў, лінгвістаў адосна тапоніма-вандроўніка ***Белая Русь***: “Белы колер суправаджае нас (беларусаў) праз усё жыццё. Нават край наш здавён завецца ***Белай Руссю***. Усе аўтары і даследчыкі звяртаюць увагу галоўным чынам на тое, калі і адкуль завітала ў наш край назва ***Белая Русь*** і які сэнс у ёй хаваецца. На аснове паказанняў друкаваных і рукапісных крыніц у большасці з іх склалася ўражанне, што гэтая назва, перш чым прыстаць да нашага краю, доўга вандравала па ўсходнеславянскіх прасторах. У розныя часы ***Белай Руссю*** іменаваліся такія землі, як Пскоўска-Наўгародская, Смаленская, Полацка-Віцебская, Ноўгарад-Северская, Кіеўская, Галіцка-Валынская, Масковія (Маскоўская Русь). І толькі з XV–XVII стст. яна пачынае больш канкрэтна прывязвацца да ўсходняй і паўночна-ўсходняй Беларусі (раёны беларускага Падзвіння і Падняпроўя).

У афіцыйных крыніцах за першае ўпамінанне пра ***Белую Русь*** дастасоўна да беларускіх земляў прыняты канец XIV ст., калі польскі летапісец Ян з Чарнкова, апавядаючы пра канфлікт паміж Кейстутам і яго пляменнікам Ягайлам, пад 1382 годам назваў Полацк крэпасцю ***Белай Русі***. Аднак не ўсе даследчыкі прызналі праўдзівай гэтую дату. Паводле Ул. Ламанскага, ***Белая Русь*** у дачыненні да беларускіх земляў вядомая значна раней – у канцы або ў сярэдзіне XIII ст., яна даўнейшая за час праўлення Альгерда і нават Гедыміна. Пад гэтым іменем разумелася калі не ўся сучасная Беларусь, то пэўная яе частка. Дз. Анучын быў перакананы, што ***Белая Русь*** прыйшла на Літву не з усходу, а з захаду, і ўпершыню яе засведчылі германскія хронікі ў XIII ст. У замежнай беларусістыцы склалася агульнае ўяўленне, што ***Белая Русь*** знаходзіцца недзе на ўсход і поўнач ад тэрыторыі лівонскіх мечаносцаў і што самая ранняя яе лакалізацыя звязана з крывіцкімі (беларускімі) землямі паўночнай Беларусі.

Пасля таго як амерыканскі вучоны Марвін Колкер апублікаваў у 1979 г. трактат «Апісанне земляў» («Descriptiones terrarum») у часопісе «Specutum» («Люстра»), стала відавочным, што на захадзе пра ***Белую Русь*** (***Alba Ruscia***) ведалі ўжо ў сярэдзіне XIII ст. (паміж 1255–1260 гг.) і што размяшчалася яна недзе ў раёне Прыбалтыкі. Беларускі даследчык старажытнасцяў В. Чамярыцкі лічыць, што ***Белай Руссю*** аўтар трактата называе суседнюю з Прыбалтыкай Заходнюю Русь (сучасная ўсходняя

або цэнтральная Беларусь). Цяпер мы ведаем, што ***Белай Руссю*** наша Бацькаўшчына называлася з сярэдзіны XIII ст. У папулярызацыі назвы асноўную ролю адыгралі не самі беларусы, а іх заходнія суседзі, перш за ўсё палякі і немцы.

А што магла азначаць назва ***Белая Русь*** у той ранні перыяд? Адказ на гэтае пытанне даўно шукаюць многія лінгвісты і гісторыкі. Яшчэ ў XVII ст. Сымон Старавольскі спрабаваў звязаць значэнне эпітэта ***Белая*** з колерам снежнага покрыву. Пасля з'явілася шмат іншых версій. Самая папулярная з іх (калярова-этнаграфічная) тлумачыць сэнс назвы ***Белая Русь*** тым, што большасць жыхароў нашага краю ў мінулым былі бландзінамі і насілі світкі, кажухі, шапкі-магеркі і іншую апратку светлых колераў. На думку А. А. Патабні, эпітэт ***Белая*** мае палітычны сэнс '*вольная, незалежная*', нешта такое, што і ў выразах ***белае*** месца '*незанятае месца*', ***белы*** цар '*свабодны, незалежны цар*'. Міхаіл Драгаманаў, Мітрафан Доўнар-Запольскі, Мацей Любаўскі і іншыя выказваліся больш канкрэтна: пад ***Белай Руссю*** яны разумелі зямлю, няскораную татарамі, у процілегласць Русі Маскоўскай, якая стагоддзямі пакутавала ад татара-мангольскага іга.

Група даследчыкаў, сярод якіх Алег Трубачоў, Рута Агеева, Аляксандр Рогалеў, Вітальд Маньчак, Ігар Грэкаў, трымаецца погляду, што семантыка эпітэта ***Белая*** склалася пад уплывам сістэмы цюркскай каляровай сімволікі, засвоенай славянамі ад усходніх народаў (найверагодней, праз пасярэдніцтва татараў). Па гэтай сістэме '***белы***' = '*заходні*'.

Белы колер – сімвал найвышэйшай боскай і княскай улады. Назвы кожнай тэрытарыяльна-палітычнай вобласці з белай сімволікай узнікалі самастойна ва ўмовах змагання за гегемонію, за першынства, перавагу ў сіле і папулярнасці. Імя ***Белая Русь*** было для іх прэстыжным тытулам і своеасаблівай рэлігійнай і палітычнай візітоўкай. Адным з асноўных прэтэндэнтаў на такое імя было старажытнае Полацкае княства, якое ў 1044–1101 гг. дасягнула найвышэйшага росквіту, а ў яго сталіцы Полацку, па сведчанні летапісца (907 г.), "седяху велиции князи...". Няма сумнення, што ***Белая Русь*** як назва першай крывіцкай дзяржавы з'явілася на гістарычнай арэне значна раней, чым сведчаць дайшоўшыя да нас хронікі. Яна і дала імя нашай Бацькаўшчыне – імя старадаўняе, светлае і святое" [36, с. 15–18].

Даследчыкі-анаматолагі адзначаюць, што вывучэнне тапонімаў распачалося ў старажытнасці. "Усходнеславянскія тапонімы ўтрымліваюцца ў творах візантыйскага імператара Канстанціна Багранароднага (949–952): ***Ноўгарад***, ***Смаленск***, ***Куява*** (г. зн. Кіеў), у старажытных рускіх летапісах, на старых картах. Ужо аўтары летапісаў у асобных выпадках спрабуюць даць гістарычнае абгрунтаванне тапонімам, звязваючы іх с той ці іншай асобай або асаблівасцямі мясцовасці (параўн. імёны легендарных

заснавальнікаў Кіева: ***Кій***, ***Шчэк***, ***Харыў*** – і тапонімы ***Кіеў***, а таксама ***Шчэкавіца***, ***Харывіца***). У тапаніміцы старт адбыўся бліскучым артыкулам А. Х. Востокова «Задача аматарам этымалогіі» (1812 г.). Не змяшчаючы ні аднаго з тэрмінаў, прынятых у сучаснай тапанімічнай навуцы, артыкул уключаў у сябе, як жолуд, усё неабходнае, каб даць жыццё магутнаму дрэву с багатай тапанімічнай кронай. І фактычны матэрыял, і яго сістэматызацыя па «канчатках», і лінгвістычная інтэрпрэтацыя «падобных» канчаткаў, і прапанова аб сувязі іх з «якім-небудзь агульным значэннем», і перакананне ў невыпадковасці «гэтак часта сустрэтых» фактаў – усё гэта не толькі не страціла сваёй навуковай каштоўнасці, але складае аснову сучаснай тапанімікі” [12, с. 164].

Вучоныя зацікавіліся беларускай тапаніміяй яшчэ ў першай палове XIX ст. (З. Даленга-Хадакоўскі, А. К. Кіркор, І. В. Турчыновіч, П. М. Шпілеўскі).

Найбольшая актывізацыя вывучэння тапаніміі прыпадае на 60-я гг. XX ст. Тапанімія даследуецца па рэгіёнах. Актыўна вывучалася айканімія Мінскай (В. П. Лемцюгова), Віцебскай (Л. М. Грыгор’ева), Гомельскай (А. В. Багамольнікава, Э. К. Бірыла), Брэсцкай (В. М. Емельяновіч, Л. В. Леванцэвіч) абласцей, гідранімія басейна Дняпра і Заходняй Дзвіны (У. М. Тапароў, А. М. Трубачоў, А. М. Катонава), мікратапанімія некаторых раёнаў Мінскай (Я. М. Адамовіч , Г. М. Прышчэпчык), Гомельскай (Г. А. Іванова), Брэсцкай (В. М. Емельяновіч, Л. В. Леванцэвіч) абласцей.

Актыўна вывучаецца тапанімія Брэстчыны. У пасляваенны перыяд у сваіх працах В. А. Жучкевіч, разглядаючы пытанні тапаніміі Беларусі, прыводзіць матэрыял з Брэстчыны. Значнае месца ў тапаніміі Брэстчыны займала праца Я. Н. Рапановіча “Слоўнік назваў населеных пунктаў Брэсцкай вобласці”. Слоўнік ахоплівае назвы ўсіх населеных пунктаў Брэстчыны, у тым ліку ўласныя назвы вёсак, што зніклі па прычыне далучэння да гарадоў і пасёлкаў, перайменавання, рассялення, знішчэння ў гады вайны. У 2010 г. выйшла новая праца такога тыпу – “Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Брэсцкая вобласць”. Сярод аўтараў – выкладчыкі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта (В. М. Емельяновіч, З. М. Заіка, Н. Р. Якубук). У выданні айконімы падаюцца на беларускай мове кірыліцай і лацінкай, а таксама на рускай мове. Беларускамоўная частка даведніка ўключае нарматыўныя найменні з націскамі, граматычнымі паметамі і парадыгмамі скланення.

Вывучэнню анамастыкі Брэстчыны прысвечаны кандыдацкія дысертацыі. В. М. Емельяновіч у працы “Микротопонимия северо-западной части Брестской области” даследуе мікратапонімы Брэсцкага рэгіёна. Дысертацыя Н. Р. Якубук “Айканімія і гідранімія Пабужжа. Праблемы ўзае-

мадзеяння” ўключае тэарэтычнае даследаванне айконімаў і гідронімаў Брэстчыны. Айканімія і мікратапанімія беларускай часткі Заходняга Палесся паслужыла аб’ектам даследавання Т. М. Аліферчык у дысертацыйнай рабоце “Тапанімія Заходняга Палесся ў этналінгвістычным аспекце”.

У публікацыях В. М. Емельяновіч, Л. В. Леванцэвіч, Н. Р. Якубук, С. С. Клундук, В. М. Андрасюк даецца лексіка-семантычная характарыстыка айконімаўтваральных асноў, лексічных рэсурсаў, якія паслужылі матывавальнай базай для фарміравання ўласных назваў паселішчаў Брэстчыны [34, с. 130].

Тэма 8. ВЫТОКІ ГЕАГРАФІЧНЫХ НАЗВАЎ БЕЛАРУСІ

Геаграфічныя назвы Беларусі ўтрымліваюць нацыянальна-культурную інфармацыю. Унутраная форма тапонімаў указвае на межы рассялення вядомых у гісторыі племянных саюзаў: вв. *Крывічы*, *Крывіца* (крывічы), *Русілы*, *Русінавічы*, *Русіно* (русы), *Нароўшчына* (неўры), *Ляхі*, *Ляхавічы*, *Ляхаўцы*, *Ляхчыцы*, *Ляхва* (ляхі), *Жамайдзякі* (жэмойты), *Ятвезь* (яцвягі), *Лотвічы*, *Літва*, *Літвіны*, *Літоўка*, *Літвінкі*, *Літоўск*, *Ліцвінкі* (лотвы, латгалы, літва), *Пруска*, *Пруска Велівейская*, *Пруска Валгінова* (прусы).

На значнай частцы тэрыторыі Брэстчыны можна адшукаць найменні, якія захавалі ў структуры элементы балцкага паходжання. Тлумачыцца гэта тымі абставінамі, што да VIII ст. балцкія плямёны займалі тэрыторыю да Прыпяці. Наяўнасць суфіксаў **-оса**, **-іта**, **-ета**,**-ата**, **-уса**, **-еса**, **-ея** гаворыць пра прысутнасць мовы балтаў у сумесным суіснаванні славян і балтаў. Гэта рэчкі: *Вілія*, *Лоша*, *Нароўля*, *Піна*, *Уша* і інш. На Брэстчыне доўгі час пражывалі яцвягі, пра што сведчаць назвы населеных пунктаў, а таксама назвы рэк: *Груда*, *Ясельда*, *Зэльва*, *Зальвянка*, *Сакольда* і інш.

На Беларусі, асабліва на Палессі, высокую частотнасць маюць назвы паселішчаў на **-ічы**, **-ычы**: *Сукачы*, *Вельямовічы*, *Краглевічы*, *Манькавічы*, *Ляхавічы*. Фармант **-ічы** паказвае на прыналежнасць роду, а не на абазначэнне месца. Беларускія назвы на **-ічы** ўтвораны ад старажытных дахрысціянскіх і кананічных імён: *Васюковічы*, *Асобавічы*, *Калауравічы*, *Хомічы*. Кананічных імёнаў у аснове тапонімаў у тры разы меней, чым аналагічных найменняў, утвораных ад дахрысціянскіх імёнаў [33, с. 51].

Як адзначае Б. Рыбакоў, захаванне язычніцкіх тапонімаў сведчыць аб неўміручасці іх першапачатковых функцый і аб паступовым зліцці архаічнага славянскага пачатку з хрысціянскім. Характар многіх язычніцкіх святаў быў паўсямесным, звязаным з усёю прыродай вакол вёскі (лес, гай, дуброва, дуб, крыніца, рака, балота, узгорак, гара), таму і зараз амаль ля

кожнай вёскі можна знайсці “святую дубраву”, “красную горку”, “лысую гару”, “дзявочую гару”, “бабін ручэй” і інш.

Сярод сабраных Л. В. Леванцэвіч мікратапонімаў можна вылучыць некалькі тэматычных груп, звязаных з язычніцкімі вераваннямі:

– *Бабін луг* (Пясчанка, Іван.), *Бабін грудок* (Сяхновічы, Жаб.), *Бабіцкае* (поле) (Доўбізна, Кам.), *Бабіна гара* (Каланая, Свісл.), *Бабіна Магіла* (Багданава, Лун.), *Бабы* (хутар) (Кажан-Гарадок, Лун.).

– *Лысая гара* (поле) (Орлавічы, Драг.), *Лысая гара* (Вялічкавічы, Саліг.; Бабр.; Белін, Драг.; Струга, Стол.; Доўбізна, Кам.; Панасавічы, Бяроз.; Тамашоўка, Бр.; Гезгалы, Дзятл.), *Лысуха* (лес) (Доўбізна, Кам.), *Лысая паляна* (Азёры, Гродз.).

– *Валасач* (балота) (Ласінцы, Ганц.).

– *Ведзьмін ручэй* (Лойкава, Кам.), *Чорная гара* (Воса, Кобр.), *Чорна* (поле) (Буса, Іван.), *Чорнае* (поле) (Каралін, Іван.).

– *Змяіная гара* (Вялічкавічы, Саліг.), *Воўчы луг* (Хацінава, Кам.), *Ваўкаўня* (гара) (Палонка, Бар.), *Зайцава гара* (Осаўцы, Драг.), *Зайцаў бор* (Воса, Кобр.), *Зайкаўшчына* (поле) (Ласасін, Пруж.).

“Яшчэ ў 70-я гады XX ст. у многіх мясцовасцях на Купалле рытуальныя вогнішчы запальвалі толькі на самай высокай (святой, свяшчэннай) гары ў акрузе. Многія з гэтых гор называюцца *Дзявочая* або *Бабіна гара*. Яны захавалі старажытны славянскі культ жаночага боства. У нашыя дні ўсе мясціны з назвай ***Бабіна*** звязваюць або са смерцю жанчыны-бабы ў гэтым месцы, або з бабкамі-павітухамі (народная лекарка-бабуля з роду нявесты), якія некалі сяліліся за вёскамі.

Сярод сабранага матэрыялу часта сустракаецца як назва гары прыметнік *лысая*. Агульнавядомае паданне пра кіеўскіх ведзьмаў, якія збіраліся на свае «шабашы» на Лысай гары пад Кіевам. У язычніцкі перыяд святкаванне багіні Лады ды і іншых язычніцкіх бостваў адбывалася на Лысых горах. Б. Рыбакоў адзначае, што паводле падання на Лысай гары (паміж Кельцамі і Сандамірам у Польшчы) знаходзіліся некалі ідалы трох бостваў – ***Лады***, ***Лелі*** і ***Ежы***. У сваю чаргу, археалагічныя раскопкі ўстанавілі, што гара была абнесена каменным валам. Магчыма, «лысымі» гэтыя горы называліся таму, што іх верхняя частка расчышчалася пад «требище» (месца ахвяраў боству). І да гэтага часу на такіх горах «нічога не расце», бо «гара зачаравана»” [32, с. 62–63].

Вельмі шматлікімі і разнастайнымі паводле семантыкі і ўтварэння назвы паселішчаў (гарадоў, пасёлкаў, вёсак і хутароў) – **айконімы**. Вучоныя-тапанімісты звычайна вылучаюць тры лексіка-семантычныя групы **айконімаў**: 1) айконімы, утвораныя ад агульных назоўнікаў, або апелятыўнага паходжання; 2) ад імёнаў і прозвішчаў людзей, або антрапанімічнага паходжання; 3) ад назваў рэк і азёраў,

або гідранімічнага паходжання. Асноўны спосаб утварэння айконімаў – суфіксацыя. Айконімы толькі называюць паселішча, але і характарызуюць яго: назвы ***Зарэчча***, ***Залессе***, ***Залужжа***, ***Паддуб'е*** паказваюць на размяшчэнне вёскі або вёскі за ракой, за лесам, за лугам і г. д. ***Старое Сяло***, ***Старасельцы*** – назвы вёсак, пабудаваных пазней за суседнія, а ***Наваселкі***, ***Новае Сяло*** – назвы вёсак, якія ўзніклі параўнальна нядаўна.

Назвы ***Масты***, ***Брады*** сведчаць аб шляхах зносін, ***Дзягцярня***, ***Цагельня***, ***Гута***, ***Тартак*** – аб тых промыслах і прадпрыемствах, якія былі ў гэтай мясцовасці.

Назвы тыпу ***Гарадзішча***, ***Гарадзец***, ***Гарадзечна*** паказваюць на паселішчы і гарады дагістарычнага часу.

Шмат якія вёскі маюць назву ***Баяры***, якая паходзіць ад наймення невялікай сацыяльнай групы дробных землеўладальнікаў-баяр, служылых людзей, вядомых на Беларусі з XV да XIX ст. Спачатку баяры былі старэйшымі ў дружынах князя, пазней неслі службу па ахове граніц, перавозу пошты.

У Брэсцкай вобласці многа вёсак з назвамі ***Воля***, ***Волька***, ***Вулька***, ***Добрая Воля***, ***Чырвоная Воля***, ***Вулька Лаўская***. Паселішчы з такімі назвамі ўзнікалі калісьці на новых, раней пустых, цяжкіх для апрацоўкі землях. Іх жыхары за тое, што распрацоўвалі новыя землі, былі вызваленыя ад падаткаў, былі вольнымі. ***Вулька*** – тое ж, што і ***Воля***, Волька ("у" на месцы "о" развілася пад уплывам польскай мовы).

Назвы населеных пунктаў ***Андрыянаўка***, ***Антонава***, ***Баранавічы***, ***Васілевічы***, ***Дзмітравічы***, ***Дзямянчыцы***, ***Мікалаеўшчына***, ***Паўлінава*** адантрапанімічнага паходжання. У некаторых назвах адлюстраваны ўстарэлыя імёны людзей, якія ў наш час не ўжываюцца: ***Ждановічы*** – ад імя ***Ждан*** "жаданы сын", ***Маўчаны*** – ад ***Маўчан*** "спакойнае, некрыклівае дзіця". ***Олтуш*** (Малар.) – ад імя ***Олтуш***, якое сустракаецца ў актах XVI ст., ***Шарашова*** – ад цюркскага імя ***Шэраш***.

Назвы паселішчаў з суфіксам -ск, -цк адгідранімічнага паходжання: ***Пінск***, ***Віцебск***, ***Чачэрск***, на *-ічы*, *-іна*, *-ына*, *-ава*, *-ява*, *-ева* – ад імёнаў і прозвішчаў людзей (***Аўсямірава***, ***Даманава***, ***Мікашэвічы***, ***Міхалін***).

У аснове некаторых айконімаў ляжыць іншамоўная лексіка. Гэта балтызмы на *-ішкі*, *-ышкі* (***Абалішкі***, ***Венгелішкі***), *-эйкі*, *-ейкі* (***Бянейкі***, ***Мадэйкі)***, паланізмы ***Кляштор*** (хутар у Раснянскім сельсавеце Кам. р-на), ***Плянта*** (вёскі ў Брэсцкім, Камянецкім, Кобрынскім раёнах) ад польскага *planta* 'план чаго-небудзь', ***Тартак***, ***Тартакі*** – польск. *тартак* 'лесапілка'.

Смуга – вёска ў Чарнаўчыцкім сельсавеце Брэсцкага раёна – ад польскага *smuga* 'вузкая прырэчная паласа зямлі, парослая травой

і кустоўем’. На Берасцейшчыне многа мікратапонімаў ***Смуга***. Звычайна гэта назвы забалочаных мясцін. Ёсць і невялікая рэчка ***Смуга*** (Камянецкі р-н).

У аснове некаторых назваў ляжаць устарэлыя словы. Так, назва вёскі ***Павіцце*** ў Кобрынскім раёне ўтворана ад старажытнага тэрміна *віць, павіцце* ‘топкае, непраходнае балота’. Назвы паселішчаў тыпу ***Ляда***, ***Лядзінка***, ***Ляды***, ***Лядавічы***, ***Лядзец*** утвораны ад устарэлага слова *ляда*, што азначае ‘поле на месцы выкарчаванага лесу’. Назва вёскі ***Буса*** (Іван. р-н) – ад слова *буса*, якое мела значэнне ‘доўбанае судна, лодка’. Тапонімы ***Чарцёж*** (хутар у Радчыцкім сельсавеце Столінскага раёна), ***Чарцяжы*** паходзяць ад старажытнага тэрміна *чарцёж*, звязанага з падсечна-агнявым земляробствам: перш, чым высякаць дрэвы, іх абчэрчвалі (здымалі кальцо з кары з ніжняй часткі дрэва). Калі дрэвы высякалі, іх спальвалі, а зямлю апрацоўвалі пад палі, якія ў такім выпадку называліся *чарцяжамі*. Тапонімы ***Язвіны***, ***Язвінкі*** паходзяць ад беларускага рэгіянальнага слова *язвіна* ‘балота, акно на балоце, якое не замярзае’.

Выклікае цяжкасці і этымалагізацыя назваў, якія дайшлі да нас у змененым выглядзе (хоць геаграфічныя назвы вельмі ўстойлівыя, некаторыя з іх мяняюцца пад уплывам змен у вымаўленні або ў выніку прыстасавання іншамоўнага слова да роднай мовы). “У старажытнасці іншы выгляд мелі назвы ***Брэст***, ***Гродна***, ***Мінск***, ***Навагрудак***, ***Слонім*** і інш. Так, Брэст упершыню ўпамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе і ў “Аповесці мінулых гадоў” пад 1019 г. як ***Берасце***. Назва паходзіць ад слова *бераст* (парода дрэў, нагадвае вяз). У мясцовых гаворках ***Брэст*** і цяпер называюць ***Бэрэсть*** (***Бэрэсць***). Існуе і іншае тлумачэнне, якое зараз аспрэчваецца: быццам назва Берасце ўтворана ад слова *бяроста (бярозавая кара)*. Бытуе легенда, якую ў XIX ст. запісаў беларускі этнограф П. Шпілеўскі: «Калісьці, вельмі даўно, адзін багаты купец вёз на калёсах тавар у Літву і загруз у багністым балоце. Ён зрабіў плаціну з бярозавых дрэў, загаціў балота, пакрыў гаць *бяростаю* і такім чынам праклаў бітую шляхавую дарогу. З удзячнасці за ўдалы пераход балота купец пабудаваў капішча і прынёс ахвяру свайму паганскаму богу Вялесу, а тое месца ў знак зробленай з бярозы плаціны назваў ***Берасценем***, ***Берасцем***, з чаго потым з’явіўся ***Брэст***». У XVII – пачатку XX ст. ***Брэст*** называўся ***Брэст-Літоўск*** (у адрозненне ад Брэста Куяўскага ў Польшчы), у 1921–1939 гг. – ***Брэст-над-Бугам***, з 1939 года – ***Брэст***”. Вядомы гісторык і археолаг А. Ф. Лысенка піша, што яшчэ напярэдадні Першай сусветнай вайны ў Сенаце Расійскай імперыі разглядалася хадайніцтва пра вяртанне гораду ўсходнеславянскай назвы – ***Берасць***. Назва абласнога цэнтра Гродна ўжывалася ў форме ***Гарадзень***, ***Гародня***, у аснове назвы – славянскае слова ***горад***” [22, с. 18–20].

Прафесар Васіль Шур адзначае: “Шырока вядомы ў народзе так званыя **наіўныя (народныя) этымалогіі** пра ўзнікненне асобных тапанімічных назваў, дзе тлумачэнне анамастычных назваў падаецца надзвычай спрошчана, прымітыўна і нярэдка супярэчліва.

Вядомы рускі лінгвіст-этымолаг Ю. Адкупшчыкоў звярнуў увагу, што народная этымалогія – гэта зусім не абавязкова этымалогія, што ўзнікла ў народзе, а такая, што абапіраецца не на ўсталяваныя навуковыя прынцыпы аналізу слова, а на выпадковыя супастаўленні, якія выклікаюцца простым сугучам слоў. Як правіла, народная этымалогія не прадугледжвае для аргументацыі прыкладаў і аналогіі з роднасных моў, дыялектныя факты, гістарычныя звесткі. Асяроддзе, дзе народныя этымалогіі ствараюцца, не карыстаецца распрацаванымі, апрабаванымі методыкамі аналізу слова (параўнальна-гістарычным, супастаўляльным, марфемным, фанетычным, семантычным і інш.), а найчасцей абмяжоўваецца выпадковым супадзеннем у гучанні вядомых у народзе слоў. Напрыклад, пра ўзнікненне назвы вёскі ***Стадолічы*** Лельчыцкага раёна ёсць некалькі народных этымалогій. У адной сцвярджаецца, што вёска спачатку мела назву ***Стодымічы***: паселішча належала тураўскаму князю, які накіраваў у вёску сваю дружыну, каб збіраць падаткі з кожнага двара, з кожнага дыма. Калі зімовай раніцай людзі князя пад’ехалі да паселішча, то над курнымі хатамі вёскі ўгору ўздымалася роўна сто дымоў, адсюль і першая назва – ***Стодымічы***. У пазнейшы час першая назва трансфармавалася ў ***Стадолічы***. Змена ***Стодымічы*** ў ***Стадолічы*** быццам бы адбылася таму, што з цягам часу падаткі ў двор князя пачалі збіраць не ад колькасці дымоў над вёскай, а ад долей (збожжа, мёду, мяса, пушніны і інш.), якія меў (атрымліваў) са сваіх уладанняў кожны гаспадар. Зборшчык падаткаў у гэтым паселішчы княжацкаму двару ад сялян сто долей лічыў. Адсюль нібыта ***Стадолічы***. Ёсць яшчэ меркаванне, што вёска ўзнікла на месцы былых ***стадол*** – вялікіх хлявоў, што размяшчаліся паблізу торнай дарогі з Пінска і Турава на Кіеў. Апошняя легенда, відаць, блізкая да сапраўднасці, бо на Беларусі ёсць некалькі вёсак у Глыбоцкім, Бялыніцкім, Полацкім, Шчучынскім, Ашмянскім раёнах, назвы якіх (***Стадола***, ***Стадолішча***, ***Стадольніца***, ***Стадольнікі***, ***Стадаляны***) утвораны, на думку вучоных, ад слова ***стадола***, якое цяпер архаізавалася, а ў старажытнасці мела некалькі значэнняў: пастаялы двор, канюшня, навес, астрог і інш.” [81, с. 131–132].

Валянціна Пятроўна Лемцюгова прыводзіць прыклады народнай і навуковай этымалогіі назвы ***Пружаны***: “Пра паходжанне назвы ***Пружаны*** створаны тры ***легенды***. Паводле адной з іх, паселішча названа ў гонар княжацкай дачкі ***Пружаны***. Паводле другой, назва спачатку мела форму ***Прасяна***, паколькі ў мінулым тут нібыта добра радзіла ***проса***.

Згодна з трэцяй легендай, ***Пружаны*** – вынік пераагучання назвы ***Прусаны*** (або ***Прусяны***), таму што заснавалі паселішча прусакі, якія, уцякаючы ад крыжакоў, аселі ў лясістых ваколіцах вёскі Дабучына. Старабеларускія пісьмовыя крыніцы не засведчылі ні імя ***Пружана***, ні назваў ***Прусяны***, ***Прусаны***, ***Прусяна***. Але ёсць звесткі, што ў XVII–XVIII стст. назва мела форму сцягнутага прыметніка – ***Пружана***. Значыць, можна меркаваць, што ў аснове назвы ляжыць нейкая прыкмета. ***Пружанай*** магла называцца рака, на якой зрабілі запруду, гаць або грэблю. Такую версію ў пэўнай ступені падтрымлівае наяўнасць на тэрыторыі Беларусі рачной назвы ***Пружаніца*** (басейн Нёмана), у якой празрыста выступае прыметнікавая аснова (параўн.: ***Прудная***, ***Прудніца*** ў басейнах Нёмана, Дняпра, Бярэзіны). Уяўляецца, што назва ***Пружана*** першапачаткова ўзнікла як назва ракі, а потым была перанесена на паселішча і перааформлена па множналікавай мадэлі” [36, с. 187].

Л. Лыч прыводзіць народную этымалогію назвы аднаго з абласных цэнтраў Беларусі: “Не задаволіўся народ і навуковым вытлумачэннем этымалогіі тапоніма ***Магілёў***. З пункту гледжання навукі тут усё вельмі проста: у аснове яго дахрысціянскае асабовае імя ***Магіла***, да якога дадаецца суфікс -ёў. Такіх назваў населеных пунктаў патранімічнага паходжання ва ўсходнеславянскіх народаў нямала. Але ў беларускім народным паданні існуе наконт гэтага даволі цікавае меркаванне, якое ў свой час захапіла і фантазію Я. Купалы. Паводле існуючай легенды, ***Магілёў*** быў закладзены ля магілы бясстрашнага змагара з сацыяльнай несправядлівасцю Машэкі. Вось гэты фальклорны сюжэт і апрацаваў народны пясняр Я. Купала для сваёй паэмы «Магіла льва», а Е. Міровіч і В. Вольскі паклалі яго ў аснову п’есы «Машэка»” [41, с. 15].

Тэма 9. ТАПАНІМІЧНЫЯ НАЗВЫ ЯК АДЛЮСТРАВАННЕ ЖЫЦЦЯ І ПОБЫТУ НАРОДА

Тапонімы з’яўляюцца культураноснымі знакамі, што захоўваюць каштоўную інфармацыю аб гісторыі славян і іншых народаў, якія насялялі і насяляюць Беларусь, аб характары гаспадарчай дзейнасці, асваенні прыроды.

Прагматычная зона семантыкі тапонімаў захоўвае наступныя культурныя ўяўленні, якія складаюць аснову менталітэту славянскіх народаў: культ раслін і жывёл, напр.: “Волкавічы – былы хутар у Ленінскім сельсавеце Жабінкаўскага раёна. Магчыма, назва кельтско-балцкага паходжання, пар. літ. **vilkas** – воўк. На балтыйскі корань паказвае тэрытарыяльная блізкасць назваў урочышчаў ***Воўчы Брод*** (Viliskal Brasta), ***Волкава***, ***Воўчын*** і інш. Мяркуецца, што ў гэтых назвах адлюстравана імя

аднаго з кельцкіх плямёнаў вялетаў (кельтск. Veltos), якія жылі на тэрыторыі Беларусі і прызнавалі культ ваўка” [46, с. 45]; “Культ змяі быў вельмі развіты як у прыбалтаў, так і ў беларусаў. Носьбітамі культу змеяў выступалі этнічныя групы, продкамі якіх былі індаеўрапейцы. Магчыма, яны адносіліся да кельта-балцкай моўнай групы. Звязаныя з культам змяі-кобры, яны пакінулі свае сляды не толькі ў археалагічных рэчавых крыніцах, але і ў тыповых тапонімах-этнонімах: ад асабовага імя ***Кобрунус*** да ракі ***Кобрынка*** (басейн ракі Заходні Буг), вёсак ***Кобравічы***, ***Кобраўцы***, г. ***Кобрын***. Сутыкненне і моўнае змяшэнне розных народаў, пераклад старых назваў на мову новага народа абумовілі з’яўленне такіх назваў, як с. ***Змееўцы*** (Дзятлаўскі раён), с. Змееўка (Жлобінскі раён). І нават рака ***Гарынь***, прыток Прыпяці, мае статус змяі падзямельнай (гарынскай), якая нясе жывую ваду” [46, с. 105]. Шэраг тапонімаў утвораны ад назваў плямёнаў: “***Пруска*** – вёска ў Якаўчыцкім сельсавеце Жабінкаўскага раёна. Назва этнанімічнага паходжання ад заходнебалтыйскага народа – прусаў або немцаў, якія гвалтоўна германізавалі прусаў і сталі носьбітамі гэтага этноніма” [46, с. 68]; “Калісьці на гэтай зямлі пасяліліся **велеты**, якіх яшчэ называлі **люцічамі**. Прыйшлі яны сюды з-пад Карпат. Мужны і ваяўнічы быў народ, моцна трымаліся за сваю зямлю, ды яшчэ і ў бакі глядзелі, каб чужой прыхапіць. І былі здаровыя. ***Велет*** азначае вялікі. Курганы пасля іх засталіся – ***валатоўкі***. Недалёка ад Прускі ёсць вёска **Вялека**, калі ісці на Відамле, і вёска ***Люта*** – гэта ў бок Брэста пад Высокім. Суседзі называлі іх ***люцічамі***, ***лютамі***, ***лютвою***” [18, с. 68]; “Доўга ***обры*** (ваяўнічае племя, якое прыйшло з усходу) ваявалі са славянамі, але аднойчы згінулі, быццам ніколі іх не было. Засталіся ў памяці пра ***обраў*** толькі назвы вёсак: ***Абрына*** паблізу Целяханаў, ***Абровы*** на Іванаўшчыне, ***Аброўская вулька*** ў Івацэвіцкім раёне” [10, с. 68]; “Найменні славянскіх плямёнаў, якія згадваюцца ў вышэйпамянёных аналах, дзіўным чынам адгукаюцца ў назвах шматлікіх беларускіх паселішчаў: ***лісічане*** – вёска ***Лісічы*** (Бярозаўскі раён), ***споры*** – вёска ***Спорава*** (Бярозаўскі раён), возера ***Споры*** (Пастаўскі раён); ***рачане*** – назвы ***Рэчыца***, такія частыя на Беларусі; ***смаляне*** – назвы вёсак ***Смаляны*** ў Пружанскім і Аршанскім раёнах, ***Смалявічы*** і, нарэшце, ***Смаленск***; ***драгавіты*** – ***Драгічын*** (сярэдневяковая назва – ***Драговічы***); ***магіляне*** – ***Магілёў***; ***селічы*** – вёскі з назваю ***Сялец*** ёсць у Быхаўскім, Бярозаўскім, Горацкім, Мсціслаўскім, Чашніцкім раёнах, а яшчэ і ***Сялецк*** – у Касцюковіцкім раёне; ***наровы*** – горад ***Нароўля***, рака ***Нароў***, ***жыцічы*** – ***Жыткавічы***, і гэты спіс можна доўжыць” [21, с. 45]. Выдзяляюцца тапонімы, утвораныя ад імёнаў князёў і валадароў населеных пунктаў, земляў, угоддзяў: “***Давыд-Гарадок*** – горад у Столінскім раёне. Узнік на мяжы XI–XII стст. (1100–1112 гг.). Названы

ў гонар заснавальніка – валынскага князя ***Давыда*** Ігаравіча” [23, с. 109]. Некаторыя тапонімы адлюстроўваюць рэлігійныя вераванні славян і іх продкаў-арыйцаў: “Назву раённага цэнтра ***Карма*** і вёскі з аднайменнаю назвай у Добрушскім раёне на Гомельшчыне нам прасцей звязваць са знаёмым словам, якое азначае заднюю частку чаўна. Дакладна такое ж слова «***карма***» (толькі з націскам на першым складзе) існуе ў ведычнай міфалогіі і азначае матэрыяльную дзейнасць дзеля асалоды. А таксама вынікі такой дзейнасці. Ці выпадковае такое супадзенне?” [21, с. 274]. Тапонімы могуць утрымліваць інфармацыю пра гаспадарчую дзейнасць людзей: “Можна інтэрпрэтаваць тапонім «***Мушкетна***» на Жабінкаўшчыне як месца, дзе татарамі вырабляліся ***мушкелі*** – дубінкі, апраўленыя жалезам. Назва «***Корд***» выводзіцца ад цюркскага ***корд*** ‘від халоднай зброі’” [46, с. 34]; “Назвай ***Волыня*** рубельцы абазначылі луг, дзе раней пасвілі ***валоў*** – непаваротлівых, але цягавітых жывёлаў: імі даводзілася араць зямлю, выконваць іншыя сельскагаспадарчыя работы” [48, с. 167]. Унутраная форма тапонімаў можа ўказваць на сацыяльную структуру грамадства: “У цэнтральнай частцы вёскі жыла ***шляхта***; за царквою, бліжэй да Хатомеля, – ***мужыкі***, што і адлюстравалася ў мікратапонімах сяла: ***Шляхта*** і ***Мужыкі***” [48, с. 24–25]. “Пра геаграфічную адметнасць Брэстчыны сведчаць: ***Ямы***, ***Ямін***, ***Пад’ямна***, ***Ямнае***; ***Брады***, ***Брадок***, ***Бродкі***, ***Брадзяцін***, ***Бродніца***, ***Бродча***, ***Выброды***, ***Падбрадзяны***, ***Заброддзе***, ***Козі Брод***; ***Пескі***, ***Пяскі***, ***Старыя Пескі; Зялёны Мох***. Неад’емнай асаблівасцю Палесся ў мінулым былі дрымучыя пушчы, а таму значную частку найменняў складаюць: ***Дубы***, ***Дубок***, ***Дубнякі***, ***Дубава***, ***Дубавая***; ***Бяроза***, ***Бярозна***, ***Беразнякі***, ***Беразцы***, ***Бярозкі***, ***Бярэзніца***, ***Бярозаўка***, ***Забярэззе***, ***Бярозавыя Кладкі***, ***Касцінская Бяроза***, ***Картузская Бяроза***; ***Ліпна***, ***Ліпавіца***, ***Заліпенне***, ***Бор-Ліпы***; ***Альшэва***; ***Бор***, ***Барок***, ***Зялёны Бор***, ***Вялікі Добры Бор*** і інш.” [33, с. 18].

Гідрані́міка (ад грэч. υδωρ ‘вада’ і όνομα ‘назва’) – раздзел тапанімікі, які вывучае ***гідронімы*** (уласныя назвы мораў, заліваў, рэк, ручаёў, крыніц, азёр, балот і інш.), што гістарычна склаліся на пэўнай тэрыторыі, а таксама іх сукупнасць – гідранімію.

Н. А. Багамольнікава вылучае наступныя храналагічныя пласты гідранімічнай лексікі: “Самымі старажытнымі па часе ўзнікнення лічацца буйныя па памерах і ў цэлым нязменныя гідронімы. Большасць такіх назваў на старажытных мовах абазначае паняцці ‘*вялікая вада, рака, паток вады*’ ці проста ‘*вада, рака*’. Мяркуецца, што ў назвах рэк ***Дон***, ***Днепр***, ***Днестр***, ***Дунай***, ***Дзвіна*** ёсць часткі, якія ўзыходзяць да інд.-еўр. **danu* ‘рака’. Асобныя водныя аб’екты ў розныя гістарычныя часы ў мове розных носьбітаў могуць называцца па-рознаму. Напрыклад, рака ***Дняпро*** ў старажытнагрэчаскіх помніках гучала, як ***Барысфен***, у старажыт-

нарымскіх – ***Данапрыс***, а ў VI ст. – ***Данапер***; рака ***Заходняя Дзвіна*** ў Беларусі і ў Расіі, але ***Даўгава*** ў Латвіі, рака ***Нёман*** (Беларусь) – ***Неман*** (Расія) – ***Нямунас*** (Літва); рака ***Волга*** – у рускіх і татар і ***Іціль*** – у башкір.

Старажытнарускі (агульнаўсходнеславянскі) пласт лексікі сфарміраваўся ў мове ўсходніх славян – продкаў цяперашніх беларусаў, рускіх і ўкраінцаў. Гідронімы захавалі лексемы і гэтага перыяду: *бондар* (бал. ***Бандарэчча***, Нар.), *волхвы* (р. ***Волхва***, Жытк.), *каравы* (бал. ***Караваткі***, Маз.), *віляць* (р. ***Павілістая***, Маз.), *ракатаць* (воз. ***Ракатун***, Маз.).

Лексіка перыяду беларускай народнасці характарызуецца пераафармленнем спрадвечнага лексічнага фонду па фанетычных законах народна-гутарковай беларускай мовы, вызваленнем ад стараславянскіх фанетычных, граматычных і словаўтваральных элементаў і заменай іх усходнеславянскімі або ўласна беларускімі адпаведнікамі, утварэннем рознымі спосабамі (суфіксальным, прыставачным, шляхам аснова-складання і субстантывацыі) ад асноў спрадвечных і запазычаных слоў спецыфічна беларускіх лексем. Сваё адлюстраванне знайшлі і новыя лексіка-семантычныя групы слоў.

Для апошняга перыяду характэрна пранікненне ў літаратурную мову лексікі народных гаворак, тэрытарыяльна абмежаваных слоў. У якасці словаўтваральнай асновы знайшлі адлюстраванне наступныя рэгіянальныя намінацыі: *верацея* ‘нізкае балоцістае месца’ (бал. ***Верацея***, Жытк.), *віць* ‘сырое месца, багна’ (в. ***Вітлін***, Раг.), *віш* ‘дрыгвяністае балота’ (рр. ***Віша***, ***Віша Палеская***, Акц.), *лелька* ‘бусел’ (***Лялецкія балоты***, Петр.), *яз, ез* ‘месца, якое не замярзае’ (вв. ***Язвін, Язвінцы***, Св.). Як сведчаць прыклады, для онімаў прадуктыўна ўжыты лексемы ландшафтна-геаграфічнай тэматыкі, радзей – фаўністычнай і назваў пабудоў.

Асновай для ўтварэння прапрыяльнай лексікі паслужылі таксама запазычанні са славянскіх і неславянскіх моў у выніку працяглых непасрэдных кантактаў паміж этнасамі або шляхам пранікнення праз пасрэдніцтва іншых моў. У якасці матыватараў задзейнічаны лексемы са значэннем адлюстравання прыродна-геаграфічных умоў краю: балт. himinas ‘мох’ (бал. ***Хімы***, Петр.), фінск. *neva* ‘балота’ (б. ***Неўе***, Нар.), літ. *bala* ‘балота’ (воз. ***Балоўка***, Жытк.), літ. *kudra* ‘невялікая сажалка’ (воз. ***Кудрае***, Жытк.), літ. *palios*, лат. *pali*, *palas* ‘абмялелае возера’, ‘шырокая балотная прастора на месцы абмялелага возера’, ‘балота, якое зарасло вялікім кустоўем’, ‘забалочаны бераг возера’ (воз. ***Палока Міхайлаўска***, Маз.)” [6, с. 94 – 99].

Л. В. Леванцэвіч разгледзела паходжанне гідронімаў Берасцейшчыны: “*Спораўскае* возера, *Спораўскія* балоты, вёска *Спорава*... На картах XVI–XVII стст. возера *Спораўскае* называлі *Салман* (1540 г.), *Салмація*, *Салмаціка* (1606 г.). У паведамленнях вядомага візантыйскага гісторыка VI ст.

Пракопія Кесарыйскага ёсць сцвярджэнне, нібыта некалі плямёны склавенаў і антаў (славян) называлі «спорамі» (рассеянымі) з-за таго, што жылі «спорадзен» – рассеяна, асобнымі пасёлкамі. На поўначы Заходняга Палесся гэта былі крайнія славянскія аб'екты, а далей знаходзіліся балты. На Беларусі ёсць шэраг гідронімаў з асновай **спор**-: азёры *Споры*, *Споркі*, рэкі *Спорыца*, *Спорня*. Ва ўсіх выпадках назіраецца сутыкненне двух водаў: рачной і азёрнай. Э. М. Мурзаеў тлумачыць спалучэнне спорная (спорая) вада як '*запруджаная вада, сутыкненне двух патокаў*'. Тады *Спорава* азначае запруджаную ваду, сутыкненне дзвюх водаў. В. А. Жучкевіч этымалогію назвы звязвае са 'спорная зямля' ад старажытнарускай асновы **споръ** 'спрэчка'[33, с. 55–56].

Айконімы – уласныя назвы населеных пунктаў: гарадоў, сёл, вёсак, пасёлкаў, хутароў, раз'ездаў – вывучае адзін з раздзелаў тапанімікі – **айканіміка** (ад грэч. oikos 'жыллё' і onyma 'імя').

Грунтоўныя даследаванні беларускай айканіміі звязаны з імем В. П. Лемцюговай. Даследчыца прааналізавала найменні з боку лексіка-семантычнага складу ўтваральных асноў і словаўтварэння, выявіла агульныя заканамернасці ў адпаведнасці з матывавальнымі прыкметамі, пакладзенымі ў аснову онімаў, і іх граматычнай прыродай [35–38].

У даследаванні В. П. Лемцюговай наступным чынам тлумачыцца паходжанне айконіма **Брэст** і даюцца звесткі з гісторыі паселішча: "Брэст (горад, цэнтр вобласці і раёна) на рацэ Буг. У летапісах паселішча ўпамінаецца з 1019 года пад назвамі **Берестие**, **Берестье**, **Бересть**. У канцы XIX – пачатку XX стст. вядома як **Берестие, Бересте Литовское**, **Брэст Літоўскі**, **Брэст-Літоўск**, з 1921 па 1939 гг. – як Брэст-над-Бугам. Паколькі **Берасце** першым з беларускіх гарадоў атрымаў магдэбургскае права, то прывілеем 1441 года ён быў прылічаны да катэгорыі галоўных гарадоў ВКЛ. Тут Мікалай Радзівіл Чорны пабудаваў першую ў межах сучаснай Беларусі друкарню, у якой выдадзена Брэсцкая Біблія (1563 г.).

Назва выводзіцца са старажытнарускага **берестъ**, якое ўзыходзіць да праславянскага ***berstъ** 'ільма' (парода дрэў). Слова **бераст** шырока фіксуецца і каментуецца ў дыялектных слоўніках беларускай мовы.

С. Роспанд дапускае, што першаснай была назва, утвораная ад антрапоніма **Берестъ**. Старажытнае дахрысціянскае імя **Берест** адзначана ў «Славянскім іменаслове…» Марошкіна, у «Словаре древнерусских личных имён» Тупікава.

Ва Устаўной грамаце смаленскага князя Расціслава Мсціслававіча сярод 11 старажытных гарадоў названы і горад **Берестов**, асновай для назвы якога паслужыла ўласнае асабовае імя **Берест**. Ад гэтага ж імя ўтворана і назва хутара **Берасты**, так што версія С. Роспанда таксама мае права на існаванне" [36, с. 40].

Прагматычная зона семантыкі айконімаў утрымлівае інфармацыю пра духоўную культуры Беларусі: язычніцкія культы, якія складаным чынам узаемадзейнічаюць з хрысціянскай рэлігіяй. Л. В. Леванцэвіч адзначае: “Пры абследаванні язычніцкай тапаніміі выяўляецца некалькі тэматычных груп. На першым месцы стаяць тапонімы, якія звязаны з мужчынскімі боствамі і, перш за ўсё, назвы, звязаныя з богам ***Воласам-Велесам:*** *Велясніца, Валоскі*, *Валасані, Валасачы*, а таксама – *Дзівін*, *Родкавічы*, *Хорск*, *Храсты*, *Перунова*, *Перарова*, *Малая Сваротва*, *Вялікая Сваротва*; на другім – з жаночымі боствамі: *Макашы*, *Макасі*, *Ладараж*, *Лелікава*.

З богам **Вялесам** звязаны:

– айконімы: *Валасачы* (Лях., Бр.), *Валасані* (Іван., Бр.), *Валоскі* (Бр.), *Велясніца* (Пін., Бр.), *Воласа* (Брасл., Віц.), *Улоссе* (Светл., Гом.), *Уласы* (Хой., Гом.);

– гідронімы: азёры *Валасацік* (Рас., Віц.), *Волас*, *Воласа* (Брасл., Віц.), *Воласна* (Леп., Віц.)” [33, с. 45].

У выніку даследавання тапонімаў, унутраная форма якіх утрымлівае звесткі аб рэлігійных плынях, прыхільнікі якіх жылі на Беларусі, І. Піваварчык адзначае: “Па характары ўтваральнай асновы культавыя айконімы, можна падзяліць на некалькі груп.

1. Тапонімы, якія ўзыходзяць да назваў Вярхоўнага Боства ці Божай Маці.

2. Тапонімы, асновы якіх матывуюцца назвамі культавых пабудоў.

3. Тапонімы, якія ўзыходзяць да назваў служыцеляў культу.

Да айконімаў, топаасновы якіх узыходзяць да **тэонімаў**, адносіцца вёска пад назвай ***Божы Дар***, што існавала ў Бялкоўшчынскім с/с Смаргонскага р-на да 1964 года; зараз яна мае назву Хадакі. Назва **Божы Дар** мела не толькі метафарычны характар, але і надавала непаўторны воблік населенаму пункту. Яшчэ адна назва населенага пункта **Святы Дух** (Кальчунскі с/с Ашмянскага р-на) з 1949 г. стала іменавацца Будзёнаўка. Найменне звязана са святам, якое адзначаецца на 50-ты дзень пасля Вялікадня. Гэтыя тапонімы маюць яўную ўнутраную форму. Для хрысціянаў унутраная форма тапоніма значная, носіць сакральны характар.

Асновай для ўтварэння тапонімаў могуць стаць назвы культавых пабудоў. У названую групу айконімаў уваходзяць назвы ***Вялікая Капліца*** і ***Малая Капліца*** (вёскі ў Путрышкаўскім с/с Гродзенскага р-на), матываваныя апелятывам **капліца** – невялікі малельны будынак з іконамі, але без алтара. На месцы вёскі ў XVI ст. быў двор ***Капліца***, які належаў ксяндзу Пількоўскаму. Атрыбутыўны кампанент ***Вялікая*** з’явіўся толькі ў XX ст., калі поруч узнікла яшчэ адна вёска з аналагічнай назвай, якая пазней у мэтах адрознення атрымала назву ***Капліца Малая***. У выніку пашырэння

працэсу ўрбанізацыі гэтыя геаграфічныя назвы зніклі з культурнага ландшафту Гродзенскай вобласці.

Лексічнай асновай для айконімаў могуць служыць назвы служыцеляў культу. Колькасць такіх назваў абмежавана. Назва ***Біскупцы*** (Дакудаўскі с/с Лідскага р-на, Ваўкавыскі с/с Ваўкавыскага р-на) узыходзіць да апелятыва **біскуп** ‘вышэйшае духоўнае званне ў каталікоў’; айконімы Капланаўцы (Гінавіцкі с/с Гродзенскага р-на), ***Капланы*** (в. да 1968 года ў Сінькоўскім с/с Смаргонскага р-на), ***Каплуны*** (хутар у Галавічпольскім с/с Шчучынскага р-на) матываваны словам **каплан** ‘каталіцкі ваенны святар’, у тым ліку ў польскай агаласоўцы. Назва ***Папоўшчына*** (хутар да 1970 х гадоў у Дзятлаўскім р-не) паходзіць, на думку В. П. Лемцюговай, ад антрапоніма **Поп** ці ад апелятыва **поп**, якому належала зямля. Зыходнае матывацыйнае значэнне айконіма ***Равіны*** (Варачанскі с/с і Карэліцкі п/с Карэліцкага р-на) выявіць складана: магчыма, ад **равін** ‘служыцель культу ў яўрэйскай рэлігійнай абшчыне’” [51, с. 238].

Тэма 10. ШЛЯХІ АДРАДЖЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ ТАПАНІМІІ

У 30–60-я гг. на Беларусі масава неапраўдана мяняліся шматлікія самабытныя, традыцыйныя народныя назвы. Былі ўведзены новыя, найчасцей запазычаныя з рускай мовы. Страчаныя, замененыя назвы былі спарадкаваны навукоўцамі ў наступныя семантычныя групы:

1) назвы, якія нагадвалі пра асоб царскага, імператарскага, панскага паходжання; белагвардзейцаў, апартуністаў: *Біскупская Камяніца*, *Камень Шляхецкі*, *Асторомічы Каралеўскія*, *Баяры*;

2) назвы, звязаныя з рэлігіяй, служыцелямі культу: *Валасані*, *Аннаспаская*, *Багуславічы*, *Царкоўнікі*;

3) назвы, якія ўяўлялі сабой немілагучныя, абразлівыя словы (мянушкі): *Більдзейкі*, *Каростычы*, *Гнойна*, *Гавінавічы*, *Скарбічы*, *Дурневічы*, *Свінёва*, *Дурачы*;

4) асобныя найменні былі заменены дзеля таго, каб увесці ў сістэму беларускіх тапонімаў модныя і новыя ў той час сацыяльна-палітычныя тапонімы: *Буракоўцы*, *Валокі*, *Арол*, *Бартноўшчына*, *Дзедзін*, *Зламышле*, *Цярпілавічы*, *Бясхлебічы*;

5) старажытныя назвы, якія ў выніку аманіміі з сучаснымі словамі выклікалі непажаданыя асацыяцыі: *Засценак*, *Бурмакі*, *Дворышча*, *Калонія Папіна (Новая Папіна)*, *Горач (Светач)* [32, с. 18].

Беларускі анаматолаг Валянціна Пятроўна Лемцюгова з болем адзначае: “Ні ў адной цывілізаванай краіне свету нацыянальная тапанімія не зазнала такога глумлення, як у Беларусі. Яшчэ і сёння на ёй ляжыць

адбітак дзейнасці польскай і расійскай канцылярыі. Але найбольшы здзек над ёй учынілі савецкія ўладныя структуры.

Колькі непапраўных страт нанесена беларускай тапаніміі ў выніку бяздарных перайменаванняў! Знішчалася ўсё, што не адпавядала чыноўніцкаму ўсведамленню новай ідэалогіі або гучала як быццам не вельмі прыстойна. Але, да прыкладу, што ідэалагічна шкоднае неслі ў сабе беларускія тапонімы ***Ліхтэрня***, ***Паташня***, ***Гута***, ***Майдан***, ***Радацэнь***? Амаль усе яны непаўторныя і пераважна месцяць у сабе назвы старажыт-ных беларускіх промыслаў: *гута* ‘прадпрыемства, дзе вырабляецца шкло’, *майдан* ‘смалакурня;’, *паташня* ‘паташны завод’, *ліхтэрня* ‘прадпрыемства, на якім выраблялі ліхтэры – невялікія грузавыя судны тыпу баржы’. А што непрыстойнае пачулася некаму ў назве ***Гавязна*** Стаўбцоўскага р-на? У яе аснове не што іншае, як назва травяністай расліны *гавяз* (націск на першым складзе), якая звычайна расце па берагах рэчак і вадаёмаў. Незразумела таксама, дзеля чаго і дзеля каго стала ахвярай старажытная назва ***Мондзін*** (першая згадка – 1559 год). Спачатку яе перайменавалі на ***Сиреневка***, якая, па сведчанні Я. Адамовіча, па-беларуску стала пісацца ***Сярэнеўка***. Відаць, гэта і змусіла чыноўнікаў паўторна перайменаваць яе ў ***Чаромушкі***. У аснове тапоніма ***Мондзін*** – нямецкае слова ***монд*** ‘месяц’. У размоўным ужыванні так называецца лысіна чалавека, якая нагадвае па форме дыск месяца. Значыць, заснавальнікам або ўладальнікам паселішча быў чалавек з такой лысінай.

А хіба можна чым-небудзь растлумачыць замену цалкам нейтральных тапонімаў ***Барок***, ***Гарбы***, ***Двор Левандоўскага***, ***Германава***, ***Адверніца***, ***Мікалаеўка***, ***Хацееўка***, ***Хаткі***, ***Куравічы***, ***Шаламы***, ***Пляцянічы***, ***Крыжовы Лог***, ***Падгоранка***, ***Каўшоўка***, ***Божы Дар*** і шмат іншых?

Ні ў адным з афіцыйных спісаў тапонімаў не быў прастаўлены націск, праз што тапонімы нярэдка прачытваліся памылкова і нават траплялі ў лік абразлівых. Прыкладам могуць служыць ***Мартышкі*** (націск на апошнім складзе) і ***Холуй*** (націск на першым складзе). У выніку пераносу націску яны па асацыяцыі з мартышкамі і халуямі падпалі пад перайменаванне. Між іншым сэнс іх бяскрыўдны. ***Мартышкі*** паходзяць ад асабовага імя ***Мартын***, якое ўяўляе сабой размоўную форму ад афіцыйнага імя ***Марцін***, а назва ***Холуй*** паходзіць ад слова *холуй* ‘пясчаны нанос на беразе ракі’.

Шматлікія пераназываннi спрадвечных назваў (і на рускай, і на беларускай мове) запалымнелі ідэалагічнай чырванню: ***Красная Пло-шчадзь***, ***Красны Пахар***, ***Красны Лес***, ***Красны Рог***, ***Красны Свет***, ***Красны Май***, ***Красны Партызан***, ***Чырвоны Барэц***, ***Чырвоная Звязда***, ***Чырвоная Знаменка***, ***Чырвоная Кветка***.

Шматлікія спрадвечныя назвы бязвінна знішчаныя і замененыя нейкім ідэалагічным сурагатам тыпу ***Пралетарыя***, ***Вішнёвая***, ***Рамашкі***, ***Залог Пяцігодкі***, ***Першамай***, ***Вазраждзенне***, ***Надзежда***, ***Акцябр***, ***Звязда***, ***Зоранька***, ***Рассвет***, ***Лучазарная***, ***Перадавы***, ***Труд***, ***Бальшавік***, ***Камсамолец***! Хіба гэта паўнацэнныя назвы для населеных пунктаў? Гэта пустыя штучныя знакі, якія не маюць ніякага дачынення ні да гісторыі паселішчаў, ні да аб'ектаў іх наваколля. Напрыклад, што атрымаецца, калі ў паселішчах з пералічанымі назвамі з'явіцца школа, крама, дзіцячы садок? Як яны будуць называцца? Як будуць называцца людзі, якія там жывуць? Ці падумаў хто пра гэта? І тым не менш такія назвы прыйшлі на месца тысяч тапанімічных сведак нашай гістарычнай мінуўшчыны, якія маглі б шмат чаго расказаць не толькі лінгвісту, але і гісторыку, географу, эканамісту, этнографу" [38].

Перайменаванні Прыпяцкага Палесся ў савецкія часы гісторыі былі даследаваны А. В. Кавалёвай: "Значную групу сярод перайменаваных назваў паселішчаў XX стагоддзя ў беларускай айканіміі складаюць найменні, якія ўзыходзяць да апелятываў, што ўмоўна перадаюць абнаўленне жыцця, сімвалізуюць пачатак новай эпохі. Такія адзінкі матываваны лексемамі, якія сведчаць пра грамадскі рух наперад, ідэі сацыяльных змен. Так, назва ***Прагрэс*** узыходзіць да апелятыва *прагрэс* 'рух наперад, пераход на больш высокую ступень у развіцці', найменне ***Росквіт*** матывавана агульным назоўнікам *росквіт* 'найвышэйшая ступень развіцця, уздыму чаго-небудзь', якія ў адпаведнасці з тагачасным савецкім ідэалагічным вучэннем набылі новы пафасны сэнс, перадаючы ідэалы новага ладу. Сярод такіх назваў паселішчаў вылучаюцца айконімы, матываваныя лексемамі, што ўтрымліваюць выразную ацэначную ці эмацыянальна-экспрэсіўную канатацыю. Так, адзінка ***Светлы*** ўтворана ад лексемы *светлы* 'нічым не азмрочаны, шчаслівы, азораны ўнутраным пачуццём радасці, прасякнуты аптымізмам, узнёслы'. Такія онімы, на думку іх стваральнікаў, павінны былі перадаваць настрой тагачасных сацыяльных пераўтварэнняў,

Перайменаванні ад сімвалічных апелятываў лакалізуюцца па ўсёй тэрыторыі Беларусі. Новае ўтварэнне ***Ударная*** матывавана лексемай *ударная* 'звязаная з ударнай працай, ударніцтвам'. Страчанае найменне ***Асмаленік*** суадносіцца з апелятывам *асмалены (абсмалены)* 'які падпаў пад дзеянне агню, полымя, сонца'. Не выключана і паходжанне ад антрапоніма **Асмола*. Даследчыкі адносяць топааснову ***двор*** да найбольш прадуктыўных у станаўленні ўсходнеславянскай тапаніміі пад уплывам развіцця форм землеўладання і землекарыстання. Да 1932 г. на Петрыкаўшчыне існавала старажытная назва ***Двор Левандоўскага***, якая ўзыходзіць да апелятыва *двор*. Постпанент ***Левандоўскага*** ўказвае на прыналежнасць (ад антрапоніма ***Левандоўскі***). Яе замяніў айконім ***Чырвоная***

Горка, што суадносіцца з арфаграфічным апелятывам *гара* ‘ўчастак зямной паверхні, які высока ўзнімаецца над навакольнай мясцовасцю’. Традыцыйна ад’ектыў *красны (чырвоны)* у складзе айконімаў ужываўся са значэннем ‘прыгожы’, але наватворы савецкага часу маюць сімвалічнае значэнне.

У перайменаваннях XX ст., што лакалізуюцца ў межах Прыпяцкага Палесся, выяўлены новыя адзінкі, матываваныя апелятывамі з сімвалічным значэннем (***Авангард, Пабедная, Рассвет*** і інш.). Яны характарызуюць культуру эпохі, сацыяльныя змены, але не з’яўляюцца тыповымі для айканімічнай сістэмы Беларусі. Страчаныя ў выніку перайменаванняў старажытныя айконімы пазначанага рэгіёна (***Двор Левандоўскага***, ***Ліхтэрня***, ***Стары Фальварак***, ***Анзельмава***, ***Кліндупаўка***) указвалі на традыцыйныя тыпы пасялення, асаблівасці грамадскага жыцця і вытворчасці, зафіксавалі антрапонімы, характэрныя для іменавання асоб у час узнікнення паселішча [26, с. 110].

У сувязі са з’яўленнем новых ідэалагічна афарбаваных найменняў на карце Беларусі савецкага часу ўзнікла праблема перакладу тапонімаў з рускай мовы на беларускую. Валянціна Пятроўна Лемцюгова адзначае: “Увесь гэты набор наватвораў на рускай і беларускай мове затым пачалі даслоўна перакладаць з мовы на мову, што ўнесла страшэнную блытаніну і разнабой у сістэму беларускай тапаніміі. У выніку ўзнікла такая з’ява, як двухназоўе (***Двигатель – Рухавік***, ***Красный Пахарь – Чырвоны Араты***, ***Ромашки – Рамонкі***, ***Октябрь – Кастрычнік*** і інш.) і тапонімы фактычна перасталі выконваць сваю асноўную намінатыўную функцыю – служыць адназначным арыенцірам на мясцовасці. Падчас дыялекталагічных экспедыцый мне даводзілася гутарыць з жыхарамі двухназоўных паселішчаў. У адказ на пытанне, як усё ж такі называецца іх вёска, напрыклад, ***Победитель*** ці ***Пераможац***, яны толькі паціскалі плячыма.

Надзвычайная тапанімічная блытаніна ўзнікла ў выніку перакладу тапонімаў з кампанентам ***Красны – Чырвоны***. Назвы тыпу ***Красный Большевик***, ***Красный Маяк***, ***Красный Октябрь*** пры перакладзе зрабіліся чырвонымі: ***Чырвоны Бальшавік***, ***Чырвоны Маяк***, ***Чырвоны Кастрычнік***. А тыя пераназовы, якія афіцыйна засведчаныя па-беларуску (ёсць і такія), пры перакладзе на рускую мову сталі ***краснымі***. У гэтай каламуці ўжо цяжка вылучыць беларускія спрадвечныя ***красныя*** назвы, якія ніякіх адносін да кастрычніцкай рэвалюцыі не маюць. Яны паходзяць ад старажытнага прыметніка ***красны*** ‘адметны прыгажосцю, хараством, маляўнічасцю наваколля’. Напрыклад, ***Красная*** Слабада, ***Красны*** Двор, ***Красна***полле. Першыя ўпамінанні аб іх у пісьмовых крыніцах адносяцца да XIV–XVI стст., а ўзніклі яны значна раней.

Ад савецкіх часоў пануе анархія і блытаніна ў перакладной частцы назваў нашых вуліц. Нават добры знаўца беларускай і рускай моваў не ў

стане прызвычаіцца да двухмоўя: ***Крынічная – Родниковая, Вясёлкавая – Радужная, Шпалерная – Обойная, Чыгуначная – Железнодорожная, Яравая – Овражная, Будаўнікоў – Строителей, Бэзавая – Сиреневая, Усходняя – Восточная, Паўночная – Северная, Калгасная – Колхозная*** і інш. Вядома нямала казусаў, якія ўзнікаюць на глебе перакладаў. Так, напрыклад, на вуліцы Крынічнай адбылося здарэнне. Міліцыянер аформіў пратакол, указаўшы назву вуліцы, напісаную на шыльдзе, – Крыничная. Залішне адукаваны следчы ўнёс гэтую назву ў паперы ўжо ў перакладным варыянце – Родниковая. У выніку з залы суда дакументы вярнуліся на даследаванне, бо суддзя цалкам законна пабачыў розначытанні пры вызначэнні месца здарэння.

Вуліца ***Дыяментавая*** перакладаецца як ***Алмазная***. Але ж алмаз – гэта сыры прыродны мінерал, а дыямент – апрацаваны, адшліфаваны пэўным спосабам алмаз. У рускай мове ёсць эквівалент беларускага слова дыямент – гэта диамант. То адкуль узяўся рускі адпаведнік Алмазная для беларускай назвы?” [38]

Працэс перайменавання закрануў назвы берасцейскіх вуліц. Краязнавец Васіль Сарычаў у даследаванні “У пошуках страчанага часу” піша пра перайменаванні брэсцкіх вуліц савецкага часу: “Кожная ўлада пачынаецца з перайменавання вуліц. Тапанімічныя шыльды з новымі назвамі, якія ўваходзяць у побыт жыхароў горада, паказваюць прыярытэты новага ладу. Надзвычай прыгожымі былі імёны вуліц сярэднявечнага Брэста, які размяшчаўся на Цэнтральным востраве сучаснай крэпасці: ***Слюзная, Падзамкавая, Кавальская, Біскупская***.

Па прыходзе ў 1939 годзе ў Брэст першых Саветаў быў зроблены ўпор на назвы вуліц, утвораныя ад імён і падзей. Вуліцы Брэста былі перайменаваны ў гонар ***Леніна, Дзяржынскага, Свердлава, Арджанікідзэ, Куйбышава, Урыцкага, Войкава***. Да слова, ***Пётр Войкаў*** (той самы, што пасля расстрэлу царскай сям’і адрэзаў палец з рукі мёртвай імператрыцы і потым хваліўся пярсцёнкам) у статусе савецкага пасла ў Польшчы быў забіты на варшаўскім вакзале студзентам Барысам Кавярдой. Пасля выхаду з заключэння Кавярда ажаніўся з брастчанкай Нінай Пятрушынай.

У пачатку 1940 года дзясятак брэсцкіх вуліц атрымалі імёны рускіх і савецкіх пісьменнікаў: ***Пушкінская, Лермантава, Талстога, Гогаля, Чэхава, Тургенева, Горкага, Маякоўскага, Шолахава***. У іншых выпадках увекавечылі камдзіва ***Чапаева***, лётчыкаў ***Чкалава*** і ***Леванеўскага***, прагрэсіўных нямецкіх таварышаў ***Карла Лібкнехта, Клару Цэткін, Розу Люксембург, Фрыдрыха Энгельса, Карла Маркса***, савецкага ўдарніка ***Аляксея Стаханава***, тэрарыста (!) ***Сцяпана Халтурына***. З’явіліся вуліцы

11 Ліпеня (дзень вызвалення Мінска ад белапалякаў у 1920 годзе, цяпер Адамкоўская), ***1 Мая*** (цяпер Карбышава).

У адпаведнасці з новымі прыярытэтамі ў Брэсце з'явіліся вуліцы ***Савецкая***, ***Маскоўская***, ***Камуністычная***, ***Камсамольская***, ***Інтэрнацыянальная***, ***Дэпутацкая***, ***Партызанская***, ***МОПРа***, ***Рабочая***.

Прывядзём прыклады вуліц Брэста, перайменаваных у 1940 годзе:

Длуга – імя ***Куйбышава***, ***Граеўска*** – ***Рэспубліканская***, ***Ягелонска*** – ***Маскоўская***, ***Кобрынска*** – ***Кірава***, ***Касцюшкі*** – імя ***Гогаля***, ***Крашэўскага*** – імя ***Льва Талстога***, ***Мяшчанска*** – ***Працоўная*** (цяпер ***Кіжаватава***), ***Шлюхтузава*** – імя ***Тэльмана***, ***Весела*** – імя ***Войкава***, алея ***Вольнасці*** – імя ***Розы Люксембург***" [58, с. 211–214].

Прафесар Васіль Шур піша: "Змененыя, знявечаныя беларускія тапанімічныя назвы трапляюцца нават у такіх аўтарытэтных выданнях, як «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя». Так, назву вёскі ***Глінішчы*** ў Хойніцкім раёне, у якой нарадзіўся народны пісьменнік Беларусі Іван Паўлавіч Мележ, у названым выданні перадаюць у памылковым напісанні – Глінішча. У шматлікіх мастацкіх і публіцыстычных тэкстах І. Мележа, у аўтарскіх успамінах пісьменнік назву сваёй вёскі перадае толькі ў форме множнага ліку – Глінішчы, як яна спрадвеку вядома сярод землякоў мастака слова і жыхароў навакольных вёсак. Памылковае напісанне, што выйшла з энцыклапедыі, цяпер тыражуецца і ўводзіць у зман некаторых рэдактараў і журналістаў. С. Прач падрабязна прасачыў ужыванне гэтай тапанімічнай назвы на старонках разнастайных беларускіх выданняў і газет і лічыць, што няма ніякіх падстаў калечыць дарагую для многіх беларусаў тапанімічную назву. Патрэбна пісаць так, як вымаўляе народ: вёска Глінішчы. Гэта падмацоўваецца словаўтваральнай мадэллю з фармантам на -ішчы (-ышчы), што надзвычай характэрны для шматлікіх тапанімічных назваў Палесся: ***Дворышчы***, ***Селішчы***, ***Гарохавічы***, ***Кочышчы*** і г. д." [81, с. 215].

Валянціна Пятроўна Лемцюгова, адстойваючы важнасць захавання спрадвечных назваў піша: "Тапонімы – вочы краіны. З глыбіні вякоў яны высвечваюць гістарычны лёс народа, яго культурныя і духоўныя набыткі, яго менталітэт. І зусім ужо непрыстойна ператвараць нацыянальную тапанімію ў разменную манету.

Думаецца, што і нашай уладзе і ўсім нам не ўсё роўна, што будуць высвечваць гэтыя вочы: гісторыю і культуру народа, яго незалежнасць, самабытнасць мовы або нашу нядбайнасць, бяспамяцтва, рабалепства, невуцтва і бескультур'е" [38].

Тэма 11. ДЭРЫВАЦЫЯ (СЛОВАЎТВАРЭННЕ) АНАМАСТЫЧНАЙ ЛЕКСІКІ

Важным складнікам вывучэння анамастыкону з'яўляецца словаўтваральны аналіз. Разгляд анамастычных дэрывацыйных працэсаў дае магчымасць вызначыць асноўныя онімаўтваральныя тыпы і мадэлі. На аснове словаўтваральнай структуры імён можна вызначыць час і грамадска-гістарычныя ўмовы ўзнікнення складнікаў анамастыкону, паколькі іх будова непасрэдна звязана з культурна-гістарычнай эпохай.

Адной з першых у беларускай тапаніміцы да аналізу структуры беларускіх геаграфічных назваў звяртаецца В. П. Лемцюгова [35, с. 100]. Яна выдзяляе першасныя і другасныя тапанімічныя назвы. Да першасных адносяцца тыя, якія пазбаўлены з пункту гледжання структуры тапоніма якіх-небудзь істотных тапанімічных адзнак. У гэтую групу аднесены назвы населеных пунктаў, якія ўтвораны семантычным спосабам на аснове апелятываў, антрапонімаў і гідронімаў. Другасныя найменні – гэта тапонімы, што валодаюць якой-небудзь словаўтваральнай прыкметай, якая мае пэўную тапанімічную нагрузку.

У. М. Генкін наступным чынам акрэслівае словаўтварэнне і структуру тапонімаў: "Да простых адносяць тапонімы, якія складаюцца з аднаго слова ў форме назоўніка або прыметніка. Невытворныя назвы ўтварыліся семантычным спосабам. Можна выдзеліць айконімы, роўныя па структуры назвам водных аб'ектаў, каля якіх фарміравалася паселішча: *р. Дзісна → г. п. Дзісна, воз. Вымна → в. Вымна, воз. Язна → в. Язна, воз. Лосвіда → в. Лосвіда, р. Ула → в. Ула,* і г. д. Многія назвы населеных пунктаў з'явіліся ў выніку анімізацыі апелятываў, часцей за ўсё розных наменклатурных геаграфічных тэрмінаў і назваў тыпаў паселішчаў: *Бор, Гара, Кардон, Майдан, Слабада, Сяло, Сяльцо* і да т. п.

Адметнай рысай вытворных тапонімаў з'яўляецца наяўнасць у іх тапанімнага фарманта, г. зн. словаўтваральнага элемента, які служыць для ўтварэння тапоніма. Паняцце словаўтваральнага фарманта ў дачыненні да тапанімікі мае пэўныя асаблівасці. Па-першае, да ліку словаўтваральных афіксаў у анамастыцы адносяць і флексію. Па-другое, тапанімны фармант можа складацца з двух элементаў: суфіксальнага і флексійнага, як, напрыклад, фарманта *-ічы, -онкі, -ова* і інш. На Беларусі распаўсюджанымі можна лічыць топафарманты *-ова/-ава, -ева, -ічы/-ычы, -овічы, -евічы, -ішкі/-ышкі, -шчына*. Шырокае распаўсюджванне айконімаў з фармантамі *-ова, -ева, -ава, -іна, -ына* тлумачыцца сацыяльна-эканамічнымі прычынамі: "развіццём прыватнага землекарыстання, калі кожны кавалачак зямлі, нават самы маленькі, меў уладальніка і атрымліваў найменне, у большасці выпадкаў па імені гаспадара. З цягам часу на гэтых зямельных участках

маглі ўзнікнуць хутары і іншыя тыпы паселішчаў, захоўваючы пры гэтым свае назвы [37, с. 32]. Семантычная і граматычная спецыфіка дадзеных афіксаў (яны выражаюць пасесіўнае значэнне і запазычаны тапаніміяй са сферы словаўтварэння прыметнікаў) абумовіла і пэўны выбар асноў, да якіх далучаюцца гэтыя фарманты. У большасці сваім айконімы на *-ова, -ева, -ава, -іна, -ына* з'яўляюцца адантрапанімнымі. Часцей за ўсё разгледжаныя фарманты далучаліся да поўных, гутарковых або дыялектных формаў імёнаў: *Антонава, Данева, Данілава, Гаўрыліна, Іванова, Мар'іна, Марынкіна, Янава, Яроміна*.

Шэраг назваў узыходзіць да мянушак: *Барадуліна, Зюзіна, Капусціна, Лапунова*. Айконімы на *-ова, -ева, -ава, -іна, -ына* маглі быць утвораны ад назваў асоб па прафесіі (*Ганчарова, Кавалева, Стральцова, Ткачова*) і іншых прыкметах. Адантрапанімнае ўтварэнне характэрнае і для большасці айконімаў з формантамі *-шчына, -оўшчына, -еўшчына*: *Грыгораўшчына, Юркаўшчына, Гаспараўшчына.* Назвы, у складзе якіх выяўляецца старажытнарускі суфікс -je (у сучаснай беларускай мове ён у многіх словах трансфармаваўся, выклікаўшы падаўжэнне зычных), прадстаўлены двума словаўтваральнымі тыпамі: 1) айконімы суфікальнага ўтварэння: *Абалонне, Бабоўе*; 2) айконімы прэфіксальна-суфіксальнага ўтварэння: *Заполле, Запруддзе, Зарэчча*.

У аснову назваў на *-ічы/-ычы, -овічы, -евічы* маглі быць пакладзены як поўныя, так і размоўна-дыялектныя формы імёнаў уласных: *Апанаскавічы, Васевічы, Юравічы, Клімавічы*.

Складаныя тапонімы ўяўляюць сабой аднаслоўныя геаграфічныя назвы, якія маюць не менш за дзве каранёвыя марфемы: *Мар'янполле, Адамполле, Старадворышча, Краснагорка*.

Састаўнымі называюцца айконімы, якія ўключаюць у сябе два, радзей большую колькасць кампанентаў, звязаных рознымі тыпамі сінтаксічных адносін: злучальнай, падпарадкавальнай або прэдыкатыўнай сувяззю. Абсалютная большасць састаўных айконімаў уяўляе сабой двухслоўнае найменне, кампаненты якога звязаны падпарадкавальнай сувяззю і атрыбутыўнымі адносінамі: *Чорная Лаза, Чорны Засценак, Зялены Бор, Зялены Лог, Белая Дуброва, Браслаўская Лука*" [19, с. 50–51].

Беларускія анаматолагі разгледзелі пытанне ўтварэння тапаніміі Брэстчыны. У публікацыях В. М. Андрасюк, С. С. Клундук, В. М. Емельяновіч, Л. В. Леванцэвіч даецца характарыстыка лексічных рэсурсаў, якія паслужылі матывавальнай базай для фарміравання ўласных назваў паселішчаў. Лінгвакраязнаўчы змест язычніцкай (культавай) айканіміі Палесся выяўлены Л. В. Леванцэвіч. М. М. Аляхновічам і Л. В. Леванцэвіч распрацаваны тапанімічныя карты Брэстчыны: закартаграфаваны тапонімы з кампанентамі, што характарызуюць

прыродна-геаграфічныя асаблівасці мясцовасці, велічыню пасяленняў, якія звязаны з язычніцкімі боствамі і якія паходзяць ад этнонімаў. В. . Міцкевіч даследавала айканімію Пінскага павета XVI ст. Падрыхтаваны слоўнікі па айканіміі Століншчыны (аўтар З. М. Заіка) і Бярозаўшчыны (аўтар Г. М. Пыж'янава). Першая манаграфія па тапаніміцы Брэстчыны падрыхтавана Т. М. Аліферчык ("Тапанімія Заходняга Палесся: этналінгвістычны аспект", 2013) [34, с. 130].

У даследаванні В. Брышцен была разгледжана мадэль pluralia tantum у айканіміі Брэстчыны. "Назвы населеных пунктаў у форме множнага ліку вельмі пашыраныя. Хаця ўсе найменні адзначанага тыпу аб'ядноўвае плюральная форма, можна вылучыць дзве іх структурныя разнавіднасці: айконімы флексійнага ўтварэння і айконімы суфіксальна-флексійнага ўтварэння.

Айконімы флексійнага ўтварэння. Айконімы гэтай шматлікай групы аб'ядноўвае выключна форма множнага ліку. Суфіксы, запазычаныя айканіміяй разам з апелятывамі, імёнамі-мянушкамі і ўласнымі кананічнымі імёнамі, пры класіфікацыі ў разлік не прымаюцца, паколькі яны не выяўляюць якіх-небудзь прыкмет айканімізацыі. Неаднароднасць лексічных асноў разглядаемых айконімаў дае магчымасць выдзеліць тры групы назваў:

1. Айконімы, утвораныя ад уласных асабовых кананічных імёнаў: *Засімы*, *Калюхі*, *Малышы*, *Стасюкі*.

2. Айконімы, утвораныя ад апелятываў: *Агароднікі*, *Балоты*, *Боркі*, *Залескі*, *Завершы*, *Запруды*, *Ліпнікі*, *Мельнікі*, *Навасадкі*, *Навасёлкі*, *Пескі*, *Плашчыны*, *Рачкі*, *Хідры*.

3. Айконімы, утвораныя ад антрапонімаў апелятыўнага паходжання: *Авады*, *Баршчы*, *Батчы*, *Гуцкі*, *Дзявяткі*, *Дубіны*, *Жукі*, *Калубелі*, *Каташы*.

Айконімы суфіксальна-флексійнага ўтварэння. Да суфіксальна-флексійнага спосабу ўтварэння належаць айконімы з апелятыўнымі і антрапанімічнымі суфіксамі, якія ў выніку працягласці ўжывання ў айканіміі набылі айканімічную функцыю. Разам з паказчыкамі множнага ліку *-а, -і(-ы)* яны ўспрымаюцца зараз як непадзельныя самастойныя айканімічныя фарманты *-ічы(-ычы)*, *-ата(-ята)*, *-аны(-яны)*, *-аўцы(-оўцы)*. Тыповымі і прадуктыўнымі з'яўляюцца назвы з суфіксам *-ічы(-ычы)* з варыянтамі *-авічы(-овічы)*, *-евічы(-эвічы)*, *-іцы(-ыцы)*: *Аніскавічы*, *Асмолавічы*, *Астромічы*, *Бародзічы*, *Буховічы*, *Вялічкавічы*, *Гарыздрычы*, *Ківацічы*, *Корчыцы*, *Кустовічы*, *Луцэвічы*, *Ляхчыцы*, *Мазічы*. У старажытнасці гэтыя фарманты выкарыстоўваліся для ўтварэння асабовых уласных імёнаў, імёнаў па бацьку і прозвішчаў. Яны з'явіліся асновай для станаўлення адной з самых прадуктыўных беларускіх айканімічных мадэлей на *-ічы (-ычы)*, *-авічы (-овічы)*. Айконімы гэтай

мадэлі сустракаюцца на тэрыторыі ўсёй Беларусі, за выключэннем Магілёўскай вобласці, дзе адзначаны адзінкавыя ўтварэнні. Як адзначае В. П. Лемцюгова, пераважная большасць зафіксаваных у Беларусі айконімаў на *-ічы (-ычы)* па паходжанні патранімічныя.

Пры дапамозе суфіксаў*-аўцы(-оўцы),-еўцы(-эўцы),-анцы(-інцы),-энцы, -цы* ўтвараюцца айконімы на аснове калектыўных назваў групы людзей – выхадцаў ці высяленцаў з якога-небудзь населенага пункта: *Восаўцы* < восаўцы < выхадцы з в. *Воса*" [13, с.27].

Значная частка тапонімаў на тэрыторыі Беларусі іншамоўнага паходжання. Прафесар Васіль Шур адзначае: "Працэс узаемаўплыву моў, культур бярэ свой пачатак з дахрысціянскіх часоў, калі продкі беларусаў, палякаў, літоўцаў жылі яшчэ плямёнамі. На ўзроўні лексікі гэтыя з'явы найбольш выразна праяўляюцца ў тапанімічных назвах. Пісьменнік Канстанцін Тарасаў, творчасць якога заглыблена ў гістарычнае мінулае нашага народа, наступным чынам тлумачыць наяўнасць шматлікіх балтызмаў у беларускай тапаніміцы: «У часы перасялення крывічоў і дрыгавічоў літоўскія і латышскія плямёны не адступалі самі па сабе да балтыйскага прыбярэжжа, у сучасныя межы. Частка іх загінула ў бітвах з прышэльцамі, але большасць засталася жыць, дзе жыла адвеку, і паступова злівалася са славянскім насельніцтвам, прымаючы нешта ад яго і аддаючы яму ад сваіх адметнасцяў як матэрыяльных, так і моўных». Ён, як і папярэднія даследчыкі, адзначае, што дзевяноста працэнтаў назваў рэк і азёр на Беларусі захавалі сваё балцкае паходжанне. На яго думку, гэта ***Ачоса***, ***Бержыца***, ***Беседзь***, ***Бабруйка***, ***Балога***, ***Важа***, ***Вілія***, ***Волма***, ***Гайна***, ***Дражня***, ***Іпа***, ***Клева***, ***Ласвіда***, ***Лоша***, ***Іслач***, ***Лучоса***, ***Нароўля***, ***Нарач***, ***Піна***, ***Ольса***, ***Арэса***, ***Уша*** і інш. Паходжанне некаторых названых гідронімаў да нашага часу з'яўляецца спрэчным" [81, с.160–162]. "На Беларусі сустракаюцца і іншыя тапанімічныя назвы, якія ўзніклі ад цюркскіх, у асноўным ад татарскіх каранёў: ***Шайбакова***, ***Чавусы***, ***Арда***, ***Баева***, ***Карацк***, ***Агдамер***, ***Балбасава***, ***Балашэвічы***, ***Балажэвічы***, ***Баштан***, ***Мамайкі***, ***Шайтэрава***, ***Шарыба***, ***Шарыбаўка*** і інш. Вядомы даследчык А. Крычынскі ў адной са сваіх прац прыводзіць каля сотні назваў татарскіх пасяленняў у Літве, Беларусі, на Валыні і ў Падоллі, у тым ліку і беларускія ***Койданава***, ***Арда***, ***Агдамер***, ***Болбасава***, ***Карацк***, ***Татарка***, ***Мамаі***, ***Сорак Татараў*** і інш. У кнізе «Исследование о происхождении и состоянии литовских татар» (СПб., 1857) прафесар А. Мухлінскі прыводзіць статыстычныя звесткі аб колькасці татараў, што пражывалі ў заходніх губернях Расіі ў сярэдзіне XIX ст. У Віленскай губерні тады пражывала 2170 чалавек, у Ковенскай – 400, у Гродзенскай – 836, у Мінскай – 1500, у тым ліку ў Мінску – 400 чалавек. Мабыць, ні адзін народ-прышэлец на Беларусі не пакінуў пра сябе столькі легендаў, падан-

няў, як татары. Татарскія курганы, могільнікі, грэблі, палявыя і лясныя дарогі, палянкі, гарадзішчы ёсць на Беларусі ўсюды” [81, с.156].

Найбольш старажытныя тапанімічныя назвы – **гідронімы**. Яны далі найменні многім паселішчам (гарады ***Віцебск***, ***Полацк***, ***Слуцк***, ***Ушачы***, вёскі ***Панямонь***, ***Задзвінне***). Аднак бывае і наадварот, калі рака атрымлівае назву па назве населенага пункта, напрыклад ***Зяльвянка***, ***Кобрынка***, ***Ружанка*** і інш. На ўтварэнне назвы горада ад назвы ракі ці наадварот у пералічаных прыкладах указваюць суфіксы, прыстаўкі (р. ***Віцьба*** – г. ***Віцебск***, р. ***Палата*** – г. ***Полацк***, р. ***Ушача*** – г. ***Ушачы***, р. ***Нёман*** – в. ***Панямонь***, р. ***Дзвіна*** – в. ***Задзвінне***, г. ***Кобрын*** – р. ***Кобрынка***, г. п. ***Ружаны*** – р. ***Ружанка***, в. ***Катэра*** на Брэстчыне – р. ***Катэрка***).

Назвы рэк і азёраў на тэрыторыі Беларусі могуць быць як славянскага, так і балтыйскага паходжання. Славянскія назвы звычайна суадносяцца з назвамі раслін (***Альхоўка***, ***Бярэзіна***, ***Кляноўка***), указваюць на колер вады ў рацэ (***Белка***, ***Мутвіца***,***Чорная***, ***Чарнянка***), на хуткасць цячэння, тэмпературу вады, характар дна, на забалочанасць мясцовасці (***Быстрыца***, ***Глыбочка***, ***Сцюдзёнка***, ***Пясчанка***, ***Гнілуха*** і інш.). Назвы азёраў часта ўтвараюцца ад назваў размешчаных непадалёку вёсак: ***Лукаўскае возера*** (вёска Лукава Маларыцкага раёна), ***Мотальскае*** (вёска Моталь Іванаўскага раёна), ***Олтушскае*** (вёска Олтуш Маларыцкага раёна), ***Спораўскае*** (вёска Спорава Бярозаўскага раёна), ***Сэляхівськэ*** (в. Селяхі Брэсцкага раёна). Тое самае можна сказаць і пра каналы: ***Батчынскі канал*** (вёска Батчы Кобрынскага раёна), ***Шыповіцкі*** (вёска Шыповічы Кобрынскага раёна), ***Якаўчыцкі*** (вёска Якаўчыцы Жабінкаўскага раёна).

Антрапонімамі (імёнамі, прозвішчамі, мянушкамі людзей) гідронімы матывуюцца рэдка, за выключэннем назваў невялікіх рачулак, сажалак, каналаў і равоў, а таксама штучных вадаёмаў, выкапаных чалавекам, напрыклад ***Левонова яма***, ***Янув рів*** у Брэсцкім раёне, ***Мачуковэ озыро*** (Церабунь Брэсцкага раёна), ***рака Марцёха*** (Тамашоўка Брэсцкага раёна).

Невялічкія гідрааб’екты і штучныя вадаёмы могуць зусім не мець спецыяльных назваў. Мясцовыя жыхары часта называюць іх родавымі геаграфічнымі тэрмінамі: ***возера***, ***канава***, ***ручай***, ***роў***, ***яма***.

Назвы неславянскага паходжання этымалагізуюцца цяжка. Звычайна яны заканчваюцца на *-ва*, *-да*, *-жа*, *-ла*, *-ма*, *-са*,*-ша* (***Мытва***, ***Ясельда***, ***Вожа***, ***Волма***, ***Арэса***), але могуць быць утвораны ад балтыйскіх каранёў пры дапамозе славянскіх суфіксаў: ***Сільніца*** (лат. sils ‘*бор*’), ***Шылаўская*** (параў. літ. silas ‘*лес*’), ***Думблянка*** (літ. dumblas ‘*глей, ціна, гразь*’, ***Нарач*** (літ. naras ‘*птушка, нырок, гагарка*’) [22, с. 16–17].

Л. В. Леванцэвіч у дапаможніку “Лінгвістычнае краязнаўства” сістэматызуе звесткі пра паходжанне гідронімаў Берасцейшчыны: “Рака *Ясельда* (варыянты *Ясольда*, *Ясолка*, *Яцельда*, *Ясіолда*). Хутчэй за ўсё гэта

кантамінаваная, «гібрыдная» славяна-яцвяжская назва, бо тут славянскі корань ***jasl** і яцвяжскі фармант ***da**. На Піншчыне існуе мясцовая назва ракі – *Ясэлька* «рака асаў», багоў, якім пакланяліся індаеўрапейцы яшчэ ў часы свайго першага пранікнення да Балтыі. Параўнаем, у індаеўрапейцаў рака – «альда», а ў балтаў човен – «алдзія». Культ асаў захоўвалі готы і ірландцы, таму, разглядаючы фармант **да**, нельга прыпісваць назву толькі да яцвяжскай. У аснове назвы можа быць і славянскае слова *яслі* – ‘кармушка для свойскай жывёлы, у якую, як у драбінкі, закладваюць сена’.

У назве ракі *Дарагабуж* (прыток Ясельды) таксама знаходзяць як славянскую, так і балцкую аснову. У. М. Тапароў і А. М. Трубачоў мяркуюць, што гэтая назва з’яўляецца вытворнай на ***ja** ад славянскай формы **Дорогобудь*, *Dorogobud*. У кельтаў слова «драгон» – кола, адсюль колавая павозка – “дрогі”, а шлях для яе – дарога, або дрога. Г.М. Пыж’янава звязвае назву са словамі *дарога* і *буса* ‘выдзеўбаная лодка, човен’. Семантыка назвы – ‘дарога для чоўна’” [32, с. 55–56].

Дэрывацыю гідраніміі Заходняга Палесся разгледзела В. Брышчен: “У выніку структурна-словаўтваральнага аналізу гідранімічнага матэрыялу Заходняга Палесся ўстаноўлена, што гідронімы, зафіксаваныя на даследаванай тэрыторыі, прадстаўлены простымі, складанымі і састаўнымі назвамі.

Даволі значную частку ад усіх зафіксаваных гідронімаў складаюць простыя найменні, ужытыя найчасцей у форме назоўнікаў: *воз.* ***Астравок***, р. ***Плотніца***, р. ***Піна***, к. ***Страла***, радзей – у форме прыметнікаў: воз. ***Мульнае***, воз. ***Чорнае***, р. ***Лясная***.

Сярод простых гідронімаў афіксальныя ўтварэнні пераважаюць над бязафікснымі. Да тыпу афіксальнага ўтварэння належаць назвы гідрааб’ектаў, у структуру якіх уваходзяць афіксы, што маюць статус тапанімічных або спецыфічныя прыкметы тапанімічнасці. Абсалютная большасць афіксальных гідронімаў Заходняга Палесся ўтворана па тыпе суфіксацыі. Пры класіфікацыі ў асобныя групы вылучаны мадэлі, тапафарманты якіх характарызуюцца наяўнасцю агульнага суфіксальнага элемента. Найбольш распаўсюджанымі і прадуктыўнымі з’яўляюцца суфіксальныя элементы *-к-*, *-ц-*, *-н-*, *-в-*: р. ***Кобрынка***, р. ***Барысаўка***, к. ***Смаляніца***, к. ***Лешня***, вад. ***Лукава***. Прэфіксальныя і прэфіксальна-суфіксальныя гідронімы разам складаюць невялікую групу сярод усіх зафіксаваных афіксальных назваў: *р.* ***Прысёла***, *р.* ***Прысела***, *р.* ***Запруда***.

Сутнасць бязафікснага, ці семантычнага, спосабу заключаецца ва ўтварэнні гідронімаў шляхам пераносу ў тапанімію апелятываў ці онімаў без змены структуры зыходнага слова. Такі перанос суправаджаецца стратай датапанімічнага значэння і напаўненнем слова новым, тапанімічным зместам, г. зн. адбываецца яго пераасэнсаванне.

Да ліку бязафіксных утварэнняў належаць гідронімы, па граматычнай структуры роўныя апелятывам з невытворнай асновай: *к.* ***Страла*** (Івацэвіцкі, Іванаўскі), *р.* ***Ступа*** (Пінскі), *р.* ***Струга*** (Іванаўскі), *р.* ***Смуга*** (Камянецкі), *р.* ***Канава*** (Брэсцкі), *р.* ***Вішня*** (Камянецкі), *р.* ***Брод*** (Брэсцкі), *р.* ***Сарока*** (Брэсцкі), *р.* ***Мыш*** (Пінскі) і інш. У функцыі гідронімаў даследуемай тэрыторыі ўжываюцца таксама вытворныя (суфіксальныя) апелятывы без спецыяльных тапанімічных фармантаў: *р.* ***Млынок*** (Драгічынскі), *к.* ***Мядзведзіца*** (Маларыцкі), *р.* ***Стрэлка*** (Маларыцкі) і г. д.

Зафіксаваны назвы гідронімаў, суадносныя з якаснымі прыметнікамі. Лексемы, што іх матывуюць, указваюць звычайна на пэўную характэрную асаблівасць аб'екта: колер вады: *воз.* ***Белае*** (Брэсцкі), *воз.* ***Чорнае*** (Бярозаўскі), *воз.* ***Мульное*** (Іванаўскі), *к.* ***Рудная*** (Івацэвіцкі); размяшчэнне ў прасторы: *р.* ***Папярэчная*** (Пружанскі); тэмпературу вады: *р.* ***Люта*** (Лунінецкі), *р.* ***Лютая*** (Брэсцкі), *р.* ***Студзёнка*** (Кобрынскі); забалочанасць: *р.* ***Струга*** (Іванаўскі).

Бязафіксны (семантычны) спосаб словаўтварэння водных найменняў даследуемай тэрыторыі прадстаўлены трыма відамі пераносу назваў: *метаніміяй*, *метафарай*, *сінекдахай*. Сутнасць тапанімічнай метаніміі ў тым, што адзін аб'ект называецца імем другога, які знаходзіцца з ім у прасторавых сувязях: *воз.* ***Астравок*** (Пескі Кобрынскі) – атрымала такую назву таму, што пасярэдзіне возера знаходзіцца пясчаны астравок.

Сустракаюцца гідронімы, утвораныя па мадэлі *сінекдахі*, г. зн. водныя найменні ўзнікаюць шляхам пераасэнсавання геаграфічных тэрмінаў. Распаўсюджанне гэтага тыпу пераносу тлумачыцца тым, што гідрааб'екты ў асноўным невялікія па памерах і часта не маюць спецыяльных уласных назваў, у якасці якіх і выкарыстоўваюцца геаграфічныя тэрміны: *р.* ***Орля*** (Івацэвіцкі) – са старажытнапрускага «возера», *р.* ***Запруда*** (Іванаўскі), *р.* ***Струга*** (Іванаўскі) – ад мясц. *струга* «балоцістая мясціна».

Нешматлікую колькасць складаюць гідронімы, утвораныя па мадэлі *метафары*. Асновай метафарычнага наймення служыць знешняе падабенства паміж гідрааб'ектам і прадметам, назва якога пераасэнсоўваецца: *к.* ***Страла*** (Івацэвіцкі), *воз.* ***Падкова*** (Брэсцкі)" [14, с. 179–181].

Дэрывацыя мікратапонімаў Берасцейшчыны была разгледжана В. М. Емельяновіч: "Назвы малых геаграфічных аб'ектаў – **мікратапонімы** – адрозніваюцца ад назваў паселішчаў тым, што яны не зафіксаваны на картах і вядомыя невялікай колькасці людзей, але іх значна больш, чым айконімаў, і яны таксама нясуць багатую інфармацыю: пра жывёльны і раслінны свет краю, гісторыю яго засялення, пра гаспадарчую дзейнасць нашых продкаў.

Паводле паходжання назвы ўрочышчаў маюць многа агульнага з назвамі паселішчаў. Іх утваральнымі асновамі з'яўляюцца як агульныя, так

і ўласныя назоўнікі. Сярод агульных, у першую чаргу, – геаграфічныя тэрміны: назвы мясцовага рэльефу (мікратапонімы тыпу ***Богно***, ***Балоцечка***, ***Вярхі***, ***Града***, ***Груд***, ***Даліна***, ***Купіна***, ***Равок***, ***Ямнік***), назвы лясных масіваў, дрэў і раслін (***Бор***, ***Гайкі***, ***Лясок***, ***Дуброўка***, ***Лозы***, ***Дубнічкі***, ***Альхова***, ***Ляшчыннік***, ***Малінне***), назвы вадаёмаў і іх частак, або гідралагічныя тэрміны (***Азярышча***, ***Зарэчка***, ***Крыніца***, ***Брады***, ***Вадзіца***, ***Затокі*** і інш.).

Назвы палёў часта матывуюцца земляробчымі тэрмінамі. У іх аснове ляжаць назвы зямельных участкаў па спосабе набыцця (*надзел*, *паласа*, *дзялянка*, *прыдатак*, *рэзы*, *рэзкі*) і старажытныя і сучасныя назвы адзінак вымярэння зямельнай плошчы (*валока*, *морг*, *шнур*, *дзесяціна*, *гектар*), назвы ўчасткаў па іх канфігурацыі (*востраў*, *вугал*, *клін*, *рог*), назвы з агульным значэннем ‘*поле, ворная зямля’*, словы-антонімы (*навіна – старына*), назвы ўчасткаў у залежнасці ад якасці глебы (*глінішча*, *лысуха*, *камяніца*, *тарфянікі*): ***Дзялка*** (вёска Клейнікі Брэсцкага раёна), ***Валока*** (вёскі Боркі Бярозаўскага раёна, Еўлашы Іванаўскага раёна), ***Шнурэ*** (вёска Обэч Пружанскага раёна), ***Моргы*** (вёска Мацы Кобрынскага раёна, Казловічы Брэсцкага раёна), ***Дысятына*** (вёска Плоска Брэсцкага раёна), ***Новына*** (вёска Еўлашы Іванаўскага раёна), ***Старына*** (вёска Галены Пружанскага раёна), ***Клін*** (вёска Азарычы Пінскага раёна), ***Куток*** (вёска Каты Драгічынскага раёна), ***Остров*** (вёска Валішча Пінскага раёна), ***Глінкі*** (вёска Лазоўка Пружанскага раёна), ***Пясчанка*** (вёска Таўцвілы Пружанскага раёна).

Шырокае адлюстраванне ў мікратапаніміі знайшлі і назвы тыпаў пасяленняў. Старой сістэмай вядзення гаспадаркі было абумоўлена з’яўленне тапонімаў, утвораных ад апелятываў *дворышча*, *печышча*, *селішча.* Земляробства вялося на невялікіх участках сярод балот і лясоў. У сувязі з тым, што зямля праз некаторы час спусташалася, прыходзілася мяняць участкі. Пакінутыя землі называліся ***Дворышчамі***, ***Печышчамі***, ***Селішчамі***. Хутарная сістэма вядзення гаспадаркі адлюстравана ў мікратопонімах ***Абруб***, ***Засценкі***, ***Хутары***.

Мікратапонімы заўсёды перадаюць асаблівасці дыялектнай мовы. Вясковае насельніцтва называе палі, дарогі, сенажаці словамі той гаворкі, якой карыстаецца, таму асновамі мікратапонімаў часам з’яўляюцца вузкамясцовыя словы або паланізмы, асіміляваныя гаворкай. Да такіх мікратапонімаў на Берасцейшчыне можна аднесці назвы ***Кубаня*** (луг у вёсцы Падбела Камянецкага раёна), ***Кубані*** (лес ля вёскі Радванічы Брэсцкага раёна) – ад лакалізаванага ў Пабужжы тэрміна *кубаня*, што мае значэнне ‘невялікае штучнае азярцо’ або ‘яма, запоўненая вадой’, ***Кацёл*** (поле ў вёсцы Сухаполь Пружанскага раёна), ***Куцёл*** (сенажаць у вёсцы Шышова Камянецкага раёна) – ад мясцовага *кацёл* ‘глыбокая круглая яма’

або ‘глыбокае месца ў рацэ, вір’, ***Кенпы*** (купністы луг у вёсках Брэсцкага, Кммянецкага і Пружанскага раёнаў), ***Струга*** (вёска Якаўчыцы Жабінкаўскага раёна) ад старабеларускага і польскага ‘роў, выбіты ручаямі, што сцякаюць з высокага месца’, ***Шаховніца*** (вёска Сасноўка Пружанскага раёна) – ад польскага szahownica ‘палі, размешчаныя ў выглядзе шахматнай дошкі, цераспалосіца’.

Сярод уласных назоўнікаў утваральнымі асновамі мікратапонімаў часцей за ўсё з’яўляюцца імёны, прозвішчы і мянушкі людзей, радзей – назвы вёсак і гідрааб’ектаў. Гэта мікратапонімы тыпу ***Аляксандрава***, ***Грыневічава***, ***Яромаўшчына***, ***Адамавы кавалкі***, ***Барысаў гарод***, ***Асошніцкі лес*** (ад назвы вёскі ***Асошнікі***), ***Бузуноўска дарога*** (вядзе ў вёску ***Бузуны*** Пружанскага раёна), поле ***Рудаўка*** – рака ***Рудаўка***, прыток Нарава, сенажаць ***Пульва*** – рака ***Пульва***, прыток Лясной, поле ***Тачніца*** – рака ***Тачніца***, прыток Левай Лясной.

Паводле структуры мікратапонімы могуць быць: простыя (***Азярышча***, ***Грушэўшчына***, ***Крапіўніца***, ***Сівец***, ***Хвішка***), складаныя (***Верхалессе***, ***Кацыполле***, ***Васьмізагоны***, ***Сямівехі***, ***Трохзагонніца***) і састаўныя (***Велькі Вугал***, ***Друга стрэлка***, ***Якімовы гектары***).

Простыя мікратапонімы вельмі часта ўтвараюцца семантычна, шляхам пераасэнсавання агульных і ўласных назоўнікаў без іх фанетычнага і граматычнага змянення. Назва вёскі ці ракі як бы пераносіцца на поле, луг, лес, могуць пераносіцца і назвы звычайных прадметаў, калі мікрааб’ект нагадвае іх сваёй канфігурацыяй, – мікратапонімы тыпу ***Гара***, ***Галіцыя*** (вёска Лука Столінскага раёна), ***Грыўда*** (рака Грыўда, Прыток Шчары – Пружанскі раён), ***Лыч***, ***Нага***, ***Штаны*** (Пружанскі раён).

Спецыфікай састаўных мікратапонімаў з’яўляецца тое, што яны могуць мець форму прыназоўніквава-іменных канструкцый (***За садам***, ***На Вялікасельскім***, ***Пад лес*** і інш.). Гэта сведчанне таго, што працэс тапанімізацыі гэтых назваў яшчэ не закончыўся, што многія з іх знаходзяцца як бы на шляху пераўтварэння агульных назоўнікаў ва ўласныя.

Мікратапонімы менш устойлівыя, чым гідронімы і айконімы, яны часцей мяняюцца, сярод іх існуюць нават назвы-дублеты, калі адно і тое ж поле ці той самы лес называюцца па-рознаму. У наш час у сувязі са зменамі ў грамадскім жыцці шмат якія назвы зусім знікаюць. Гэтым тлумачыцца неабходнасць іх хутчэйшага запісу і вывучэння” [22, с. 20–22].

На працягу многіх стагоддзяў фарміраваўся такі насычаны нацыянальна-культурнай інфармацыяй складнік анамастыкону, як прозвішчны фонд беларусаў. “Паводле паходжання сістэма прозвішчаў, якія ўжываюцца на Беларусі, з’яўляецца неаднароднай. Гэты разрад антрапонімаў утрымлівае каштоўную інфармацыю пра асаблівасці

матэрыяльнай і духоўнай культуры нашых продкаў. Прозвішчы ўзнікалі ад: кананічнага імені: *Іванчын*, *Пятроў*, *Паўленка*; імён-мянушак: *Дзеравянка, Салапека, Зубаха*; назваў людзей па прафесіі: *Стралец*, *Каваль*; паселішча, дзе нарадзіўся: *Пінчук*, *Туравец*, *Кобрынскі*; іншых уладанняў: *Падгайскі*, *Падлужны*, *Маставы*, *Паляшук*; язычніцкіх багоў: *Велес*, *Пярун*, *Падвей*, *Грамыка*; міфічных істот: *Лясун*, *Вадзянік*, *Чур*; назвы народаў і этнічных груп: *Паляк*, *Ляхавец* (паляк), *Мазур* (этнічная група палякаў), *Прусак* (Прусія), *Швед*, *Жамойдзін* (Літва), *Татарчук*. Асобныя рамёствы ў наш час зніклі, а прозвішчы засталіся: *Бортнік*, *Руднік*, *Паташнік*, *Смалянік*, *Дзягцяр*, *Алейнік*" [32, с. 41].

Г. Усціновіч прааналізавала тэрытарыяльнае пашырэнне на Беларусі прозвішчаў, утвораных з дапамогай розных суфіксаў.

"Тэрытарыяльна нераўнамерна размешчаны прозвішчы з суфіксамі -оў,-аў, -еў, -ін,-ын. Максімальна пашыраны прозвішчы з суфіксам -оў,-аў, -еў у Магілёўскай вобласці, дзе ў некаторых раёнах яны складаюць больш за 50 %, а ў Гродзенскай вобласці і ў паўднёвай частцы Брэсцкай вобласці – ці адсутнічаюць зусім, ці сустракаюцца спарадычна. Значыць, у Беларусі назіраецца змяншэнне колькасці такіх прозвішчаў у напрамку з усходу на захад. Арэал пашыранасці гэтага тыпу супадае з тэрыторыяй, што ўвайшла ў склад Расіі ў 1722 годзе, а пры пашырэнні рускага самакіравання падчас афармлення дакументаў большасць насельніцтва была запісана прозвішчамі з суфіксамі -оў, -еў. Так сцвярджаў М. Бырыла. Выбар суфіксаў вызначаецца характарам асновы, да якой далучаецца адзін з адзначаных фармантаў. Прозвішчы на -оў / -аў / -еў ёсць не толькі ў беларусаў, але і ў рускіх, украінцаў, палякаў, але ў рускіх іх больш, чым у беларусаў і ўкраінцаў.

Прозвішчы на -скі/ -цкі найбольш часта сустракаюцца ў Гродзенскай, Мінскай і ўсходняй частцы Віцебскай абласцей. Прозвішчы на -скі/ -цкі маюць тапанімічны характар, таму што лексічнай асновай іх выступае тапонім. Такая аснова ўказвае на рэгіён, уладанне, якое належала асобе, або мясцовасць, адкуль яна паходзіць. Напрыклад: ***Слонімскі, Халецкі, Яленскі.*** Але пад уплывам моды на польскія намінацыі на -скі/ -цкі яны маглі ўтварацца непасрэдна ад антрапонімаў. Таму адрозніваюцца прозвішчы тапанімічнага і антрапанімічнага характару. На практыцы такія ўтварэнні цяжка размежаваць. Так, прозвішча ***Крывіцкі*** магло ўтварыцца ад тапонімаў Крывічы, Крывая і ад антрапоніма Крывы. Прозвішчы на -скі/ -цкі – гэта найбольш старажытны тып у палякаў (***Запатоцкі, Скарападскі***). Параўн. аналагічныя рускія княжаскія прозвішчы – ***Вяземскі*** і інш. Больш познія прозвішчы на -скі / -цкі былі ў духавенства: ***Мірскі, Жыровіцкі*** [72, с. 75].

А.Ф. Рогалеў адзначае, што “сярод непатранімічных прозвішчаў асаблівае месца займаюць прозвішчы на -скі/ -цкі. Такія антрапонімы характэрныя для шырокага этнакультурнага арэала, які ўключае Беларусь, Украіну і Польшчу.

У многіх выпадках нярэдка (а часам немагчыма) устанавіць паходжанне прозвішча, асабліва калі яны не маюць дакладых фанетычных прымет польскай, украінскай, беларускай моў і маюць утваральную топааснову (канкрэтную геаграфічную назву, ад якой прозвішча ўтворана), паўтаральную ў розных славянскіх мовах.

Так, беларускім паводле паходжання можна лічыць, напрыклад, прозвішча ***Ашмянскі***, якое адлюстроўвае беларускае аканне і ўтворана ад назвы беларускага горада Ашмяны, што знаходзіца ў Гродзенскай вобласці. У прозвішчы ***Васілевіцкі*** зафіксавана беларуская форма прыметніка ***васілевіцкі*** (параўн. рускую форму ***василевичский***) – ад назвы беларускага горада ***Васілевічы*** Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці.

Першапачаткова прозвішчы на -скі/ -цкі належалі да вышэйшых слаёў грамадства і ўтвараліся ад назваў уладанняў. Такое паходжанне надавала гэтым прозвішчам сацыяльную прэстыжнасць.

Прэстыж прозвішчаў на –скі / -цкі, якія лічыліся польскімі і шляхетнымі, быў настолькі высокім, што гэты словаўтваральны тып быў распаўсюджаны і на патранімічныя прозвішчы. Напрыклад, ***Пятроў*** станавіўся ***Пятроўскім***.

У XIV-XV стагоддзях іменаванні на -скі / -цкі былі родавымі празваннямі-тытуламі, якія перадаваліся ад бацькі да сына як сімвал тэрытарыяльнай улады.

Калі з сярэдзіны XVI стагоддзя сталі фарміравацца пастаянныя прозвішчы, у іх склад і ўвайшлі такога роду найменні: ***Вяземскі*** – ад Вязьма, ***Масальскі*** – ад Масальск, ***Трубяцкі*** – ад Трубчэўск.

Рэдкасць рускіх прозвішчаў на -скі/ -цкі, на думку Б. Унбенгауна, тлумачыцца таксама сістэмай землеўладальніцтва ў Маскоўскай Русі. Спадчынных уладанняў (вотчын) там было няшмат. Вялізныя тэрыторыі займалі так званыя маёнткі (рус. поместья), якія кіраваліся памешчыкамі. Маёнткі даваліся царом як узнагарода за службу – ваенную ці цывільную. Пасля смерці ўладальніка яны адыходзілі ў казну і далей маглі быць перададены новаму ўладальніку. Частая змена землеўладальнікаў перашкаджала стварэнню прозвішчаў, заснаваных на назвах маёнтка.

Зусім іншая сітуацыя складвалася ў Рэчы Паспалітай. Тут здаўна дваране валодалі маёнткамі, якія перадаваліся ў спадчыну, і найменні гэтых дваран (магнатаў і шляхты) заканамерна ўтвараліся ад назваў іх маёнткаў” [53, с. 66–67].

А. Усціновіч адзначае: “Славянскім мовам у той ці іншай ступені вядомы прозвішчы з патранімічныя суфіксамі -іч / -ыч / -ыц / -овіч / -евіч / -авіч: ***Адаміч, Адамовіч, Асташкевіч, Жарыч, Казакевіч, Лазарэвіч.*** Максімальная прадуктыўнасць прозвішчаў гэтага тыпу на паўночнай ускраіне Мінскай вобласці на паўночны захад ад Полацка і ў Брэсцкай вобласці ў зоне Пружанаў і зоне Лунінца, у паўднёва-заходняй частцы Мінскай вобласці, на ўсходзе Гродзенскай і Мінскай абласцей. Не адзначаны прозвішчы з гэтым суфіксам у паўднёва-ўсходняй частцы Гомельскай вобласці. Безумоўна, частотнасць прозвішчаў з гэтым суфіксам на ўсёй тэрыторыі Беларусі розная, ад 50 % да менш. 10 %. Пры дапамозе суфіксаў -іч, -ыц утвораны прозвішчы ад поўных і скарочаных формаў славянскіх мужчынскіх імён, уласных асабовых хрэсных поўных, размоўна-бытавых і скарочаных формаў імён і ад імён-мянушак (***Абодзіч, Галоўчыц, Смоліч***). Пры спалучэнні з суфіксамі -оў / -еў / -ін утварыліся расшыраныя суфіксы -овіч, -евіч, -ініч: ***Андрушкевіч, Кляновіч, Кунцэвіч, Пятровіч, Русаковіч***. Суфікс -іч, -ыц меў памяншальнае і прыналежнае значэнне, выступаў і ва ўскладненай форме -овіч, -евіч. Па ступені прадуктыўнасці і пашыранасці вылучаецца беларуска-ўкраінска-польская зона.

Прозвішчы з суфіксам -ук,-юк максімальна пашыраны ў паўднёва-заходняй частцы Брэсцкай вобласці. Не адзначаны гэты тып у Магілёўскай вобласці, усходняй частцы Віцебскай і Гомельскай, паўночнай частцы Мінскай і ў раёне Ліды ў Гродзенскай вобласці. Прозвішчы на -ук / -юк утвараюць украінска-беларуска-рускі арэал з адзіным ядром найбольшай прадуктыўнасці, якое знаходзіцца на сумежнай тэрыторыі паўночна-заходняй Украіны і паўднёва-заходняй Беларусі. Пры аддаленні ад гэтага ядра і на Украіне, і на Беларусі паступова змяншаецца прадуктыўнасць прозвішчаў з суфіксам -ук / -юк. Прозвішчы з адзначаным суфіксам утварыліся як ад уласных асабовых імён (***Абрамук, Апанасюк, Сідарчук***), так і ад імён-мянушак (***Кавальчук, Пакіслюк, Прымачук***).

Да дэмінутыўных формаў уласных асабовых імён і антрапонімаў апелятыўнага паходжання генетычна ўзыходзяць прозвішчы з суфіксамі -ік /-ык / -чык: ***Баганік, Бадзялік, Базыльчык, Бандзік, Бражнік, Грынчык, Красік, Пузік.*** Гэты тып прозвішчаў адзначаны ў паўднёвай частцы Гродзенскай і паўночнай ускраіне Брэсцкай абласцей. Спарадычна прозвішчы з суфіксам -ік / -ык / -чык сустракаюцца ў паўночна-заходняй частцы Гродзенскай, на большай частцы Віцебскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцей.

Цікавую групу складаюць прозвішчы з суфіксамі -ец, -эц: ***Антонец, Іванец, Міронец, Якавец.*** Так называлі дзяцей у сям’і. Але з цягам часу ўжо дарослыя дзеці пераносілі такія формы і на сваіх дзяцей. Разам з тым,

пры дапамозе суфікса -ец / -эц утвораны прозвішчы ад назваў мясцовасці – геаграфічных і тапанімічных – Азярэц (возера), Асавец (Осава), Ашмянец (Ашмяны), Быхавец (Быхаў). Але ад такіх антрапонімаў неабходна адрозніваць прозвішчы з суфіксам -авец: ***Паўлавец, Цітавец, Яфімавец***. Тут суфікс -авец мае патранімічнае значэнне. Пры дапамозе яго ўтвораны прозвішчы ад асабовага імя ці імя-мянушкі бацькі – ***Буравец, Гаўрылавец, Жукавец, Івашкавец, Клімавец, Рагавец, Тарасавец, Філіпавец, Хлебавец, Худавец, Чарнавец.*** Прозвішчы з суфіксамі -ец /-эц / -авец тэрытарыяльна пашыраны раўнамерна.

У беларускай мове прозвішчы з суфіксам -ак, -як нячастыя. Пашыраны яны ў асноўным у паўднёва-заходняй частцы Беларусі – на Брэстчыне. У Польшчы суфікс -ак / -як прадуктыўны і тыповы для паўночна-ўсходняй часткі краіны, на поўдні яму адпавядаюць суфіксы -ек / -ік: ***Антосяк, Барадак, Бачак, Пятрак, Юрчак.*** Уласцівы беларускай мове прозвішчы з суфіксам -еня / -эня, які засведчаны на поўдні Мінска і на поўначы Брэсцкай і Гомельскай абласцей. Па значэнні суфікс -еня / -эня суадносіцца з апелятыўным суфіксам -яня (*гусяня, кацяня, качаня*), які ў прозвішчах выражае патранімічныя адносіны. Прозвішчы з суфіксам -еня / -эня ўтварыліся ад уласных асабовых імён (***Абраменя, Асташэня, Каліценя, Кандраценя, Паўленя, Пятрэня, Сергіеня, Тарасеня***) і ад антрапонімаў апелятыўнага паходжання (***Бабеня, Гайдучэня, Каваленя, каратчэня, Удавеня***).

Асноўны масіў бытавання прозвішчаў з патранімічнымі суфіксамі -енка / -энка / -анка – усходняяя частка краіны (на ўсходзе ад лініі Бягомль – Барысаў – Чэрвень – Слуцк – Лунінец). Ядро максімальнай канцэнтрацыі іх не на пагранічча з Украінай, а ў зоне горада Віцебска (хоць прозвішча і лічыцца тыпова ўкраінскім). У Гродзенскай, Мінскай і Брэсцкай абласцях прозвішчы з суфіксам -енка / -энка / -анка адсутнічаюць ці сустракаюцца толькі спарадычна. Утвораны прозвішчы ад асабовых імён і імён-мянушак: ***Абраменка, Брыленка, Воўчанка, Дударэнка, Ігнаценка***.

Беларускай мове ўласцівы прозвішчы з суфіксамі -онак / -ёнак. Аднак яны сустракаюцца на тэрыторыі, прылеглай да Расіі. Суфікс -онак / -ёнак мае патранімічнае значэнне. Пры дапамозе яго ўтвораны прозвішчы ад уласных імён – ***Адамёнак, Барысёнак, Іванёнак, Кандрацёнак, Паўлёнак*** і ад антрапонімаў апелятыўнага паходжання – ***Арлёнак, Акулёнак, Глушонак, Кавалёнак, Лісічонак, Сталяронак.*** Прозвішчы з гэтым суфіксампашыраны на той жа тэрыторыі, на якой бытуюць назвы маладых жывёлін – *цялёнак, парасёнак, жарабёнак*, у той час як на іншай – *цяля, парася, жарабя.* Арэал прозвішчаў з суфіксам -онак / -ёнак – на поўнач ад Мінска і ў паўночна-заходняй частцы Віцебскай вобласці.

Прозвішчы, утвораныя суфіксамі -оў / -еў / -аў / -ін / -ын / -скі / -цкі / -віч / -евіч / -авіч / -іч / -ыч / -ак / -як / -ец / -эц, вядомы ўсім славянскім мовам. Малапрадуктыўнымі пры ўтварэнні прозвішчаў з'яўляюцца суфіксы -ак / -як / -ік / -ык / -чык / -ец / -эц / -авец. Пашыраны сярод усходніх славян прозвішчы з суфіксамі -ук / -юк / -енка / -энка / -анка. Да ўласнабеларускіх прозвішчаў адносяцца тыя, што ўтвораны суфіксамі -ёнак / -онак / -еня / -эня. Суфіксы -ік / -ык / -чык маюць памяншальнае (у апелятывах і антрапонімах) і патранімічнае значэнне. Суфіксы -ук / -юк / -чук – нейтральнае значэнне ў апелятывах і патранімічнае ў антрапаніміі. Пры дапамозе суфікса -ак / -як утвараюцца назвы жыхароў па назвах населеных пунктаў (патранімічнае значэнне). Суфікс -ец / -эц мае памяншальнае значэнне (у апелятывах і антрапонімах), пры яго дапамозе утвараюцца назвы асоб па назвах населеных пунктаў" [72, с. 75–77].

І. А. Шумская прааналізавала словаўтваральныя тыпы прозвішчаў студэнтаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. "Паходжанне многіх з гэтых прозвішчаў матываванае: яны ўтвораны або ад уласных кананічных імёнаў, або ад апелятыўнай лексікі. Большасць прозвішчаў утворана ад імён: ***Абрамчук***, ***Алексіч***, ***Астапчук***, ***Васільковіч***, ***Грынчык***, ***Карняйчук***, ***Ігнацюк***, ***Лаўранюк***, ***Міхайлава***, ***Карпук***, ***Міцкевіч***, ***Панасюк***, ***Пашкоўская***, ***Юрчанка***, ***Яшчук***, ***Фаміна***, ***Барташ*** (***Варфаламей***, кат. ***Барталамей***), ***Мончык*** (***Моня*** ад ***Маісей***), ***Санько*** (ад ***Аляксандр***), ***Сацюк*** (памянш. ад ***Сацір***). Прозвішчы ***Нялюбіна***, ***Мароз***, ***Някрасава***, ***Субоціна*** ўтварыліся ад дахрысціянскіх імён ***Нялюб***, ***Някрас***, ***Мароз***, ***Субота***. Прозвішчы ***Ляшкевіч***, ***Прус***, ***Сярбук*** паходзяць ад назваў прышэльцаў з іншых мясцовасцяў.

Некаторыя прозвішчы ўзніклі з імён-мянушак, якія не толькі канкрэтна называюць асобу, але і характарызуюць яе па нейкай адметнай уласцівасці: ***Горбава***, ***Клюка***, ***Губарэвіч*** (губач, губаты), ***Цэкала*** (асаблівасці маўлення).

Другую групу складаюць прозвішчы, утвораныя ад разнастайных апелятываў, якія вызначалі асобу па роду заняткаў: ***Бандарчук***, ***Камісарэнка*** (*камісар* – чыноўнік, які выконваў паліцэйскія функцыі), ***Канавалюк***, ***Кузняцова***, ***Кавальчук***, ***Капітан***, ***Кухарчук***, ***Музыкіна***, ***Папеня***, ***Смаляўская***, ***Сталярчук***, ***Топчая*** (цюркск. ***топчы*** – артылерыст); абазначалі назвы раслін, жывёл, птушак: ***Валошка***, ***Варанюк***, ***Дрозд***, ***Жук***, ***Заяц***, ***Пугачова***, ***Салаўёва***, ***Селях*** (у многіх гаворках азначае '*качар*', магчыма, скарочанае ад ***Саліфан***), ***Савінская***, ***Турыч*** (***тур*** – вымерлы дзікі бык), ***Уюн***; паказвалі на розныя якасці, уласцівасці: ***Кудлач***, ***Няволіна*** (ад *няволя* – 'паднявольны чалавек'), ***Рыкава***, ***Серыкава*** (ад *шэры* – колер скуры ці адзення, ці просты, грубы чалавек), ***Хмара*** (хмуры, пануры чалавек); абазначалі розныя прадметы: ***Барушка*** (рус. *борушка* – 'жаночы

галаўны ўбор’), ***Бакштай*** (устар. *бакшта* – ‘гаўптвахта, турма’, ‘вежа’), ***Балка*** (лагчына), ***Гурская*** (ад гура – ‘сумёт, гурба’), ***Доўбік*** (*доўба* – старабел. ‘довба’ – яма, роў), ***Куклеўская*** (магчыма, ад *кукла* – прычоска), ***Молат***, ***Саханевіч***, ***Солапава*** (*солап* – ‘той, хто высалоплівае язык’), ***Шклянік***, ***Шырма***. Два прозвішчы ўтварыліся ад дзеяслоўных асноў: ***Атліванава*** (адліваць, *адліваны* – добра складзены, прыгожы), ***Пагарэлава*** (пагарэць, з пагарэлай вёскі).

Асаблівасць адапелятыўных прозвішчаў у тым, што яны суадносяцца з апелятывам не непасрэдна, а праз антрапонім дапрозвішчнай фармацыі: апелятыў – антрапонім (старажытнае імя) – сучаснае прозвішча.

Разнастайныя формы прозвішчаў і паводле структуры. Большасць з іх утварылася пры дапамозе патранімічных суфіксаў -ук, -юк, -чык: ***Абрамчук***, ***Астапук***, ***Карпук***, ***Ігнацюк***, ***Сталярчук*** і інш.; -к, -ік, -чык, -нік, -янік: ***Доўбік***, ***Грынчык***, ***Шклянік***; -іч, -ыч, -овіч, -евіч, -эвіч: ***Алексіч***, ***Турыч***, ***Васільковіч***, ***Саханевіч***; -еня, -енка, -энка, -анка: ***Юрчанка***, ***Камісарэнка***, ***Крысенка***, ***Папеня***. Шмат прозвішчаў утварылася семантычным спосабам: ***Жук***, ***Дрозд***, ***Заяц***, ***Шпак***” [76, с. 182–183].

Адтапанімныя дэрываты (**ад’ектонімы** і **катайконімы**) – вялікі старажытны пласт лексікі беларускай мовы, словаўтваральная норма якога фарміруецца спантанна. ***Ад’ектонімы*** – адтапанімныя прыметнікі (*гершонскі*, *заазерскі*, *крушынскі*, *галоўчыцкі*), ***катайконімы*** – назоўнікі, найменні жыхароў паводле назвы месца жыхарства (*альпенцы*, *альпенец*, *альпенка*, *столінцы*, *столінец*, *столінка*). На сучасным этапе развіцця культуры адбываецца мэтанакіраванае, асэнсаванае ўтварэнне ад’ектонімаў і катайконімаў і іх вытворных.

Адтапанімныя вытворныя выйшлі за межы дыялектнага і бытавога маўлення, яны шырока выкарыстоўваюцца ў афіцыйна-дзелавым, навуковым стылях, у розных жанрах мастацкай літаратуры. Беларускія мовазнаўцы актыўна пачалі займацца складаннем слоўнікаў ад’ектонімаў і катайконімаў толькі ў другой палове XX ст. Гэтыя лексемы прааналізаваны на тэрыторыях пэўных моўных арэалаў (В. В. Шур, З. М. Заіка, У. М. М. Генкін, А. А. Паўленка, В. І. Піскун, Л. М. Шакун, П. П. Шуба, Т. М. Шчур і інш.).

МАТЭРЫЯЛЫ ДА ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

Практычныя заняткі 1
АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ ТЭОРЫІ АНАМАСТЫКІ

Пытанні для самакантролю

1. Акрэсліце значэнні тэрміна **анамастыка**. Што з'яўляецца яе аб'ектам?
2. Назавіце прыметы ўласных імёнаў. Чым онімы адрозніваюцца ад агульных назоўнікаў (апелятываў)?
3. Якое месца займае анамастыка сярод іншых дысцыплін? Акрэсліце яе суадносіны з лінгвістыкай, гістарычнымі навукамі, геаграфіяй, сацыялогіяй.
4. Параўнайце меркаванні розных навукоўцаў аб наяўнасці/адсутнасці ва ўласнага імені лексічнага значэння, яго характары, аб'ёме, прыродзе, сутнасці супрацьпастаўлення ўласных імёнаў агульным.
5. Акрэсліце значэнні тэрміна **анамастыкон (анамастычная прастора)**.
6. Ахарактарызуйце дасягненні сучаснай беларускай анамастыкі.
7. Пералічыце асноўныя групы онімаў паводле сувязі з названымі аб'ектамі.

Практыкаванні

Практыкаванне 1. Прачытайце ў дапаможніку Н. А. Багамольнікавай "Анамастыка Гомельшчыны: назвы роднага краю ў тапонімах" (Гомель, 2012) пра метады вывучэння анамастыкі. Карыстаючыся картаграфічным метадам, на геаграфічнай карце Брэсцкай вобласці адзначце тапонімы, утвораныя ад каляндарных імёнаў. Растлумачце прычыну ўзнікнення названай мадэлі намінацыі.

Практыкаванне 2. Прачытайце ў дапаможніках Н. А. Багамольнікавай "Анамастыка Гомельшчыны: назвы роднага краю ў тапонімах" (Гомель, 2012) і Г. Ю. Сызранавай "Анамастыка" (Тальяці, 2013) пра статыстычны метад даследавання анамастыкі. Карыстаючыся названым метадам, акрэсліце склад анамастычнай прасторы казкі Г. Марчука "Ясельда": выявіце колькасць антрапонімаў (язычніцкіх і хрысціянскіх імёнаў), айконімаў, гідронімаў, міфонімаў і інш. уласных імёнаў, выкарыстаных аўтарам для стварэння мастацкіх вобразаў.

Практыкаванне 3. Прачытайце ў дапаможніку Г. М. Мезенка "Беларуская анамастыка" (Мінск, 1997) пра такія напрамкі анамастычнай работы, як тэарэтычная анамастыка, гістарычная анамастыка, прыкладная анамастыка. Пазнаёмцеся са зместам і структурай дапаможнікаў А. Ф. Рогалева "Введение в антропонимику. Именование людей с древнейших

времён до конца XVIII века (на белорусском антропонимическом материале)” (Бранск, 2009) і “Имя и образ: Художественная функция имён собственных в литературных произведениях и сказках” (Гомель, 2007). Якім накірункам анамастычнай працы адпавядаюць названыя даследаванні? Напішыце рэцэнзію на адзін з названых дапаможнікаў.

Практыкаванне 4. Выпішыце са слоўніка А. А. Увядзенскай і М. П. Калеснікава “От собственных имён к нарицательным” (М., 1981) або з дапаможніка М. У. Бураковай і В. А. Ляшчынскай “Анамастыка, тэрміналогія і фразеалогія (Мінск, 2011) па чатыры прыклады **апелятывацыі** (пераходу ўласнага імя ў агульны назоўнік – апелятыў), **анімізацыі** (пераходу апелятываў ва ўласныя імёны) і **трансанімізацыі** (пераходу аднаго тыпу ўласнага імені ў другі).

Раскажыце пра гісторыю пераходу ўласных імён у агульныя назоўнікі на прыкладзе прыведзеных у практыкаванні слоў. Як змяняецца іх семантыка ў выніку такога пераходу?

Гігіена, мецэнат, донжуан, пасквіль, мансарда, áтлас, бадмінтон, акадэмія, пламбір, фужэр, эскулап, алгарытм, байкот, вакзал, герастрат, каламбур, марыянетка, пергамент, плюшкін, зёлкін, гарлахвацкі.

Практыкаванне 5. Выпішыце ўласныя імёны. Вызначце іх разрады паводле дэнататыўнага зместу.

Першая згадка пра Сафійскі сабор звязана з Еўфрасінняй Полацкай, якая стала патронкай зямлі беларускай. У Жыціі прападобнай можна знайсці словы пра беларускую Сафійку. Мяркуецца, што храм створаны ў другой палове XI стагоддзя. У той час князем Полацкай зямлі быў Усяслаў Брачыславіч – адзін з самых славутых і знакамітых яе ўладароў, які стаў і героем “Слова пра паход Ігаравы”.

Магутны Рагвалод, заснавальнік полацкай княскай дынастыі, быў прадзедам Усяслава. Знаная далёка за межамі беларускай зямлі Рагнеда – ягоная прабабка. У летапісах засведчана легенда, нібыта Усяслаў нарадзіўся ў сарочцы, таму ў жыцці яму ва ўсім было спрыянне. Ён набыў неверагодна шырокую ваенную славу, стаў вядомы многімі карыснымі дзеямі дзеля дабра княства. Народ назваў яго Чарадзеем, або Ваўкалакам.

У сярэдзіне XI стагоддзя Усяслаў загадаў узнесці над рачным люстэркам храм, які быў бы не менш велічны за Кіеўскі і Наўгародскі, а заадно сведчыў бы пра незалежнасць Полацкага княства і магутнасць самога князя (А. Бутэвіч).

Практыкаванне 6. Выпішыце ўласныя імёны. Вызначце іх разрады паводле дэнататыўнага зместу. Знайдзіце ў тэксце выпадкі анімізацыі.

Існуюць рукапісныя кнігі, створаныя на беларускай мове арабскім пісьмом. Называюцца яны Кітабы, або аль-Кітабы. Аўтары іх – беларускія татары. Яны звязалі свой лёс з нашай зямлёй яшчэ ў далёкім XIV стагоддзі і цягам шасцісот гадоў годна і дбайна шчыруюць у агульнай супольнасці з беларусамі.

Кітабы – гэта рукапісныя зборнікі рэлігійнага характару. Ёсць нават беларускі Каран, ці, як завуць яго самі татары, Кур'ан.

З'яўленне татар на беларускіх землях звязана з часам княжання у Вялікім Княстве Літоўскім Гедыміна. У 1319 годзе ў час бітвы з Тэўтонскім ордэнам татары склалі ягонае перадавое войска. Але асабліва спрыяльны час настаў пры Вітаўце Вялікім. Ён, шчыры апякун татар, прыхільнік хана Залатой Арды Тахтамыша, запачаткаваў татарскія пасяленні на беларускіх зямлях.

Шмат татарскіх пасяленцаў з'явілася на беларускіх землях пасля паходу ў 1397 годзе Вітаўта на Дон, супраць Азоўскай Арды.

Беларускія татары былі не толькі ваярамі. Яна аралі зямлю, станавіліся рамеснікамі. Месцамі буйнейшых аседлішчаў татар лічацца Іўе, Мір, Навагрудак, Слонім, Ляхавічы, Мядзел (А. Бутэвіч).

Практыкаванне 7. Прачытайце ўрывак з кнігі Андрэя Суворава "Брэст. На перакрыжаванні дарог і эпох" (Брэст, 2009). Выдзеліце з прыведзенага ўрыўка ўласныя імёны. Падзяліце іх на тэматычныя групы. Падрыхтуйце паведамленне пра гісторыю храмаў Вашага горада або вёскі. Акрэсліце этымалогію прадстаўленых у паведамленні **эклезіёнімаў**.

Галоўныя будынкі старога горада, якія вызначалі яго нетрывіяльны твар, падчас будаўніцтва крэпасці зніклі зусім ці "растварыліся" ў новых аб'ектах. Касцёл манастыра спярша перабудавалі ў Фарны, затым у межах разгорнутай уладамі "праваславізацыі" яго зусім знеслі (у 1848 годзе). Былы знесены таксама ўніяцкія цэрквы Спаская, Святога Міхаіла і Святой Троіцы. Былі комплекс іезуітаў быў перабудаваны і прыстасаваны для патрэб Каменданцкага ўпраўлення, Манастыр трынітарыяў (Кобрынскае ўмацаванне) заняла вайскова-рабочая рота, а Манастыр базыліян пасля перабудовы ператварыўся ў артылерыйскія казармы. Манастыр аўгусцінцаў пасля рэканструкцыі стаў Інжынерным упраўленнем. Больш, чым іншым, пашанцавала будынкам комплексу бернардзінцаў і бернардзінак, а таксама Брыгіцкага манастыра. Выдатны бернардзінскі комплекс, размешчаны на Валынскім умацаванні, пасля перапрацоўкі прыняў кадэтаў Аляксандраўскага кадэцкага корпуса, з 1854 года там размясціўся шпіталь. Манастыр манашак-брыгітак увогуле перажыў архітэктурны "патоп". З будынкаў, якія былі размешчаны за правым рукавом Мухаўца, зрабілі турму – спярша арыштанцкую, затым туды

“падсялілі” і следчую частку. За турмой назаўсёды замацавалася народная назва “брыгіткі”. Самы гучны гістарычны лёс сярод пабудоў старога Брэста ў Петрапаўлаўскай царквы. Уніяцкі храм пасля перабудовы ператварыўся ў Белы палац.

Замест знішчаных храмаў старажытнага Брэста вернікам было дазволена пабудаваць некалькі аб’ектаў. За знесеную сінагогу “Брыск дэ Літа”, якая лічылася адной з найбуйнейшых і найпрыгажэйшых у Еўропе, брэсцкія яўрэі атрымалі 8000 рублёў кампенсацыі. Гэтага не хапіла, каб пабудаваць храм у новым горадзе, давялося збіраць ахвяраванні. У 1851 годзе сінагога пачала будавацца на новым месцы (закончана ў 1861 годзе). У 1856 годзе каталіцкая абшчына, атрымаўшы дазвол, пабудавала касцёл Узвіжання Святога Крыжа. Першы праваслаўны манументальны храм – Свята-Сімяонаўская царква – адкрыўся ў 1865 годзе, да таго часу праваслаўныя храмы ў новым горадзе былі выключна драўлянымі. Яшчэ адзін выдатны па архітэктурнай задуме праваслаўны храм быў закладзены ў 1851 годзе на тэрыторыі Цытадэлі крэпасці, ён атрымаў назву Мікалаеўскай гарнізоннай царквы.

Практычныя заняткі 2
УЛАСНЫЯ АСАБОВЫЯ ІМЁНЫ

Пытанні для самакантролю

1. Акрэсліце меркаванні вучоных па пытанні перыядызацыі ўсходнеславянскай антрапаніміі.
2. Пералічыце тэматычныя групы язычніцкіх імён.
3. Пакажыце, якія ўяўленні пра свет адлюстроўваюцца ў іменаслове язычніцкай эпохі.
4. Ахарактарызуйце паходжанне хрысціянскіх імён, акрэсліце хрысціянскую канцэпцыю імені.
5. Ахарактарызуйце працэсы фанетычнай і марфалагічнай адаптацыі, якія перажылі хрысціянскія імёны ва ўходнеславянскіх мовах.
6. Пералічыце найбольш прадуктыўныя суфіксы, якія ўтвараюць эмацыйныя формы мужчынскіх імён Брэстчыны. Якія сэнсавыя адценні выражаюцца гэтымі формамі?
7. Якія функцыі выконвалі імёны па бацьку ў старажытным грамадстве? Назавіце прычыны ўзнікнення імён па бацьку.
8. Ад якіх адзінак і як утвараліся ў старажытнасці *патронімы*?
9. Супастаўце меркаванні сучасных даследчыкаў антрапанімікону і маўленчага этыкету па пытанні паходжання і ўжывання імён па бацьку ў беларускай мове.

Практыкаванні

Практыкаванне 1. Прачытайце вытрымкі з твораў Зінаіды Дудзюк: аповесці-хранографа “Славянскія князі” і рамана “Велясіты”. Адзначце, якія асаблівасці светапогляду нашых продкаў адлюстраваны ў імёнах правадыроў славянскіх плямён.

1. **Вышан** – князь славянскага племені абадрытаў. Магчыма, імя магло гучаць як **Вышань**, бо **так называўся адзін з галоўных язычніцкіх багоў, у якім увасабляўся дух Усявышняга** (“Славянскія князі”). 2. **Валук** – князь венедаў. Імя гэтае паходзіць ад слова “**ўладыка**” і азначала ў славян вярхоўнага **кіраўніка**, **правадыра** ці **князя.** Магло паходзіць імя і ад слова “**вялікі**”, якое, магчыма, уваходзіла ў склад княжацкага тытула (“Славянскія князі”). 3. **Нябул** – славянскі князь, імя якога паходзіць ад дзеяслова “**не быў**” і з’яўляецца ахоўным ад злых духаў, дарэчы, на палескім дыялекце гэтыя словы вымаўляюцца як “**не буў**” (“Славянскія князі”). 4. Самая галоўная рэч на гэтым свеце – **воля**. Толькі з ёю ты належыш сам сабе, а без яе чалавек ператвараецца ў жывёлу, з якою можна зрабіць што заўгодна. Заві мяне проста **Воля**. Я – гэта **Воля**. Калі няма **Волі**, няма і мяне (“Велясіты”). 5. **Дзярван** – князь сорбаў, або сербаў. Этымалогія імя праглядваецца лёгка, яно аднакарэннае са словам “**дрэва**” або “**дзірван**” (“Славянскія князі”). 6. Захаваліся звесткі пра наўгародскага паганскага валхва, які так прыгожа і ўзнёсла ўмеў гаварыць пропаведзі, што за гэта быў празваны людзьмі **Салаўём** (“Шляхамі адвечнага слова”).

Практыкаванне 2. Прааналізуйце паходжанне асабовых імён студэнтаў групы (філалагічнага факультэта).

Практыкаванне 3. Прааналізуйце імёны студэнтаў вашай групы, суаднёсшы сэнсавую нагрузку імені з характарам яго носьбіта (гл.: Хигир Б. Ю. Тайна имени. М., 2010).

Практыкаванне 4. Запішыце мужчынскія і жаночыя імёны жыхароў вашай вёскі. Устанавіце іх паходжанне.

Практыкаванне 5. Прааналізуйце сэнсавую нагрузку прадстаўленых ў творах Георгія Марчука формаў асабовых імён (поўных, усечаных, эмацыйна-ацэначных). Вызначце спосаб утварэння ўсечаных і эмацыйна-ацэначных формаў.

1. Дзіўна, колькі сябе помніць Сава, ён не чуў, каб яго аднакласніцу называў хто інакш, як **Галіна**. Мажліва, гэта ішло ад яе зусім не дзіцячай сур’ёзнасці, удумлівых адносінаў да вучобы, яе дабрыні і сціпласці (“Сава Дым і яго палюбоўніцы”). 2. Васямнаццацігадовая **Маня** была старэйшая на два гады за сваю сястру **Улю**, першай адчула нешта нядобрае (“Крык на хутары”). 3. На дубовых колах ля хаты суседкі Сарокі сядзелі хлопцы-

сябрукі: **Толік** Бабёр, **Васько** Кіцель, **Ванька** Гасцюшкін (“Кветкі правінцыі”). 4. Памёр **наш Казік**. Сорак дзён сёння. Уся вёска, калі хавалі, за труной ішла, плакала. І старыя, і малыя. Вы ведалі яго? Больш такі музы́ка наўрад ці народзіцца. Ад Бога талент меў (“Вочы і сон”) 5. Кастусю Іванавічу Пузану да пенсіі засталіся лічаныя гады, але ж да гэтага часу мястэчка не перавучыцца, каб не клікаць яго неяк іначай. Як прычапілася да Пузана з дзяцінства гэтае дзіцяча-пацешнае **Косцік**, так і не змог ён з гадамі выкарчаваць ці перайначыць яго. І малыя, і старыя клікалі **Косцікам**, дый годзе. Змірыўся, прызвычаіўся, не злаваўся ні на кога за такое панібрацтва, нават не крывіўся (“Начная рыбалка”) 6. Міналі дні і месяцы, і ахапіла яе нуда, якая з’ела ў вачах рэшту маладога агню. **Цётка Еўдакія** пасівела і зрабілася **бабай Яўдохай** (“Яўдоха Шабуня”) 7. Пісала мне сюды, што нарадзіла дзіця, пытала, якое імя хачу даць. Напісаў: **Васілёк** (“Вочы і сон”). 8. Было тое ці не было, а можа яно толькі прыснілася старэнькай і слабой **Ірыне Анатольеўне**, якую на свой манер Іван Сільвестравіч **называў пяшчотна і артыстычна Ірэн** (“Год дэманаў”).

Практыкаванне 6. Апішыце сэнсавыя адценні і прагматычную значнасць формаў асабовых імён як сродкаў рэгулявання міжсуб’ектных адносінаў у кантэксце аўтабіяграфічных твораў берасцейскіх пісьменнікаў: аповесці В. Жуковіча “Як адна вясна…”, М. Сянкевіча “У аперацыйным блоку холадна…”, цыкла раманаў У. Гніламёдава “Сямейная хроніка ў стылі барока”.

1. Неяк нечакана мяне прывабіла **Марыська**, якое доўгі час не прыкмячаў (В. Жуковіч “Як адна вясна…”). 2. **Генік** быў малады, сярэдняга росту мужчына з доўгімі, як у музыканта, пафарбаванымі ў нейкі ржавы колер валасамі, надзвычай худы, вузкагруды. Сутулаваты, з наколкамі на пальцах і перадплеччы (М. Сянкевіч “Нара”). 3. З “мілага”, “**Сёмачкі**” Сямён паступова ператварыўся ў **Каваля**. **Таццянка** ўсё часцей называла яго па прозвішчы, тым самым нібы падкрэсліваючы: я – гэта адно, а ты – зусім чужы чалавек, з якім, такая доля, прыходзіцца пакутаваць. Сямён махнуў рукой: **Каваль** дык **Каваль**. Мо калі і ганарыцца будзеш, дурніца, што і ў тваім пашпарце гэтае прозвішча запісана. Жонка ж па-ранейшаму была для яго “**Таццянкай**”, і ў гэтым слове чулася і прымірэнчая нотка, і нейкае шкадаванне, і надзея на лепшае. Не было нянавісці, але не было і пяшчоты (М. Сянкевіч “У аперацыйным блоку холадна”). 4. “Ражэвіч **Уладзімір**”, – выразна вымаўляе Іван Іванавіч. “**Уладзімір**” – так мяне ніхто дагэтуль не называў. Звалі ўсе іначай: **Воўка, Валодзька, Валодзя**. Я ўстаю, сэрца маё пырхае, як верабейка (В. Жуковіч “Як адна вясна…”). 5. Вучняў было не так і мала, –

лічы, усё маладое пакаленне прускаўцаў, а таксама дзеці з суседніх вёсак. Побач з **Лявонкам** сядзеў Змітрок Зуб з Бабіч, крыху далей – кавалёў сын **Цішка** Пахолак. Крыху далей, ля карты Расійскай імперыі, салідна атабарыліся Дармідонтаў **Трахімка** з братам **Цімошам** – шалапутныя хлопцы…Побач сядзелі **Піліпко** Ламака і Аляксей Галёнка (У. Гніламёдаў "Уліс з Прускі"). 6. Айцец Глеб даў яму пры нараджэнні, глянуўшы ў святцы, імя **Агамемнан**, але яно аказалася цяжкім для прускаўскага вымаўлення, і вяскоўцы перарабілі яго на **Гамон**(У. Гніламёдаў "Уліс з Прускі"). 7. Выбіраемся мы ад цябе, **Лявоне** (У. Гніламёдаў "Вяртанне").

Практыкаванне 7. Прааналізуйце сэнсавыя адценні і словаўтваральную структуру эмацыйна-ацэначных формаў асабовых імён, ужытых у кнізе ўспамінаў У. Калесніка "Доўг памяці".

1. На пратэст Вані Мацко знайшлася яшчэ адна дадатковая, ужо злавесная выкрутка, фактычна пагроза палітычнага характару: "А ён палітычна нявытрыманы, сказаў на Сталіна ***Ёська!"***. Іранічны, нястрыманы ў словах Ваня Мацко сапраўды назваў Сталіна фамільярным чынам – ***Ёська***. Але ў якім кантэксце? Сярод партызан у прыватных размовах праяўляліся настроі прыгнеченасці, выказваліся балючыя недаўменні, што наша армія адступае ды адступае, што баі перакінуліся ажно на Волгу і на Каўказ. Вось тады Іван Мацко і запярэчыў аднаму ныціку, сказаўшы бадзёра: "Не хныч! Наш ***Ёська*** задасць яшчэ гэтаму Адольфу пытлю, што той касцей не пазбірае. Папомніш маё слова!". Але для аматараў адабраць у Мацка наган патрэбны быў капраметуючы факт, і яго спрэпарыравалі, высмыкнуўшы з кантэксту размовы фамільярнае слова "***Ёська***". Гэтае вырванае з фразы слова ўключылася ў той афіцыйны кантэкст, дзе было прынята называць Сталіна ўрачыста: ***Іосіф*** ды яшчэ ***Вісарыёнавіч***. І ў такім міжвольным кантэксце фамільярнае ***Ёська*** набывала пагардлівую ацэначную афарбоўку. Пажанглірываўшы кантэкстам, атрадныя фарысеі прыпісалі Мацку непавагу да правадыра, а гэта азначала палітычную нясталасць і нават ненадзейнасць. У парадку пакарання, канешне, тут можна было адабраць не толькі наган, а і ўсю зброю. 2. Наогул у Сіняўцы была традыцыя здрабняць і распадабняць імёны, каб яны маглі замяніць і прозвішчы, якія з-за эканоміі слоў неахвотна ўжывалі. Распадабнёныя імёны выяўлялі яшчэ індывідуальныя характары ўладальнікаў, напрыклад, самае пашыранае імя ***Іван*** у нашай вёсцы мела такі веер мадыфікацый: ***Іван*** – гэта нехта салідны, ***Іванко*** – так сабе, ***Іваначко*** – благоцце ці блазан, але ***Ян, Янко, Ясько, Ясенько*** – ішлі на поўным сур'ёзе. Біблейскае імя **Іосіф** мела такія варыянты: ***Ёсіп, Язэп, Язэбко, Джэп, Язэбачко, Юзік, Юзічак, а Пётр – Пятрук, Пецер, Петрык, Пятро***. Калі такіх варыянтаў на ўсіх **Іванаў,** ***Язэпаў*** ці ***Пятроў***

не хапала, то дазвалялася ўзмацняць імя родавымі мянушкамі і атрымлівалася ***Пецер Тарэсін, Пецер Хвелеў, Пецер Базёнаў***. 3. ***Шурачка*** Бразоўская – філігранная брунетка, што ўмела сябе паказаць і на сцэне ў спектаклі, і саліруючы ў хоры. 4. Грамада выбірала чалавека не менш бывалага, разумнага і дасціпнага, толькі куды больш роўнага і дабрадушнага, чым Андрыян – ***Фаніка*** Васілеўскага. Ён умеў тактоўна пагаварыць з "уласцю", не задзіраючыся. 5. З усіх школьных сяброў, якія вымушаны былі спыніцца на сямі класах Ярэміцкай пачатковай школы, я найбольш шкадаваў ***Косціка*** Балабановіча. Косця падабаўся мне за сілу, цвярозы дасціпны розум і праўдамоўнасць.

Практыкаванне 8. Ахарактарызуйце структуру і значэнне патронімаў, ужытых у складзе зафіксаваных у гістарычнай прозе берасцейскіх пісьменнікаў старажытных найменняў асоб.

1. Полаччына адкрыта загаварыла пра **Васільку Святаславіча** (В. Коўтун "Пакліканыя"). 2. А Еўфрасіння ўжо абыходзіла капліцу, якую **Глебавічы** збудавалі яшчэ ў даўнія леты (В. Коўтун "Пакліканыя"). 3. І калі звярнуцца да тэмы героя свайго часу, дык постаць **Льва Іванавіча Сапегі** і цяпер з'яўляецца добрым прыкладам служэння народу, захавання мовы і гістарычнай спадчыны (З. Дудзюк "Леў"). 4. **Ганна Сапяжанка Радзівіл** памерла якраз у той час, калі бацька ваяваў са шведамі (З. Дудзюк "Леў"). 5. **Ганна Ягелонка** таксама прагнула бачыць на троне свайго любімага пляменніка Жыгімонта Вазу (З. Дудзюк "Леў"). 6. У 1536 годзе Сапега быў зноў уключаны ў склад пасольства, якое ўзначаліў **Нікадзім Янавіч Цеханавецкі** (З. Дудзюк "Леў"). 7. Самусь рашуча падышоў да вайскоўца, сказаў: "Запішыце мяне. **Самусь Антонаў сын Буйніч**". Вайсковец чыкнуў па паперы гусіным пяром, крыкнуў: "Запісаны! Чарку навабранцу!" (З. Дудзюк "Год 1812"). 8. Быў настаўнік, здавалася, свой, мясцовы, з суседняй вёскі – таксама сялянскі сын **Тамаш Шпронька**. Зразумела, цяпер ён займеў больш паважанае імя: **Фама Фаміч Шпранько** – з націскам на апошнім складзе. Але некаторыя бацькі называлі яго па-ранейшаму – проста Тамашом Шпронькам. Таму, можа, што настаўнік не адмаўляўся ад традыцыйна простых педагагічных прыёмаў уздзеяння на навучальны працэс: здаралася, ставіў на калені ў кут, круціў за вушы, біў па патыліцы. Часам грозны быў да незвычайнасці, крычаў, наганяючы вялікага страху: "На калені, скаціна!". Раззлаваўшыся, і на грэчку ставіў, і на соль… Разам з імем **Фама Фаміч** змяніў і надворны, як казалі прускаўцы, выгляд. Настаўнік насіў форменную фуражку з бліскучай цэшкай, тужурку з гафкамі (У. Гніламёдаў "Уліс з Прускі").

Практыкаванне 9. Акрэсліце прагматычную значнасць формаў “імя+імя па бацьку” або “імя па бацьку” як этыкетных знакаў, ужытых у творах берасцейскіх пісьменнікаў.

1. “Як я бачу, вы вельмі ўзрадаваны, **Юлія Іванаўна**. Не думайце, што вас чакае лёгкая гульня ў вайну”. **Юлі** падабалася, што ён, малады лейтэнант, гаворыць з ёю на “вы”, гаворыць далікатна, як з роўнай сабе або нават яшчэ вышэйшай за сябе, адным словам, паважае яе асобу” (У. Дамашэвіч “Кожны чацвёрты”). 2. Былі мужчыны аднагодкамі, абодвум каціла пад семдзясят, але колішні механізатар Карней Трахімавіч Лясняк так і застаўся **Карнеем**. А былога настаўніка называлі **Платонавічам**, і, мусіць, мала хто помніў яго імя. А як інакш можна называць настаўніка? Простаму вясковаму чалавеку найбольш ягонае імя падыходзіць (З. Дудзюк “Аднарог”). 3. **Глеб Іванавіч** распісваў у цэрквах алтары, пісаў іконы святых мучанікаў… Ён быў мастак на гарадок і знаў сабе цану, хоць і ніколі сваім талентам не хваліўся… Калі выпадала **Глебу Іванавічу** ўпрыгожваць дзе-небудзь на вёсцы старую царкву, згаджаўся з вялікай ахвотай і за невялікія грошы (Г. Марчук “Кветкі правінцыі”) 4. “Не трогайте партию, она здесь ни при чём”, – з інтанацыяй змагара за чысціню партыйных радоў адрэзала аднойчы слухачка падрыхтоўчага аддзялення выкладчыку матэматыкі, інтэлігенту і дабраку, калі той неяк тактоўна заўважыў нашаму камсамольскаму важаку, што грамадская праца не павінна перашкаджаць засваенню элементарных звестак матэматыкі. Збянтэжаны дацэнт сумеўся, змоўк, абвёў вачыма аўдыторыю, нібы шукаючы паратунку, і да гэтага часу **Ліну Рыгораўну** – адзіны выпадак у гісторыі факультэта – называў па бацьку без малейшага знаку іроніі і доўга тлумачыў кожную яе здавальняючую, часцей за ўсё, адзнаку (М. Сянкевіч “Адлучэнне”). 5. Бабуля Ганна жыла ўспамінамі. Болей за паўвека, з самай вайны, адпрацавала яна ў раддоме. Усе старэйшыя жыхары раённага гарадка ведалі **Ганну Мікалаеўну** ў твар. Сямідзесяцігадовую жанчыну з вялікай неахвотай праводзілі на пенсію: больш чулай і спагадлівай як да маладых супрацоўнікаў, так і да шчасліва-заклапочаных наведвальнікаў не было за ўсю гісторыю гэтай установы (М. Сянкевіч“Груша”).

Практычныя заняткі 3
ПРОЗВІШЧЫ

Пытанні для самакантролю

1. Раскажыце пра гісторыю фарміравання прозвішчаў на Беларусі.
2. Ахарактарызуйце функцыі прозвішчаў.

3. Пакажыце розніцу паміж патранімічнымі і непатранімічнымі прозвішчамі. Прывядзіце прыклады прозвішчаў кожнай групы.

4. Акрэсліце тэрытарыяльнае пашырэнне на Беларусі прозвішчаў, утвораных з дапамогай розных суфіксаў.

5. Выкажыце свае адносіны да з'явы перайначвання, скажэння беларускіх прозвішчаў.

Практыкаванні

Практыкаванне 1. Запішыце прозвішчы студэнтаў групы (філалагічнага факультэта). Ажыццявіце іх лексіка-семантычны і структурны аналіз.

Практыкаванне 2. З тэлефоннай кнігі горада Брэста выпішыце прозвішчы, матывавальныя асновы якіх утрымліваюць: 1) формы кананічных імён; 2) мірскія імёны-мянушкі: а) празванні-характарыстыкі ўзросту, знешняга выгляду і фізічных уласцівасцяў; б) мянушкі-характарыстыкі маральных якасцяў, паводзінаў, разумовых і псіхічных уласцівасцяў; в) мянушкі, утвораныя ад назваў прадметаў матэрыяльнай культуры; г) мянушкі, утвораныя ад назваў з'яў прыроды, жывёл, насякомых, птушак і іх частак; д) мянушкі, утвораныя ад назваў раслін; е) мянушкі, утвораныя ад назваў чалавека паводле яго становішча ў грамадстве і інш.

Практыкаванне 3. Адной з важных і складаных праблем беларускай граматыкі з'яўляецца пытанне скланення імён і прозвішчаў. Прачытайце артыкулы "Аб скланенні і склонавых канчатках асобных груп уласных імён і прозвішчаў" у "Слоўніку асабовых уласных імён" М. Р. Судніка (Мінск, 2005, С. 165–173). Вызначце тып скланення назоўнікаў **Ігнат Дамейка**, **Тадэвуш Касцюшка**, **Сімяон Полацкі**, **Казімір Семяновіч**, **Павел Сухі**, **Адам Міцкевіч**, **Фёдар Дастаеўскі**, **Соф'я Гальшанская**, **Жыгімонт Стары**, **Кастусь Астрожскі**, **Пётр Мсціславец**, **Кірыла Тураўскі**, **Кастусь Каліноўскі**, **Валерый Урублеўскі**, **Вольга Корбут**, **Юлія Несцярэнка**, **Ксенія Сітнік**, **Георгій Марчук**, **Алена Масла**. Пастаўце гэтыя назоўнікі ў давальным, творным і месным склонах.

Практыкаванне 4. Выпішыце з тэксту асабовыя імёны і прозвішчы. Вызначце тып іх скланення. Пастаўце гэтыя назоўнікі ў формах давальнага, творнага, меснага склонаў.

Беларусы зрабілі надзвычай шмат для расейскай культуры і навукі, пачынаючы ад Івана Фёдарава (Федаровіча з беларускага роду Рагозаў), Пётры Мсціслаўца ды Самойлы Пятроўскага-Сітніяновіча (Сымона Полацкага).

Новыя рамёслы прынеслі ў Маскву Клім Міхайлаў са Шклова, майстар аб'ёмнай разьбы, які стварыў іканастас Смаленскага сабора ў

Маскве, Сцяпан Палубес (Іваноў) з Мсціслава, кафляр і майстар шматколерных рэльефаў, Андрэй Чохаў (Чэхаў), заснавальнік маскоўскай пушкарскай традыцыі, які адліў "Цар-гармату".

Сярод беларусаў з паходжання – аўтар першай фундаментальнай "Гісторыі Расійскай" Васіль Тацішчаў (са смаленскіх князёў), літаратары Тадэвуш Булгарын, Фёдар Глінка, Фёдар Дастаеўскі, Дзмітры Пісараў, Міхаіл Ісакоўскі, Юры Алеша (з барысаўскае шляхты), Яўген Еўтушэнка (продкі з вёскі Хамічы на Гомельшчыне) і Аляксандр Грын (сапраўднае прозвішча Грынеўскі). А Уладзімір Высоцкі з Мяшчанскае слабады ў Маскве, з XVII стагоддзя заселенай беларусамі (ён і сам згадваў, што ягоныя карані – на беларускім Палессі). Выдатны мовазнавец, галава Ленінградскае фаналагічнае школы Леў Шчэрба паходзіў з Ігумена Менскай губерніі (Паводле У. Арлова)

Практыкаванне 5. Прачытайце прыведзеныя ўрыўкі з прозы берасцейскіх аўтараў. Вызначце тэматычныя групы прадстаўленых у прыведзеных кантэкстах гаваркіх прозвішчаў, акрэсліце спосабы іх словаўтварэння.

1. Жыў Таццянка **Чудайкін** бедна, у яго гаспадарцы не было ні плуга, ні каня. Сваё прозвішча апраўдваў у поўнай меры. Меў, напрыклад, звычай хадзіць у Борскім па базары са сваёй лыжкай – каштаваць смятану, тварог. Купляць не купляе, толькі прыцэньваецца. Гандляркі ведалі Таццянку – праганялі (У. Гніламёдаў "Расія"). 2. Тут жа стаяў той самы **мажны мацак** з чорнай кучаравай барадой, які некалі хваліўся, што Запалонне ўсю Расею пракорміць. Звалі яго Спірыдон **Вярзілін** – **шыракаплечы здаравенны дзяцюк** – ну, **проста велікан** (У. Гніламёдаў "Расія"). 3. Прафесар **Крук** быў самым блізкім чалавекам сярод педагогаў гімназіі. **Крук** па-беларуску – груган. Знешнасцю прафесар нечым нагадваў гэтую птаху: быў чарнявы, з птушыным сухашчавым тварам і вострым прыгнутым носам. Абрыс твару ў яго быў авальны, таму не кідалася ў вочы нічога драпежнага. Чорныя маленькія (У. Калеснік "Доўг памяці"). 4. Дзіва, як часам пасуе чалавеку яго прозвішча: вайсковы старшына – **Халяўка**, суддзя – **Судноўскі**, кухар – **Яечня**, інспектар рыбааховы – **Верхаводка**, пчаляр – **Гніламёдаў**, дырыжор – **Скрыпка** (А. Філатаў "Страла жыцця"). 5. Я ў такіх гаворках заўсёды згадваю **Цяплова**, пра якога мой дзядзька любіў расказваць, – самавіта сказаў Рыгаровіч. – Гэты шчасліўчык нават прозвішча не меў. Ягоны бацька быў апальшчыкам Аляксандра-Неўскай лаўры, вось архірэй і даў сыну апальшчыка прозвішча Цяплоў. Гэтаму бязроднаму Цяплову пашчасціла быць выхаванцам Феафана Пракаповіча, які звярнуў увагу на здольнага вучня і дапамог яму выехаць у Германію, каб ён там змог працягваць вучобу (З. Дудзюк "Год 1812"). 6. Хітры і

асцярожны **Карась** адпавядаў свайму прозвішчу. Вадзіў ён мяне за нос тыдні тры, усё абяцаючы “подходящее место, руководящий пост”. Абяцаў з такім выглядам, што здавалася: яго кругленькія шчокі, маленькі роцік, кірпаты носік – увесь твар, уся фігура спачувалі твайму гору (Г. Марчук “Без ангелаў”). 7. Усе пасмейваліся з **Малечкі**, з яго плашч-палаткі, сшытай з дзвюх палатак, і з недарэчнага прозвішча, бо куды здатней было б яму звацца **Вялічкам**. Быў высачэзны, дзябёлы, шыракаплечы, насаты, вірлавокі, з цяжкімі, як гіры, рукамі і агромністымі ступакамі. Ногі былі такія вялікія, што хлапец ніяк не мог сабе падабраць ботаў. І таму ў яго заўсёды ці нешта ціснула, ці муляла, і ён проста сцізорыкам прапорваў у перадках ботаў дзіркі, каб хоць трохі даць волю пальцам (К. Каліна “Піяніна”). 8. Маці мая мела прозвішча **Балабановіч**. Яно было настолькі распаўсюджана ў вёсцы, што я ў дзіцячым узросце успрыняў яго як прэстыжнае і пазней доўга, ледзь не да апошніх курсаў педінстытута, не ўлоўліваў у гэтым прозвішчы татаршчыны ў квадраце: **бала-бан, бала-бан**… У беларускай мове **балабонь**, што азначае павярхоўнага безадказнага гаваруна. Можа таму, што носьбіты гэтага прозвішча былі ў вёсцы людзьмі паважанымі, статэчнымі гаспадарамі, мне і ў галаву не магло прыйсці, што лінгвістычная этымалогія прозвішча маёй маці выглядае так непрыглядна (У. Калеснік “Доўг памяці”)

Практыкаванне 6. Прачытайце ўрыўкі са зборніка Уладзіміра Юрэвіча “Слова жывое, роднае, гаваркое...” (Мінск, 1998). Размяжуйце патранимичныя и непатранимичныя прозвишчы.

З таго, што бытуе на Беларусі

Ажгірэй. Сустракаецца ў нас і такое прозвішча, утворанае ад татарскага слова ***ажгыру*** — злавацца, раззлавацца. Злому, сярдзітаму давалі такую мянушку.

Адзін*е*ц, Адын*е*ц. Такое прозвішча давалі чалавеку, які жыў адзін, без сям'і або калі было адно дзіця.

Аз*і*мы. Такое прозвішча атрымаў той, хто нарадзіўся да зімы. Прозвішча гэта пашыралі за кошт канчатка — Азімаў.

Арл*о*ў, Ар*о*л, Арлянёнак. Паходзіць ад назвы птушкі ***арол***, з магутнасцю, дужасцю якой параўноўвалі чалавека і давалі яму такую мянушку, каб засцерагчы яго ад розных замахаў на жыццё. Мянушка Арол стала прозвішчам, а сям'ю чалавека ўжо называлі Арловы.

Асмал*о*ўскі. Каб бервяно не гніло, калі яго кладуць на зямлю або ўкопваюць у яе, ставячы слупы, або забіваюць як п**а**лю, спачатку яго асмольваюць ці абвуглліваюць. Чалавека, які займаўся гэтым, звалі Асмаловіч, Асмольчык, Асмалоўскі.

Аўч*ы*ннік, Аўч*ы*ннікаў. Гэтыя прозвішчы даваліся тым, хто вырабляў ***аўчыны***, футра авечкі.

Ашуркевіч, Ашурак – ад слова ***ашкуркі***, як у некаторых мясцінах называюць рызманы, абрэзкі аўчыны. Хадзіў чалавек недагледжаны, увесь у рызманах, так і ахрысцілі яго — Ашурак. Сын ужо насіў прозвішча Ашуркевіч.

Б*а*біч. Так называлі дзіця, якое нараджала сама бабка-павітуха, тая жанчына, што ***бабіла*** нованароджаных, прымала роды. Гэткая мянушка засталася прозвішчам.

Баг*а*тка, Багатк*о*, Багацэвіч, Багацёнак, Баг*а*цкі – усе ад слова ***багаты***: багаты хлопец, які мае прафесію; багатая кошка, што з поўсцю у тры колеры

Барадз*і*нчык. Калі чалавек насіў бараду ды яшчэ быў высокі ростам, яму давалі мянушку Барадзін, а яго нашчадкаў ужо называлі барадзінчыкі. Так і замацавалася прозвішча Барадзінчык, а яшчэ — Барадзей, Барадзейка.

Баразн*а* – ад звыклага беларускага слова ***баразна***. Мянушка нараздзілася для чалавека, які жыў не самастойна, а ішоў па пракладзенай іншымі баразне. Прозвішчы Баразнёнак, Бараздзін — усе адсюль, з гэтага гнязда.

Бар*а*н. Націск ставяць чамусьці на першым складзе, але гэта не выратоўвае. І не абавязкова ад назвы свойскай жывёліны весці радаводную. А чаму не ад назвы сталярскага інструменту — ***баран***, рубанак на чатыры рукі, каб стругаць дошкі ўдваіх?! Вытворныя ад яго прозвішчы — Бар**а**наў, Баран**о**віч, Баранч**у**к, Бар**а**нчык, Баран**о**ўскі і іншыя.

Барб*а*рчык. Прозвішча ўтварылася ад мужчынскага Барбар, якое паходзіць ад грэчаскага слова ***барбарас*** — іншаземны, чужаземец. У польскую мову гэтае слова прыйшло ў яго першапачатковым гучанні — Б**а**рбар. Праз польскую мову асталявалася і ў беларускай. Дзяцей Б**а**рбара ўжо называлі Барб**а**рчыкі.

Бардз*е*цкі. У аснове прозвішча слова ***барда***. На Украіне так называецца акраец бохана хлеба. Аднак за аснову можа быць прынята і італьянскае б**а**рда — сякера, цясла, якой часалі бярвенне, будуючы караблі. Параўнайце з словам ***алебарда*** — сякеры на доўгіх кіях, як зброя для аховы каралеўскіх палацаў.

Барст*о*к – ад летувіскага ***барстыці*** — сыпаць, насыпаць крупы ці муку ў мяхі на млыне. Так нызывалі людзей, якія працавалі млынарамі. У Летуве прозвішчы — Барст**а**йціс, Б**а**рсціс.

Б*е*рднік. Так называлі майстра, які вырабляў ***берды***, прыстасаванне для кроснаў, пры дапамозе якога набіраюць з нітак аснову. А яшчэ — Б**е**рднікаў, Берднік**о**віч. Часам гук ***д*** выпадае і тады гучыць як Б**е**рнік.

Практычныя заняткі 4
АСНОВЫ ЛІТАРАТУРНАЙ АНАМАСТЫКІ

Пытанні для самакантролю

1. Акрэсліце прадмет літаратурнай (паэтычнай) анамастыкі.
2. Зрабіце агляд даследаванняў беларускіх лінгвістаў у сферы літаратурнай анамастыкі.
3. Дайце азначэнне тэрміна ***паэтонім***.
4. Ахарактарызуйце складнікі эстэтычнай функцыі паэтонімаў у мастацкім тэксце. Пакажыце іх рэалізацыю ў творах беларускіх аўтараў XXI ст.
5. У чым сутнасць класіфікацыі паэтонімаў з улікам іх кантэкстуальнай семантыкі? Прывядзіце прыклады ***прамагаваркіх, ускоснагаваркіх, схаванагаваркіх паэтонімаў*** і ***імён-рэмінісцэнцый*** у творах беларускіх аўтараў XX–XXI стст.

Практыкаванні

Практыкаванне 1. Прачытайце вытрымкі з трылогіі Вольгі Іпатавай “Гаспадары Вялікага Княства” і рамана “Знак Вялікага магістра”. Выдзеліце ўласныя імёны, правядзіце іх класіфікацыю з пункту гледжання сувязі з дэнататамі (тэматычную класіфікацыю) і аднясення да рэальнага і выдуманага анамастыкону. Адзначце, якія асаблівасці светапогдляду нашых продкаў адлюстраваны ў прыведзеных паэтонімах.

1. Але праз колькі дзясяткаў гадоў менавіта гэты круглавокі хлопчык з хітрым бляскам у наіўных вачах, якому бацька завяшчаў вялікакняскі стол, ператворыцца з вялікага князя Ягайлы-Якава ў караля Польшчы Уладзіслава. 2. Раней жа мяне клікалі Таўкачом, бо надта тоўкся я ў матчыным жываце. 3. Доўга піў моцную медавуху Сосень, у хрысціянстве Цімафей, а пасля бухнуўся на калені перад божышчам Вялеса і падзякаваў за шчаслівае выратаванне ад страшнага гневу валадара. 4. “Уна – гэта на старадаўняй мове значыць юная, – разглядаючы дзяўчынку, задумаўся Святазар. – Імя сведчыць пра высокі лёс, які яе чакае”. 5. Гож і сапраўды і гожы, і разумны, але ён не сын караля Польшчы. 6. Княжыч мог час ад часу браць у рукі запаведную дзіду, дакранаючыся да вострага ліста арэшыны, нібыта адчуваць Лозку – яе гнуткую постаць, імклівыя рухі, светлыя вочы. 7. Шварна, чыё імя нездарма значыла на старой мове, што была ў самых старажытных храмах Ашвінаў, «валадарны» альбо «непахісны», кідаў мне [Ляздзейку] выклік не проста так. Яго падтрымліваюць віленскія жрацы, незадаволеныя нашэсцем новагародцаў і трокаўцаў. Шварну хацелася быць вярхоўным уладаром язычнікаў, і яму абяцалі падтрымку з княжага двара. Пакараны толькі няволяй і

пашкадаваны мной, Шварна ўсё ж выплыў – якраз ён і стаў вярхоўным жрацом пасля мяне. І нарэшце наступіў дзень, калі я зразумеў, што чалавек, з якога я злітаваўся і не пакараў яго смерцю, узяў верх нада мной і цяпер мне трэба альбо змагацца альбо схіліцца перад ім. 8. Юльяна назвала першынца мясцовым імем – Ягайла. Даўнім было яно тут, і жрацы тлумачылі яго то як “жывы, палкі”, то, найчасцей, як “усясветна слаўны”. Казалі, што ідзе гэтае імя ад продкаў-арыяў, чые храмы-свяцілішчы захаваліся дасюль па ўсім Княстве. 9. І расказаў Рыгор пра тое, што імя ягонае было раней Бабёр, але пры хрышчэнні далі яму імя Рыгора Акуліча, які ў Крэве паклаў за князя жыццё.

Практыкаванне 2. Прачытайце прыведзеныя ўрыўкі з рамана Генрыха Далідовіча “Кліч роднага звона”. Выдзеліце ўласныя імёны. Правядзіце тэматычную класіфікацыю паэтонімаў. Вызначце тыпы антрапонімаў: асабовыя імёны, патронімы, мянушкі.

1. Усе з захапленнем і жахам расказвалі пра Тэмучына – былога бедняка, раба, але смелага, разумнага, справядлівага і ў той жа час бязмежнага ў жорсткасці чалавека, які стаў вялікім каганам Чынгісханам. Ён не толькі здолеў сабраць усю мангольскую сілу, падакляраваць суродзічам не многа і не мала, а па́шу ва ўсім свеце, але кіўком аднаго пальца змусіў іх даверліва і паслухмяна згарнуць шатры, ускочыць на коней і паімчацца з запаснымі табунамі за ім, Трасуном Сусвету. 2. Воўк невялікі, але разумны, хітры і люты звер. Ён не чапае зубра, мядзведзя, але і іх змушае лічыцца з ім. Абкладае з іншымі Ваўкамі і збівае з ног лася, каня і дзіка. Якраз такімі былі нашы далёкія продкі – неўры, велеты-волаты, якія пакланяліся найперш ваўку, насілі воўчыя скуры, а ў баях начэплівалі на твар воўчыя зяпы. Вялікімі Ваўкамі былі мае родзічы – няшчасны Рагвалод, грозны і славуты Усяслаў Чарадзей. Таму я, Міндоўг, ніколі не скарджуся, нават ганаруся, калі мяне называюць Ваўком ці Ваўкалакам: я пакланяюся гэтаму зверу, бо мушу жыць так, як жыў, жыве і будзе жыць тут ён – гаспадар гэтага краю. 3. Аспід ты, ваявода полацкі Усяслаў! Як і твой цёзка, полацкі князь Усяслаў! Я добра ведаю: не зусім выпадкова ты так шануеш таго. Не лік Уладзіміра Святаславіча альбо Уладзіміра Манамаха, а якраз лік “Чарадзея” на сцяне тваёй святліцы. Ты найперш шануеш таго ваўкалаку за тое, што ён хітрасцю і вераломствам вывеў Палацеск з-пад улады Кіева. Табе мілая гэтая ідэя. 4. Любка!.. Якое слаўнае імя далі табе бацькі! Каб ты ведала, як ты мне любая! Ведай, уладарка мая, я не вытрымаю, ты мяне загубіш, калі адвернешся! Любка! Люба! Любоў!

Практыкаванне 3. Прачытайце прыведзеныя ўрыўкі з аповесці Анатоля Бензерука “Мячы Грунвальда, альбо Дванаццаць абаронцаў

караля”. Выдзеліце ўласныя імёны. Правядзіце класіфікацыю паэтонімаў 1) з улікам іх дэнататыўнага зместу (тэматычную класіфікацыю), 2) паводле суадносінаў з рэальнай анамастыкай, 3) паводле структуры. Вызначце язычніцкія і хрысціянскія антрапонімы.

1. Добра, – згадзіўся Ягайла, – хай будзе, як паслы просяць, як меншасць вырашыла: да лета 1410 года ад Раства Хрыстова да дня Святога Яна Хрысціцеля будзе ў нас мір з Ордэнам Святой Марыі. 2. А ў горадзе тым свята – Вербная нядзеля. Чыста прыбраныя людзі да царквы пайшлі, святара слухаюць, Бога славяць, галінкі маладой вярбы асвячаюць, песні добрыя пяюць: “Вярба б’е, не я б’ю, за тыдзень – Вялікдзень. Будзь здаровы, як вада, будзь багаты, як зямля”. 3. Ягайла ціхмяна маліўся, спяваючы “Багародзіцу”. 4. Шкадуе рыцар сваю шэрую торбу: у ёй хаваў грамату ад былога гаспадара – караля неапалітанскага ды іерусалімскага Ланселота Велікадушнага, напісаную каралю Ягайле. 5. Жыў-княжыў у Пінску слаўны гаспадар Юрый, па мянушцы Нос. 6. Комтур быў са старажытнага роду. Усе мужчыны ў сям’і насілі аднолькавае імя, Генрыхі – бацька, дзед, прадзед і гэтак ажно да Генрыха Чэшскага і Генрыха Рускага, заснавальнікаў роду. Яны атрымалі мянушкі не за тое, што адзін быў чэхам, а другі русінам. Зусім наадварот: адчайна і смела змагаліся продкі Плаўэна супраць славян, прыхоплівалі чужыя землі, на іх замкі свае будавалі, таму і стаў забойца чэхаў звацца Чэшскім, а забойца русаў Рускім. 7. А вось Тэцінгена адолеў не чужы рыцар, а страх за сваю скуру. Меў комтур зычны голас. Калі пабачыў, што справа – швах, тады крычаў сваім воям: “Хэрум!” “Хэрум!” (што значыць “Назад! Назад!) Комтур Тэцінген, хвалько і задзіра, наперадзе ўсіх даваў драпака. (З тае пары яго звалі Рэйтар-Хэрум – Рыцар-Назад.) За ім кулём каціліся рэшткі крыжовага воінства. 8. Прыставіў князь да дачкі выхавацеля – даўгавусага Кіршу Данілавіча, вопытнага ваяра. 9. Але Барташ-капелан паспеў пракрычаць войску: “Мы пераможам!”

Практыкаванне 4. Выпішыце са “Слоўніка беларускіх псеўданімаў і крыптанімаў XVI–XX стагоддзяў” Янкі Саламевіча прозвішчы і псеўданімы дзесяці берасцейскіх пісьменнікаў. Вызначце тып псеўданімаў.

Практыкаванне 5. Прачытайце вытрымкі з прозы берасцейскіх аўтараў: кнігі ўспамінаў У. Калесніка “Доўг памяці” і цыкла раманаў У. Гніламёдава “Сямейная хроніка ў стылі барока” (“Уліс з Прускі”, “Расея”, “Вяртанне”). Вызначце тыпы прадстаўленых у прыведзеных кантэкстах сямейна-родавых мянушак (андронімы, гінонімы, патронімы, матронімы), акрэсліце спосабы іх утварэння.

1. ***Васіліха*** не без поспеху займалася народным лекаваннем (У. Гніламёдаў “Уліс з Прускі”). 2. Напішыце, як там Ганна ***Васілішына*** (У. Гніламёдаў “Уліс з Прускі”). 3. Многія роды ў нашай вёсцы называліся чамусьці па імёнах жанчын, прытым яўна ўніяцка-каталіцкага гучання: былі ***Тарэсіны***, ***Крысіны***, ***Марысіны*** і нават ***Марышчыны***. З роду ***Марышчыных*** паходзіла мая бабка Зося, а таксама бацька і дзед Лёвы Васілеўскага, майго траюроднага браценіка (У. Калеснік “Доўг памяці”) 4. Бацькаў род называлі ***Базёнавымі***, а хто быў той родапачынальнік ***Базён*** – адказаць не мог ніхто ні ў сям’і, ні ў вёсцы. Ніколі не чуў я расказу пра яго жыццё, і сёння, ведаючы прафесійна лінгвістыку, магу толькі здагадвацца, што зыходнае было ***Васіль***, вымаўлялася на ўніяцкі лад ***Базыль***, а памяншальна-ласкальная форма ***База***, сын таго ***Базы***, таксама ***Васіль***, пры памяншэнні называўся ўжо ***Базёнам***… Матчын род называлі ***Хвелевымі***, а хто быў той ***Хвель*** – таксама ні сямейнікі, ні вяскоўцы не ведалі. Не ведалі нават імя, ад якога некалі ўтварылася родавая мянушка, на маёй памяці такіх імён у вёсцы ўжо не было. ***Фелікс*** – імя каталіцкае ці ўніяцкае, а Сіняўская Слабада ўжо на памяці дзядоў была ўся праваслаўная. Праваслаўны быў і мой дзед па маці Ясь Балабановіч, у якога родавай мянушкай служыла імя нейкага продка ***Хвеля*** (У. Калеснік “Доўг памяці”). 5. Федзя Гаранчук завёў яго на пастой да саламянай удавы ***Гэбліхі***, муж якой – Гэблік – з’ехаў некалі, гадоў з пятнаццаць назад, у Амерыку ды так і не вярнуўся (У. Гніламёдаў “Вяртанне”). 6. Апанас ***Хомчышын*** са спалоханым выглядам моўчкі назіраў, як паліцыянты выганялі з хлява карову (У. Гніламёдаў “Вяртанне”). 7. У кутку тоўпіліся дзяўчаты: Гэлька ***Відэркава***, Луша ***Гальяшова***, Сонька ***Пракопава***, Волька ***Хомкава*** (У. Гніламёдаў “Уліс з Прускі”). 8. Оргій ***Маркаў*** – сын Марка Замагільнага (У. Гніламёдаў “Уліс з Прускі”).

Практыкаванне 6. Прачытайце вытрымкі з прозы берасцейскіх аўтараў: кнігі ўспамінаў У. Калесніка “Доўг памяці” і цыкла раманаў У. Гніламёдава “Сямейная хроніка ў стылі барока”. Вызначце тэма-тычныя групы прадстаўленых у прыведзеных кантэкстах індывідуальных мянушак, акрэсліце спосабы іх словаўтварэння.

1. З выгляду ён нагадваў маладога ***Пушкіна***. Яму і ў педвучылішчы далі мы клічку ***Пушкін***, і яна так да яго прыстала, што нават і імені яго ўжо не сталі ўжываць (У. Калеснік “Доўг памяці”). 2. За ўсцібісты і памаўзлівы характар, гарбаты нос і з’едлівую грымасу на твары Жоржыку Б., майму блізкаму земляку, далі ў гімназіі мянушку ***Д’ябэлак*** (У. Калеснік “Доўг памяці”). 3. У іх быў толькі адзін наглядчык за арандаванымі ўгоддзямі – гэта ***Смешка***. Увесь год ён ахоўваў лясы ад браканьераў і сам употай лупіў, што пад руку трапляла. Праўда, рабіў гэта асцярожна і маскіраваў

спрытна. ***Смешка*** быў чалавек патайны, негаваркі. І празвалі яго так за прыскаленую ўсмешку, што не сыходзіла з твару. Жартавалі, што дзе ён ні йдзе, на каго ні глядзіць, дык усё цэліць, меціць, забіць хоча (У. Калеснік "Доўг памяці"). 4. У інтэрнаце, галодным і халодным, нашы вучнёўскія актывісты збіралі складчыну, набывалі матэрыялы ды наводзілі такі-сякі божы выгляд. Мне даручылі ўзначальваць афармленчыя работы. Мне і прозвішча далі "***художнік***" з лёгкай рукі Мішы Араб'я (У. Калеснік "Доўг памяці") 5. Акрамя жабракоў і калек прадметам страху для мяне быў ***Пэтала-конская смерць***. Гэта малы, скалазубы, вечна ўсмешлівы (губы не сыходзіліся ў яго на зубах і таму пакідалі вечную грымаслівую ўсмешку) яўрэй, кожную восень праязджаў праз сяло і збіраў старых або безнадзейна хворых коней і вёў іх біць недзе ў лес, абдзіраў скуры, а тушы пакідаў ваўкам на конскіх могілках. Коней не зусім безнадзейных ён вёў і там, у сябе, крыху трымаў, потым спрабаваў прадаць на конскім рынку ў Міры або забіваў недзе там, каля мястэчка (У. Калеснік "Доўг памяці") 6. Загінуў тады намеснік Саятэвіча па баявой часці Васіль Пазняк ("***Дух пушчы***" – меў такую мянушку, бо лесарубам пазнаў усю пушчу, як уласную кішэню) (У. Калеснік "Доўг памяці") 7. Летам усё было. Старэйшы сын роды прымаў, а маці падказвала, што і як рабіць. Сын разарваў сваю сарочку, загарнуў у яе нованароджаную сястрычку і, бедны, не ведае, што рабіць. Маці аслабла. Ажно чуе – загрукатала па дарозе фурманка. Чалавек убачыў іх, пад'ехаў, забраў усіх траіх і хуценька павёз у вёску. "Гэта, – кажа, – мая **знайда**". Так тую дзяўчынку і празвалі – ***Знайда*** (У. Гніламёдаў "Уліс з Прускі"). 8. Марка ***Замагільны*** (ён сапраўды жыў на хутары за могліцамі), які аднойчы, матлянуўшы падолам сваёй палатнянай сарочкі, вырваў з хаты Масея Галёнкі бервяно і разагнаў ім п'яных, калі тыя ўсчалі паміж сабой бойку. Назаўтра, праўда, Марка падняў хату за вугал і ўставіў бервяно на месца, але падагнаць яго як трэба усё ж не здолеў, і яно крыху выпірала ўбок. Пасля гэтага Масея і празвалі ***Касабокім***, сапраўднае прозвішча яго было Галёнка (У. Гніламёдаў "Уліс з Прускі"). 9. Сядзельца звалі Навумам, але ў Трахіма была ў яго мянушка "***Хе-хе***" – з націскам на апошнім складзе па звычцы самога Навума – так звалі карчмара кожны раз дадаваць "хе-хе" да таго, што ён сказаў (У. Гніламёдаў "Расія"). 10. "О! – як бы пахваліў Міхаля Пацей і дастаў з ніжняй шуфляды стала замусоленую цяжкую шклянку, дзьмухнуў у яе, каб там нічога не заставалася, і выліў усё, што было ў кручку. – У мяне, браце, разумовая праца, без чаркі нельга. Ну, ***будзьма***!". Міхаль кіўнуў галавой і міжвольна пасміхнуўся, успомніўшы пісараву мянушку ***Будзьма***. Пацей падняў шклянку, сабраў губы ў трубачку і кульнуў гарэлку ў рот настолькі спраўна, што наведвальнік ажно мусіў быў здзівіцца. Поўная шклянка адразу апусцела да дна (У. Гніламёдаў "Уліс з Прускі"). 11. Фэдар

колькі гадоў таму вярнуўся з японскай вайны. Быў паранены, інвалід, кульгаў, атрымліваў пенсію. І мянушку яму далі – ***Фэдар-японец*** (У. Гніламёдаў “Расія”).

Практыкаванне 7. Выпішыце паэтонімы з прыведзеных урыўкаў са зборніка аўтарскіх казак сучасных беларускіх пісьменнікаў “Зорная Кася”. Выдзеліце тэматычныя разрады онімаў, вызначце тыпы паэтонімаў паводле структуры і паводле суадносінаў з кампанентамі сучаснага анамастыкону.

1. Чорная Панна гэта не хто іншы, як сапраўдная каралева і вялікая княгіня Барбара Радзівіл – каханая жонка караля польскага і князя літоўскага Жігімонта II Аўгуста. Праўда, яна не жыла ў Нясвіжскім замку. У Вільні, колішняй сталіцы Вялікага Княства Літоўскага, сустракалася з Жыгімонтам. А затым яны пераехалі ў сталіцу Польшчы горад Кракаў. Прывід каралевы пасяліўся ў Нясвіжы толькі пасля яе заўчаснай смерці. Там і блукае па пакоях і лёхах замка, аглядае незлічоныя багацці. Ноччу Чорная Панна спадзяецца сустрэць свайго любага мужа. А Чорнай яе называюць, бо апранута ва ўсё чорнае. Жалобу па мінулым носіць (А. Бутэвіч). 2. Ка́раля Станіслава Радзівіла называлі яшчэ Пане Каханку за тое, што з гэтым словам ён звяртася да кожнага са сваіх суразмоўцаў (А. Бутэвіч). 3. За ўласныя грошы ў 1563 годзе надрукаваў Радзівілаўскую Біблію ў старажытным Бярэсці ў сваёй друкарні стараста берасцейскі і канцлер вялікі літоўскі Мікалай Крыштоф Радзівіл Чорны. Радзівілаўская Біблія з’яўляецца найвялікшым паводле аб’ёму і самым цяжкім друкаваным выданнем ва ўсім Вялікім Княстве Літоўскім (А. Бутэвіч). 4. Спарышка дае спор ва ўсялякай працы. Хто перад працай пакліча яе, таго яна абляціць вакол, і тады праца будзе ісці лёгка і хутка. Яшчэ яе клічуць Спешка” (П. Ляхновіч) 5. Лознікі могуць заблытаць чалавека або жывёлу ў лазе або праваліць у вадзяное акенца. Потым самі дапамагаюць ахвяры выбрацца – падсоўваюць лазіныя дубцы, трыснёг, аер…” (П. Ляхновіч). 6. Цёця, дух лета, – прадстаўляў Лясун. – Цёця мела выгляд пажылой, мажнай кабеты, прыбранай каласамі жыта, са спелай садавінай і гароднінай у руках (П. Ляхновіч). 7. Хлеўнік жыве ў стайні і любіць начамі ездзіць на кані. Проста па хляве. Конь намагаецца яго скінуць, але Хлеўнік учэпісты яздок. Калі ёсць каровы – ездзіць на каровах (П. Ляхновіч).

Практыкаванне 8. Адна з важных функцый дзіцячай літаратуры – адукацыйна-асветніцкая. Творы, адрасаваныя дзецям і падлеткам, назычаны ўласнымі імёнамі розных разрадаў. Нярэдка на старонках твораў раскрываецца ўнутраная форма онімаў і расказваецца гісторыя найважнейшых помнікаў нацыянальнай культуры. Прачытайце ўрывак з казкі Анатоля Бутэвіча “Як Данік у Радзівілаўскае метро трапіў”, у якім

расказваецца гісторыя Налібоцкай шклянай гуты і тлумачыцца сэнс **эргоніма**. Знайдзіце ў зборніку казак сучасных беларускіх аўтараў “Зорная Кася” (Мінк, 2014) і іншых зборніках казак кантэксты, якія прадстаўляюць этымалогію ўласных імёнаў – назваў рэалій старадаўняй культуры, рэалізуючы адукацыйна-асветніцкую функцыю дзіцячай літаратуры.

Радзівілаўская шкляная гута. Якая яна светлая ды прыгожая! Са столі дзясяткі большых і меншых жырандоляў звісае. У іх мо сотні свечак гараць, мігатлівымі светлячкамі адбіваюцца ў бліскучых крышталёвых падвесках і люстрэрках. Люстэркі ж такія, што дзіву даешся – усё ў іх адлюстроўваецца мноства разоў і ствараеца ўражанне бясконцасці. **Гута** – гэта ***шкляная майстэрня***, альбо, інакш кажучы, мануфактура. Невялікі па сённяшніх мерках заводзік, дзе выраблялі люстэркі, люстры, жырондолі, посуд і шмат-шмат што іншае. Больш за сто назваў шкляных вырабаў асвоілі налібоцкія майстры. Такіх, як на Налібоцкай гуце, ніхто больш не ўмеў рабіць. Вельмі часта майстры аздаблялі свае вырабы незвычайнымі ўзорамі і мясцовымі краявідамі, вершамі, жартоўнымі пажаданнямі, парадамі.

Практычныя заняткі 5
Вытокі геаграфічных назваў Беларусі

Пытанні для самакантролю

1. Якую інфармацыю пра жыццё, побыт, заняткі, веру нашых продкаў можна атрымаць, калі ўважліва вывучыць асаблівасці беларускіх тапонімаў?
2. Чаму на карце Беларусі даволі многа балцкіх паводле паходжання тапанімічных назваў? У чым праяўляецца спецыфіка такіх найменняў?
3. У чым адметнасць народнай і навуковай этымалогіі пра ўзнікненне асобных тапанімічных назваў. Параўнайце народную і навуковую этымалогію назвы сталіцы Рэспублікі Беларусь – Мінска.
4. Прывядзіце прыклады народных этымалогій пра ўзнікненне найменняў паселішчаў Берасцейшчыны.
5. Прывядзіце прыклады народных этымалагій, засведчаных у творах мастацкай літаратуры Берасцейшчыны. Якое пазнавальна-выхаваўчае значэнне мае гэтая інфармацыя?

Практыкаванні

Практыкаванне 1. Запішыце 20 айконімаў вашага раёна, разгледзьце іх на лексіка-семантычным узроўні: выдзеліце тапонімы, утвораныя ад назваў рэк і азёраў, мянушак і імёнаў людзей, назваў плямёнаў, народаў,

асаблівасцяў рэльефу, назваў раслін, назваў аб'ектаў матэрыяльнай культуры.

Практыкаванне 2. Прачытайце прыведзеныя ў кнізе А. Бутэвіча "Падарожжа па сівых мурах з Адамам Міцкевічам" версіі паходжання тапоніма **Мір**. Параўнайце прыведзеную народную этымалогію з навуковай, выкладзенай у кнізе Валянціны Пятроўны Лемцюговай "Тапонімы распавядаюць" (Мінск, 2008).

Прыхільнікі адной з версій пра паходжанне назвы горада ***Мір*** даводзяць, што некалі тут быў заключаны ***мір*** паміж заваёўнікамі-крыжакамі і вялікалітоўскімі князямі. Аўтары другой версіі паспрабавалі разабрацца, а што ж азначала слова "***мір***" у тыя далёкія часы. Высветлілася, што ў даўніну так называўся агульны сход жыхароў, на якім усім ***мірам***, усёй супольнасцю абмяркоўвалі і вырашалі найбольш важныя пытанні жыцця. Захаваліся нават прымаўкі на гэты конт: "Як ***мір*** скажа, тое і будзе", "Як ***мір*** асудзіць, так і будзе".

Да нашых дзён захаваліся прыкметы і сведчанні татарскага побыту на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Нямала іх і ў Міры, і яго ваколіцах. Калісьці адна з вуліц называлася Татарскай, у паселішчы дзейнічала мячэць. Пра колішнюю татарскую прысутнасць нагадваюць нязвыклыя для беларускага вуха назвы паселішчаў: Ішкалдзь, Турэц, Бербашы, Сімкава… І вось робіцца выснова: калі так шмат вакол Міра татарскіх прыкмет, то і назва яго таксама цюркскага паходжання. У даўняй энцыклапедыі Бракгаўза і Эфрона паведамляецца, што нашчадкаў Магамета татары называлі "***эмір***" або "***амір***", гэта значыць "князь, валадар, начальнік". "***Мір***" – скарочанае ад "***эмір***".

Практыкаванне 3. Прачытайце прыведзеныя ў зборніку "У ноч на Івана Купалу" (Мінск, 2005) паданні пра ўзнікненне Лунінца і Узды. Параўнайце прыведзеную народную этымалогію з навуковай, выкладзенай у кнізе Валянціны Пятроўны Лемцюговай "Тапонімы распавядаюць" (Мінск, 2008). Прывядзіце прыклады прадстаўлення народнай этымалогіі назваў беларускіх паселішчаў у творах фальклору і навукова-папулярнай літаратуры сучасных беларускіх пісьменнікаў.

Лунінец

Наша сяло старэйшае за горад. Ад Луніна і Лунінец паходзіць. Сяло Лунін з даўніх часоў вялікае. Жыхароў тут заўсёды было "богато", а на месцы горада Лунінца нічога не было. Ніхто там не жыў. Толькі дзікія качкі плёскаліся ў лужыне. Неяк адзін з жыхароў Луніна аддзяліўся ад сваякоў. Пасяліўся ён якраз там, дзе цяпер горад. Пабудаваў сабе хату,

узараў зямлю, пасадзіў сад, наладзіў гаспадарку. Неўзабаве яго сядзібу пачалі называць Лунінцам, бо там жыў Лунінец, чалавек з Луніна.

Час ішоў, патомства Лунінца павялічылася. Унукі і праўнукі будаваліся па суседству, жылі побач. З хутара вырасла акружаная лясамі вёска, за якой назаўсёды захавалася назва Лунінец, як памяць пра яе заснавальніка, першага перасяленца з Луніна.

Узда

Пад Койданавам беларусы разбілі татараў, а сам татарскі атаман Кайдан уцёк. Але беларусы дагналі яго там, дзе цяпер Узда стаіць, і ранілі. Падаючы з сядла, Кайдан ухапіўся за ўзду свайго каня і сказаў:

– Вось дзе напаткала мяне смерць.

На тым месцы пачалі будавацца людзі, і пасяленне тое назвалі Узда.

Практыкаванне 4. Запішыце ад інфарматараў легенды аб паходжанні вёсак вашага рэгіёна.

Практыкаванне 5. Выпішыце са зборнікаў М. Міцковіча “Тапанімічная повязь часоў” (Мазыр, 2002) і П. Татарынава “Гарады Беларусі. Брэстчына” (Мінск, 2010) прыклады народнай і навуковай этымалогіі геаграфічных назваў Брэсцкай вобласці.

Практыкаванне 6. Як гучалі ў XI–XII стагоддзях назвы гарадоў Брэст, Гродна, Слонім, Мінск, Навагрудак?

Практыкаванне 7. Вялікую па колькасці групу складаюць назвы, утвораныя ад прозвішчаў ці імёнаў першапасяленцаў. Назавіце не менш за 5 такіх назваў населеных пунктаў Берасцейшчыны.

Практыкаванне 8. Назвы гарадоў, што заканчваюцца на -ск, -цк, лічацца адгідранімічнымі. Назавіце 5 найменняў гарадоў, у аснове якіх ляжаць рачныя назвы.

Практыкаванне 9. Геаграфічныя назвы цікавыя і разнастайныя паводле сваёй струкутры. Шмат якія з іх састаўныя. Дапоўніце назвы Буда-_____, _____Горка, _____Дарогі, _____Гарадок.

Практыкаванне 10. Некаторыя тапонімы складаюць антанімічныя пары: **вялікі** – **малы**, **новы** – **стары**. Назавіце як мага болей пар назваў такога тыпу.

Практыкаванне 11. Прачытайце прыведзеныя ўрыўкі з кнігі У. Арлова “Таямніцы Полацкай гісторыі”. Выдзеліце імёны ўласныя. Зрабіце іх тэматычную класіфікацыю. Выдзеліце ў ліку ўстарэлых онімаў твора **гістарыёнімы** і **археонімы**.

У сённяшнім беларускім друку можна сустрэць цалкам сур’ёзныя прапановы назваць беларусаў крывічамі, а Беларусь перайменаваць у

Крывію. Аднак будзем памятаць, што пэўнасці на гэты конт не меў нават сам Вацлаў Ластоўскі… Гісторыкі дагэтуль спрачаюцца, хто ж усё-такі беларусы – славяне з моцным дамешкам балцкай крыві ці аславяненыя балты, аднак у любым выпадку цяперашнія латышы і літоўцы даводзяцца нам кроўнымі братамі. Дастаткова верагодным выглядае меркаванне, што сам этнонім «крывічы» цесна звязаны з найвышэйшым балцкім вешчуном Крыва-Крывейтам. Сакральнасць самога кораня «крыў» яскрава праяўляецца ў этнаграфічных матэрыялах Падзвіння. Русальны тыдзень меў тут паралельную назву – «крывы». Найбольш спрыяльныя для варажбы калядныя вечары на Полаччыне і цяпер называюць не толькі святымі, але і крывымі, а ў запісаных тут этнографамі чарадзейных казках можна прачытаць, што «гаспадар быў змей-чараўнік, ды яшчэ крывы» або што «вядзьмак і ведзьма абавязкова маюць крывізну.

Угневаны Зеўс паразіў няшчаснага Фаэтона маланкаю, і той упаў у далёкую ад роднага Алімпа раку Эрыдан. Чаго я раптам узгадаў гэты міф? З тае прычыны, што Эрыдан, які прыняў Фаэтонава цела, успаміналі яшчэ Гамер і яго вучань Гесіёд. Шмат паважаных вучоных у XIX і XX стагоддзях сцвярджалі, што Эрыдан – гэта наша Дзвіна. Дарэчы, яна мела і іншыя старажытныя імёны: Рубон (адсюль і баявы кліч палачанаў, з якім яны ішлі на ворагаў, – «Рубон!») або Рудон, а яшчэ Дзіна або Віна – так завецца рака ў некаторых скандынаўскіх сагах.

Практычныя заняткі 6
Шляхі адраджэння беларускай тапаніміі

Пытанні для самакантролю

1. Акрэсліце змены, што адбыліся ў тапанімічнай сістэме Беларусі ў савецкі перыяд. Ахарактарызуце разнавіднасці новых назваў. У чым іх спецыфіка?
2. Прывядзіце прыклады неапраўданых замен традыцыйных беларускіх назваў, што было абумоўлена савецкай ідэалогіяй.
3. Прывядзіце прыклады скажоных назваў вашага рэгіёна. Выкажыце свае адносіны да гэтых змен.
4. Падбярыце найбольш цікавыя выступленні ў абласным, раённым і рэспубліканскім друку па праблеме вяртання традыцыйных геаграфічных назваў Беларусі.

Практыкаванні

Практыкаванне 1. Прачытайце артыкул А. В. Кавалёвай “Перайменаванні Прыпяцкага Палесся” (Веснік МДПУ імя І. П. Шамякіна, 2016, № 2(48), с. 107–110). Прывядзіце прыклады замены ў савецкі перыяд

геаграфічных назваў вашай мясцовасці. Прааналізуйце этымалагічную семантыку першапачатковых і замененых назваў.

Практыкаванне 2. Прачытайце нататкі зборніка М. С. Міцковіча “Тапанімічная повязь часоў” (Мазыр, 2002). Занатуйце прыведзеныя ў даследаванні прыклады замены ў савецкі перыяд тапонімаў Жабінкаўшчыны. Акрэсліце этымалагічную семантыку гэтых назваў.

Практыкаванне 3. Прачытайце раздзел “Перайменаванне вуліц” зборніка Васіля Сарычава “У пошуках страчанага часу” (Брэст, 2007). Супастаўце назвы берасцейскіх вуліц часоў уваходжання горада ў склад Расійскай імперыі, Польшчы, Савецкага Саюза. Ахарактарызуйце тэндэнцыі надання імёнаў вуліцам у савецкія часы.

Практыкаванне 4. Прачытайце ў зборніку П. Татарынава “Гарады Беларусі. Брэстчына” (Мінск, 2010) пра перайменаванні вуліц Баранавічаў, Івацэвічаў, Драгічына. Ахарактарызуйце этымалагічную семантыку назваў савецкага часу.

Практыкаванне 5. Прачытайце ўрывак з кнігі берасцейскай краязнаўцы Валяніцны Рыгораўны Купцовай “Я иду по городу, по знакомой улице...: путешествия по улицам довоенного и современного Бреста” (Брэст, 2008). Выдзеліце з прыведзенага ўрыўка ўласныя імёны. Падзяліце іх на тэматычныя групы. Выпішыце ўстарэлыя найменні вуліц. Размяркуйце іх на **археонімы**, якія адрозніваюцца ад сучасных назваў асаблівасцямі гучання і словаўтваральнымі афіксамі, і **гістарыёнімы** – найменні паняццяў, якія зніклі з жыцця соцыуму.

Падрыхтуйце, выкарыстоўваючы матэрыялы гэтай кнігі, паведамленне пра гісторыю іншых мікрараёнаў і вуліц Брэста. Акрэсліце этымалогію прадстаўленых у кнізе ўрбанонімаў.

Валынка

Валынка – былое прадмесце Берасця, увайшла ў гарадскую рысу яшчэ ў XIX стагоддзі. Гэта было рамесна-гандлёвае пасяленне на гандлёвым шляху з Валыні (адсюль паходзіць яго назва).

Валынка – адно з найстаражытнейшых пасяленняў. Яе заснаванне датуецца XIII стагоддзем, калі Берасце ўваходзіла ў склад Галіцка-Валынскага княства.

Валынь, суседні з Берасцейшчынай рэгіён Украіны, сваёй назвай абавязана надзейнаму памочніку палешука – валу.

Вол – даўні гаспадарчы сімвал Палесся. У якасці цяглавай жывёлы ва ўмовах балот і пяскоў ён быў незамянімы на працягу тысячагоддзяў. Гэтаму палескаму гужавому транспарту ўжо не адна тысяча гадоў. Адна з вуліц даваеннага Брэста насідла назву Валавая сцежка (Воловая тропа) (цяпера вуліца Салтыкова-Шчадрына).

У 1921–1930 гадах, калі Брэст знаходзіўся ў складзе Польшчы, Валынка стала называцца мястэчкам Траўгутава, атрымаўшы імя ў гонар Рамуальда Людвікавіча Траўгута (1826–1864), выхадца з вёскі Шастакова Камянецкага раёна, чалавека трагічнага лёсу. Падчас паўтання 1863–1864 гг. ён стаў адным з найбуйнейшых ваенных кіраўнікоў, а затым кіраўніком нацыянальнага ўрада. З кастрычніка 1863 года урад прысвоіў яму званне генерала і прызначыў сваім прадстаўніком за мяжой. З кастрычніка Траўгут стаў фактычным кіраўніком паўстання і зрабіў многа, каб надаць руху новыя сілы. Праз пяць месяцаў генерал быў арыштаваны і па прысуду ваенна-палявога суда павешаны ў Варшаўскай цытадэлі.

Лысая Гара

Вёска Лысая Гара ў 1940–1958 гг. знаходзілася ў саставе Рэчыцкага сельсавета Брэсцкага раёна, у гарадскую рысу ўвайшла 31 мая 1958 года, праз два дзесяцігоддзі – у Ленінскім раёне Брэста. Лысая Гара ўключала вуліцы Белавежскую, Беларускую, Лысую Гару, Цалінную і іншыя. Назва паходзіць ад пасялення на ўзвышаным месцы, цалкам ці часткова пазбаўленым расліннасці. Населеныя пункты з такой назвай нярэдка сустракаюцца ў тапаніміцы Беларусі. Напрыклад, Ласая Гара ў Целяханах. Легенда гаворыць, што ў часы нашэсця на Русь на ўзлеску быў пахаваны забіты хан. Яго цела знаходзіцца ў кургане, які зараз называецца Лысай Гарой. Хто-ніхто са старажылаў упэўнены, што паводле звычаяў таго часу разам з ханам у зямлю закапалі і скарбы. Падчас нямецка-фашысцкай акупацыі Лысая Гара была месцам масавых расстрэлаў берасцейцаў. Уваходзіць у раён Свабоднай эканамічнай зоны, якая жыве сваім асаблівым жыццём.

Вуліца 17 верасня

Вуліца 17 верасня названа ў памяць пра падзеі, якія адбываліся 17 верасня 1939 года. У гэты дзень Чырвоная Армія, перайшоўшы савецка-польскую мяжу, узяла пад абарону насельніцтва Заходняй Беларусі. Забудоўвацца пачала з 1840 года, атрымаўшы назву Тапалёвай. Палякі перайменавалі вуліцу ў гонар класіка яўрэйскай літаратуры Іцхака Лейбуша Пераца (1851–1915), пісьменніка з сусветным іменем. Берасцейка Ганна Глюксман успамінае: “Хто з берасцейскіх яўрэеў не ведаў Тапалёвай, 12? Гэты дом быў як пчаліны вулей – заўсёды тут панавала ажыўленне, людзі наведвалі яго днём і ноччу. Дом быў падобны на старажытны замак, вакол якога з усіхбакоў былі высокія дамы. У ім знаходзілася школа “Хатхія”. Калі гэтую школу перанеслі на Беластоцкую (вул. Савецкіх Пагранічнікаў), гэта месца заняла Арганізацыя Сіяністкіх рабочых, “Маладыя Сіяністы” і “Хахалюц”, затым сюды ўвайшлі “Агульныя сіяністы”, “Рэваншысты” і іншыя яўрэйскія арганізацыі, якія займаліся выкупам зямлі ў Ізраілі. Хто толькі не быў у гасцях у гэтым

доме! Пасол Сейма І. Грыгберг, прафесар Бейтар, выхадзец з Брэста Гольдберг, намеснік прэзідэнта горада доктар Левінсон. Тысячы дзяцей прыходзілі сюды ў дзень пасадкі дрэваў і адтуль выходзілі ў поле з аркестрам і сцягамі". У гэтым доме бываў таксама выхадзец з Брэста Менахем Вольфавіч Бегін (1913–1992), будучы прэмьер-міністр Ізраіля, лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру. Яго бацька, чалавек высокаадукаваны, выдатны матэматык, ведаў многа моў і медыцыну, быў сакратаром іўдзейскай суполкі, за што ўтоплены немцамі ў Мухаўцы. Маці Менахіма Хасі Бегін загінула ў гета. Паўднёвая частка горада ўвогуле была іўдзейскім раёнам. Да Тапалёвай-Пераца можна дастасаваць выраз "Вашы вуліцы, нашы дамы". Да 1939 года гэта была гандлёвая частка горада. Магазіны мелі добрае забнспячэнне. На вуліцы было нямала рэстаранчыкаў. Адзін з іх – "Малка" – быў вядомы выдатнай рыбай па-яўрэйску.

Практычныя заняткі 7
ДЭРЫВАЦЫЯ (СЛОВАЎТВАРЭННЕ) АНАМАСТЫЧНАЙ ЛЕКСІКІ

Пытанні для самакантролю

1. Праілюструйце прыкладамі найменняў населеных пунктаў Брэстчыны наступныя лексіка-семантычныя групы айконімаў: 1) айконімы апелятыўнага паходжання; 2) айконімы адантрапанімічнага паходжання; 3) айконімы адгідранімічнага паходжання.
2. Ахарактарызуйце асноўныя шляхі ўтварэння беларускіх гідронімаў.
3. Дайце азначэнне тэрміна **мікратапонім**. Ахарактарызуйце асноўныя спосабы словаўтварэння ў мікратапаніміі. Кожны спосаб праілюструйце мікратапонімамі вашай маленькай радзімы.
4. Прааналізуйце тэрытарыяльнае пашырэнне на Беларусі прозвішчаў, утвораных з дапамогай розных суфіксаў. Прозвішчы з якімі прозвішчаўтваральнымі фармантамі пашыраны ў Брэсцкай вобласці?
5. Дайце азначэнне тэрмінам **ад'ектонім** і **катайконім**. Утварыце прыметнікі і найменні жыхароў мужчынскага і жаночага полу ад назваў вашага роднага горада або вёскі.

Практыкаванні

Практыкаванне 1. Устанавіце, якім спосабам утвораны назвы населеных пунктаў Брэстчыны. Падчас тлумачэння паходжання назваў звяртайцеся да працы В. П. Лемцюговай "Тапонімы распавядаюць: навукова-папулярныя эцюды" (Мінск, 2008).

Астрамечава, Астравок, Астромічы, Мікулічы, Мацясы, Мачулішча, Плешчыцы, Плоскае, Агароднікі, Алешкавічы, Алёхнавічы, Алізараў-

шчына, Аніскавічы, Альшэва, Антопаль, Асаўніца, Астрэйкі, Багданаўка, Багушэвічы, Баранавічы, Бельчыцы, Берасні, Ваўкаўня, Вільянава.

Практыкаванне 2. Запішыце 10 мікратапонімаў вашай роднай вёскі, растлумачце іх матывацыю.

Практыкаванне 3. Запішчыце 10 мікратапонімаў вёскі Рубель Столінскага раёна Брэсцкай вобласці, што ўвайшлі ў падборку анамастычнай лексікі, прадстаўленай у кнізе М. Пашкевіча “У родным слове адгукаецца душа…” (Брэст, 2012), растлумачце сэнс іх словаўтваральных асноў.

Практыкаванне 4. З даследавання М. Міцковіча “Топонимическая связь времён” (Мазыр, 2002) выпішыце 5 назваў рэк Жабінкаўшчыны. Акрэсліце прадстаўленыя на старонках кнігі версіі паходжання гідронімаў.

Практыкаванне 5. Выпішыце патранімічныя і непатранімічныя прозвішчы, абгрунтуйце свой выбар.

Тацішчаў, Гадуноў, Пляшчэеў, Залатарэнка, Налівайка, Вельямінаў, Марозаў, Хадкевіч, Галіцын, Шэін, Валовіч, Глябовіч, Гаркуша, Лабада, Сапега, Солтан, Радзівіл, Скарга, Пачобут, Курч, Карповіч, Нямцэвіч, Філіповіч, Францкевіч.

Практыкаванне 6. Вызначце матывацыйную прыкмету, якая стала асновай утварэння прыведзеных прозвічаў.

Квяткоўскі, Казлоўскі, Чыж, Дрозд, Барановіч, Мамантаў, Рэпін, Мураўёў, Лавашоў, Верашчака, Катухоў, Баршчэўскі, Дзяркач, Цвярскі, Мірскі, Мяшчэрскі, Ткач, Вашчыла, Казакевіч, Ваданос, Літвінава, Чумак, Царык, Ганчарук, Есауленка, Канавалаў, Кавальчук, Вайцяшонак, Тупіца, Багатырэвіч, Харашун, Лобач, Ліхадзей, Бягун, Галавач, Балаболка, Губарэвіч, Нядбайла, Трухан, Лысюк, Бабёр, Карп, Сарока, Лось, Карась, Шчука, Ракіна, Дрозд, Сокал, Каўрыга, Шыла, Рагожка, Кісялёў, Кіцель.

Практыкаванне 7. Вызначце, якія поўныя кананічныя імёны суадносяцца з гутарковымі формамі, што сталі асновай утварэння прозвішчаў.

Рыгаровіч, Яцкевіч, Якімовіч, Апанасовіч, Урбановіч, Пашкевіч, Юхневіч, Ігнатовіч, Семяновіч, Глябовіч, Лаўрыковіч, Тамашэвіч, Паўлёнак, Сянкевіч, Філіпчык, Савічык, Саўчык, Дзмітрук, Кірыльчук, Давыдзюк, Ільючонак, Грынчык, Яфімік, Кузьміч, Барташэвіч, Елізаровіч, Хомка, Панкоў, Засімовіч, Клімчук, Мартынаў, Андронаў, Фільчыкаў, Навумчык, Іваноў, Карнілаў, Самсонаў, Платонаў, Мартынюк.

Практыкаванне 8. У прыведзеных прозвішчах выдзеліце прозвішчаўтваральныя фарманты.

Васюкоў, Бурмістраў, Точын, Карзухіна, Міхеева, Ракіна, Ярэміч, Нікановіч, Крыловіч, Раковіч, Піліповіч, Граковіч, Сушчэня, Дарашэнка, Вальковіч, Баярынаў, Мельнічук, Ляшук, Літвінюк.

Практыкаванне 9. Прачытайце артыкул “Спосабы катайканімічнай намінацыі” з вучэбна-метадычнага дапаможніка У. М. Генкіна “Ойконимия и катойконимия Белорусского Поозерья” (Віцебск, 2009. С. 51–53). Ад назваў **Брэст**, **Баранавічы**, **Камянец**, **Пінск**, **Іванава**, **Івацэвічы**, **Пружаны**, **Ружаны**, **Маларыта**, **Столін**, **Давыд-Гарадок** утварыце найменні жыхароў згаданых населеных пунктаў.

Практыкаванне 10. Карыстаючыся “Слоўнікам тапонімаў і адтапанімных дэрыватаў у арэале заходнепалескіх гаворак” З. М. Заіка (Брэст, 2001), утварыце ад прыведзеных назваў населеных пунктаў назвы асоб мужчынскага роду, назвы асоб жаночага роду, назвы асоб у форме множнага ліку. Вызначце словаўтваральныя афіксы.

Варсынь, Піліпкі, Рухча, Відзібор, Давыд-Гарадок, Камянец, Пінск, Рэчыца, Радавецкая Вулька, Зялёны Бор, Мокрая Дуброва, Вялікая Ніўка, Малыя Арлы, Люты Бор, Малы Халажын, Новы Двор, Вялікія Вікаравічы, Малыя Корчыцы, Лаўская Вулька, Бронная Гара, Тоўсты Дуб.

Практыкаванне 11. Са “Слоўніка тапонімаў і адтапанімных дэрыватаў у арэале заходнепалескіх гаворак” З. М. Заіка (Брэст, 2001) выпішыце варыянты матываваных прыведзенымі тапонімамі адтапа-німных ад’ектонімаў і катайконімаў. Чым абумоўлена зафіксаваная ў слоўніку з’ява варыянтнасці?

Абрамава, Агдамер, Альпень, Багуслаўка, Агова, Адамкова, Струга, Бухлічы.

Практыкаванне 12. Прачытайце артыкул В. Вячоркі “Менчукі ці мінчане” (электронны рэсурс). – Рэжым доступу: https://www.svaboda.org/a/25401944.html. – Дата доступу: 18.08.2019, а таксама раздзел “Сацыякультурныя фактары тапанімічнай намінацыі” у вучэбна-метадычным дапаможніку У. М. Генкіна “Ойконимия и катойконимия Белорусского Поозерья” (Віцебск, 2009. С. 53–56”. Выкажыце сваё меркаванне пра ўжыванне ў сучаснай маўленчай практыцы катайконімаў **мінчанін – мінчук**, **віцяблянін – віцябчанін**, **брастчанін – берасцеец** і інш.

ПЫТАННІ ДА ЗАЛІКУ

1. Прадмет анамастычных даследаванняў. Разрады ўласных імёнаў. Напрамкі анамастычнай работы.
2. Месца анамастыкі сярод іншых навук.
3. Уласнае імя як моўная адзінка. Яго адрозненне ад агульных назоўнікаў (апелятываў). Семантыка ўласнага імені.
4. Прадмет антрапанімікі. З гісторыі беларускай антрапанімікі.
5. Перыядызацыя ўсходнеславянскай антрапаніміі.
6. Язычніцкі этап гісторыі ўласных асабовых імёнаў. Тэматычныя групы язычніцкіх празванняў-мянушак.
7. Крыніцы фарміравання хрысціянскіх (каляндарных) уласных асабовых імёнаў.
8. Працэсы адаптацыі хрысціянскіх імёнаў да фанетычнай і граматычнай сістэмаў усходнеславянскіх моў. Фанетычныя змены хрысціянскіх імёнаў, абумоўленыя асаблівасцямі беларускай мовы.
9. “Анамастычны бум” XX стагоддзя.
10. Імёны па бацьку як тып антрапонімаў: гісторыя фарміравання, сучасныя спосабы ўтварэння.
11. Мянушкі як тып антрапонімаў: класіфікацыя, структура, тэматычныя групы.
12. Прозвішчы як тып антрапонімаў. Гісторыя іх фарміравання.
13. Структурныя і семантычныя асаблівасці прозвішчаў.
14. Праблема скажэння беларускіх прозвішчаў.
15. Псеўданімы як тып антрапонімаў: прычыны з’яўлення, асноўныя характарыстыкі. З гісторыі даследавання псеўданімаў.
16. Уласнае імя (паэтонім) у мастацкім тэксце. Тыпы паэтонімаў паводле ступені семантычнай актыўнасці (на прыкладзе твораў сучасных беларускіх аўтараў).
17. Прозвішча як сродак характарыстыкі героя літаратурнага твора.
18. Мянушка як сродак характарыстыкі героя літаратурнага твора.
19. Прадмет тапанімікі. З гісторыі беларускай тапанімікі. Сучасны стан тапанімікі.
20. Вытокі беларускай тапаніміі.
21. Народная і навуковая этымалогія тапонімаў.
22. Міжэтнічныя працэсы ў люстэрку тапаніміі.
23. Шляхі адраджэння нацыянальнай тапаніміі.
24. Спосабы словаўтварэння беларускіх айконімаў.
25. Дэрывацыя гідронімаў Беларусі.
26. Спосабы словаўтварэння мікратапонімаў.
27. Словаўтварэнне прозвішчаў беларусаў.

Тэст па анамастыцы

1. Дапоўніце сказ:
Від антрапоніма. Іменаванне жонкі па імені мужа – гэта…
2. Дапоўніце сказ:
Агульнае імя ў процілегласць уласнаму імені – гэта…
3. Дапоўніце сказ:
Зашыфраванае любое ўласнае імя, якое хаваюць – гэта…
4. Дапоўніце сказ:
Найменне чалавека, утворанае ад імені ці мянушкі маці – гэта…
5. Дапоўніце сказ:
Дадатковае неафіцыйнае імя, дадзенае чалавеку іншымі людзьмі ў адпаведнасці з яго характэрнай рысай, жыццёвымі абставінамі, па якой-небудзь аналогіі, паходжанні і іншых матывах – гэта…
6. Дапоўніце сказ:
Мянушка брата па імені, мянушцы брата ці сястры або найменне сястры па імені, мянушцы брата (іншай сястры) гэта….
7. Дапоўніце сказ:
Мянушка, утвораная ад імені, прозвішча або мянушкі жонкі – гэта…
8. Дапоўніце сказ:
Найменне чалавека, утворанае ад імені ці мянушкі бацькі або продкаў па бацькоўскай лініі – гэта…
9. Дапоўніце сказ:
Спадчыннае афіцыйнае найменне, якое паказвае на прыналежнасць чалавека да пэўнай сям'і – гэта…
10. Дапоўніце сказ:
Мужчынскае імя, выкарыстанае ў якасці псеўданіма жанчынай – гэта…
11. Дапоўніце сказ:
Жаночае імя, выкарыстанае ў якасці псеўданіма мужчынам – гэта…
12. Сярод прыведзеных асабовых імён выдзеліце каляндарныя.
а) Сафія;
б) Святаполк;
в) Усевалад;
г) Вячаслаў;
д) Аляксандр.
13. Сярод прыведзеных імён выдзеліце імёны праваслаўнага календара.
а) Фама;
б) Тамаш;
в) Георгій;
г) Ежы;
д) Себасцьян.
14. Сярод прыведзеных імён выдзеліце імёны каталіцкага календара.
а) Барбара;
б) Варвара;
в) Баніфацый;
г) Ваніфацій;
д) Тодар.
15. Адзначце імёны па бацьку, у якіх пры перакладзе на беларускую мову адбудзецца з'ява якання.
а) Еремеевич;
б) Ефимович;
в) Ермолаевич;
г) Евдокимович;
д) Ефремович.

16. Адзначце імёны па бацьку, у якіх пры перакладзе на беларускую мову адбудзецца з'ява якання.

а) Ермилович;
б) Ерофеевич;
в) Ермакович;
г) Епифанович;
д) Елизарович.

17. Адзначце імёны па бацьку, у якіх пры перакладзе на беларускую мову адбудзецца з'ява якання.

а) Македоньевич;
б) Дементьевич;
в) Емельянович;
г) Пименович;
д) Ренальдович

18. Адзначце імёны па бацьку, у якіх пры перакладзе на беларускую мову адбудзецца з'ява дзекання.

а) Диогенович;
б) Леонидович;
в) Родионович;
г) Динарович;
д) Демидович.

19. Ў пішацца ў імёнах па бацьку:

а) Я…графавіч;
б) Я…цеевіч;
в) Я…рэмавіч;
г) Я…лампавіч;
д) Я…стахавіч.

20. Суаднясіце імёны і імёны па бацьку:

а) Арыян;
б) Арэф;
в) Арый;
г) Арафат.

1. Ар'евіч
2. Арыстархавіч
3. Арыянавіч
4. Арэфавіч
5. Арафатавіч

21. Суаднясіце імёны і імёны па бацьку:

а) Анфіл;
б) Анфім;
в) Анфір;
г) Анфілох

1. Анфімаўна
2. Анфілаўна
3. Анфілохаўна
4. Анфіраўна
5. Ануфрыеўна

22. Суаднясіце імёны і імёны па бацьку:

а) Бярнардзій;
б) Бярнард;
в) Бернардын;
г) Бернат

1. Бернардынавіч
2. Бернатавіч
3. Бярнардзьевіч
4. Бярнардавіч
5. Бертольдавіч

23. Суаднясіце імёны па бацьку і імёны:

а) Валентавіч;
б) Валенцьевіч;
в) Валянцінавіч;
г) Валенціёнавіч.

1. Валянцін;
2. Валент;
3. Валенцій;
4. Валенціён;
5. Валяр'ян.

24. Суаднясіце імёны па бацьку і імёны:

а) Аркадзь;
б) Генадзь;
в) Генадзій;
г) Аркадзій

1. Аркадзьеўна
2. Аркадзеўна
3. Генадзеўна
4. Генадзьеўна
5. Генадзіеўна

25. Суаднясіце імёны па бацьку і імёны:

а) Кір'як
б) Кірэй
в) Кірык
г) Кір

1. Кір'якаўна
2. Кірыкаўна
3. Кірэеўна
4. Кіраўна
5. Кірылаўна

26. Якім тэрмінам прынята называць выдзеленыя фінальныя элементы ў прозвішчах Іван- оў, Казлоў-скі, Хам-ёнак?
а) суфіксы;
б) канчаткі;
в) суфіксоіды;
г) карані;
д) прозвішчаўтваральныя фарманты.

27. Якія з пералічаных прозвішчаў з'яўляюцца патранімічнымі?

а) Лісіцын;
б) Кузьміч;
в) Міхельсон;
г) Белавус;
д) Уюн.

28. Якія з пералічаных прозвішчаў з'яўляюцца патранімічнымі?

а) Шубін;
б) Чарных;
в) Паўловіч;
г) Галавач;
д) Маўчан.

29. Якія з пералічаных прозвішчаў з'яўляюцца непатранімічнымі?

а) Буйновіч;
г) Каламіец;

б) Глухіх;
в) Жданёнак;
д) Жлобінскі.

30. Якія з пералічаных прозвішчаў з'яўляюцца непатранімічнымі?
а) Жданенка;
б) Сабалевіч;
в) Баброўнічы;
г) Цырульнік;
д) Падгорны.

31.У аснове якіх прозвішчаў ляжаць уласныя асабовыя імёны або іх формы?
а) Курыла;
б) Сянчура;
в) Алёхна;
г) Гуменнік;
д) Прымакоў

32.У аснове якіх прозвішчаў ляжаць уласныя асабовыя імёны або іх формы?
а) Хадасевіч;
б) Мацяш;
в) Хоміч;
г) Бондар;
д) Касцюшка.

33. Якія фінальныя часткі сустракаюцца толькі ў прозвішчах усходніх славян?
а) -ук;
б) -аў;
в) -ін;
г) -енка;
д) -скі.

34. Па якіх прыметах з вялікай доляй верагоднасці можна сцвярджаць, што носьбіт прозвішча – карэнны беларус?
А) прозвішча заканчваецца на –енка, -энка,-анка,
Б) прозвішча з'яўляецца непатранімічным;
В) прозвішча заканчваецца на –онак, -ёнак;
Г) прозвішча ўтворана ад уласнага асабовага імені;
Д) прозвішча заканчваецца на –эня/ -еня.

35. У якіх сказах дапушчаны фактычныя памылкі?
А) у беларускай антрапаніміі лексемы, якія называюць адмоўныя рысы характару, выкарыстоўваюцца ў прозвішчаўтварэнні часцей, чым тыя, што абазначаюць станоўчыя якасці.
Б) далёкія продкі сучасных носьбітаў прозвішчаў Цароў, Князеў ***абавязкова*** *належалі да царскай ці княжаскай сям'і.*
В) апелятывы, што ў аснове прозвішчаў Суднікаў, Жарнасекаў, Калеснічэнка, Ігольнікаў*, абазначаюць чалавека па родзе дзейнасці.*
Г) Язычніцкае імя Воўк выражала толькі адмоўную ацэнку носьбіта.
Д) Ядро прозвішчаў на –енка знаходзіцца на поўдні Міншчыны.

36. Якія прозвішчы ўтрымліваюць фанетычныя рысы польскай мовы?

а) Загурскі;
б) Шыдлёнак;
в) Грудзіс;
г) Сцепанян;
д) Венжык.

37. Хто з даследчыкаў прапанаваў падзел прозвішчаў на патранімічныя і непатранімічныя?
а) М.В. Бірыла;
б) А.Ф. Рогалеў;
г) Г.К. Усціновіч
д) А.В. Супяранская.

в) У.А. Ніканаў;

38. Як скланяюцца прозвішчы тыпу **Масальскі, Белы**?
а) як рознаскланяльныя назоўнікі;
б) як прыметнікі;
в) як назоўнікі 2 скланення
г) не скланяюцца ўвогуле?

39. Як скланяюцца мужчынскія прозвішчы **Дамейка, Касцюшка**?
а) як рознаскланяльныя назоўнікі;
б) як назоўнікі 1 скланення;
в) як назоўнікі 2 скланення
г) не скланяюцца ўвогуле.

40. Як скланяюцца прозвішчы тыпу **Скарына, Бульба**?

а) як рознаскланяльныя назоўнікі;
б) як назоўнікі 1 скланення;
в) як назоўнікі 2 скланення
г) не скланяюцца ўвогуле.
41. У антрапаніміі якіх славянскіх народаў непатранімічныя прозвішчы займаюць значнае месца?
а) рускія;
б) балгары;
в) беларусы;
г) палякі;
д) украінцы.
42. Якія прозвішчы маюць у сваім складзе неславянскія фарманты?

а) Эрдман;
б) Скараход;
в) Давідсон;
г) Недасека;
д) Кандынашвілі.
43. У аснове якіх прозвішчаў аберагальныя язычніцкія імёны?

а) Неўдах;
б) Траянаў;
в) Нянашаў;
г) Чарнышоў;
д) Воўк.
44. У якіх прыкладах пры ўтварэнні прозвішча ад тапоніма назіраецца поўнае або частковае накладанне марфем?

а) Слуцкі;
б) Полацкі;
в) Смаленскі;
г) Друцкі;
д) Крымскі.
45. Назавіце факультатыўныя (неабавязковыя) для кожнага чалавека антрапанімныя адзінкі.
а) прозвішча;
б) мянушка;
в) асабовае імя;
г) псеўданім;
д) імя па бацьку.
46. Якія функцыі выконвалі мянушкі ў старажытнасці?
А) намінатыўна-ідэнтыфікацыйную;

Б) прафілактычную;
В) пажадальную;
Г) эмацыйна-экспрэсіўнай характарыстыкі.
47. Хто аўтар “Слоўніка беларускіх псеўданімаў і крыптанімаў (XVI– XX стст.)”?

а) В.В. Шур;
б) М.В. Бірыла;
в) Ю.А. Гурская;
г) Г.К. Усціновіч;
д) Я.У. Саламевіч.

48. Хто аўтар “Словаря имён собственных в поэзии М. Богдановича”.

а) Ю.А. Гурская;
б) Г.М. Петрачкова;
в) А.Ф. Рогалеў;
г) В.М. Касцючык;
д) М.І. Пашкевіч.

49. Паэтонім – гэта
А) онім, што ўжываецца ў паэтычным тэксце;
Б) антрапонім, які ўжываецца ў паэзіі;
В) онім, выдуманы паэтам;
Г)уласнае імя мастацкага тэксту.
50. Толькі ва ўмовах мастацкага тэксту могуць існаваць наступныя анамастычныя адзінкі:
А) Базыль;
Б) Ян;
В) Дзот Пятровіч;
Г) Электрон.

Ключы да тэсту

1. Андронім	**11**. Псеўдагінім	**21**. а2, б1, в4, г3	**31**.а,б, в	**41**. в,г,д
2. Апелятыў	**12** а, д	**22**. а3, б4, в1, г2	**32**. а,б,в,д	**42**. а,в,д
3. Крыптанім	**13.** а, в	**23**. а2, б3, в1, г4	**33**. а,г	**43.** а,в,д
4. Матронім	**14**. а, в, д	**24.** а2,б3,в4, г1	**34**. б,в,д	**44**. а,б, в,г
5. Мянушка	**15**. в, д	**25**. а1, б3,в2, г4	**35**. б,г,д	**45**. б,г
6. Адэльфонім	**16**. а, в	**26**. д	**36.** а,б,д	**46**. а,б,в
7. Гінонім	**17**. б, в	**27**. а,б,в	**37.** б	**47**. д
8. Патронім	**18.** в, д	**28**. а,б,в	**38**. б	**48.** а
9. Прозвішча	**19**. а,в,г	**29.** г, д	**39**.а	**49**. а,г
10. Псеўдаандронім	**20**. а3, б4, в1, г5	**30**. г, д	**40**. б	**50**. в,г

Ацэнка тэматычнага тэсту

Балы	Аб’ём і правільнасць выканання задання
1	Правільна выканана менш, чым на 2 балы
2	Правільна выканана 20 % заданняў
3	Правільна выканана 30 % заданняў
4	Правільна выканана 40 % заданняў
5	Правільна выканана 50 % заданняў
6	Правільна выканана 60 % заданняў
7	Правільна выканана 70 % заданняў
8	Правільна выканана 80 % заданняў
9	Правільна выканана 90 % заданняў
10	Правільна выкананы ўсе заданні

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Анамастычны слоўнік твораў Якуба Коласа / Акад. навук БССР, Ин-т мовазнаўства імя Я. Коласа ; склад.: Г. У. Арашонкава [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 638 с.

2. Арашонкава, Г. У. Кароткі слоўнік беларускай мовы: Правапіс. Вымаўленне. Словазмяненне. Словаўжыванне / Г. У. Арашонкава, В. П. Лемцюгова ; пад рэд. В. І. Рабкевіча. – Мінск : Выш. шк., 1994. – 400 с.

3. Арутюнова, Н. Д. Аномалии и язык (К проблеме языковой картины мира) / Н. Д. Арутюнова // Вопр. языкознания. – 1987. – № 3. – С. 3–18.

4. Багамольнікава, Н. А. Анамастыка Гомельшчыны: назвы роднага краю ў тапонімах : практ. кіраўн. для студэнтаў спецыяльнасці 1-21 05 01 “Беларус. філалогія” / Н. А. Багамольнікава. – Гомель : ГДУ, 2012. – 45 с.

5. Багамольнікава, Н. А. Антрапанімія Гомельшчыны ў кантэксце беларускай анамастыкі : практ. кіраўн. для студэнтаў спецыяльнасці 1-21 05 01 “Беларус. філалогія” / Н. А. Багамольнікава. – Гомель : ГДУ, 2012. – 46 с.

6. Багамольнікава, Н. А. Гісторыка-этымалагічны аналіз тапонімаў Гомельшчыны / Н. А. Багамольнікава // Изв. Гомел. гос. ун-та им. Ф. Скорины. – 2012. – № 1 (70). – С. 94–99.

7. Беларуская антрапаніміка : вучэб. дапам. / Г. М. Мезенка (навук. рэд.) [і інш.]. – Віцебск : УА “ВДУ імя П. М. Машэрава”, 2009. – 254 с.

8. Бензярук, А. Касцюшкі-Сяхновіцкія: гісторыя старадаўняга роду / А. Бензярук. – Брэст : Академия, 2006. – 130 с.

9. Бензярук, А. Рэквіем па зніклых вёсках / А. Бензярук // Сел. праўда. – 2019. – 28 студз. – С. 5.

10. Бензярук, А. Свята для сэрца: невялікія гісторыі для юных беларусаў / А. Бензярук. – Мінск : Лит. и Искусство, 2009. – 150 с.

11. Бірыла, М. В. Беларуская антрапанімія: Уласныя імёны, імёны-мянушкі, імёны па бацьку, прозвішчы / М. В. Бірыла. – Мінск : Навука і тэхніка, 1966. – 328 с.

12. Бондалетов, В. Д. Русская ономастика / В. Д. Бондалетов. – М. : Просвещение, 1983. – 224 с.

13. Брышцен, В. Мадэль pluralia tantum у айканіміі Кобрыншчыны / В. Брышцен // Слова ў мове, маўленні, тэксце : зб. навук. арт. / Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна ; пад агул. рэд. Н. Р. Якубук ; рэдкал.: Я. І. Абрамава [і інш.]. – Брэст, 2015. – С. 26–28.

14. Брышцен, В. Гідранімія Заходняга Палесся ў структурных адносінах / В. Брышцен // Слова ў мове, маўленні, тэксце : зб. навук. арт. / Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна ; пад агул. рэд. Н. Р. Якубук ; рэдкал.: Я. І. Абрамава [і інш.]. – Брэст, 2014. – С. 178–181.

15. Буракова, М. У. Анамастыка, тэрміналогія і фразеалогія : вучэб.-метад. дапам. / М. У. Буракова, В. А. Ляшчынская. – Мінск : РІВШ, 2011. – 166 с.

16. Бут-Гусаім, С. Ф. Імя і культура [Электронны рэсурс] : электрон. вучэб.-метад. дапам. / С. Ф. Бут-Гусаім. – Брэст : БрДУ, 2018. – Рэжым доступу: http://www.brsu.by/div/kafedra-belorusskoj-filologii. – Дата доступу: 12.01.2019.

17. Бут-Гусаім, С. Ф. Мянушкі жыхароў вёскі Калауравічы Пінскага раёна Брэсцкай вобласці / С. Ф. Бут-Гусаім // Мова Брэсцка-Пінскага Палесся : зб. навук. арт. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна, каф. гісторыі беларус. мовы і дыялекталогіі ; рэдкал.: М. М. Аляхновіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Брэст, 2010. – С. 14–18.

18. Гніламёдаў, У. Уліс з Прускі / У. Гніламёдаў. – Мінск : Маст. літ., 2006. – 300 с.

19. Генкин, В. М. Ойконимия и катойконимия Белорусского Поозерья : учеб.-метод. пособие / В. М. Генкин. – Витебск : ВГУ, 2009. – 120 с.

20. Горбачёва, О. Г. Ономастическое пространство русских народных и авторских сказок : дис. … канд. филол. наук : 10.02.01 / О. Г. Горбачёва. – Брянск, 2008. – 273 л.

21. Дудзюк, З. І. Кола Сварога / З. І. Дудзюк. – Мінск : Беларусь, 2006. – 400 с.

22. Емельяновіч, В. М. Беларуская анамастыка ў школе : матэрыялы спецкурсаў і спецсемінараў / В. М. Емельяновіч. – Брэст : Выд-ва БрДУ, 1999. – 50 с.

23. Емельяновіч, В. М. З гісторыі некаторых назваў / В. М. Емельяновіч // Берасцейскія карані : гіст.-краязн. і літ. зб. – Брэст, 1993. – С. 108–112.

24. Ефанова, Л. П. Выявление компонентов этнокультурного сознания в ономастиконе Ставропольского края / Л. П. Ефанова // Этнос. Язык. Культура: национальное и индивидуальное мировидение : материалы Всерос. науч. конф. – Славянск-на-Кубани, 2001. – С. 84–88.

25. Ефанова, Л. П. Имядатель как языковая личность в зеркале топонимии Ставропольского края / Л. П. Ефанова // Проблемы региональной ономастики : материалы Всерос. науч. конф. – Майкоп, 2004. – С. 56–60.

26. Кавалёва, А. В. Перайменаванні Прыпяцкага Палесся, утвораныя ад апелятываў з сімвалічным значэннем / А. В. Кавалёва // Вес. МДПУ імя І. П. Шамякіна. – 2016. – № 2 (48). – С. 107–110.

27. Калинкин, В. М. Поэтика онима / В. М. Калинкин. – Донецк : Донец. гос. пед. ун-т, 1999. – 408 с.

28. Карасик, В. И. Языковый круг: личность, концепты, дискурс : монография / В. И. Карасик. – Волгоград : Перемена, 2002. – 477 с.

29. Карніеўская, Т. А. Іменаслоў Гомеля другой паловы XX ст. : манаграфія / Т. А. Карніеўская. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2010. – 168 с.

30. Касцючык, В. М. Самабытныя моўныя адзінкі ў дыялектным і літаратурным кантэксце : вучэб.-метад. дапам. / В. М. Касцючык. – Брэст : БрДУ, 2013. – 124 с.

31. Ковадло, Л. Я. Слово – тайна тысячелетий / Л. Я. Ковадло. – Минск : Тесей, 2004. – 304 с.

32. Леванцэвіч, Л. В. Лінгвістычнае краязнаўства : вучэб.-метад. комплекс / Л. В. Леванцэвіч. – Брэст : БрДУ, 2015. – 145 с.

33. Леванцэвіч, Л. В. Праблемы лінгвакультуралогіі і этналінгвістыкі : вучэб.-метад. комплекс / Л. В. Леванцэвіч. – Брэст : БрДУ, 2018. – 130 с.

34. Леванцэвіч, Л. В. Тапанімічная прастора Брэстчыны ў навуковых даследаваннях / Л. В. Леванцэвіч // Учён. зап. Витеб. гос. ун-та. – 2018. – Т. 25. – С. 129–136.

35. Лемцюгова, В. П. Беларуская анамастыка: Лінгвістычны аналіз назваў населеных пунктаў Мінскай вобласці / В. П. Лемцюгова – Мінск : Навука і тэхніка, 1970. – 150 с.

36. Лемцюгова, В. П. Тапонімы распавядаюць : навукова-папулярныя эцюды / В. П. Лемцюгова. – Мінск : Літ. і Мастацтва, 2008. – 416 с.

37. Лемтюгова, В. П. Формирование восточнославянской ойконимии в связи с развитием типов поселений / В. П. Лемтюгова. – Минск : Навука і тэхніка, 1983. – 39 с.

38. Лемцюгова, В. П. Як нам вярнуць беларускія назвы? [Электронны рэсурс] / В. П. Лемцюгова. – Рэжым доступу: https://nn.by/?c=ar&i=114591. – Дата доступу: 4.07.2020.

39. Літвіноўская, А. 20 крокаў да беларускай мовы / А. Літвіноўская, Г. Лабадзенка. – Мінск : Медыял, 2016. – 168 с.

40. Лосев, А. Ф. Философия имени / А. Ф. Лосев. – М. : Изд-во МГУ, 1990. – 450 с.

41. Лыч, Л. М. Назвы зямлі беларускай / Л. М. Лыч. – Мінск : Універсітэцкае, 1994. – 150 с.

42. Матвеев, А. К. Ономастика и ономатология / А. К. Матвеев // Вопр. ономастики. – 2005. – № 2. – С. 5–10.

43. Мезенка, Г. М. Беларуская анамастыка : навуч. дапам. для студэнтаў ун-таў / Г. М. Мезенка. – Мінск : Выш. школа, 1997. – 119 с.

44. Мезенка, Г. М. Віцебшчына ва ўласных імёнах: мінулае і сучаснасць : манаграфія / Г. М. Мезенка, В. М. Ляшкевіч, Г. К. Семянькова. – Віцебск : ВДУ, 2006. – 234 с.

45. Митрополит Сурожский Антоний. Школа молитвы / Митрополит Сурожский Антоний. – Клин : Христиан. жизнь, 2006. – 493 с.

46. Мицкович, Н. С. Топонимическая связь времён / Н. С. Мицкович. – Мозырь : Белый ветер, 2002. – 131 с.

47. Никитина, С. Е. Имена духоборов и молокан / С. Е. Никитина // Имя: внутренняя сруктура, семантическая аура, контекст : сб. науч. ст. : в 2 ч. – М., 2001. – Ч. 1. – С. 123–126.

48. Пашкевіч, М. І. У родным слове адгукаецца душа / М. І. Пашкевіч. – Брэст : Альтернатива, 2012. – 196 с.

49. Петрачкова, І. М. Жанраўтваральная роля онімаў у гістарычных аповесцях К. І. Тарасава / І. М. Петрачкова // Изв. Гомел. гос. ун-та им. Ф. Скорины. – 2001. – № 1 (10). – С. 122–124.

50. Петрачкова, И. М. Значимость имени собственного в художественном тексте (на материале современной русской прозы) : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10. 02. 02 / И. М. Петрачкова ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2003. – 21 с.

51. Піваварчык, І. В. Хрысціянскія айконімы ў тапаніміцы Гродзеншчыны / І. В. Піваварчык // М. В. Ломоносов в истории науки, культуры, университетского образования : материалы Междунар. науч. конф., Гродно, 15–16 дек. 2011 г. / Гродн. гос. ун-т им. Я. Купалы ; гл. ред. А. В. Никитевич. – Гродно, 2013. – С. 237–239.

52. Подольская, Н. В. Словарь русской ономастической терминологии / Н. В. Подольская. – М. : Наука, 1988. – 312 с.

53. Рогалев, А. Ф. Введение в антропонимику. Именование людей с древнейших времён до конца XVIII века (на белорусском антропонимическом материале) / А. Ф. Рогалев. – Брянск : Десяточка, 2009. – 147 с.

54. Рогалев, А. Ф. Имя и образ: Художественная функция имён собственных в литературных произведениях и сказках / А. Ф. Рогалев. – Гомель : Барк, 2007. – 224 с.

55. Русская грамматика : в 2 т. / Н. Ю. Шведова (гл. ред.) [и др.]. – М. : Наука, 1980. – Т. 1 : Фонетика. Фонология. Ударение. Интонация. Словообразование. Морфология. – 789 с.

56. Саламевіч, Я. Пад жаночымі прозвішчамі / Я. Саламевіч // Роднае слова. – 2009. – № 6. – С. 34–36.

57. Саламевіч, Я. Слоўнік беларускіх псеўданімаў і крыптанімаў (XVI–XX стст.) / Я. Саламевіч. – Мінск : Маст. літ., 1983. – 207 с.

58. Сарычев, В. В поисках утраченного времени : в 7 кн. / В. Сарычев. – Брест : Брест. тип., 2007. – Кн. 2. – 312 с.

59. Слоўнік мовы Скарыны : у 3 т. / Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны, Нац. навук.-асвет. цэнтр імя Ф. Скарыны ; склад. У. В. Анічэнка ; навук. рэд. В. І. Баркоўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978 –1994. – Т. 3 : Анамастыка і тапаніміка. – 248 с.

60. Слоўнік мовы Янкі Купалы : у 8 т. / склад.: У. А. Бобрык [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 1997–2003. – Т. 6 : Анамастыка / рэдкал. В. А. Ляшчынская (гал. рэд.) [і інш.]. – 2003. – 262 с.

61. Станкевіч, Я. Хрышчоныя імёны вялікалітоўскія / Я. Станкевіч // Спадчына. – 1992. – № 6. – С. 96–101.

62. Суперанская, А. В. Ваше имя? Рассказы об именах разных народов / А. В. Суперанская. – М. : Армада-пресс, 2001. – 256 с.

63. Суперанская, А. В. Общая теория имени собственного / А. В. Суперанская. – М. : Наука, 1973. – 366 с.

64. Суслова, А. В. О русских именах / А. В. Суслова, А. В. Суперанская. – Л. : Лениздат, 1985. – 222 с.

65. Суслова, А. В. Современные русские фамилии / А. В. Суслова, А. В. Суперанская. – М. : Наука, 1981. – 324 с.

66. Сцяшковіч, Т. Ф. Слоўнік Гродзенскай вобласці / Т. Ф. Сцяшковіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 671 с.

67. Сызранова, Г. Ю. Ономастика : учеб. пособие / Г. Ю. Сызранова. – Тольятти : Изд-во ТГУ, 2013. – 248 с.

68. Сянкевіч, В. І. Семантыка і прагматыка беларускай мовы / В. І. Сянкевіч. – Брэст : БрДУ, 1995. – 214 с.

69. Теория и методика ономастических исследований / А. В. Суперанская [и др.] ; АН СССР, Ин-т языкознания. – М. : Наука, 1986. – 254 с.

70. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы : больш за 65 тысяч слоў / І. М. Бунчук [і інш.] ; пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко. – Мінск : БелЭн, 1996. – 784 с.

71. Усціновіч, А. К. Антрапанімія Гродзеншчыны і Брэстчыны (XIV–XVIII стст.) / А. К. Усціновіч ; пад рэд. М. В. Бірылы. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 176 с.

72. Усціновіч, А. К. Нашы прозвішчы / А. Усціновіч // Роднае слова. – 2005. – № 8. – С. 73–77.

73. Философский словарь / под ред. И. Т. Фролова. – М. : Политиздат, 1987. – 590 с.

74. Фонякова, О. И. Имя собственное в художественном тексте / О. И. Фонякова. – Ленинград : Изд-во ЛГУ, 1990. – 104 с.

75. Чыж, А. Беларускі іменьнік / А. Чыж. – Гомель : Collegium sarmacum, 1998. – 60 с.

76. Шумская, І. А. Аналіз словаўтваральных тыпаў прозвішчаў студэнтаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта / І. А. Шумская, Н. А. Вабішчэвіч // Пачатковая адукацыя і выхаванне: праблемы, пошукі, знаходкі : зб. навук. пр. ; пад рэд. М. В. Міхальчука, І. А. Шумскай. – 1995. – Вып. 1. – С. 181–183.

77. Шумская, І. А. Антрапонімы, якія характарызуюць знешні выгляд чалавека / І. А. Шумская // Дыялекталогія і культура беларускай мовы : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Мінск, 10–11 снежня 1991 г. / Акад. навук. Рэсп. Беларусь, Ін-т мовазнаўства. – Мінск, 1991. – С. 190–191.

78. Шумская, І. А. Пра адзін тып антрапонімаў / І. А. Шумская // Беларуская анамастыка : зб. арт. / Акад. навук БССР, Ін-т мовазнаўства ; рэд. М. В. Бірыла, В. П. Лемцюгова. – Мінск, 1992. – С. 26–31.

79. Шумская, І. А. Эмацыянальна-ацэначныя формы жаночых асабовых імён / І. А. Шумская // Badania dialektów i onomastyki na pograniczu polsko-wschodniosłowiańskim / Uniwersytet Warszawski, Filia w Białymstoku, Zakład Filologii Wschodniosłowiańskich ; pod redakcią M. Kondratiuka. – Białystok, 1999. – S. 297–303.

80. Шумская, І. А. Эмацыянальна-ацэначныя формы мужчынскіх асабовых імён Брэстчыны / І. А. Шумская // Вес. АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1983. – № 1. – С. 102–109.

81. Шур, В. В. Беларускія ўласныя імёны: беларуская антрапаніміка і тапаніміка : дапам. для настаўнікаў / В. В. Шур. – Мінск : Маст. літ., 1998. – 239 с.

82. Шур, В. В. Слова ў мастацкім кантэксце: онімы, метафары : манаграфія / В. В. Шур, С. Б. Кураш. – Мазыр : УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, 2013. – 268 с.

СЛОЎНІК АНАМАСТЫЧНЫХ ТЭРМІНАЎ

Агіёнім – імя святога: ***Еўфрасіння Полацкая, Матрона Маскоўская, Святая Сафія***.

Анамастыка – раздзел мовазнаўства, якія вывучае любыя ўласныя імёны, гісторыю іх узнікнення і трансфармацыі ў выніку працяглага ўжывання ў мове-крыніцы ці ў сувязі з запазычваннем з іншых моў. У больш вузкім значэнні анамастыка – гэта ўласныя імёны розных тыпаў, сукупнасць анамастычных слоў, анамастычная лексіка.

Анамастычная прастора (анамастыкон) мовы – сукупнасць імён уласных, якія ўжываюцца ў мове данага народа для іменавання рэальных, гіпатэтычных і фантастычных аб'ектаў.

Анамастычная прастора (анамастыкон) мастацкага твора – гэта сукупнасць усіх ужытых у творы імён уласных, якія канструююць спецыфічную анамастычную парадыгму, што акумулюе культурна-гістарычную, міфалагічную, сацыяльную, ідэалагічную інфармацыю.

Антрапанімічная прастора (антрапанімікон) – сукупнасць усіх антрапонімаў, якія ўжываюцца ў мове пэўнага этнасу ў пэўны гістарычны перыяд.

Антрапонім – імя ўласнае, якое ідэнтыфікуе чалавека ці групу людзей, у тым ліку асабовае імя (***Кацярына***), імя па бацьку (***Аляксандраўна***), прозвішча (***Юнкевіч***), псеўданім (***Цётка***), мянушка (***Чапля***).

Археонім – устарэлае ўласнае імя, якое адрозніваецца ад сучаснага оніма поўнасцю або асаблівасцямі гучання, марфемным складам і інш., напр.: ***Полацак*** (сучасны ***Полацк***), ***Менск*** (сучасны ***Мінск***), ***Ізяслаўль*** (сучаснае ***Заслаўе***), ***Лагожаск*** (сучасны ***Лагойск***), ***Хвалынскае мора*** (сучаснае ***Чорнае мора***).

Астронім – імя ўласнае асобнага нябеснага цела: зоркі, планеты, каметы, астероіда і інш.: ***Венера, Юпітэр, Плутон***.

Бібліёнім – назва пісьмовага твора, напр.: казка Г. Марчука ***"Чужое багацце".***

Геартонім – назва свята, памятнай даты, урачыстага мерапрыемства: ***Вадохрышча, Купалле, Раство***.

Гістарыёнім – устарэлае ўласнае імя, якое з'яўляецца найменнем аб'екта, што знік з гістарычнай і палітычнай карты: ***Вялікае Княства Літоўскае, Візантыўская імперыя, Полацкае княства, Маскоўскае княства***.

Заонім – імя ўласнае (мянушка) жывёлы, напр.: празванні герояў казак Г. Марчука конь ***Мадагаскар***, крумкач ***Крывыя Лапы***.

Імя-рэмінісцэнцыя – паэтонім, ужыванне якога заснавана на перанясенні пэўных рыс асобы, названай іменем-арыгіналам, на іншы персанаж, у адносінах да якога наўмысна выкарыстоўваецца імя вобраза-“першакрыніцы”. Напр., у аснове мянушкі персанажа рамана Г.Марчука “Крык на хутары”, аматара чаркі ***Бахуса*** – метафарычнае выкарыстанне імені героя антычнай міфалогіі, бога вінаградарства і вінаробства.

Касмонім – уласнае імя зоны касмічнай прасторы, галактыкі, зорнай сістэмы (сузор’я), часткі сузор’я: ***Вялікая Мядзведзіца, Зорны шлях,*** сузор’е ***Лебедзя.***

Літаратурная (паэтычная) анамастыка – раздзел анамастыкі, які вывучае ў розных аспектах любыя імёны ўласныя (паэтонімы) у мастацкіх тэкстах. Літаратурная анамастыка даследуе адлюстраванне элементаў рэальнай і выдуманай анамастыкі (іх сукупнасць складае анамастыкон мастацкага тэксту) на аснове іх індывідуальнага пераламлення і выкарыстання ў створаным пісьменнікам тэксце, элементам якога з’яўляюцца імёны ўласныя.

Міфонім – уласнае імя прыдуманага аб’екта любой катэгорыі (героя, боства, дэманічнага персанажа, месца) у міфах і казаннях: ***Хлеўнік, Спешка-Спарышка, Алатыр-камень***.

Мянушка – неафіцыйнае ацэначна-характарыстычнае найменне асобнага чалавека, а таксама прадстаўнікоў пэўнай сям’і, роду і жыхароў пэўнай вёскі: ***Фарысей, Археолаг, Павейкавы, Кабыльнікі***.

Мянушка-андронім – мянушка, дадзеная жонцы па імені, мянушцы або прозвішчы мужа: ***Лявоніха***, ***Васіліха, Аграномка***.

Мянушка-гінонім – мянушка, утвораная ад імені, прозвішча або мянушкі жонкі: *Вунь у дубняку відаць тутэйшага прыстава, па мянушцы* ***Вусаціха***. *У жонкі ягонай* ***пад носам вусікі***. *Таму і* ***Вусаціха***. *І ён, прыстаў,* ***Вусаціха****, і яна – жанчына, таксама* ***Вусаціха*** (А. Наварыч “Літоўскі воўк”).

Мянушка-матронім – найменне чалавека, утворанае ад імені ці мянушкі маці або продкаў па жаночай лініі, напр.: ***Барбарыч, Цэцыліха, Тарэсіны, Тарэсіны, Крысіны, Марысіны***.

Мянушка-патронім – мянушка, утвораная ад імені ці мянушкі бацькі або продкаў па мужчынскай лініі: ***Хвелевы, Канакрадавы***.

Сямейна-родавая мянушка – мянушка, замацаваная за прадстаўнікамі сям’і, а таксама за прадстаўнікамі роду: ***Канакрадавы, Адэсішыны, Чушбавы, Тарэсіны, Хвелевы.***

Нейтральныя паэтонімы – уласныя імёны, значэнне асновы якіх, іх этымалогія не нясуць інфармацыі пра асаблівасці характару персанажа, не выражаюць ацэнкі літаратурнага героя. Нейтральныя імёны выконваюць у мастацкім творы выключна намінатыўна-ідэнтыфікуючую

функцыю. Напр., да ліку нейтральных адносяцца ўжытыя ў гістарычным рамане Г. Далідовіча “Кліч роднага звона” імёны рэальных асоб – валадароў тагачасных дзяржаў свету: ***Кацян, Батый, Чынгісхан, Міхаіл Чарнігаўскі, Конрад Мазавецкі, Ізяслаў Навагародскі, Яраслаў Уладзімірскі***, ***Альфрэд фон Штумпенхаўзен***, ***Міндоўг, Войшалк, Таўцівіл, Эдзівід, Транята,*** якія ствараюць “фон” мастацкага палатна.

Парадыйныя імёны – паэтонімы з камічным гукавым абліччам, заснаваныя на наўмысна кплівым ці зняважлівым скажэнні сапраўднага імені і дадзеныя персанажам з мэтай камічнай ці сатырычнай іх абмалёўкі. Напр., мянушка персанажа п’есы Г. Марчука “Цвярозы дзень Сцяпана Крыварчкі” ўчастковага ***Дзот Пятровіч***, утвораная на аснове сапраўднага імені ***Зот Пятровіч.***

Патронім (імя па бацьку) – найменне чалавека, утворанае ад імені ці мянушкі бацькі або продкаў па бацькоўскай лініі: ***Глебавічы, Святаславічы***, Уладзімір ***Андрэевіч*** Калеснік.

Паэтонім – імя ў мастацкай літаратуры, якое мае ў мове твора, акрамя намінатыўнай, характарыстычную, стылістычную і ідэалагічную функцыі. Як правіла, адносіцца да катэгорыі прыдуманых імён, але часта пісьменнікам выкарыстоўваюцца рэальна існуючыя імёны ці камбінацыя тых і іншых, напр., імёны персанажаў казак Г. Марчука ***Несцерка, Багуслава, Сілуян***, каралева ***Бона.***

Паэтонім-вобраз – характарыстыка літаратурнага персанажа, у аснове якой метафарычна ўжытае імя вядомай гістарычнай асобы або літаратурнага героя, якія сталі ўвасабленнем пэўных чалавечых якасцей: “*Хрысця – німфа, якую паслаў мне Бог, ранішняя кветка,* ***Афрадыта***” (А.Наварыч “Літоўскі воўк”).

Прагматонім – уласнае імя, выкарыстанае для абазначэння гатунка, маркі, таварнага знака: масла “***Расінка***”, хлеб “***Гаспадар***”.

Прамагаваркія імёны (онімы, паэтонімы) – паэтонімы з празрыстай унутранай формай, якія характарызуюць прама, непасрэдна, з’яўляючыся свайго роду ярлыкамі, этыкеткамі, якія прадвызначаюць характар успрымання і ацэнкі героя. Напрыклад, імя героя рамана З. Дудзюк “Велясіты” ***Гаразд*** уяўляе сабой лаканічную характарыстыку здольнага, спрытнага, кемлівага хлопца.

Прозвішча – гэта спадчыннае імя сям’і, устойлівае не менш як у трох пакаленнях, спадчыннае афіцыйнае найменне: ***Луцэвіч, Міцкевіч, Каско.***

Патранімічнае прозвішча – прозвішча, якое першапачаткова выконвала функцыю імёні па бацьку – указвала на прыналежнасць чалавека да пэўнага бацькі (***Пятроў*** – “сын Пятра”, ***Шубін*** “сын Шубы”, ***Якабсон*** “сын Якаба”, ***Кузьміч*** – “сын Кузьмы”.

Псеўданім – спецыяльна прыдуманае найменне, якое ўжываецца ў грамадскім жыцці чалавека паралельна з сапраўдным іменем або замест яго: ***Янка Купала*** (І. Луцэвіч), ***Міхась Чарот*** (М. Кудзелька), ***Кузьма Чороны*** (М. Раманоўскі).

Схаванагаваркае імя (онім, паэтонім) – імя, якое выражае "затушаваную" характарыстыку літаратурнага героя за кошт выкарыстання дыялектнай і іншамоўнай асновы: напрыклад, прозвішча героя казкі Г. Марчука пана ***Валкевіч*** (ад польскага ***walka*** '*змаганне, барацьба'*).

Тапонім – уласнае імя любога геаграфічнага аб'екта: мора, ракі, горада, поля і інш.: ***Брэст, Пружаны, Прыпяць, Паросцы***.

Тэонім – уласнае імя боства (***Пярун, Велес, Буда***).

Уласнае асабовае імя – персанальнае імя чалавека ў адрозненне ад прозвішча, імені па бацьку, напр.: ***Усевалад, Кацярына***.

Хрысціянскае імя – імя, дадзенае падчас хрышчэння: ***Васіль, Алена, Якаў***.

Царкоўнае імя – імя, якое фіксуецца ў праваслаўных святцах: ***Еўфрасіння, Сергій***.

Язычніцкае імя – неканонічнае імя, звязанае з перыядам першабытных рэлігійных вераванняў і культаў у розных народаў, якое працягвала існаваць і пасля ўвядзення сусветных рэлігій, побач з кананічнымі імёнамі, напр.: Неўдах, Воўк.

Уласнае імя (онім) – слова, словазлучэнне або сказ, якія служаць для вылучэння называнага імі аб'екта сярод іншых аб'ектаў, яго індывідуалізацыі і ідэнтыфікацыі, напр.: ***Зінаіда Іосіфаўна Дудзюк, Велясіція, Грамніцы.***

Урбанонім (урбонім) – від тапоніма, уласнае імя любога ўнутрыгарадскога тапаграфічнага аб'екта – плошчы, вуліцы, базара, будынка і інш., напр: вуліца ***Брэсцкіх дывізій***, плошча ***Свабоды.***

Ускоснагаваркія імёны (онімы, паэтонімы) – характарыстычныя паэтонімы з "зацемненай" ўнутранай формай, для высвятлення якой патрэбны кантэкст, які спрыяе раскрыццю характарыстыкі, закладзенай у паэтоніме. Напр., прозвішча персанажа апавядання А. Крэйдзіча "Перон для беспрытульных" ***Карчэўскі***, асацыятыўна звязанае з пераносным значэннем дзеяслова ***карчаваць*** "*выкараняць, вынішчаць без астатку*", адлюстроўвае маральнае аблічча міліцыянера, які, выслужваючыся перад начальствам, забіў, "*выкарчаваў*" чалавечыя пачуцці: спачуванне, павагу да чалавека.

Хрэматонім – гэта ўласнае імя прадмета матэрыяльнай культуры: цукеркі "***Знічка***", крама "***Несцерка***".

Эклезіёнімы – імёны ўласныя, якія абазначаюць назвы сабораў, храмаў, манастыроў, капліц: ***Свята-Мікалаеўская царква, Сімяонаўскі сабор***.

Эргонімы – уласныя імёны дзелавых аб'яднанняў людзей, арганізацый, устаноў, прадпрыемстваў: рэстаран "Малка", гасцініца "Беларусь".

ЗМЕСТ

Прадмова 3
Змест вучэбнага матэрыялу 5
Прыкладны тэматычны план 9
Лекцыйны матэрыял 10
Тэма 1. Агульныя пытанні тэорыі анамастыкі 10
Тэма 2. Антрапаніміка як раздзел анамастыкі 16
Тэма 3. Уласныя асабовыя імёны 24
Тэма 4. Прозвішчы 44
Тэма 5. Мянушкі. Псеўданімы 52
Тэма 6. Асновы літаратурнай анамастыкі 69
Тэма 7. Тапаніміка як раздзел анамастыкі 75
Тэма 8. Вытокі геаграфічных назваў Беларусі 84
Тэма 9. Тапанімічныя назвы як адлюстраванне жыцця і побыту народа 89
Тэма 10. Шляхі адраджэння беларускай тапаніміі 95
Тэма 11. Дэрывацыя (словаўтварэнне) анамастычнай лексікі 101
Матэрыялы да практычных заняткаў 116
Практычныя заняткі 1. Агульныя пытанні тэорыі анамастыкі 116
Практычныя заняткі 2. Уласныя асабовыя імёны 119
Практычныя заняткі 3. Прозвішчы 124
Практычныя заняткі 4. Асновы літаратурнай анамастыкі 129
Практычныя заняткі 5. Вытокі геаграфічных назваў Беларусі 135
Практычныя заняткі 6. Шляхі адраджэння беларускай тапаніміі 138
Практычныя заняткі 7. Дэрывацыя (словаўтварэнне) анамастычнай лексікі 141
Пытанні да заліку 144
Тэсты 145
Спіс выкарыстанай літаратуры 152
Слоўнік анамастычнай тэрміналогіі 158